

Віталь Тарас

# ЗВЫКЛАЕ ЗЛО

Кнігарня Наша Ніва

# Зьмест

Прадмова ............ 5
Ад аўтара ............ 7

**Правілы граматыкі ............ 9**

12 ............ 11
Зьніклым не баліць ............ 17
«Ленін», — думае беларус ............ 26
Голая праўда ............ 34
Правілы граматыкі ............ 40
Новы крыжовы паход ............ 47
Цунамі ............ 52
Прага волі ............ 60
Білборды ў цемры,
альбо Няхай сабе паклёпнічаюць ............ 67
Вялікі спачын. Субота для чалавека
ці чалавек для суботніка? ............ 73
Апошні парад надыходзіць ............ 78
Дагары нагамі,
альбо Высакародны каўбой Джо ............ 85
Горад-герой майго дзяцінства ............ 89
Гэтае забытае слова — «Салідарнасьць» ............ 96
Чароўная кніга скаргаў,
альбо Дзівоснае лета 2005-га ............ 104
Іншым разам яны вяртаюцца ............ 110

Тры бакі аднаго мэдаля .......... 118
Ціха! Ідзе інфармацыйная вайна! .......... 126
На вайне як на вайне .......... 133
Што мне рабіць? .......... 141
Хто вы? Думкі ў рэанімацыі .......... 151
Адваротны бок месяца .......... 163
Суцэльныя непрыемнасьці,
альбо Антыапалёгія інтэрнэту .......... 169
Закон выпадковасьці .......... 175
Звыклае зло .......... 183
Канец антыўтопіі .......... 191

**Personalia .......... 207**

Рожденный под знаком Водолея .......... 209
Быкаў у Празе .......... 213
Урокі пэсымізму .......... 220
Апорыі Зянона .......... 226
Юра .......... 228
Рэжысэр, якому пашанцавала .......... 230

**Расчараваны вандраўнік .......... 235**

Каменьчыкі ў чужым гародзе .......... 237
Блізу Далі. Паездка ў Фігэрэс .......... 285
Жэнэўскі тупік, альбо Страсьці
ў кулюарах ААН на тле
альпійскага краявіду .......... 291

**Замест пасьляслоўя .......... 299**

Што гэта было? .......... 301

# Прадмова

Пісаць прадмову да кнігі, пазыцыя аўтара якой, пры ўсёй палемічнасьці тэкстаў, падаецца табе бясспрэчнай, — справа няўдзячная. Хоць ты вазьмі ды далучы свой подпіс суаўтара. Таму пра зьмест я казаць ня буду. Скажу пра сэнс.

Супрацьпастаўленьне газэтнага артыкула, які, нібыта жыве тыдзень, і рамана, разьлічанага на вечнасьць, — умоўнае. Бывае і наадварот. Галоўнае, што і артыкул, і раман падпарадкоўваюцца агульным законам літаратуры.

Адзін з памылковых стэрэатыпаў — пра тое, што літаратура мусіць кагосьці чамусьці вучыць, настойліва абвяргаў Васіль Быкаў. Літаратура — будзь гэта артыкул або раман — ня толькі ня мусіць, але й ня мае права вучыць.

Другі памылковы стэрэатып — пра тое, што літаратура павінна вытлумачваць рэчаіснасьць, абвяргае сваёй кнігай Віталь Тарас. Літаратура ўвогуле нічога нікому не павінна.

Тыя аўтары, якія знаходзяцца ў палоне гэтых стэрэатыпаў, якраз і асуджаюць сябе на непрачытаньне або хуткае забыцьцё.

Але для чаго ж тады пішацца і чытаецца літаратура — вось гэтыя артыкулы і эсэ? Насамрэч у іх высокая місія. Яны фармуюць адзіную прастору нашага паразуменьня. Яны яе ўтвараюць і ўвесь час падтрымліваюць на прыкладах зьменлівае рэчаіснасьці. Якім мы бачым сьвет вакол сябе і якімі — сябе саміх? Калі нашыя ба-

чаньні супадаюць, тады мы не разрозьненыя адзінкі, а — грамадзтва.

Беларускае грамадзтва сёньня разрозьненае настолькі, наколькі, бадай, не было ніколі. Гэта плён сьвядомае палітыкі аўтарытарнага рэжыму, які ня церпіць ніякіх праяваў альтэрнатывы. Такія аўтары, як Віталь Тарас, існуюць у паўпадпольных выданьнях, тады як афіцыйныя СМІ поўныя фальшу і прапаганды. Яны не фармуюць кансалідаванага меркаваньня грамадзтва, а наадварот, разбураюць яго, сьцьвярджаючы вяршэнства і нязьменнасьць існуючага ладу. Таму публіцыстыка і эсэістыка ў сёньняшняй літаратуры — жанры «недзяржаўныя» і «апазыцыйныя».

Тым ня менш, голас публіцыстаў даходзіць да публікі і робіць сваю справу. Ці мы і ў сёньняшнім кантэксьце ўсе разам лічым фашызм адмоўнай зьявай? Ці мы аднолькава разумеем сутнасьць грамадзянскіх свабод? Ці мы не перасталі адрозьніваць высокую культуру ад падробак сэрвільнага поп-мастацтва? На гэтыя пытаньні і адказвае публіцыстыка. Чытаючы ўсхваляваныя словы літаратара, ты кожны раз пераконваесься, што дабро і зло, белае і чорнае, сьвятло і цемра ў гэтым сьвеце хоць і зьмянілі свой выгляд, але ў сутнасьці засталіся ранейшымі. Ты, можа, і гатовы быў зачаравацца іх новымі незвычайнымі апранахамі, але прачытаў артыкул і — ня даў падмануць сябе шэрасьці ды ня зьбіўся з дарогі ў тумане.

Нездарма пра таленавітага публіцыста чытач часьцяком кажа: ён напісаў тое, што я думаў.

Праўдзівая літаратура — і тая, што жыве адзін дзень, і тая, што жыве вечнасьць, — кожная ў сваім жанры прапануе нам «зьверыць гадзіньнікі» і пераканацца, што ёсьць у сьвеце рэчы, да якіх мы ставімся аднолькава, і гэта нас яднае. Як любоў да аднае Радзімы. Як погляд на тое, што ёсьць добра, а што кепска. Як правілы граматыкі.

*Сяргей Дубавец*

## Ад аўтара

Век газэтнага артыкулу ці эсэ нядоўгі. Нават калі газэта — тыднёвік, публікацыя ў ёй жыве, самае большае, дзён пяць. Але, насуперак законам жыцьця і журналістыкі, я спрабаваў пісаць для «Нашай Нівы» хоць і актуальна, але ўсё-ткі маючы на ўвазе так званыя «адвечныя тэмы».

Наконт «адвечных тэмаў» ёсьць анэкдот. Людажэрца ноччу ніяк ня можа заснуць, варочаецца з боку на бок. У галаву яму лезуць розныя дзіўныя пытаньні: «Хто мы такія? Адкуль прыйшлі і навошта? Што будзе пасьля нас? У чым сэнс жыцьця?» Нарэшце жонка людажэрцы не вытрымлівае і пачынае папікаць мужа: «Я табе колькі разоў казала — ня еш на ноч інтэлігентаў!»

Я прывёў гэты анэкдот зусім не таму, што лічу сябе інтэлігентам. Як і большасьць звычайных людзей, я належу, хутчэй, да людажэрцаў. Усе мы ў той або іншай ступені займаемся ў паўсядзённым жыцьці паяданьнем чалавекаў — блізкіх і далёкіх. І ўсе мы час ад часу пакутуем ад філязофскіх пытаньняў. Сэнс іх у тым, што на іх няма адказаў. Зразумела, дарма было б шукаць іх і ў газэтных публікацыях учарашняга дня. Я проста спрабаваў шчыра зірнуць на жыцьцё і тыя паў-

сядзённыя пытаньні палітыкі і культуры, якія хвалявалі ці дагэтуль хвалююць беларусаў, са сваёй, так бы мовіць, званіцы, з гледзішча ўласнага досьведу і перакананьняў. Нікога і ні ў чым пры гэтым не імкнучыся пераканаць.

Але калі хоць бы ў аднаго чалавека пры чытаньні маіх «нашаніўскіх артыкулаў» узьнікне жаданьне сказаць: «Га, і я так думаю!», альбо наадварот: «Не, я так ня думаю!» — мэта мая як аўтара будзе цалкам дасягнутая.

Дзякуй рэдактару «Нашай Нівы» Андрэю Дыньку за некалькі гадоў цярплівасьці і ўпартасьці, зь якой ён друкаваў мае эсэ і артыкулы на старонках свайго выданьня.

Дзякуй усім «нашаніўцам» за тое, што я меў шчасьце й гонар быць зь імі знаёмым.

Дзякуй маёй жонцы Алене, майму сыну Антосю, маім бацькам, а таксама сябрам за маральную падтрымку, карысныя парады і проста за тое, што яны не ленаваліся чытаць артыкулы, якія склалі гэтую кнігу.

# Правілы граматыкі

# 12

Мы жывем паводле бабілёнскага календару. У сярэдзіне другога тысячагодзьдзя да Раства Хрыстова ў Бабілёне была прыдуманая дванаццацірычная сыстэма лічэньня. (Адтуль пайшло дзяленьне году на дванаццаць месяцаў, дня на дванаццаць гадзінаў і г.д.) Каляндарны год складаўся з дванаццаці месяцаў ужо ў старажытным Эгіпце. Але ў Бабілёне кожны трэці год пачалі прыбаўляць высакосны месяц — дзеля таго, каб сума дванаццаці месячных цыкляў супадала з сонечным годам. Ужо тагачасныя астраномы ведалі, што дакладна падзяліць поўны сонечны цыкль на цотныя кавалкі немагчыма. Заўсёды будуць заставацца «лішнія» сэкунды, хвіліны, содні. Таму астранамічны сонечны час ніколі не супадае зь зямным, нягледзячы на высакосныя гады.

**За сэкунду да скону сьвету**

За тры з паловай тысячы гадоў чалавек няшмат даведаўся пра прыроду часу, хоць і навучыўся дзяліць яго на нанасэкунды ды яшчэ драбнейшыя кавалкі, як матэрыю — на элемэнтарныя часьцінкі. Апрача ўсяго іншага, выявілася, што час залежыць ад індывідуальнага ўспрыняцьця чалавека. Для кагось ён цягнецца, як гумка, для

кагось нясецца наўскапыт. Гэтаксама па-рознаму ўспрымаюць яго асобныя нацыі й народы.

Старажытныя індусы аднекуль ведалі (а можа, веды ім былі дадзеныя аднекуль звыш?), што сусьвет існуе доўга. Не бясконца доўга, але даволі шмат часу.

Адзін дзень жыцьця бога Брамы, які стварыў сусьвет, роўны 12 000 боскіх гадоў, альбо 4 320 000 чалавечых гадоў (адзін год жыцьця чалавека — гэта суткі жыцьця багоў). Брама жыве сто сваіх боскіх гадоў. Цягам Махаюгі — аднаго дня жыцьця Брамы — існуе наш сусьвет. Калі бог засынае, сьвет гіне, а раніцай Брама стварае яго наноў. Цяпер, паводле вераваньняў індусаў, пачаўся апошні, чацьверты адрэзак Махаюгі — Каліюга. Гэты пэрыяд цягнецца ўсяго 1000 боскіх гадоў, і ў гэты час на зямлі, да самай яе гібелі, верхаводзяць загана й зло. Так што да скону сьвету застаўся які-небудзь мільён гадоў. І пераменаў да лепшага ня будзе. Будзе толькі горш.

Але забудземся на хвіліну аб вераваньнях старажытных індусаў і зьвернемся да хрысьціянскага календару. У гэтым выпадку сказаць, што ўсе народы сьвету жывуць у дваццаць першым стагодзьдзі — значыць, сьвядома зьдзейсьніць памылку. Некаторыя народы шчэ ня выбраліся зь сярэднявечча, некаторыя засталіся ў першабытнай эпосе. Гэта ня значыць, што першабытныя народы чымсьці лепшыя за так званыя высокаразьвітыя нацыі. Высокі ўзровень тэхналёгіі вытворчасьці кока-колы ці балістычных ракетаў і ўменьне карыстацца інтэрнэтам зусім не абавязкова азначае, што ў карыстальніка розум і эмацыйны ўзровень чымсьці кардынальна адрозьніваецца ад узроўню нэандэртальца.

У кожным выпадку, зямны час, час зямнога чалавека, як і ў дагістарычную эпоху, вымяраецца ягоным уласным жыцьцём. У дзяцінстве ды юнацтве здаецца, што часу яшчэ вельмі шмат, потым яго становіцца ўсё меней. А ў старасьці яго проста не застаецца зусім — дні мільгаюць, як тыя слупы абапал дарогі ў вакне гоначнага аўтамабіля.

**Ніколі не кажы ніколі**

Мабыць, у сілу гэтай псыхалягічнай асаблівасьці, а таксама ў сілу жаданьня пераносіць свой асабісты досьвед на навакольную рэчаіснасьць, чалавек пачынае думаць, быццам зь цягам часу ўсё вакол становіцца горш. І сапраўды, лепшыя сябры паміраюць, пасаджаныя дрэвы сохнуць, каханыя прыгажуні старэюць, становяцца непрыгожымі, усё набытае багацьце кудысьці зьнікае, а калі не зьнікае, дык перастае радаваць, і нават сонца сьвеціць ня так, як у маладосьці. (А яно ж і насамрэч паступова састывае!) Толькі зло нікуды не дзяваецца. Яно жыве й перамагае.

Ніколі-ніколі, здавалася яшчэ якіх-небудзь трыццаць гадоў таму (менш за адну сэкунду ў жыцьці Брамы), ніколі ня зьнікне гэтае зло пад назвай Савецкі Саюз. Заўсёды будуць існаваць КПСС, парады на Краснай плошчы, старыя правадыры на трыбуне Маўзалея, дні палітынфармацыі, «рыбныя дні» ў сталоўках, дапамога першакурсьнікаў на ўборцы бульбы. Ніколі БССР ня будзе Рэспублікай Беларусь — незалежнай і сувэрэннай.

Рэспубліка Беларусь ёсьць. Савецкага Саюзу няма. Як няма КПСС і старых партыйных правадыроў. Палітынфармацыя і «шэфская дапамога» на ўборцы бульбы засталіся, але не выклікаюць

былога раздражненьня. А шчасьця ўсё адно няма. Бо колькасьць зла ў прыродзе не зьмяншаецца. Проста зло набыло іншае аблічча. У адных выпадках яно стала яшчэ больш нахабным і нахрапістым, у іншых — наадварот, больш вытанчаным і крывадушным.

Час зьмяніўся — каб пераканацца ў гэтым, дастаткова зірнуць у вакно. Мы не зьмяніліся. Мы прызвычаіліся засоўваць уласнае жыцьцё ў пракрустаў ложак вонкавых формаў і фактараў. Некалі мы жылі «ад зьезду да зьезду». Паступова прызвычаіліся жыць ад выбараў да выбараў. Як з тымі зьездамі КПСС — чым большы быў іхны парадкавы нумар, тым меней даводзілася чакаць пераменаў у жыцьці ад іх рашэньняў, — гэтак і выбары зь цягам часу ўсё больш сталі ператварацца ў колішні рытуал, звычку, сьвята паслухмянасьці.

12 гадоў (аб гэтым ведалі і ў старажытным Бабілёне) — лічба магічная. Гэта поўны цыкль паводле ўсходняга гараскопу. Але ў тэхніцы існуе тэрмін «халасты цыкль». Апошнія 12 гадоў нашчадкі сёньняшніх беларусаў, напэўна, назавуць страчанымі гадамі. За гэты час, у чаканьні «справядлівых выбараў», мы страцілі цэлае пакаленьне. Гэтае пакаленьне мы навучылі толькі таму, што самі добра некалі засвоілі ад бацькоў, — трэба прыстасоўвацца. Да начальства, да абставінаў, да часу. Трэба прыняць правілы гульні, прыдуманай ня намі. Толькі і ўсяго. Застаецца пагадзіцца, каб і наступныя 12 гадоў пайшлі на марна.

**Дзяўчынка Дабро і дзяўчынка Зло**

Нікому і ў галаву не прыходзіць, што можна ня проста патрабаваць, каб працаўнік гуляў па правілах. Марна чакаць ад круцяля прыстойных

паводзінаў. Але ў любы момант можна спыніць гульню, выйсьці з-за стала і нават, калі хопіць характару, схапіць махляра за каўнер. Час тут ні пры чым. Гэта пытаньне волі.

Хтосьці некалі выдумаў, што дабро заўсёды перамагае. У нашыя дні нехта прыдумаў злы жарт на гэтую тэму. Сядзелі на бальконе дзьве дзяўчынкі і плявалі на мінакоў. Адна, якую звалі Зло, аплявала пяць чалавек. А тая, якую звалі Дабро, — сем. Хто перамог?.. Можна лічыць гэты жарт характэрным менавіта для нашага часу. Але, насамрэч, добрага ці кепскага часу не бывае. Добрыя ці кепскія ўчынкі робім мы самі.

Філязофія старажытных індусаў як быццам не пакідае нам маральнага выбару. Усё адно эпоха Каліюгі скончыцца перамогай зла й усеагульнай гібельлю. Які ж сэнс кожнага разу, у новым жыцьці, змагацца са злом? Але ў тым і хаваецца, як модна цяпер казаць, фішка. Калі ты робіш выбар на карысьць дабра пры ўмове яго перамогі (хай у бясконца далёкай пэрспэктыве), яно адразу абясцэньваецца. Мала гонару змагацца на баку пераможцаў, — тым больш калі ты ведаеш, што перамога загадзя забясьпечаная. Ідэяй выбару ў сытуацыі бяз выбару, у сытуацыі, калі зло перамагае, пранізаныя творы Васіля Быкава. Становіцца абсалютна зразумела, што зусім не палітычныя погляды й схільнасьці Быкава выклікалі да яго інстынктыўную нянавісьць улады ў апошнія гады жыцьця, а таксама пасьля сьмерці пісьменьніка. Прычына — у ім самім, у ягонай маральнай пазыцыі. Ад быкаўскай праўды ўлада бяжыць, як нячыстая сіла ўнікае сьвятога крыжа.

Нават калі зло атрымала татальную і пагалоўную перамогу, калі ты аб гэтым ведаеш і хоць бы

адзін не згаджаесься з гэтым, значыць, бітва яшчэ ня скончаная. Значыць, час можа спыніцца й насуперак усім законам фізыкі павярнуцца назад.

*Наша Ніва. 2005. 23 сьнежня.*

## Зьніклым не баліць

Некалькі год таму я спрабаваў зрабіць на радыё «Свабода» цыкль перадачаў пад назвай «Выкраданьне Беларусі». Мне хацелася паспрабаваць знайсьці паралелі паміж тым, што адбывалася зь Беларусяй на мяжы стагодзьдзяў, і тым, што прайшлі іншыя краіны, якія до' паспыталі дыктатуры ў стагодзьдзі мінулым. І пры гэтым яны былі й заставаліся эўрапейскімі краінамі альбо краінамі з культурай пераважна эўрапейскага паходжаньня. (Тая ж гітлераўская Нямеччына хіба не на эўрапейскай, ды яшчэ якой вытанчанай, культуры ўзгадаваная!) Для асьвятленьня бягучай палітычнай сытуацыі гэткі цыкль аказаўся непатрэбным. Ды й сам я, як і амаль кожны журналіст, займаўся, канечне, верхаглядзтвам. Аднак нешта ж і засталося.

Засталося ў памяці, напрыклад, інтэрвію зь перакладчыкам Карласам Шэрманам, які ўжо тады пакутаваў на цяжкую хваробу, але яшчэ заставаўся ў Менску. Разьлік быў просты. Я ведаў, што Карлас прыехаў у Беларусь у 60-я гады з Аргентыны, і мне хацелася, каб ён нешта распавёў пра свае ўражаньні ад жыцьця пры Пэроне і Эвіце. І ўжо адтуль, як бы навакольным шляхам, выйсьці на тэму зьніклых у 70-х — пачатку 80-х. Успамі-

ны Шэрмана былі, зразумела, пераважна настальгічныя. Хоць у той Аргентыне пяцідзесяцігадовай даўніны пэраністы перасьледавалі яго як камсамольца, змагара з дыктатурай, але ж таго, што здарыцца потым з краінай пры хунце, ня можна было сабе ўявіць. Людзі зьнікалі дзясяткамі, цэлымі сем'ямі — кожнага дня, па ўсёй краіне. Менавіта там і тады зьявіўся панятак «швадроны сьмерці». Рэпрэсіі, ды яшчэ якія, былі і пры Франка ў Гішпаніі, і ў мусалініеўскай Італіі, і пры рознага кшталту дыктатурах у Лацінскай Амэрыцы (таталітарныя рэжымы пакуль што не чапаем). Але ж гэтулькі падступнай, гнюснай і баязьлівай тактыкі ў вайне з уласным народам, з інтэлігенцыяй датуль яшчэ, бадай, не было.

Цывілізаваны сьвет, Эўропа павінны былі, здавалася, уздрыгануцца. Куды больш мяккі, чымся ў Аргентыне, рэжым «чорных палкоўнікаў» у Грэцыі патрапіў пад усеагульны астракізм і ў выніку даволі хутка зьнік. А тут падасьпеў чэмпіянат сьвету па футболе. Спачатку ў заходніх краінах узьнікла ідэя байкоту Мундыялю-78, але ж зборная Нямеччыны на ўздыме, зборная Галяндыі ўпершыню заявіла аб сабе як супэркаманда, каманда будучыні, якая грае ў свой неверагодны «татальны» (ня блытаць з таталітарным!) футбол. І ўвогуле, ёсьць жа вызначаныя тэрміны, каманды рыхтуюцца да галоўнага чэмпіянату чатыры гады, прабіваюцца скрозь адборачнае сеціва пры падтрымцы ўрадаў і спонсараў, падтрымцы мільёнаў заўзятараў нацыянальных камандаў, у рэшце рэшт. Адзінае, на што пайшла Эўропа, — яна адмовілася ад тэлетрансьляцыяў. Савецкі Саюз не зрабіў і гэтага, за што савецкаму кіраўніцтву была ўдзячная шматмільённая савецкая тэлеаў-

дыторыя. Тады ў СССР было загадана спачуваць толькі аднаму народу ў Паўднёвай Амэрыцы — чылійскаму, бо ў Чылі да Піначэта былі ва ўладзе камуністы.

Байкот маскоўскай Аліміпяды-80, абвешчаны амэрыканцамі пасьля ўводу савецкага «абмежаванага кантынгенту» ў Аўганістан, фактычна праваліўся. Куды больш дзейснымі ў змаганьні з дыктатарскімі рэжымамі аказаліся брытанскі ваенна-марскі флёт (Фальклэнды), ударная авіяцыя НАТО (Югаславія) і ўдарная групоўка войскаў кааліцыі (Ірак). Ніякай іроніі тут няма. Зразумела, сьмешна было б думаць, быццам Захад ці паасобныя заходнія краіны абаранялі ў памянёных выпадках правы чалавека. Амэрыканскія войскі ўвайшлі ў Ірак ня дзеля таго, каб шукаць там безыменныя магілы тысяч закатаваных і расстраляных без суду й сьледзтва. І ўжо хіба тым больш Маргарэт Тэтчэр пасылала авіяносцы да Фальклэндзкіх (Мальдыўскіх паводле аргентынскага боку) выспаў, каб шукаць там зьніклых. Проста пра кожную краіну, дзе парушаюцца элемэнтарныя правы чалавека, можна са стопрацэнтавай упэўненасьцю сказаць, што там парушаюцца і ўсе астатнія правы і свабоды — у тым ліку эканамічныя. І такім чынам, падобная краіна ня толькі не прываблівае замежных інвэстараў, яна ўвогуле як бы выпадае з кантэксту сучаснае заходняе цывілізацыі, ставіць сябе па-за міжнародным правам. Права, заўважым, ці, калі заўгодна, правілы паводзінаў у сьвеце, усталёўваліся звышдзяржавамі — заснавальніцамі ААН, у тым ліку Савецкім Саюзам.

У гэтых правілах правы чалавека заўсёды адыгрывалі падпарадкаваную адносна геапалітыкі

ролю. Савецкі Саюз пайшоў на падпісаньне Хэльсынскіх пагадненьняў улучна з «трэцім кошыкам» (так зваўся разьдзел, прысьвечаны правам чалавека) таму, што гэтыя пагадненьні замацоўвалі вынікі Другой усясьветнай вайны, непарушнасьць пасьляваенных межаў, у тым ліку статус Калінінградзкае вобласьці. Аналягічна і заходнія дзяржавы-пераможцы ня надта разьлічвалі на тое, што ў Савецкім Саюзе раптам вызваляць усіх палітвязьняў — іх задавальняў свайго роду новы пакт аб ненападзе. Але ж тэма правоў чалавека і ўвогуле АБСЭ сталася палітычным інструмэнтам, з дапамогай якога Захад час ад часу паказваў Маскве яе месца. Хэльсынскія пагадненьні мелі й неспадзяваны вынік — у Савецкім Саюзе сталі ў многім стыхійна ўзьнікаць хэльсынскія групы, разьвіўся праваабарончы рух. Можна сказаць, што цяпер у сучаснай Расеі гэты рух перажывае сьмяротны крызіс. І не таму, што тэма правоў чалавека сталася там неактуальнай, а таму, што Хэльсынскія пагадненьні, а разам зь імі АБСЭ, ПАРЭ ды іншыя падобныя структуры становяцца анахранізмам. Сяргей Кавалёў, які ўвайшоў у камісію, што займаецца справай зьніклых у Беларусі, — апошні з магікан. І ягонай няверы ў посьпех дзейнасьці гэтае камісіі можна верыць. Ён памятае, што знайсьці тых, чыё зьнікненьне з тае ці іншае прычыны патрэбнае ўладам, немагчыма — ці то на прасторах Гулагу, ці ў Чачэніі, ці ў Беларусі.

Чатыры гаду таму ў адным з інтэрвію Кавалёў задаваўся рытарычным пытаньнем: ці магчыма ўявіць, каб у сучаснай Нямеччыне канцлерам стаў былы афіцэр SS і каб да яго выстройваліся чэргі замежных дыпляматаў, каб павіншаваць з пось-

пехам. Між тым палкоўніка КГБ Пуціна віншавалі зь перамогай на выбарах кіраўнікі ўсіх дэмакратычных краінаў. А ці можна, разьвіваючы думку сп. Кавалёва, уявіць сабе, каб брытанскі парлямэнт зьвярнуўся б некалі да ўраду Трэцяга Райху з просьбай адправіць у адстаўку, скажам, Гімлера, паколькі таго падазраюць у датычнасьці да зьнікненьня некалькіх мільёнаў габрэяў. Калі б і быў такі зварот, кіраўніцтва Райху яго папросту праігнаравала б. Гэтак здарылася ў нашыя дні з мэмарандумам Пургурыдэса (Хрыстас Пургурыдэс быў прызначаны адмысловым дакладчыкам Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы ў справе зьніклых у Беларусі — *Аўт.*).

Ды й размова ў ім пра лёс усяго некалькіх чалавек.

Між іншым, калі ідэолягі афіцыйнае прапаганды ў Беларусі называюць АБСЭ перажыткам «халоднай вайны», насамрэч яны ходзяць недалёка ад ісьціны. Толькі, хутчэй, гэта не перажытак, а вынік халоднай вайны, якая скончылася распадам СССР, з аднаго боку, і наданьнем пэўнага статусу Расеі як ядравай дзяржавы — з другога. Адсюль такія супярэчлівыя, разбэрсаныя рэакцыі кіраўніка Беларусі на дзеяньні (альбо бязьдзеяньне) АБСЭ. З аднаго боку — жаданьне пнуць нагой мёртвага (як здаецца) льва ды стаць героем супраціву міжнароднаму імпэрыялізму, зь іншага — падсьвядомае разуменьне, што ўсьлед за гэтым сканае, канчаткова разьвеецца ў нябыце тое, што звалося Савецкім Саюзам. І тады — сапраўды новая рэальнасьць, сапраўдная незалежнасьць, зь якой невядома што рабіць: ці прадаць як мага даражэй, ці проста так, з прычыны халопскае натуры, аддаць ва ўладу сюзэрэну. А

на Ўсходзе гэты сюзэрэн, ці на Захадзе — ужо ня так важна. Абы не чапалі.

Дагэтуль гаворка так ці інакш тычылася міжнароднае палітыкі. Калі кажуць, што палітыка ў прынцыпе пазбаўленая маралі, дык міжнародная палітыка пазбаўленая маралі абсалютна. Зусім інакш бачыцца справа, калі весьці гаворку з гледзішча нацыянальнае гісторыі, і ўжо ў яе кантэксьце — палітыкі ўнутранай. Арнольд Тойнбі, якога сучасныя гісторыкі-прагматыкі не прызнаюць дзеля таго, што ён карыстаўся ў сваёй канцэпцыі забароненай катэгорыяй Бога, даўно напісаў: расколіна паміж цывілізацыямі, паміж старым і новым, паміж будучыняй і мінулым праходзіць не праз рэкі і горныя хрыбты, не паўзь дзяржаўныя межы, яна праходзіць праз сэрца кожнага чалавека. Гучыць надта рамантычна, каб пераканаць у чымсьці сучаснага скептыка. Хочацца каму-небудзь ці не, але ж барацьба за захаваньне ўласнае краіны, за яе будучыню адбываецца штодня ня столькі ва ўладных кабінэтах ці на вуліцах, колькі ў галовах людзей.

Можна пайсьці стаць у пікет таму, што так робяць іншыя. Калі ты не выступаеш за тое, каб знайсьці зьніклых, — значыць, ты не змагаесься з рэжымам і, наагул, істота глыбока апалітычная ды амаральная. Той, хто так лічыць, забываецца на тое, што мараль ёсьць рэч выключна індывідуальная. Калектыўную мараль ды калектыўную адказнасьць прыдумалі бальшавікі і ўдасканалілі кіраўнікі японскіх карпарацыяў. Кожны са зьніклых — унікальная асоба, годная таго, каб пра іх гаварыць і пісаць. Кожная чалавечая асоба ўнікальная па-свойму, заслугоўвае павагі і мае права на жыцьцё й бясьпеку. Кожны, хто замахваец-

ца на гэта права — злачынца і павінен за гэта адказваць паводле закону. Гэта аксіёма. Але ні ў кога няма таксама права выкарыстоўваць імёны зьніклых альбо загіблых ва ўласных мэтах — карысьлівых, карпаратыўных ці палітычных. Дзеячы чэскай аксамітнай рэвалюцыі ў 1989-м шанавалі імя Яна Палаха, які герачна скончыў жыцьцё самаспаленьнем у 1968-м. Але ж яны ішлі на выбары ў парлямэнт не пад сьцягам Палаха, яны ішлі пад агульным чэскім сьцягам, вылучыўшы імёны дзейных палітыкаў, у тым ліку былых актывістаў Хартыі'77. Толькі жывыя людзі сваімі дзеяньнямі ды ўчынкамі (у тым ліку геракчнымі) могуць узьдзейнічаць на іншых. Толькі так, паводле Тойнбі, фармуецца «думаючая меншасьць», якая стварае парадыгму (правобраз) будучыні. Бяз гэтае «закваскі» ў грамадзтве любая, нават самая моцная, дзяржава наканаваная на застой і заняпад.

Калі ў палітыка не хапае сваіх уласных учынкаў, уласных думак, ён хаваецца за думкі і ўчынкі вялікіх продкаў, альбо — за імёны зьніклых. З аднаго боку, гэта падвышае палітыка ва ўласных вачах, бо ўсё-ткі ён выступае ў абарону справядлівасьці, зь іншага — як бы апраўдвае яго нерашучасьць у вачах грамадзкасьці, бо ўсім відавочна, зь якім падступным і небясьпечным ворагам даводзіцца мець справу. Адна справа — шанаваць пачуцьці сваякоў зьніклых, патрабаваць ва ўладаў праўды аб іх лёсе (разумеючы пры гэтым усю бясплённасьць такіх патрабаваньняў у цяперашні момант) і зусім іншая — спэкуляваць на гэтай тэме перад Захадам. Па-першае, заходняму грамадзтву ў цэлым, па вялікім рахунку, няма справы ні да лёсу зьніклых, ні да лёсу Беларусі ўвогуле. Заходняга абывателя больш цікавіць лёс Май-

кла Джэксана ці стогадовага папугая Ўінстана Чэрчыля.

Палітыкі — зусім іншая рэч. Яны абавязаныя цікавіцца ўсім, у тым ліку й тым, што дзееца ў Беларусі. Пра мараль у палітыцы, у тым ліку й заходняй, мы ўжо гаварылі. З гледзішча чыста прагматычнага, далейшыя размовы пра зьніклых з замежнымі парлямэнтарамі ўжо нічога ня зьменяць. У рэшце рэшт, экс-дыктатара Хорхэ Відэлу і ягоных паплечнікаў, адказных за масавыя зьнікненьні людзей, у Аргентыне будуць судзіць не амэрыканцы (там ненавідзяць «грынга»), а самі аргентынцы. Для гэтага ў іх ёсьць дэмакратычны парлямэнт, дэмакратычны суд і дэмакратычна, хоць і зь цяжкасьцю, абраны прэзыдэнт.

Можна зразумець тых, каго пастаянныя спэкуляцыі на тэме зьніклых спачатку расчаравалі, а потым пачалі злаваць. Некаторыя нават сталі цынічна кпіць: дзе Захаранка? дзе Ганчар? А дзе Пазьняк, дзе Шарэцкі? Насамрэч, гэтае ж пытаньне сёньня можна задаць кожнаму беларускаму палітыку: дзе вы, спадарства? Вы ёсьць, ці вас няма? Гэта ўжо не праблема некалькіх зьніклых, гэта праблема цэлага зьніклага пакаленьня ў беларускай палітыцы. Ды хіба толькі ў палітыцы... А ў культуры?

Замест спэкуляцыяў на мінулым, у тым ліку, зусім нядаўнім, многія хацелі б бачыць, найперш, асэнсаваную праграму дзеяньняў, рэальны шлях да адраджэньня Беларусі. Асабліва нецярплівым хацелася б, за адсутнасьцю альтэрнатывы, дамовіцца з уладаю. Ды хоць з чортам лысым. Хай будзе хоць якая-небудзь — абы свая, беларуская. Хоць бы нават і не Беларусь увогуле была пабудаваная, а хоць нейкая дзяржава: бяз мовы, без гісто-

рыі, бяз сымбаляў, без законаў, бязь веры. Не краіна — зона.

Падвесьці рысу пад мінулым і пачаць ад панядзелка новае жыцьцё. Хто пра гэта ня марыў? Але ж добрымі намерамі, як вядома, выбрукаваная дарога ў пекла. Размова ж нават не пра мінулае: ці дазволіць яно нам правесьці пад сабою рысу? Размова пра нас сёньняшніх. Ці гатовыя мы пазіраць у сёньняшні дзень адкрытымі вачыма і галоўнае — бачыць саміх сябе такімі, як мы ёсьць. Не будаваць паветраных замкаў, але дзейнічаць тут і цяпер, у прапанаваных абставінах. Пра зьмест эпохі хай мяркуюць нашчадкі. Нам жа застаецца жыць з разуменьнем таго, што кожны памірае паасобку.

*Наша Ніва. 2004. 30 студзеня.*

## «Ленін», — думае беларус

— Дзеці, хто з вас бачыў Леніна — на фатаграфіі, на партрэце, у кіно? — пытаецца настаўніца ў школьнікаў.

Вовачка цягне руку:

— Я бачыў, учора ў лесе!

— ???!!!.. Ну, і як жа ён выглядаў?

— Ну, такі прыгожы, мажны, зь вялізнымі рагамі на галаве...

— Вовачка! Дык, можа, гэта быў лось?!

Вовачка (крыху падумаўшы):

— Мабыць, так.

Гэта толькі адзін зь безьлічы анэкдотаў «пра Вовачку». І, бадай, адзіны з анэкдотаў, дзе гэты пэрсанаж савецкага фальклёру, так бы мовіць, сутыкаецца са сваім прататыпам. Так, менавіта прататыпам, бо гадоў сорак таму, калі гэтыя анэкдоты ўпершыню пачалі зьяўляцца, пад Вовачкам (ня «новым расейцам» Ваванам — просьба ня блытаць) быў зашыфраваны правадыр рэвалюцыі. Да сапраўднага Леніна Вовачка меў столькі ж дачыненьня, колькі герой сэрыі анэкдотаў «пра Васіля Іванавіча» мае дачыненьня да рэальнага камдыва, які стаў героем міталягічнага фільму «Чапаеў».

У гарадзкога фальклёру свае законы. Сьветлавалосы анёлак Валодзя Ульлянаў, партрэт яко-

га красаваўся на акцябрацкай зорачцы, у анэкдотах ператварыўся ў брутальнага хулігана, які лаецца матам і можа пры нагодзе «трахнуць» настаўніцу. Гэты спантанна народжаны вобраз, дарэчы, куды больш адпавядаў сапраўднаму псыхалягічнаму партрэту Леніна, хоць ягоныя славутыя «расстрэльныя» нататкі ў той час яшчэ надзейна захоўваліся ў «спэцсхове».

У 1970-м, калі адзначаўся стогадовы юбілей Леніна, прапаганда «самага чалавечнага чалавека», відаць, настолькі ўжо ўсіх дастала, што эўфэмізмы былі адкінутыя і правадыр пачаў зьяўляцца ў анэкдотах пад сваім імем. Тады нарадзіліся фальклёрная парфума «Пах Леніна», трохспальны ложак «Ленін заўсёды з намі», «ордэн Леніна імя ордэна Леніна» і г.д. А ў гістарычных анэкдотах Ільліч набыў зусім ужо рэальныя абрысы. Напрыклад, у адным зь іх Ленін ласкава гаварыў «хадакам»: «Э-э, баценька, гэта не да мяне — вам да Фэлікса Эдмундавіча трэба».

З таго часу анэкдоты пра Вовачку, якія спачатку мелі характар нейкай фронды, даўно адарваліся ад пачатковага сэнсу, і цяпер наўрад ці хоць адзін чалавек зьвязвае іх зь Леніным. Больш за тое, анэкдоты пра яго выйшлі з моды. Яны ня больш папулярныя ў сучаснай Беларусі, чым, скажам, гістарычныя анэкдоты пра Напалеона альбо Аляксандра Македонскага. Ленін як пэрсанаж адсунуўся кудысьці ў глыб нашае сьвядомасьці, у галіну дзіцячага фальклёру. Адзін журналіст расказваў, як ягоны пяцігадовы сын поўзаў па калідоры на «карачках» і пагрозьліва рычэў, палохаючы ўяўнага ворага: «Я Лее-енін! Г-р-р-р!» (Мабыць, хлопчык уяўляў сябе ў той момант кімсьці накшталт цмока.)

З другога боку, пэўны час здавалася, што і пераемнік Леніна Сталін адсунуўся кудысьці ў глыб гісторыі ды ўспрымаецца новым пакаленьнем кімсьці кшталту фараона Рамзэса III. Абарона Курапатаў, аднак, дзе спачываюць парэшткі тысяч ахвяр сталінскага рэжыму — дзядоў сёньняшніх маладых людзей, паказала, што сталінская эпоха ад нас яшчэ зусім блізкая. Не настолькі блізкая, каб анэкдоты пра Сталіна, як і пра Леніна, былі надта папулярныя, але настолькі блізкая, каб памяць аб ёй трэба было бараніць (жаданьне французаў зрабіць мэмарыял памяці напалеонаўскіх жаўнераў на Бярэзіне, напрыклад, не выклікае асаблівых пярэчаньняў беларускіх уладаў, бо гэта, на іх думку, ня тычыцца сучаснай гісторыі ды ідэалёгіі, а вось Курапаты і барацьба за іх вельмі шмат значаць для грамадзкай сьвядомасьці, і таму рэжым імкнецца ўсяляк прынізіць значэньне народнага мэмарыялу.)

Тое, што плошча Незалежнасьці ў Менску дагэтуль мае другую назву, якая ўпрыгожвае станцыю мэтро «Плошча Леніна», як і тое, што на самой плошчы стаіць помнік правадыру і што падобныя помнікі стаяць у сотнях іншых мясьцінах Беларусі, не азначае, быццам сучаснае беларускае кіраўніцтва захоўвае вернасьць ідэям правадыра пралетарскай рэвалюцыі. У гэта ня вераць, мабыць, і стваральнікі падручнікаў з гэтак званай «дзяржаўнай ідэалёгіі». У каго павернецца язык назваць існуючы сёньня ў Беларусі грамадзкі лад «дыктатурай пралетарыяту», а яе прэзыдэнта, скажам, — марксістам?

Увогуле, так званую ідэйна-філязофскую спадчыну Леніна можна выкарыстаць дзеля абгрунтаваньня ці апраўданьня чаго хочаш. Многія бе-

ларускія адраджэнцы новай хвалі могуць прыгадаць, як яны карысталіся цытатамі зь Леніна наконт «расейскага шавінізму» і «нацыяналізму прыгнечаных нацый» дзеля адстойваньня ідэй беларушчыны ў сваіх кнігах і дысэртацыях. З другога боку, прафэсійныя барацьбіты з рэвізіянізмам яшчэ больш ахвотна карысталіся ленінскімі працамі, дзе выкрываўся «буржуазны нацыяналізм» і апартунізм усялякага кшталту.

У Леніна можна знайсьці цытаты на ўсе выпадкі жыцьця. Кожны, хто чытаў ягоныя працы хоць аднойчы, мог пераканацца, што клясык марксізму зь лёгкасьцю выдаваў чорнае за белае і наадварот — у залежнасьці ад палітычнай сытуацыі й патрэб партыі. Выдатны ангельскі гісторык Тойнбі пісаў пра галоўную супярэчнасьць, якая, на ягоны погляд, адразу кідаецца ў вочы ў Леніна. З аднаго боку, гэта яго жалезны дэтэрмінізм у гісторыі (перамога пралетарскай рэвалюцыі непазьбежная, бо яна дыктуецца законамі клясавай барацьбы), адмаўленьне ролі асобы (гісторыю ствараюць масы). А з другога боку — абсалютнае нежаданьне чакаць, пакуль законы гісторыі самі зробяць сваю справу, нецярплівая, проста-такі шалёная дзейнасьць, скіраваная на падштурхоўваньне рэвалюцыі. Тае самае рэвалюцыі, умовы для якой, паводле ранейшых сьцьверджаньняў Ульлянава-Леніна, у Расеі ня высьпелі ці высьпелі наймене́й у параўнаньні з больш прамыслова разьвітымі краінамі Эўропы!

Гістарычных дзеячаў ацэньваюць, як правіла, не паводле іхных слоў, а паводле спраў. Тое, што Ўладзімер Ульлянаў з калескага рэгістратара, маладзольнага адваката, які прайграваў адну справу за другой, зрабіўся першай асобай у Расеі з

паўнамоцтвамі, якія ня сьніліся й манархам, гаворыць не аб правільнасьці марксісцкага мэтаду (тым болей што Ленін абыходзіўся зь ім, мякка кажучы, вольна), але аб здольнасьцях Леніна як інтрыгана й дыктатара. Бадай, ёсьць яшчэ толькі адзін дыктатар у гісторыі XX ст., якога можна паставіць побач. Гэта Гітлер. Само па сабе спавяданьне ідэй фашызму (калі прызнаць яго філязофіяй) не тлумачыць узьлёту Адольфа Шыкльгрубэра і ягонай фэнамэнальнай папулярнасьці ў масах. Дастаткова сказаць, што ў суседняй зь Нямеччынай Італіі фашысцкая дыктатура Мусаліні, пры ўсіх яе эксцэсах, не была настолькі крывавай, як гітлераўская.

Апытаньні, якія праводзіліся ў інтэрнэце, паказваюць, што часьцей за ўсіх сярод вядомых асобаў мінулага стагодзьдзя ва ўсім сьвеце называюць менавіта Леніна і Гітлера. Справа, відаць, ня ў тым, што абодва яны былі майстрамі палітычнай інтрыгі. (Сталін выглядае эпігонам свайго настаўніка — проста ў яго руках апынуўся сакратарыят партыі, створанай Леніным.) Містыка палягае ў тым, што гэтым двум зусім не падобным адзін да аднаго людзям з аднолькава пасрэднымі, у прынцыпе, здольнасьцямі ўдалося паставіць эўрапейскую цывілізацыю на мяжу зьнікненьня. Вядома, што на працоўным стале Леніна ў крамлёўскім кабінэце стаяла бронзавая выява малпы з чалавечым чэрапам у руцэ. Выдатны сымбаль зьдзічэньня чалавека, вяртаньня яго да першабытнага стану. Аднак насамрэч ня Ленін і ня Гітлер адкінулі чалавецтва на тысячагодзьдзі назад. Гэта само чалавецтва добраахвотна пагадзілася стаць і фактычна сталася на некалькі дзесяцігодзьдзяў плянэтай малпаў. Так што ў аднаймен-

ным рамане П'ера Буля няма нічога фантастычнага. Мільёны людзей немагчыма было б абалваніць, калі б яны самі таго не хацелі, калі б імі не кіравалі жывёльныя інстынкты. Вось самы трагічны ўрок, які магло б вынесьці чалавецтва са сваёй гісторыі. Магло б, калі б яно было адзіным арганізмам і мела самастойны розум, а не складалася зь людзей.

Справа ў тым, што чалавецтва — не мурашнік, дзе мурашкі, пазбаўленыя свабоды волі, выконваюць кожная адведзеную ёй ролю ў адпаведнасьці з плянам Усявышняга. Законы разьвіцьця грамадзтва — калі такія насамрэч ёсьць — не вызваляюць чалавека ад непрыемнага абавязку рабіць маральны выбар. Гэта страшэнна, неймаверна цяжкі абавязак, вось чаму людзям так хочацца знайсьці таго, хто будзе вырашаць за іх, што ёсьць дабро, а што зло. І ня важна, хто гэта будзе — Ленін, Гітлер, Мао ці нехта яшчэ.

Але навукова-тэхнічны прагрэс, насуперак меркаваньню антыглябалістаў і «зялёных», меў і станоўчы вынік. Са зьяўленьнем ядравай зброі, кампутарных тэхналёгій і інтэрнэту прэтэнзіі якой бы там ні было дыктатуры на сусьветнае панаваньне сталіся мізэрнымі. Сучасныя дыктатары могуць трымаць некаторы час у страху ўласны народ, але ня больш за тое. У гэтым сэнсе Ленін і Сталін сапраўды значаць для дня сёньняшняга ня больш, чым эгіпецкія фараоны.

Маўзалей з муміяй правадыра сапраўды нагадвае пахавальню фараона. Цікава, што Расейская Праваслаўная Царква, настолькі незамірэнчая да каталіцызму, зусім спакойна ўспрымае прысутнасьць паганскіх мошчаў побач з галоўнымі царкоўнымі храмамі ў самым цэнтры «Трэ-

цяга Рыму». Хоць Ленін люта ненавідзеў папоў і нават даваў загады зьнішчаць іх пры нагодзе як мага больш, Расейская Праваслаўная Царква, відаць, даравала ўсе грахі свайму крыўдзіцелю, паколькі галоўны грэх у яе вачох — гэта непаслушэнства ўладзе. Якое насьміханьне з хрысьціянства!.. А зь іншага боку, дарэчы, — якое насьміханьне зь Леніна! Усё гэта з гледзішча эўрапейскае цывілізацыі павінна ўспрымацца як свайго роду атавізм.

Помнікі Леніну на вуліцах сёньняшняй Беларусі выглядаюць ужо ня як атавізм, а як атавізьмік. Некаторыя людзі, як вядома, нараджаюцца з хвастом. З дапамогай сучаснай хірургіі хвост лёгка й бязбольна выдаляецца. Аднак можна і прызвычаіцца да таго, што ў цябе ёсьць хвост, і бессаромна насіць яго не ў штанах, а навідавоку.

Як заявіла нядаўна старшыня Цэнтравыбаркаму спадарыня Ярмошына ў адказ на крытыку ў сувязі з масавым датэрміновым галасаваньнем ды living рознымі іншымі экзатычнымі зьявамі накшталт 90-адсоткавай яўкі выбарцаў, у Беларусі ёсьць уласныя традыцыі дэмакратыі. Адна з такіх традыцый, напэўна, палягае ў тым, каб ганарыцца атавізмам.

Вяртаючыся да тэмы савецкіх анэкдотаў, якія згадваліся на пачатку, варта прыгадаць яшчэ адзін — з сэрыі «пра Штырліца». Мабыць, менавіта гэты анэкдот падказаў па нейкай асацыяцыі назву артыкулу.

Штырліц, гуляючы па лесе (цікава, што ва ўсіх анэкдотах гаўптштурмбанфюрэр, ён жа выведнік Ісаеў, абсалютна нічым не заняты й бадзяецца абы-дзе), заўважыў дупло ў дрэве й зазірнуў у яго. Там у цемры сьвяціліся чыесьці вочы.

«Філін», — падумаў Штырліц. — «Сам ты філін», — падумаў Мюлер.

Цікава, чые гэта вочы глядзяць на нас зь цемры тэлеэкранаў?

*Наша Ніва. 2005. 21 студзеня.*

# Голая праўда

На пачатку траўня 2004 г. не засталося, бадай, ніводнага інфармацыйнага сайту ў інтэрнэце, ніводнай масавай газэты, ці тэлекампаніі, якія б не апублікавалі фатаздымкаў, зробленых нібы для порначасопісаў. Голыя людзі ляжаць штабэлем адзін на адным. Жанчына ва ўніформе трымае на матузку за ашыйнік распранутага чалавека, які скурчыўся на цэмэнтавай падлозе. Тая самая жанчына з цыгарэтай у руцэ з усьмешкай паказвае на геніталіі мужчынаў, пастаўленых у шэрэнгу. На галовах у іх — нешта кшталту мяхоў ці каптуроў, што насоўвалі некалі інквізытары на ерэтыкоў. Але пра гэта — крыху ніжэй.

Напярэдадні Дня Перамогі адзін зь беларускіх каналаў паказаў фільм Рамана Палянскага «Піяніст». Наўрад ці шмат людзей даглядзелі яго да заканчэньня, бо паказ фільму завяршыўся а палове на другую ночы. Гэта ўсё ж ткі не хакей. На экране дзьве з паловаю гадзіны марудна разгортваецца гісторыя варшаўскага піяніста Шпільмана: як ён выжыў падчас вайны ў пекле гета, масавай дэпартацыі габрэяў у канцлягеры (у тым ліку ўсіх ягоных крэўных), варшаўскага паўстаньня ды наступнага зьнішчэньня гітлераўцамі Варшавы. Жахлівыя атрыбуты Галакосту зь яго зьвер-

ствамі, зьдзекамі й прыніжэньнем чалавечае годнасьці, як гэта ні па-блюзьнерску гучыць, сталіся апошнім часам дзякуючы кінематографу ледзьве ня штампам. Асабліва пасьля «Сьпісу Шындлера» галівудзкага майстра Сьпілбэрга. Фільм Палянскага, праўда, ня ёсьць чарговай ілюстрацыяй на тэму Галакосту — ён пра іншае. Але размова тут не пра мастацтва кіно, а пра асаблівасьці масавай культуры ды ўспрыняцьце рэчаіснасьці праз экран.

На расейскім тэлебачаньні (а мо, беларускім?) мільгануў сюжэт: Ала Пугачова выходзіць з кінатэатру пасьля прагляду стужкі Мэла Гібсана «Пакуты Хрыстовы». Яе ў гэты момант здымаюць усюдыісныя фотарэпартэры. Рэдактар нейкага моднага выданьня тлумачыць — гэтыя фатаздымкі абавязкова будуць апублікаваныя, бо зорка шоў-бізнэсу выйшла з кінасэансу, маўляў, зусім іншым чалавекам. Варта паглядзець на яе вочы, etc... Ці можна ўявіць сабе падобны сюжэт зь фільмам Палянскага, ці фільмам Адамовіча й Клімава «Ідзі й глядзі», альбо «Звычайным фашызмам» Рома? Дарэчы, калі б апошнія два з названых фільмаў выйшлі сёньня, у Беларусі, хутчэй за ўсё, іх проста забараніў бы Дзяржрэгістар — за прапаганду жорсткасьці й гвалту, а таксама ўсхваленьне Гітлера.

«Пакуты» паводле Гібсана хваляць (у тым ліку царква) за... праўдзівасьць у адлюстраваньні ранаў і пакутаў Хрыста. Перамога рэалізму? Ці сацрэалізму? Сацрэалізм, як мы памятаем, — гэта адлюстраваньне рэчаіснасьці такой, якой яна павінна быць. У гэтым сэнсе галівудзкае кіно мала адрозьніваецца ад савецкага. Проста ў Галівудзе казкі для дарослых заўсёды атрымліваліся ціка-

вейшыя, бо рабіліся з улікам псыхалёгіі гледача. Галівудзкія прадусэры цяпер, мабыць, за локці сябе кусаюць пасьля праколу з Гібсанам. Выявілася, што Эвангельле — цудоўная казка, калі яе адаптаваць у адпаведнасьці да патрэбаў часу. Чым болей яна страшная й крывавая, тым болей прасьвятленьня ад шчасьлівага фіналу, а значыць — жаданьня плаціць за перажыты ў кіназалі або ля тэлевізару катарсіс-ачышчэньне. «Джызус Крайст» сапраўды супэрзорка! Як Ала Пугачова, ці нават яшчэ больш.

Гэты фільм як быццам упаў зь неба ў добра ўгноеную ідэалёгіяй глебу. Прычым ідэалёгіяй найвышэйшай спробы, а не якой-небудзь там «дзяржаўнай». Барацьба цывілізацыяў, процістаяньне хрысьціянскае культуры й ісламу, пра што ўвесь час гаварылі Гантынгтан і Буш-малодшы, знайшло сваё ўвасабленьне. Спачатку ў Іраку, на полі бою, а потым і на кінаэкране.

Што да фатаграфіяў з голыміірацкімі вязьнямі, зь якіх зьдзекаваліся «простыя амэрыканскія хлопцы й дзяўчаты»... Фактычна, амэрыканскія турэмшчыкі — а гэта, зразумелая справа, ня простыя джы-ай, але адмыслова падабраная публіка — паводзілі сябе ў адносінах да ірацкіх вязьняў так, як звычайна паводзілі сябе хрысьціяне зь нехрысьціянамі. Можна ўспомніць канкістадораў у Лацінскай Амэрыцы або крыжакоў на Блізкім Усходзе. Адпаведным чынам паступалі й паступаюць мусульмане зь «няверным». Так што заява лідэра ірацкіх шыітаў Аль-Садра, што яны будуць рабіць з амэрыканскімі палоннымі тое ж, што амэрыканцы рабілі з палоннымі ў турме Абу Грэйб, наўрад ці каго зьдзівіла. Хоць, праўду кажучы, і да гэтага радыкальныя ісламскія гру-

поўкі абыходзіліся з закладнікамі (і ня толькі амэрыканскімі) ня надта гуманна. Такім чынам, і тут верхаводзіць біблійны прынцып — кроў за кроў, вока за вока.

Што ж датычыць амэрыканцаў, непасрэдна схопленых за руку (дакладней — тых, што трапілі ў аб'ектыў фотаздымача), дык іхныя дзеяньні прадыктаваныя, думаецца, ня столькі ідэалёгіяй, колькі псыхалёгіяй. Псыхалёгія вайскоўцаў, якім даюць у рукі зброю ды ўладу над іншымі людзьмі і пры гэтым яшчэ як бы здымаюць зь іх маральную адказнасьць (за цябе думае і адказвае начальства), — яна паўсюль больш-менш аднолькавая. Дазволю выказаць сабе крамольную думку: калі б на старонкі прэсы трапілі фатаздымкі ахвяраў «дзедаўшчыны», якая існавала заўсёды ў савецкім войску і застаецца, без усялякага сумневу, у сёньняшняй Беларусі, міжнародная грамадзкасьць была б шакаваная ня менш, а мо й больш, чымся ад здымкаў з Абу-Грэйб. Пра ўмовы ўтрыманьня вязьняў у прыёмніку-разьмеркавальніку на Акрэсьціна ў Менску можна ня згадваць.

Дзякаваць Богу, у беларускіх «стараслужачых» няма магчымасьці зьдзекавацца з ваеннапалонных праз іх адсутнасьць. У іхных расейскіх калегаў такая магчымасьць ёсьць. Аб тым, што рабілі і робяць расейскія вайскоўцы ў Чачэніі, у тым ліку зь мірным насельніцтвам, у Маскве лічаць за лепшае маўчаць. І пра Жэнэўскую канвэнцыю пра абыходжаньне з ваеннапалоннымі там не ўспамінаюць. Так бы мовіць, няма вайны — няма канвэнцыі. Хоць выпадак са згвалтаваньнем і забойствам чачэнскай дзяўчыны, учыненых расейскім генэралам, стаў прадметам судовага разьбіральніцтва, грамадзкая думка ў Расеі адназначна не

на баку чачэнцаў. Расейцы ня хочуць ведаць пра пакуты чачэнскага народу. Яны хочуць глядзець фільм пра Хрыста, які выкупіў іх, расейцаў, грахі. Аднойчы й назаўсёды. Амін!

Журналіст радыё «Свабода» Андрэй Бабіцкі расказваў, як яго, сярод іншых «палонных», зьбівалі ў расейскім лягеры Чарнакозава. Зьбівалі штодня па некалькі разоў — пераважна нагамі. Зьбівалі проста так. Ня дзеля таго, каб выбіць нейкія паказаньні, а каб жыцьцё «мёдам не здавалася», каб прынізіць, растаптаць і тым самым узьняцца ва ўласных вачох ці проста пацешыць садысцкія схільнасьці. Пра гэта нідзе ня пішуць, фатаздымкі з Чарнакозава, відэафільмы ды іншыя матэрыялы, якія сьведчаць аб злачынствах расейскіх вайскоўцаў у Чачэніі, ёсьць. Ёсьць цэлыя дакумэнтальныя фільмы. Але паказваюць іх толькі на Захадзе.

Некаторыя менскія падлеткі, якія ўдзельнічалі ў акцыях апазыцыі, ведаюць, што такое атрымаць «дэмакратызатарам» па сьпіне. Зьняць пабоі пасьля акцыі не бяруцца лекары ніводнай з клінік. У іх ёсьць на гэты конт інструкцыі. Некаторыя дзеці нават ведаюць ужо, што такое «слонік». Гэта калі міліцыянты надзяваюць на цябе адгазьнік і перацінаюць пальцамі шлянг... І гэта робіцца, часьцей за ўсё, не для таго, каб выбіць прызнаньні, а проста так, як рытуал, — каб больш баяліся.

Амэрыканскім ахоўнікам у іракскай турме не пашанцавала. Тое, што не прызначалася для чужых вачэй, іхныя, так бы мовіць, таямніцы душы, зрабіліся раптам здабыткам галоснасьці. Амэрыканцам, увогуле заходняй публіцы, пашанцавала — у іх ёсьць незалежная прэса. Дзякуючы ёй і міністар абароны, і дарадца ў нацыянальнай бясь-

пецы, і сам прэзыдэнт мусяць адказваць на непрыемныя пытаньні, адказваць перад сэнатам, перад рознымі камісіямі, перад выбарцамі за дзеяньні якой-небудзь жанчыны-сяржанта ці іншых шарагоўцаў ды малодшых афіцэраў. Нават калі яны нікога не забілі, а проста «прычынілі маральны ўрон».

Ці лягчэй ад гэтага ірацкім ваеннапалонным і іх крэўным? Безумоўна, не. Ці паскорыць гэта вывад амэрыканскіх войскаў з Іраку? Пакуль невядома. Ёсьць меркаваньне, што вайну ў Віетнаме ЗША прайгралі тады, калі па амэрыканскіх тэлеканалах пайшлі рэпартажы з фронту. Тады тэлерэпартажы яшчэ былі чорна-белыя. На пачатку 1990-х Сі-Эн-Эн вяла ў наўпроставым этэры трансьляцыю абстрэлу танкамі Белага дому ў Маскве.

Чалавецтва да ўсяго прызвычайваецца. Кадры генацыду ў Руандзе, бамбаваньняў Косава ці Іраку ўжо мала каго потым зьдзіўлялі і ўсё меней цікавілі шырокага гледача. Нават кадры зь нямецкім людажэрцам, які павячэраў сваім госьцем-добраахвотнікам, амаль ня выклікалі шоку. Як сказаў адзін знаёмы філёзаф — гэта была ягоная асабістая справа.

Вайна не адмяняе алімпіядаў, і наадварот. І там і там — відовішча. І тое, і другое можна прадаць. А тэлевізар заўсёды можна пераключыць на іншы канал. Праўда, як правіла, людзям не падабаецца. Ім падабаецца казка са шчасьлівым фіналам. Але праўду, як і сьмерць, не выбіраюць. Аднойчы яна прыходзіць у ваш дом голая і непрыстойная, як само жыцьцё. А ўжо што адбываецца паміж вамі далей — гэта вашая асабістая справа.

*Наша Ніва. 2004. 14 траўня.*

# Правілы граматыкі

Здымак, на якім студэнты Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту на Кастрычніцкай плошчы ў Менску седзячы пратэстуюць супраць закрыцьця навучальнай установы, выклікае супярэчлівыя пачуцьці. Студэнты сядзяць на адлегласьці адзін ад аднаго, нібы ў мэдытацыі. Яны пратэстуюць як бы кожны паасобку, кожны сам за сябе. Ці можна ўявіць сабе больш сымбалічную для сучаснай Беларусі і больш неверагодную для Эўропы карціну?

Ня памятаю, як звалі таго хлопца зь Белдзяржунівэрсытэту. Перад тым як перайсьці вучыцца зь біяфаку на іншы факультэт, я воляю абставінаў апынуўся на кароткі час на курсе, які перад тым ужо скончыў — сярод маладзейшых за мяне і зусім незнаёмых мне студэнтаў. Аднаго зь іх я запомніў надоўга — вось толькі імя ніяк ня ўспомню...

У той час ва ўсіх савецкіх вышэйшых навучальных установах, не выключаючы й біяфак, абавязковым прадметам была гісторыя КПСС. Своеасаблівасьць гэтай навучальнай дысцыпліны, таксама як і навуковага камунізму альбо, напрыклад, палітэканоміі сацыялізму, палягала на тым, што веданьне прадмету, у прынцыпе, не бы-

ло абавязковае. Цяперашні падручнік зь дзяржаўнай ідэалёгіі, дарэчы, у сэнсе мэтадалёгіі мала чым адрозьніваецца ад колішніх фаліянтаў, што выходзілі пад рэдакцыяй кандыдата ў члены палітбюро, акадэміка Панамарова. Зьмест гэтага й падобнага падручнікаў з гісторыі й грамадазнаўства, наагул, цяжка назваць ведамі. Але ня ў тым справа. Куды важнейшымі за лекцыі ды іспыты ў інстытуце былі тады так званыя сэмінары. Сэнс іх палягаў не на тым, каб студэнты працавалі зь «першакрыніцамі». («Першакрыніцамі» называліся зусім не дакумэнты, а толькі выключна кананічныя тэксты з кананічнага збору твораў Ул. І. Леніна.) Сэнс палягаў на тым, каб студэнты ўдзельнічалі ў «дыскусіі» на зададзеную падручнікам і выкладчыкам тэму і тым самым дакумэнтальна, з дапамогай адзнак і залікаў, публічна пацьвярджалі сваю ляяльнасьць камуністычнаму рэжыму. Іншымі словамі, студэнты паказвалі, што яны гатовыя прыняць правілы гульні й фактычна разам з выкладчыкамі ўжо ўдзельнічаюць у ёй.

Гэта здавалася настолькі натуральным, што, сутыкнуўшыся з адрознымі паводзінамі, я, таксама як і іншыя студэнты, аслупянеў у жаху й чаканьні імгненнага й балючага пакараньня з боку сыстэмы...

Тэмай чарговага сэмінару па гісторыі КПСС была пастанова партыі ці то аб павелічэньні ўраджайнасьці зерневых культураў ва ўмовах крайняй Поўначы, ці то аб узмацненьні ідэалягічнай працы сярод мэханізатараў на машынна-трактарных станцыях. Усе студэнты адказвалі нешта дзяжурна-няўцямнае на пытаньне выкладчыка аб значэньні гэтага дакумэнту. Выкладчык быў незадаволены пасіўнасьцю аўдыторыі і ў пошуках

ахвяры зьвярнуўся да аднаго хлопца, які дагэтуль адмоўчваўся: а што вы думаеце пра значэньне гэтай пастановы, малады чалавек. Малады чалавек, зь якім выкладчык, мяркуючы па ўсім, датуль быў незнаёмы, адказаў ахвотна і не раздумваючы. На яго думку, згаданую пастанову найлепш было б адразу выкінуць у сьметніцу — так сама, як, дарэчы, і ўсе іншыя паперкі, якія РКП(б)-ВКП(б)-КПСС напладзіла за часам свайго існаваньня. Таму што, працягваў студэнт, гэтая пастанова, як і ўсе астатнія, што выходзілі да гэтага і працягвалі выходзіць пасьля, ня мела нічога агульнага з рэальнасьцю, і рабочаму клясу, як і сялянству, ад гэтых пастановаў не было ні горача, ні холадна. Насамрэч, у лягерах зэкам было й горача, і холадна, і галадна, але вось пра гэта ў пастановах і ня згадвалася...

Пакуль студэнт гаварыў, астатнія нэрвова пырскалі ў кулак, давячыся калектыўным прыступам гістэрычнага сьмеху. А калі ён скончыў, аўдыторыяй раптам апанавала ціша. Хто ўтаропіўся ў падручнік, хто ў канспэкт, хто проста глядзеў сабе пад ногі, баючыся зірнуць на студэнта й выкладчыка, які меў неасьцярожнасьць да яго зьвярнуцца. Але, як я ўжо казаў, нічога ня здарылася. Выкладчык проста пераключыў увагу на іншага студэнта, як бы і не пачуўшы дзёрзкага адказу. Як я потым даведаўся, гэты хлопец ня быў дысыдэнтам або ненармальным. Ён проста рана застаўся сіратой, вымушаны быў сам зарабляць на жыцьцё. І хоць вучыўся на дзённым факультэце, начамі разгружаў вагоны на вакзале. Пры гэтым хлопец ня толькі меў характар і мог пастаяць за сябе, але быў, відаць, здольным студэнтам. Прынамсі, у дэканаце на ягоныя «подзьвігі» стараліся гля-

дзець скрозь пальцы. Гісторыя КПСС проста не ўваходзіла ў кола ягоных інтарэсаў, яму шкада было часу на бязглузьдзіцу, і сваімі нестандартнымі адказамі ён надоўга адбіваў ахвоту ў выкладчыкаў-марксістаў чапляцца да яго зь бязглуздымі пытаньнямі.

Я далёкі ад думкі назваць таго хлопца героем свайго часу. Мяне цікавяць цяпер не ягоныя паводзіны, у якіх маглі быць самыя розныя матывы й тлумачэньні, але паводзіны астатніх студэнтаў. Самай галоўнай заваёвай бальшавікоў, якой яны могуць ганарыцца дагэтуль, стала стварэньне новага чалавека. Прынамсі, яны здолелі вырасьціць кшталт студэнта, якога няма, бадай, больш нідзе ў сьвеце, — студэнта, які ня ўмее, ня хоча і нізавошта ня будзе дзейнічаць або думаць самастойна. Незалежныя паводзіны, незалежны погляд на рэчы, як можна пераканацца на прыкладзе таго студэнта, пачалі ўспрымацца як нешта ненармальнае — як быццам бы чалавек раптам публічна агаліў зад. Студэнцтва, якое ва ўсім сьвеце ёсьць асяродкам вольнасьці, радыкалізму й нежаданьня ісьці сьледам за агульнапрынятымі стандартамі, у Савецкім Саюзе стала ледзьве не самай кансэрватыўнай часткай грамадзтва.

Прычым размова тут не пра погляды самі па сабе. Студэнты, якія рабілі культурную рэвалюцыю ў Кітаі, студэнты, якія будавалі барыкады ў Парыжы ў 1968 г., студэнты, з асяродку якіх выйшаў Ян Палах, што скончыў жыцьцё самаспаленьнем на знак пратэсту супраць уварваньня савецкіх войскаў у Чэхаславаччыну, і студэнты, якія пэрыядычна б'юцца на сьмерць з паліцыяй ва ўнівэрсытэтах Паўднёвай Карэі, адрозьніваюцца і мэнтальна, і паводле перакананьняў. Сярод пары-

скіх студэнтаў, дарэчы, былі і мааісты, і анархісты, і «новыя левыя», і сытуаністы, ды шмат хто яшчэ. Больш за тое, унукі хунвэйбінаў праз дваццаць гадоў пасьля «культурнай рэвалюцыі» выйшлі на плошчу Цяньаньмэнь. Пачаўшы з чыста камуністычных лёзунгаў кшталту «дэмакратычнага цэнтралізму», яны за некалькі тыдняў процістаяньня з уладамі лягічна дайшлі да разуменьня неабходнасьці простай дэмакратыі, за што і былі расстраляныя ды размазаныя танкамі.

Так, радыкальная сіла можа быць і разбуральнай, аб чым сьведчыць тая ж культурная рэвалюцыя. Наўрад ці студэнцтва ўвогуле можа быць самастойнай сілай, інтэлектуальным авангардам грамадзтва, як марылі Гэрбэрт Маркузе й малады Даніэль Кон-Бэндыт (пазьней прызнаны адным з выбітных францускіх філёзафаў сучаснасьці). Але яно, студэнцтва, здольнае на праявы сапраўднай салідарнасьці й самаахвярнасьці. Нездарма, самым славутым лёзунгам 1968-га стала: «Будзьма рэалістамі — патрабуйма немагчымага!»

Але студэнцтва ў наш час можа быць таксама інфантыльным, несамастойным, нерашучым і проста баязьлівым. Калі навучэнцы Беларускага гуманітарнага ліцэю на чале са сваім дырэктарам і разам з бацькамі й некаторымі выкладчыкамі спрабавалі адстаяць у пікетах права на існаваньне ўнікальнай навучальнай установы, ніхто са студэнтаў ЭГУ нават не паглядзеў у бок ліцэістаў. Потым недзяржаўных вышэйшых навучальных установаў пачалі пазбаўляць ліцэнзіяў паступова, па адной. Ніхто са студэнтаў іншых ВНУ не выходзіў на акцыі пратэсту, не падтрымаў таварышаў. У выніку студэнты ЭГУ засталіся сам-на-

сам з рэчаіснасьцю, якой яны не хацелі заўважаць. Самы радыкальны крок, на які яны наважыліся, — гэта напісаць ліст Прэзыдэнту.

Мне давялося размаўляць з адной студэнткай чацьвёртага курсу — яна абуралася паводзінамі рэктара Міхайлава, дзеяньнямі адміністрацыі, якія пайшлі на канфрантацыю з уладамі, празьмерна палітызавалі сытуацыю, ускладалі марныя спадзяваньні на заходніх спонсараў замест таго, каб ціха дамаўляцца з айчынным міністэрствам адукацыі. Безумоўна, такі пункт погляду мае права на існаваньне. Верагодна, у гэтых развагах ёсьць свая рацыя... Але чуць такія развагі з вуснаў дваццацігадовай дзяўчыны было трохі дзіўна. Хацелася спытаць — няўжо ў гэтым унівэрсытэце ніхто й ніколі не расказваў студэнтам пра тое, што свае правы трэба таксама вучыцца адстойваць?

Было б недарэчна ва ўсім вінаваціць студэнтаў. Хацелася б зразумець прычыну іх безабароннасьці ці адмовы ад барацьбы.

Мажліва, гэтая пасіўнасьць сфармавалася дзесяцігодзьдзямі грэблівага стаўленьня да інтэлектуальнай працы ўвогуле, стаўленьня да інтэлігенцыі як да «слугаў народу»? Навучаньне ў інстытуце дагэтуль успрымаецца немалой часткай грамадзтва як спосаб «адкасіць» ад службы ў войску, як свайго роду халява, нежаданьне цяжка працаваць, альбо, у крайнім выпадку, — як прывілей, магчымасьць зьехаць за мяжу. У Беларусі веды й талент па-ранейшаму не ў пашане. Здольнасьці ня маюць значэньня, мае значэньне, як і паўвеку таму, сацыяльнае паходжаньне. Калі ты зь вёскі, дык і патрабаваньні да цябе ніжэй. І ніхто не задумваецца, што гэткі клопат дзяржавы прыніжае ня толькі гараджанаў, але й вяскоўцаў.

Падаўжальнікі савецкай сыстэмы адукацыі — рознага кшталту прапагандысты ды ідэолягі, узгадаваныя на падручніках з гісторыі КПСС, працягваюць сеяць неразумнае, нядобрае і нявечнае. Між тым, ёсьць унівэрсальнае правіла граматыкі, сфармуляванае невядомым актывістам студэнцкага руху ў Парыжы ў траўні 1968-га:

«Я маўчу — ты маўчыш — ён, яна маўчыць — мы маўчым — яны сьвяткуюць перамогу.

Я пратэстую — ты пратэстуеш — ён, яна пратэстуе — мы пратэстуем — яны церпяць паразу».

*Наша Ніва. 2004. 13 жніўня.*

# Новы крыжовы паход

Бойня ў Бэслане выклікала сапраўдны шок у расейскім грамадзтве. Ні гібель самалётаў перад тым, ні тэракты ў маскоўскім мэтро, ні трагедыя «Норд-Осту» падобнага шоку й глыбіні ўзрушэньня не выклікалі. Ня толькі расейцам, але й беларусам важна зразумець — чаму?

Справа ня толькі ў жорсткасьці й бесчалавечнасьці чачэнскіх ваяўнікоў і масавай гібелі дзяцей. Хіба захоп больніцы або, скажам, радзільнага дому тэрарыстамі былі больш гуманнымі актамі зь іхнага боку? Хіба пры штурме тэатру на Дуброўцы загінула мала дзяцей? Прыйдзецца дапусьціць, што або іх колькасьці было тады недастаткова, каб выклікаць шок, або гібель ад рук «сваіх» спэцназаўцаў наогул не ўспрымаецца ў Расеі як трагедыя. Дарэчы, успомнім, прыкладна год таму падчас пажараў у дзіцячых інтэрнатах Расеі цягам усяго некалькіх дзён загінула дзяцей ці ня больш, як у трагедыі на Дуброўцы. Расея тады нават брывом не павяла — прынамсі, калі меркаваць паводле этэру маскоўскіх тэлеканалаў, перапоўненых забаўляльна-патрыятычнымі перадачамі.

Цяпер, дарэчы, стала вядома, што ваяўнікі ў сьпіны дзяцей, якія пачалі ўцякаць пасьля выпадковага выбуху ў школьнай спартзалі, не стралялі.

(Што абсалютна не здымае з тэрарыстаў віны.) Большасьць школьнікаў сталі ахвярамі шквальнага скрыжаванага агню, які адначасова ўсчалі асэтынскія апалчэнцы, спэцназаўцы й тэрарысты. Тут напрошваецца аналёгія з падзеямі расейскай гісторыі — гісторыі, зрэшты, не такой ужо і даўняй. У 1962 г. у Навачаркаску ўнутраныя войскі атрымалі загад страляць ва ўдзельнікаў мірнай дэманстрацыі работнікаў, якія пратэставалі супраць падвышэньня цэнаў (як у Менску ўвесну 1991-га). Першы залп быў папераджальны — стралялі па вяршалінах дрэваў. І першымі ахвярамі сталі менавіта дзеці, якія залезьлі на дрэвы, каб было лепш відаць. Так што ў расейскіх унутраных і рознага роду спэцвойсках, а таксама ФСБ ёсьць пэўныя традыцыі, якія ідуць ад НКВД і загараджальных атрадаў. І традыцыі гэтыя пры сучасным кіраўніцтве ў Расеі ніколькі не асуджаюцца, але ўсхваляюцца. Пра дзеяньні фэдэральных войскаў у Чачэніі тут гаварыць проста ня будзем.

Шок, відаць, быў выкліканы іншымі, далёкімі ад чалавекалюбства, прычынамі. ФСБ разам з усялякімі «Алмазамі» ды «Вымпеламі» прадэманстравалі на ўвесь сьвет сваю поўную бездапаможнасьць і тапорнасьць працы ў барацьбе з тэрарызмам. Як трапна выказалася расейская паліталягіня Лілія Шаўцова ў «Московских новостях», спэцорганы ў Расеі ствараліся зусім ня дзеля гэтага, а выключна дзеля аховы рэжыму. І гэты рэжым захістаўся пад ударамі тэрарыстаў, колькасьць якіх непараўнальна меншая за колькасьць гітлераўскіх войскаў альбо войскаў НАТО — заўсёднага галоўнага ворага пасьляваеннага СССР, а потым і Расеі. І зусім не тэрарысты (чытай — чачэнцы) абвесьцілі вайну Расеі, як заявіў Пуцін. Гэта

Расея ўсчала вайну ў Чачэніі акурат дзесяць год таму. За гэты час выявілася, па-першае, што ўлада Масквы ня можа трываць інакш як у стане пэрманэнтнай вайны, а па-другое, яна ня можа перамагчы, нават маючы тысячаразовую перавагу над праціўнікам. Трагедыя ў Бэслане стала сьведчаньнем чарговай паразы, Цусімай дваццаць першага стагодзьдзя для крамлёўскага кіраўніцтва.

Натуральна, падобная параза патрабуе нейкага апраўданьня — і ня толькі для ўладаў, але й для народу, які гэтую ўладу падтрымаў на выбарах. Як сказаў адзін нямецкі палітоляг, Гітлер у 1933-м не падмануў свайго народу, ён зачараваў яго. Зрэшты, тое самае можна сказаць і пра Лукашэнку ў 1994-м, і пра Пуціна ў 2000-м. Апраўданьне павінна быць падмурковым, заснаваным на ўсясьветнай ідэалёгіі — на меншае рускі чалавек зь ягонай «шырынёй душы» ня згодны. І вось у «Известиях» (пасьля таго як галоўны рэдактар Раф Шакіраў быў зьняты з пасады з-за таго, што ў фотарэпартажы на старонках газэты *паказаў* чытачам, *што* адбывалася ў Бэслане) друкуецца свайго роду апраўдальны маніфэст праваслаўнага багаслова айца Кураева.

Артыкул Кураева, прысьвечаны Бэслану й ролі мусульманства ў сучасным сьвеце, паказвае абазнанасьць аўтара ня толькі ў Эвангельскіх тэкстах, але і ў сурах Карана. Пры гэтым увесь тэкст можна зьвесьці да некалькіх тэзаў. Зьверствы тэрарыстаў у Бэслане, на ягоную думку, засьведчылі той факт, што ў Расеі ідзе вайна радыкальнага ісламу супраць хрысьціянства. Фактычна, іслам у цэлым, як рэлігія, а ня толькі яго радыкальныя адгалінаваньні, абвяшчаецца айцом Кураевым адказным за ўсе тэрарыстычныя акты ў Расеі

ды па-за яе межамі. Але ня толькі мусульманскі сьвет павінен несьці адказнасьць, працягвае багаслоў. На ягоную думку, тэракты плянуюцца й накіроўваюцца Захадам, у руках якога ісламскія фундамэнталісты сталіся ўсяго толькі лялькамі. У апошняй акалічнасьці, маўляў, і вінаваты мусульманскі сьвет.

У пачатку сьвяшчэннай вайны зь няверным Усходам і д'ябальскім Захадам бачыць айцец Кураеў сэнс сучаснай эпохі ў Расеі, якая, нарэшце, паводле ягоных словаў, зможа адмовіцца ад жавальнай гумкі на карысьць Духу. Пры гэтым акцэнт робіцца ня столькі на сьвятасьці, колькі на вайне. Аўтар прапануе, каб у адказ на шахідызм Праваслаўная царква абвяшчала ўсіх загіблых у выніку тэрактаў ахвярамі, перад якімі адразу пасьля пакутніцкай сьмерці адчыняецца райская брама. Такім чынам, айцец Кураеў фактычна заклікае зьняць адказнасьць з уладаў і спэцназу за ўсе будучыя сьмяротныя ахвяры ў барацьбе з усясьветным тэрарызмам. Такім чынам, Расея становіцца духоўным лідэрам хрысьціянства, а Масква, адпаведна, Трэцім Рымам.

Варта падкрэсьліць, што аўтар гэтага «маніфэсту» — ня проста праваслаўны сьвятар, але адзін з найбольш адукаваных і інтэлектуальна разьвітых сьвятароў сучаснай Расейскай Праваслаўнай Царквы. Гэта, скажам, не тэлекамэнтатар Лявонцьеў, які дазваляе сабе разьвязна, іншы раз нападпітку, вучыць тэлегледачоў маралі й выкрывае амаральную палітыку ЗША. Кураеў карыстаецца аўтарытэтам ня толькі ў рэлігійных колах, але й у інтэлектуальным асяродку (гаварыць пра інтэлігенцыю ў традыцыйным значэньні гэтага слова сёньня ў Расеі наўрад ці выпадае). Гэта

не азначае, канечне, што артыкул Кураева заўтра стане афіцыйным маніфэстам праваслаўна-дзяржаўнай ідэалёгіі Крамля. Але думкі, падобныя выказаным пабарнікам новага крыжовага паходу на старонках «Известий», усё часьцей сустракаюцца і на старонках іншых газэт, і ў інтэрнэце, і на ўсіх расейскіх тэлеканалах.

З адной тэзай Кураева можна згадзіцца. Бэслан сапраўды стаў для Расеі тым рубяжом, за якім ужо няма вяртаньня назад. Альбо яна паспрабуе застацца сьвецкай, адносна дэмакратычнай, хай сабе карумпаванай і бюракратычнай, дзяржавай, альбо... Гэта будзе краіна, дзе сьвятары з амбоны царквы будуць блаславіць хрысьціянскіх ваяроў, агнём і мячом выпальваць «няверных» (ці нярускіх), не шкадуючы ні старых, ні малых.

Дык ці гарантуе Беларусі спакойнае, далёкае ад жахаў тэрарызму і войнаў жыцьцё яе цяперашняя дзяржаўная ідэалёгія?

*Наша Ніва. 2004. 24 верасьня.*

# Цунамі

«Мы ня можам чакаць міласьціны ад прыроды. Узяць яс — наша задача».
*М. Мічурын*

Галоўнай навіной 26 сьнежня — апошняй нядзелі 2004 г., павінна было стаць перагаласаваньне на прэзыдэнцкіх выбарах ва Ўкраіне. Украінскія падзеі маглі б застацца галоўнай навіной году. Магчыма, і засталіся. Але ў той дзень тыя падзеі адсунуліся на другі плян. Першае месца ў паведамленьнях інфармацыйных агенцыяў і тэлеканалаў занялі наступствы стыхійнага бедзтва ў Паўднёва-Ўсходняй Азіі. Сам геаграфічны маштаб яго ўражвае. Гіганцкія хвалі — цунамі, выкліканыя падземнымі штуршкамі ў раёне тэктанічнага разлому на дне Індыйскага акіяну, у некалькі імгненьняў зьнішчылі паселішчы й камунікацыі на берагох Інданэзіі, Малайзіі, Тайлянду, Бангладэш, паўднёвай Індыі, Шры-Лянкі, а таксама на Андаманскіх і Мальдыўскіх выспах і забралі дзясяткі тысяч чалавечых жыцьцяў. Стыхія мела сапраўды апакаліптычны характар: пасярод белага дня, пад бясхмарным блакітным небам пры поўным штылі на моры амаль што бясшумныя хвалі

вышынёй да 30 мэтраў адна за адной накрылі ўзьбярэжжа ў многія тысячы кілямэтраў даўжынёй. Райскі трапічны сад, мара турыстаў, ператварыўся ў кашмарнае месіва суднаў, машын, аскабалкаў дамоў, сьмецьця й чалавечых трупаў.

Чамусьці ўспомніліся словы Віктара Юшчанкі пра ягоны твар, пашкоджаны атрутай, пра які палітычны лідэр сказаў, што гэта ёсьць тварам Украіны. Чый твар мы ўбачылі ў той вечар на экранах тэлевізараў у руінах дамоў і гурбах сьмецьця — усяго чалавецтва?

Прыродныя катаклізмы быццам бы ня маюць непасрэднага дачыненьня да палітычных і сацыяльных узрушэньняў. Праўда, Герман Чыжэўскі, які першым супаставіў цыклі сонечнай актыўнасьці з цыклямі сацыяльнай актыўнасьці насельніцтва Зямлі, над такім цьверджаньнем, відаць, толькі пасьмяяўся б. Паводле спэцыялістаў — геліякасмолягаў, якія вывучаюць Сонца, адна зь нядаўніх успышак на паверхні сьвяціла і ўсьлед за гэтым — магнітная віхура былі наймацнейшымі за ўвесь час назіраньняў. А пік сонечнай актыўнасьці, які супаў з пачаткам новага тысячагодзьдзя, магчыма, яшчэ не мінуў...

Але размова тут не пра сонечную актыўнасьць ці электрамагнітнае выпраменьваньне. Навуковыя гіпотэзы пакінем навукоўцам. Таксама й не пра выбары ва Ўкраіне размова. Прынамсі, ня толькі пра выбары. Справа ў тым, што калі адбываюцца такія грандыёзныя катастрофы, чалавек міжволі пачынае задумвацца — што гэта азначае? Ніводзін тэракт, нават 11 верасьня ў Нью-Ёрку, ня можна параўнаць са стыхіяй. Пры канцы XVIII ст., калі землятрус цалкам разбурыў квітучы горад Лісабон, сярод партугальцаў, ды й сярод эўрапей-

цаў увогуле, узмацніліся інфэрнальныя, апакаліптычныя настроі, якія ў сваю чаргу прымусілі некаторых мысьліцеляў перагледзець рэлігійныя й маральныя пастуляты ці ўсумніцца ў некаторых зь іх. (Успомнім хоць бы Вялікага Інквізытара ў Дастаеўскага.)

Канечне, Другая ўсясьветная вайна пераўзышла наступствы любога стыхійнага бедства, зь якімі за апошнія тысячагодзьдзі сутыкалася чалавецтва. Вайна забрала мільёны жыцьцяў, нават існаваньне цэлага народу — габрэяў — было пастаўлена пад сумнеў. Але, як гэта ні цынічна гучыць, вайну, а таксама масавыя рэпрэсіі можна патлумачыць прыродай чалавека, ягонымі хцівымі інстынктамі, карысьлівымі інтарэсамі, інтарэсамі асобных краінаў, клясаў, сацыяльных групаў, груповак людзей, у рэшце рэшт, прыхамацьцю правадыра-тырана і г.д. Так ці інакш, усё гэта можна хоць неяк патлумачыць і нават прадказаць. Але ж і падчас войнаў ці рэвалюцый здараліся бедствы й землятрусы. Большасьць гэтых катастроф прадказаць было немагчыма (максымум, чаму давалі рады астролягі дагэтуль, дык гэта часам угадваць нешта зь верагоднасьцю 50 на 50).

Я сьвядома не бяру тут пад увагу *тэхнагенныя* катастрофы. Пра іх маральны сэнс ці адсутнасьць такога сэнсу казаў Сяргей Дубавец у адной зь перадач цыклю «Вострая Брама» на радыё «Свабода». (Пераказваць перадачу, дзе разглядаліся прыклады сьмяротных пажараў на лыжным курорце ў Аўстрыі, у аўтамабільным тунэлі ў Альпах і некаторыя іншыя інцыдэнты, тут ня бачу магчымасьці — адсылаю цікаўных да архіву радыё «Свабода» ў інтэрнэце.)

Гаварыць аб ролі выпадку ў такіх выпадках, прабачце за таўталёгію, не выпадае. Бо як бы ні шчыравалі вынаходнікі, канструктары й будаўнікі розных тэхнічных збудаваньняў, выключыць саму магчымасьць аварыі ці збою ў працы кожнага мэханізму, кожнай машыны па вызначэньні нельга. І чым вышэйшы ўзровень тэхналёгіі, чым больш складаны мэханізм ці сыстэма мэханізмаў, тым большая верагоднасьць іх паломкі. Выдатны прыклад гэтаму — сам чалавек, найбольш дасканалы з усіх вядомых нам жывых мэханізмаў.

Але чалавек настолькі паверыў у сваю ўсёмагутнасьць, што цалкам ігнаруе ў сваёй жыцьцядзейнасьці законы прыроды, законы жыцьця й сьмерці, як бы пакідае іх за дужкамі паўсядзённай сьвядомасьці. І толькі прыродныя катастрофы здольныя нагадаць чалавеку аб ягоным сапраўдным мейсцы ў сусьвеце.

У XXI стагодзьдзі неяк недарэчна казаць пра Кару Боскую, Апакаліпсіс ці нейкія знакі. Тое, у што людзі здолелі ператварыць сваё жыцьцё ў мінулым стагодзьдзі, тыя вынаходніцтвы ў сфэры фізычных і маральных зьдзекаў зь сабе падобных, якіх яны дасягнулі (улучна з газавымі камэрамі і крэматорамі), ня сьніліся старажытным пракам і стваральнікам біблейскіх тэкстаў. Як папярэджваў Фройд, цалкам цывілізаваныя й культурныя вонкава людзі зь лёгкасьцю ператвараюцца ў быдла. Прыкладаў у гісторыі ўжо новага стагодзьдзя процьма — амэрыканскія салдаткі зьдзекуюцца з палонных іракцаў; расейскі афіцэр гвалтуе і забівае палонную чачэнскую дзяўчыну; беларускія спэцназаўцы (ці як правільна іх назваць?) забіваюць па загадзе начальства ні ў чым не вінаватых безабаронных людзей, карыстаючыся пад-

ручнымі сродкамі — у тым ліку, напрыклад, рыдлёўкай, і хаваюць іх у патаемным мейсцы ў лесе, ці балоціне — як дзікіх зьвяроў.

Ніводная з папярэдніх катастрофаў не была ўспрынятая як нейкае папярэджаньне, падстава для сур'ёзнага роздуму, а тым больш карэктаваньня ў паўсядзённым жыцьці людзей або ў палітыцы цэлых дзяржаў. Можна не сумнявацца, што найбольшую цікавасьць да цунамі ў Індыйскім акіяне праявяць кінематаграфісты. Дзе-небудзь у Галівудзе ўжо сьпеюць задумы стварыць новы блёкбастэр на тэму катастрофы. Яшчэ адна выснова трагедыі — людзі сталі абыякавымі да ўсяго, што ў рэальнасьці адбываецца вакол іх, у тым ліку да сьмерцяў і крыві. Прывучаныя да гэтага тэлебачаньнем, кіно і віртуальнымі гульнямі, яны здольныя ўспрыняць трагедыю толькі ў выглядзе прафэсійна апрацаваных навінаў альбо, яшчэ лепш, прыгожа ўпакаванага відовішча.

Але ў той самы час катастрофа прадэманстравала каштоўнасьць інфармацыі. Коштам яе было ў літаральным сэнсе жыцьцё дзясяткаў тысяч людзей, і лік вёўся сапраўды на хвіліны. Калі б у пацярпелых краінах была сыстэма спавешчаньня аб цунамі, калі б амэрыканскія навукоўцы змаглі давесьці інфармацыю аб падземных штуршках (якую яны атрымалі, фактычна, яшчэ да пачатку землятрусу) да людзей, здольных прымаць рашэньні й браць на сябе адказнасьць, трагедыя магла быць значна меней маштабнай.

Як не ўзгадаць тут Чарнобыль, калі ўлады — неверагодная, злачынная рэч — ня толькі не казалі ў першыя гадзіны пра характар і маштаб ядравай катастрофы, а ўсяляк спрабавалі схаваць сам факт яе ад грамадзтва! Вытокі тае злачыннае бязь-

дзейнасьці (ды й сучасных спробаў кіраўніцтва Беларусі прымяншаць наступствы чарнобыльскай катастрофы) трэба шукаць у адносна нядаўнім мінулым.

Здаецца неверагодным, але ахвярай цунамі ледзьве ня стаў шмат гадоў назад тады яшчэ нікому не вядомы пісьменьнік Васіль Быкаў, які служыў нейкі час афіцэрам Савецкай Арміі на Курылах, на высьпе Кунашыр. Як вынікае з успамінаў Быкава ў ягонай кнізе «Доўгая дарога дадому», землятрусы на Далёкім Усходзе, у прыватнасьці, на Кунашыры, — справа звыклая. Далей цытую па кнізе:

«Неяк я бег па вуліцы ў пачатку землятрусу, і вуліца перада мной трэснула на ўсю шырыню. Ледзьве пасьпеў пераскочыць шчыліну шырынёй з далонь. А ўвосень 52-га здарылася немаведама што. Рэчка, што працякала цераз пасёлак і ўпадала ў затоку, пачала цячы назад. Вадой заліло лугавіну, падтапіла дамоўкі. Ужо праз колькі дзён дазналіся, што то — ад цунамі».

Афіцэры дазналіся праз колькі дзён, грамадзянскае насельніцтва СССР, хутчэй за ўсё, не дазналася тады пра стыхійнае бедзтва нічога. Ахвярамі цунамі на Сахаліне, здаралася, станавіліся сотні, нават тысячы людзей. Але пра гэта маўчалі. Доўгі час, напрыклад, хавалася інфармацыя пра землятрус у сталіцы Туркмэніі Ашгабадзе ў 1948-м, які амаль цалкам зьнішчыў горад. У савецкіх газэтах пра гэта не было ані слова. А як жа — хто дазволіў несанкцыяваную катастрофу?! Толькі партыя ды яе рулявы мелі эксклюзіўнае, як кажуць, права пазбаўляць жыцьця людзей, распараджацца іхнымі лёсамі. А тут ня клясавыя, а нейкія загадкавыя прыродныя сілы. Нездарма

тады нарадзіўся плян вялікага пераўтварэньня прыроды, які прадугледжваў, у прыватнасьці, паварот сібірскіх рэк, што ўпадаюць у Паўночны Ледавіты Акіян, у Цэнтральную Азію.

Значна пазьней сябра Васіля Быкава, таксама франтавік, паэт Навум Кісьлік напіша: «Дурак во сне придумал, чтоб рекам течь вспять».

Можна дадаць — і плян асушэньня Палесься таксама.

Сёньня ў Кітаі пачалі ажыцьцяўляць плян пераўтварэньня ракі Янцзы, чымсьці падобны да павароту сібірскіх рэк. Ведаючы працавітасьць і ўпартасьць кітайцаў, можна не сумнявацца, што плян будзе зьдзейсьнены. Некалі ж змаглі перастраляць там усіх вераб'ёў, абвешчаных галоўнымі ворагамі сельскай гаспадаркі. (Праўда, потым у палёх разьвялося столькі вусякоў-шкоднікаў, што давялося вераб'ёў завозіць зь іншых краінаў, каб ратаваць ураджай.)

Ужо даўно навукоўцы высьветлілі, што паводкі ў Банглядэш, якія здараюцца там ці не штогод і маюць разбуральны характар, і дзе ўсе землі разараныя пад пасадкі рысу, вядуць да страшэннай эрозіі глебы. А калі так пойдзе далей, усю краіну зь цягам часу проста змые ў акіян. Але пасевы там па-ранейшаму пашыраюць, нягледзячы на новыя й новыя тысячы ахвяраў паводак.

От, дзе там тая Банглядэш! Але ж і кіраўнік зусім далёкай ад яе дзяржавы, што мяжуе цяпер з Эўразьвязам на Захадзе й мяцежнай Украінай на поўдні, упарта запэўнівае нас, што найлепшы паказьнік разьвіцьця сельскай гаспадаркі — гэта пашырэньне пасяўных плошчаў.

Зразумела, толькі ад найвышэйшага кіраўніцтва могуць зыходзіць дырэктывы — быць даж-

джу або ня быць, калі пачынаць сеяць і калі — жаць. Толькі яно можа вырашаць, ці пакінуць жыцьцё таму або іншаму чалавеку — злачынцу альбо былому паплечніку. Калі падначаленыя з гэтым згаджаюцца, значыцца — так яно і ёсьць. Значыцца, мы ўсе жывем яшчэ ў эпоху да ўсясьветнай біблейскай залевы.

Цунамі ды ўраганы зь лёгкасьцю разбураюць любыя, самыя магутныя будынкі й сьцены. Яны ніяк ня могуць разбурыць толькі бар'ераў глупства й самаўпэненасьці ў нашых галовах.

*Наша Ніва. 2005. 7 студзеня.*

# Прага волі

Даўно заўважана — чым далей журналіст ад месца падзей, тым прасьцей пісаць пра гэта. За савецкім часам журналісты-«амэрыканісты» дасканала разьбіраліся ў праблемах палітыкі рэспубліканскай або дэмакратычнай партый і зь лёгкасьцю выдавалі прагнозы на абраньне чарговага прэзыдэнта ЗША. Адказнасьці ніякай, бо міжнародныя аглядальнікі залежалі не ад гледачоў, а толькі ад начальства і лініі кіраўніцтва КПСС у той канкрэтны момант. З таго часу мала што зьмянілася, варта толькі паглядзець БТ. Навошта пасылаць карэспандэнта ў Рыгу, каб ён пагутарыў там наконт «вызваленьня Латвіі» савецкімі войскамі як з латышамі, так і з расейскамоўнымі жыхарамі? Усё значна прасьцей — бярэцца «карцінка» шэсьця вэтэранаў Вафэн-СС і накладаецца прапагандысцкае клішэ: у Латвіі працьвітае фашызм.

Што ўжо казаць пра далёкі Кыргыстан? Кадры рабаваньня ўнівэрмагаў у Бішкеку ў камэнтарах расейскіх і беларускіх тэлежурналістаў адразу зьліліся ў агульную песьню на стары матыў: «Паглядзіце, што такое ваша рэвалюцыя і на што здольная ваша апазыцыя». Падзеі ў Кыргыстане імгненна былі пастаўленыя ў адзін шэраг з падзеямі ў

Грузіі і ва Ўкраіне. Між тым, і ў Тбілісі, і ў Кіеве рэвалюцыі былі абсалютна бяскроўныя і выключна мірныя. Але гэтая акалічнасьць папросту ігнаруецца. Факты не адпавядаюць канцэпцыі? Тым горш для фактаў!

**Шырокая кааліцыя, альбо «Тэорыя змовы»**

Ва ўсіх трох выпадках ёсьць нешта супольнае, свайго роду схема ці, кажучы мовай спэцыялістаў, архетып падзей. Падставай для актыўных дзеяньняў апазыцыі становіцца фальшаваньне вынікаў выбараў (прэзыдэнцкіх ці парлямэнцкіх) з боку ўладаў. У выніку масавых акцый пратэсту частка ці большасьць чынавенства пераходзіць на бок апазыцыі, а судовыя органы ці пракуратура прызнаюць факт фальшаваньня выбараў. Вынік — падзеньне прагнілага рэжыму ды прыход ва ўладу новых (або адносна новых) асоб.

Што яшчэ кідаецца ў вочы, дык гэта шырокая кааліцыя сіл, якія ўступаюць у супрацьстаяньне з рэжымам. Пад сьцягамі апазыцыі могуць выступаць побач нацыяналісты і камуністы, тэхнакраты і лібэралы, рэлігійныя артадоксы і рэфарматары. Але гэта парадаксальна толькі на першы погляд. Бо ў аўтарытарным грамадзтве дэмакратычныя партыі ня могуць афарміцца і дзейнічаць звычайным, законным парадкам. Апазыцыянэры проста вымушаныя, каб процістаяць рэжыму, дзейнічаць разам. І аб'ядноўвае апазыцыю не абавязкова «адзіны кандыдат». Гэта можа быць і «супольны вораг», аднолькава ненавісны ўсім. Што прыходзіць на зьмену старому ладу — асобнае пытаньне, якое кожная краіна вырашае па-свойму.

Варта адзначыць, што расейскія палітолягі і афіцыйныя асобы, улучна з прэзыдэнтам, спра-

буюць звальваць усё з хворай галавы на здаровую. Паводле іхнай лёгікі, гэта ня ўлады мусяць несьці адказнасьць за фальшаваньне выбараў, выкарыстаньне адміністрацыйнага рэсурсу, падман выбарцаў, парушэньне закону, а апазыцыя, якая нежаданьнем прызнаць такія выбары легітымнымі дэстабілізуе сытуацыю.

Некаторыя «палітолягі» ідуць далей. Прыклад такой паліталёгіі падала нядаўна «Советская Белоруссия», апублікаваўшы аналітычную нататку нейкага навукоўца з Санкт-Пецярбургу аб сытуацыі ва Ўкраіне. Заканамернасьці, пра якія казалася вышэй і якія праявіліся падчас аранжавай рэвалюцыі, ператвараюцца ў аналітыка ў зламысны сцэнар, распрацаваны замежнымі спэцслужбамі. Гэтае адкрыцьцё мала чым адрозьніваецца ад усіх астатніх «тэорыяў змовы», у тым ліку тэорыі аб тым, што развал СССР быў сплянаваны і зьдзейсьнены ЦРУ (або «Масадам», або масонамі). Калі пагадзіцца са згаданай тэорыяй, дык яе аўтары павінны прызнаць, што галоўнай зброяй у руках варожых сіл былі КГБ, ваенна-прамысловы комплекс і частка кіраўніцтва КПСС, якія ўчынілі бяздарны пераварот у жніўні 1991 г.

Зразумела, што ў ЗША, як і ў ЭЗ, як і ў Расеі, ёсьць свае інтарэсы ва Ўсходняй Эўропе і Цэнтральнай Азіі. У. Пуцін, між іншым, днямі фактычна прызнаў, што СНД на сёньняшні дзень — анахранізм. Такім самым анахранізмам трэба было б прызнаць і Дамову аб калектыўнай бясьпецы, зь якой вынікае, што Беларусь павінна турбавацца пра ахову паўднёвых межаў Кыргыстану. А Кыргыстан тады павінен дапамагаць Беларусі ў процістаяньні NATO? Але ж яшчэ Акаеў зразумеў, што ня толькі супрацоўніцтва з Масквой, але

і прыязныя дачыненьні з Вашынгтонам здольныя прынесьці карысьць ягонай краіне, і даў дазвол на разьмяшчэньне ў Кыргыстане амэрыканскай авіябазы. Пры захаваньні аналягічнай расейскай...

**Колазварот страху ў прыродзе**

Што да найвышэйшага беларускага кіраўніцтва, дык яно не абцяжарвае сябе развагамі ды аналізам сытуацыі ў краінах СНД. Яно дзейнічае, хутчэй, чыста рэфлекторна. Доказам таму — узмоцненыя нарады АМОНаўцаў і СОБРаўцаў, якія запаланілі цэнтар Менску 25 сакавіка. Змаганьне ўзброеных да зубоў, натрэніраваных спэцназаўцаў зь дзецьмі ўражвае ня столькі сваёй жорсткасьцю, колькі несувымернасьцю дзеяньняў і рэальных пагроз. Уявіць сабе, што некалькі соцень хлопцаў і дзяўчат, узброеных ледзякамі, здольныя пайсьці на штурм прэзыдэнцкай адміністрацыі, ня ў стане нават хворы розум. З другога боку, упартасьць, зь якой менскія хлопцы спрабавалі вярнуцца на Кастрычніцкую плошчу, нягледзячы на зьбіцьцё й затрыманьні дзясяткаў чалавек, сьведчыць, што, прынамсі, частка маладога пакаленьня перастае баяцца ўлады. Ці ня хоча зьмірыцца са страхам. Прынамсі, такога ўпартага процістаяньня менавіта ў Дзень Волі на вуліцах Менску даўно не назіралася.

А далей узаемазалежнасьць простая — чым менш у грамадзтве страху, тым больш яго становіцца ва ўладаў. А страх — благі дарадца. Аднак шлях да пераадоленьня страху беларусаў перад уладай яшчэ вельмі й вельмі доўгі. Бо для пераадоленьня яго патрэбна ня толькі мужнасьць. Хто асьмеліцца назваць беларусаў нямужным наро-

дам? Патрэбен, перш за ўсё, моцны стымул, жаданьне стаць свабодным. Яно сёньня нараджаецца — сярод вучняў, студэнтаў, прадпрымальнікаў. Дарэчы, частка тых, хто на пачатку сакавіка страйкаваў на прыватных рынках, пры канцы месяца, у дзень нацыянальнага сьвята, таксама выйшлі на Кастрычніцкую плошчу. Тое, што гэты дзень як бы праспалі палітыкі, якія прызвычаіліся ў апошнія гады адзначаць Дзень Волі ў падпольлі ці на імпрэзах, — таксама ня страшна. Ініцыятыву яшчэ можна перахапіць. І няважна, ад каго яна будзе зыходзіць. Самы вялікі грэх — грэх адчаю. Ён і ў палітыцы грэх. А падлік дывідэндаў — хто, чаго, колькі й на кім зарабіў — можна пакінуць і на потым. Калі застанецца жаданьне...

Застаецца, як заўсёды, адвечнае пытаньне — цана свабоды. І цана перамогі. Цынічнымі выглядаюць развагі некаторых палітыкаў і журналістаў наконт «азіяччыны», якую нібыта прадэманстравалі кыргызы. Гэтыя выказваньні гучаць асабліва недарэчна з вуснаў расейскіх палітыкаў пасьля таго, што яны нарабілі ў Маскве ў кастрычніку 1993-га. Або ў Чачэніі цягам апошніх дзесяці гадоў. Альбо на тле сучасных паведамленьняў пра зьбіцьцё і забойствы скінгэдамі армян, азэрбайджанцаў, казахаў, жыхароў азіяцкіх і афрыканскіх краін у абедзьвюх сталіцах Расеі.

Марадэры былі і ёсьць ня толькі ў Бішкеку. Яны былі і ў старажытным Багдадзе пасьля падзеньня рэжыму Хусэйна. Яны былі і ў Менску, калі яго пакінулі савецкія войскі ў 1941-м. Але гэта ніякі не паказчык маральных якасьцяў таго ці іншага народу. Гэта паказчык крызісу, які гэты народ перажывае.

**Поступ Каранара**

Рэвалюцыі бываюць не ад добрага жыцьця. Аб тым, як жыў кыргыскі народ у апошнія гады, мы маглі толькі здагадвацца паводле ўскосных зьвестак. Афіцыйная велічыня гадавога даходу — меней як 270 эўра на душу насельніцтва — была самая нізкая ў СНД. Магчыма, Акаеў і быў больш лібэральны дыктатар, чым ягоныя суседзі па Цэнтральнай Азіі. Але ж прэзыдэнт павінен несьці поўную адказнасьць перад людзьмі за вынікі 14 гадоў свайго праўленьня. Праўленьня, якое ён двойчы здолеў падоўжыць нібыта легітымным шляхам. Толькі народ у гэтую легітымнасьць не паверыў. Перамога прыхільнікаў Акаева на парлямэнцкіх выбарах стала піравай перамогай. Улада, якую адмовіўся прызнаваць народ, абрынулася. І для гэтага апазыцыі не спатрэбіўся нават харызматычны лідэр.

Магчыма, у адсутнасьці лідэра таксама ёсьць праблема новай кыргыскай улады. А магчыма — перавага. Для таго каб меркаваць аб будучыні Кыргыстану, сёньня не стае інфармацыі. Але ў любым выпадку вызначаць свой лёс будзе сам кыргыскі народ. 1991 год быў толькі фармальным пачаткам незалежнасьці былых рэспублік СССР. Цяпер сапраўдная гісторыя, а не інэрцыя былых дзесяцігодзьдзяў уступае ў свае правы, і хто будзе тут першы, а хто апошні, сказаць немагчыма. Ясна толькі, што закансэрваваць старыя савецкія парадкі ў новай форме, пад выглядам уяўнай стабільнасьці, захаваць сацыялістычную, псэўдаінтэрнацыянальную сьвядомасьць надоўга не патрапіць. Марная праца.

Рэвалюцыя ў Кыргыстане зусім не падобная, нават зрокава, на экранах тэлебачаньня, на рэ-

валюцыю ва Ўкраіне ці Грузіі. У яе няма нават агульнапрызнанага колеру ці сымбалю. Хіба што сымбалем можа лічыцца вершнік, што нясецца ўскок вуліцамі Бішкеку?

Але прыгадваецца яшчэ адзін вобраз — з Чынгіза Айтматава. У нашумелым некалі рамане кыргыскага пісьменьніка «Буранны паўстанак» два галоўныя героі — Едыгей і ягоны белы вярблюд Каранар. Вярблюд гэты — сапраўдны прыгажун і асілак сярод вярблюдаў — увесь час працаваў на свайго гаспадара, выносіў разам зь ім усе цяжкасьці і трывогі, быў прывязаны да яго і па-свойму любіў. І гаспадар любіў свайго Каранара. Але раз на год, калі пачыналася вясна і прачыналася пустыня, Каранар рабіўся дзікім і неўтаймоўным. Ніякая сіла не магла тады стрымаць яго...

Што такое свабода як «усьвядомленая неабходнасьць», многія вывучалі ў школе. Але што ёсьць свабода як такая, як нязломная прага да жыцьця і волі, дадзеная жывым істотам ад нараджэньня?.. Ці трэба тлумачыць, што ня толькі ў зьвяроў, але і ў чалавека ніхто ня мае права адбіраць волю ні пад якой умовай. А ўжо як чалавек выкарыстае свабоду, а значыць, і паклапоціцца пра свой лёс — вырашаць толькі яму самому.

*Наша Ніва. 2005. 1 красавіка.*

## Білборды ў цемры, альбо Няхай сабе паклёпнічаюць

Адна паважная беларуская газэта скрытыкавала неяк яшчэ больш паважную брытанскую The Times. Праўда, крытык, пэўна, ня ведаў, што ад нядаўняга часу гэтая газэта добраахвотна перайшла ў разрад «жаўтаватых». Але ня ў тым рэч. Аўтар паважнай газэты сьцьвярджае, што брытанскі журналіст нібыта напісаў пра Менск няпраўду, прычым тройчы. Па-першае, што аэрапорт «Менск-2» амаль не асьветлены, бо там эканомяць электрычнасьць. Па-другое — нібыта абапал дарогі з аэрапорту ў Менск зусім мала білбордаў. І па-трэцяе — на вуліцах беларускай сталіцы зусім мала аўтамашын.

Не зьбіраюся палемізаваць зь беларускім выданьнем і тым больш абараняць лёнданскую The Times. Зазначу толькі, спаслаўшыся на асабісты досьвед: калі прыяжджаеш у менскі аэрапорт гадзіны да шостай раніцы, там вельмі проста можна зламаць нагу ў цёмных калідорах і на эскалятарах, якія амаль заўсёды адключаны — відаць, таксама дзеля эканоміі. Што да білбордаў, дык кожны, хто хоць аднойчы выяжджаў у Латвію, Літву ці Польшчу, павінен прызнаць, што на тамтэйшых дарогах іх значна болей, чым у Беларусі. Таксама як і машын на вуліцах. Асабліва калі па-

раўноўваць Менск з такім мэгаполісам, як Лёндан, зь ягонымі транспартнымі праблемамі. Дый дзякаваць Богу, урэшце!

Трэба ўзяць пад увагу, што які-небудзь сярэдні брытанец, прачытаўшы нешта падобнае, наўрад ці зьменіць сваё стаўленьне да Беларусі, калі яно ўвогуле ў яго было. Мяне больш цікавіць тое, што апошнім часам прынята называць модным словам «брэнд».

Што можна лічыць брэндам сучаснай Беларусі? Ці дбае нехта пра яго ўвогуле? Што, на думку тых, ад каго залежаць у пэўнай ступені тыя самыя брэнды або імідж краіны, можа быць прыцягальным для замежніка?

Гэта можа быць і тэмай асобнай дысэртацыі для кагосьці. Але ж я абмяжуюся ўсяго толькі некаторымі развагамі. За савецкім часам усё было вельмі проста. Для Савецкага Саюзу ў цэлым замежніку ў якасьці брэнду прапаноўваліся Красная плошча разам з маўзалеем і пэрманэнтнымі вайсковымі парадамі, Вялікі тэатар і матрошкі. За кожнай жа з савецкіх рэспублік былі замацаваныя свае, так бы мовіць, патрыятычна-прамысловыя брэнды. У Беларусі гэта былі плошча Перамогі, МАЗ з эмблемай-зубром на капоце, трактары і вырабы з саломкі. Ну і, зразумела ж, імідж рэспублікі-партызанкі. Замежнік, на думку тагачаснага партыйнага прапагандыста, мог прыехаць у краіну толькі й выключна дзеля таго, каб паглядзець, як сыходзяць новыя машыны з канвэеру, ускласьці кветкі да помнікаў ІІ Усясьветнай вайны і на разьвітаньне купіць сабе сувэнір.

Яшчэ неяк у «ЛіМе» на пачатку 1980-х гадоў я атрымаў заданьне напісаць пра нейкіх прафсаюзных актывістаў, якія наведалі сталіцу Белару-

сі, і пра тое, што іх тут уразіла. Заданьне я выканаў, але больш нуднай працы ў жыцьці ніколі не даводзілася рабіць. Па-першае, незразумела, чаму сам факт прыезду замежнікаў у Менск павінен быў зацікавіць беларускага чытача, — а трэба ж было гэта неяк абгрунтаваць! Па-другое, самі прафсаюзныя актывісты, якія прыехалі аднекуль з Валіі, яўна не былі надта ўражаныя ўбачаным — ва ўсякім разе, гатэлем «Турыст», дзе іх пасялілі і дзе раніцай не было гарачай вады, дакладна. Большасьць гасьцей былі людзьмі пэнсійнага або перадпэнсійнага ўзросту. Па іх выглядзе, вопратцы й манерах адчувалася, што ў Менск гэтых турыстаў прывяло не жаданьне ўбачыць усходнюю экзотыку і тым больш не інтэрнацыянальны абавязак, а проста сьціплыя магчымасьці для нармальнага, камфортнага адпачынку. Ну і яшчэ, можа, там у іх былі нейкія цэхавыя, прафсаюзныя абавязкі, накшталт — мінулым разам да нас прыяжджалі таварышы з Малдаўскай ССР, а гэтым разам мы павінны наведаць нашых сяброў у БССР.

Чаму я так падрабязна спыняюся на гэтым малацікавым эпізодзе? Ды таму, што такімі замежнікамі і іхнымі нікому не цікавымі ўражаньнямі быў спрэс забіты этэр савецкага тэлебачаньня й радыё, а таксама газэты — у тым ліку і паважная беларуская газэта, якую я згадваў напачатку. Прамовы першага сакратара ЦК КПСС, а таксама начальнікаў розных рангаў лічыліся самай цікавай падзеяй, у тым ліку для замежнікаў. А ўжо адкрыцьцё якога-небудзь заводу вэнтыляў — увогуле падзеяй сусьветнага маштабу. Таму пад рубрыкай накшталт «Савецкі Саюз вачыма замежных гасьцей» увесь час ішлі так званыя вод-

гукі працоўных усяго сьвету на апошнія «міралюбівыя ініцыятывы» ці запуск заводаў.

Здавалася б, Беларусь за 14 гадоў свайго незалежнага існаваньня павінна была зьмяніцца непазнавальна, у тым ліку і ў сэнсе брэндаў. У людзей жа зьявілася магчымасьць свабодна езьдзіць за мяжу, і ў Беларусь таксама стала прыяжджаць больш замежнікаў. Зьявіліся тым часам і новыя тэхнічныя магчымасьці, мэдыйныя тэхналёгіі — тыя самыя білборды на вуліцах беларускіх гарадоў. Але плякаты з каўбоямі Мальбара, аўтамашынамі «Форд» і швайцарскімі гадзіньнікамі ўсё яшчэ глядзяцца нечым чужародным на агульным фоне. А яшчэ больш уражваюць сваім убоствам памкненьні айчынных вытворцаў і рэклямістаў рабіць рэкляму, як на Захадзе. Але з аглядкай усё-такі на тутэйшае начальства. Жаночая бялізна, напрыклад, хоць і рэклямуецца, але зь нейкай сарамлівасьцю — быццам гэта нейкія штуцары, ці вэнтылі, ці яшчэ нешта такое, зусім не сэксуальнае. Бо ў Беларусі, як і некалі ў СССР, сэксу дагэтуль, як вядома, няма. Ёсьць толькі дазволенае найвышэйшым начальствам і недазволенае.

Ёсьць нават адмысловая дзяржаўная ўстанова пад дзіўнаватай назвай «рэгістар». Можа, яна паходзіць ад слова рэгістраваць? Але ж установа займаецца зусім не рэгістрацыяй, а цэнзурай. Яна дбае, каб на экраны кіно і тэлебачаньня ці на відэа выходзіла толькі правераная прадукцыя, у якой няма прапаганды гвалту й парнаграфіі. Дык вось, як запэўніў кіраўнік гэтай установы, нехта Цьвяткоў, беларуская дзяржава зусім ня супраць эротыкі, калі яна выхоўвае ў грамадзянах пачуцьцё прыгожага. І ў якасьці шэдэўру, рэкамэндаванага да прагляду дарослай аўдыторыі, назваў фільм

«Грэцкая смакоўніца». Фільм, калі мне ня здраджвае памяць, выйшаў у савецкі пракат недзе ў годзе 1987-м і ўжо тады ўражваў сваёй бяздарнасьцю й пошласьцю... Пра густы не спрачаюцца. Паспрабуйце паспрачацца, калі іх дыктуе дзяржава.

Тое ж датычыць і брэндаў. Ну, чаму, напрыклад, Беларусь раптам павінна стаць гарналыжнай краінай? Толькі дзеля таго, каб менш людзей езьдзілі на замежныя курорты на лыжах катацца? Але ж тыя, у каго ёсьць грошы, усё адно будуць езьдзіць у Аўстрыю ці Францыю. А тым, у каго іх няма, — і ў Сілічах катацца не па кішэні.

Галоўны прынцып, відаць, застаўся ранейшы — «у советских собственная гордость».

Тэма чысьціні й парадку чамусьці застаецца вельмі актуальнай для начальства. На ўсе выпады заходніх журналістаў, на любую крытыку заўсёды прыхаваны забойчы аргумэнт — вы паглядзіце, як у нас чыста на вуліцах. Аргумэнт, канечне, моцны. Але ж няўжо мы ўсё яшчэ жывём у XIX стагодзьдзі? І хіба не ў Эўропе жывём? Вось жа пабудавалі аэрапорт на самай далёкай адлегласьці ад гораду на ўсім эўрапейскім кантынэнце. Праўда, калі зайсьці ў прыбіральню ў нацыянальным (!) аэрапорце, дык пачынаеш разумець, што недахоп асьвятленьня іншым разам дапамагае ня бачыць розныя іншыя недахопы.

Нядаўна на расейскіх інтэрнэт-сайтах, дый ня толькі на іх, прайшла інфармацыя пра новы аэрапорт у Таліне. Публікацыя суправаджалася зьедлівымі камэнтарамі. Журналісты навыперадкі зьдзекаваліся з жаданьня эстонцаў пабудаваць новы, звышсучасны аэрапорт. Асабліва іх насьмяшылі словы аднаго з эстонскіх кіраўнікоў аб тым,

што ў аэрапорце абавязкова павінны быць самыя сучасныя, чыстыя прыбіральні, бо гэта першае, з чым часам сутыкаюцца замежныя госьці на тэрыторыі іншай дзяржавы. Таксама, калі хочаце, брэнд. У Беларусі, як і ў сёньняшняй Расеі, такая праблема ніколі б не паўстала. Ёсьць жа ў аэрапорце заля для V.I.P.! Там заўсёды чыста. А замежнікі... Успамінаецца савецкі анэкдот. У нейкі занядбаны калгас раптам прыехалі журналісты радыё «Свабода». Прыехалі — і адразу на мэхдвор. Усе ў паніцы. Адзін старшыня спакойна ўсьміхаецца: «Ды няхай сабе паклёпнічаюць...»

*Наша Ніва. 2005. 18 лютага.*

## Вялікі спачын.

Субота для чалавека ці людзі для суботнікаў?

Напачатку — гісторыя, якую расказаў адзін мой малады калега і якую мне даўно карцела пераказаць. Аднойчы, калі яму было гадоў шэсьць, ён прачытаў вядомы надпіс на франтоне гмахаў, што ўтвараюць паўдугу на плошчы Перамогі ў Менску: «Подвиг народа бессмертен» (цытую, як прынята казаць, на мове арыгіналу). Малы запытаўся тады ў бацькі: «А што такое подзьвіг?» Той растлумачыў яму гэтую зьяву па-свойму — так, каб сыну было зразумела. Хлопчык запомніў словы ды прыгадаў іх праз колькі месяцаў, калі пайшоў у першую клясу. На адным з урокаў настаўніца спыталася ў першаклясьнікаў: «Што такое подзьвіг, дзеткі?» I вось наш герой у адказ прывёў татавы словы: «Подзьвіг — гэта калі ты саступіш некаму сваё месца ў чарзе па каўбасу...» Бацька хлопчыка, зразумела, пажартаваў, не ўлічыўшы яго малога веку. На дварэ быў пачатак 1980-х гадоў, і жарт мог мець ня самы лепшы працяг для бацькоў хлопчыка. Але ж, відаць, усё тады абышлося... Ды ня ў тым рэч.

Чэргаў па каўбасу, таксама як па мяса, рыбу, муку, мыла і ўсё астатняе, самае неабходнае, дзякаваць Богу, сёньня амаль ніхто ня згадвае — прынамсі, у сталіцы. А лёзунг на плошчы Перамогі

застаўся. І чарговы юбілей Перамогі сьвяткуецца гэтаксама, як дваццаць ці трыццаць гадоў таму. Вось і ленінскія камуністычныя суботнікі неяк непрыметна вярнуліся ў жыцьцё. І новае пакаленьне ўдзельнічае ў гэтым добраахвотна-прымусовым мерапрыемстве гэтаксама, як удзельнічалі камсамольцы — бацькі й дзяды цяперашніх БРСМаўцаў. Праўда, суботнікі ўжо не называюцца афіцыйна ні ленінскімі, ні камуністычнымі. Але ж сутнасьць «сьвята свабоднай працы», як яго некалі цынічна назвалі бальшавікі, засталася. Сутнасьць ня ў тым, што за 70 гадоў савецкай улады ў дзяржавы так і не знайшлося грошай на добраўпарадкаваньне гарадоў і вёсак.

Так званая рабоча-сялянская дзяржава ведала і ўжывала на практыцы дзясяткі розных іншых спосабаў рабаваньня рабочых і сялян. Былі і звышурочная праца, і працоўныя вахты, і зьбіраньне ўнёскаў на прафсаюзы, ДТСААФ, ратаваньне на водах, у фонд міру ды розныя іншыя фонды. Само паняцьце «халявы», няма сумневу, нарадзілася ды ўвайшло ў савецкі побыт пад уплывам дзяржавы, якая пры кожнай нагодзе карысталася той самаю халявай — інакш кажучы, бясплатнай працай грамадзян на таго дзядзьку, ці — як тады казалі — за таго хлопца. Імя якога, паводле анэкдоту брэжнеўскіх часоў, усе ведалі. Але галоўнае, паўтаруся, заключалася ў іншым. Таксама як і дэманстрацыі працоўных, суботнікі паступова ператварыліся ў тэст на ляяльнасьць уладам. Ня важна, колькі ты там зграбеш лісьця ці наломіш асфальту, колькі наточыш дэталяў на станку і колькі зь іх пры гэтым паламаеш з прычыны кепскага настрою або выпітых у гонар сьвята некалькіх шклянак гарэлкі. Важна, каб усе бачылі — ты ўдзель-

нічаеш у калектыўнай працы, выконваеш загады начальства — адным словам, крочыш правільнай дарогай разам з усімі.

Пры гэтым адбывалася свайго роду братаньне працоўных з начальствам (прынамсі, яго ніжэйшым і сярэднім зьвяном), якое пераадзявалася на некалькі гадзін у старыя штаны й пінжакі ня толькі для таго, каб сымбалічна пакласьці некалькі цаглін у агульную кладку, але ж і каб прынагодна выпіць разам з простым народам. Абодва бакі заставаліся задаволенымі адзін адным. Праўда, у народзе была папулярнай байка пра варону, у якой выпаў сыр зь дзюбы, калі ліса ёй сказала, што хутка зноў будзе суботнік...

Іншым разам найвышэйшае начальства неасьцярожна спрабавала выкарыстаць суботнікі ў чыста ідэалягічных мэтах. Напрыклад, аднойчы высокім рашэньнем працоўнымі днямі былі абвешчаныя ня толькі «чырвоная субота», але ж наступная за ёй нядзеля, якая супала з праваслаўным Вялікаднем. У адказ праваслаўны люд агрызнуўся вершыкам: «Спасибо партии родной за любовь и ласку! Отобрала выходной, о...рала пасху!» А што ўжо казаць пра пачуцьці юдэяў, якім працаваць у суботу забараняе рэлігія? Не, субота ў сацыялістычнай дзяржаве не патрэбна чалавеку, гэта людзі патрэбны ёй для суботнікаў.

Цяперашняе начальства, безумоўна, улічвае ўрокі мінулага. Цяпер ужо нікому ня прыйдзе да галавы сумяшчаць рэлігійныя (хоць чамусьці выключна праваслаўныя) сьвяты з суботнікамі. У астатнім жа сэнс іх застаецца ранейшы — гэта сьвята дзяржаўнага ахвярапрынашэньня. Прыносіць у ахвяру сваё жыцьцё ніхто нікога, вядома, не прымушае. Грамадзяне ахвяруюць усяго

толькі сваім часам і грошыкамі. І ніхто зь іх не задаецца пытаньнем: куды ідуць іхныя падаткі?

З аднаго боку, з экранаў тэлевізараў грамадзянам увесь час настойліва раяць: заплаці падаткі ды сьпі спакойна! З другога боку, у дзень рэспубліканскага (яшчэ адно добра, здавалася, забытае савецкае слова) суботніку тым самым грамадзянам прапануюць забыцца, што камунальныя службы Менску ці якога хочаце іншага гораду існуюць за кошт падаткаплатнікаў — гэта значыць за іх уласны кошт. Падаткі й зборы, якія бяруць з гараджан і прыежджых сталічныя ўлады, пералічваць тут ня будзем — гэта асобная тэма. Але ж якасьць дарог нават у самым цэнтры гораду і пасьля цэлага году «навядзеньня парадку» пакідае жадаць лепшага. Гэта факт.

Былі й ёсьць, вядома, месцы, даглядаць якія нікога ня трэба ўгаворваць, — гэта могілкі. На Радаўніцу, як і на Дзяды, прыйдуць людзі да родных магіл, пафарбуюць агароджы там, дзе яны ёсьць, пачысьцяць надмагільныя пліты й помнікі, пазьбіраюць сьмецьце, пасадзяць кветкі, туйкі або іншыя расьліны. І ніхто ня будзе рабіць з гэтага подзьвігу, ганарыцца зробленым альбо даваць справаздачы начальству.

Адметна, што сёлета 9 траўня будзе акурат напярэдадні сьвята нябожчыкаў — Радаўніцы. І хацелі б таго «ідэолягі Перамогі» або не, але на наступны пасьля Дня Перамогі дзень будуць успамінаць ня толькі палеглых на вайне савецкіх воінаў і партызан... Памінаць будуць усіх. І ня толькі на Кургане славы ці ў Берасьцейскай крэпасьці, на ўпарадкаваньне якіх афіцыйна пойдуць грошы ад суботнікаў, але ж і ў Курапатах, і ў іншых мясьцінах, дзе пахаваныя ахвяры сталіншчыны.

На яе рахунку, між іншым, і сотні тысяч палеглых у першыя месяцы вайны салдат. Парэшткі многіх зь іх дагэтуль застаюцца неапазнанымі ў беларускіх балотах побач з парэшткамі нямецкіх жаўнераў.

Непарушны блёк камуністаў і беспартыйных — гэты адвечны савецкі міт хіба толькі за магільнай агароджай мае нейкі рэальны сэнс. І падзел на пераможцаў і пераможаных тут таксама быў і заўсёды будзе недарэчы. Няма магіл больш важных — тых афіцыйных мэмарыялаў, куды прыяжджае начальства, каб перад тэлекамэрамі ды фотаапаратамі ўскласьці кветкі да бронзавых помнікаў, ці тых, куды прыходзяць звычайныя людзі. Альбо не прыходзіць ужо ніхто, і яны зарастаюць травой. Усе магілы аднолькава важныя. Бо ўсе чакаюць сваёй чаргі — і начальнікі, і падначаленыя... У гэтай чарзе кожны рады саступіць сваё месца іншаму, ды не выпадае.

*Наша Ніва. 2005. 22 красавіка.*

## Апошні парад надыходзіць

Перамога над Скарынам,
альбо Дзякуй за мірнае жыцьцё!

Напярэдадні 9 траўня 2005-га беларусы даведаліся аб перайменаваньні дзьвюх галоўных вуліц сталіцы. Праспэкт Скарыны цяпер будзе праспэктам Незалежнасьці, праспэкт Машэрава — праспэктам Пераможцаў. Прынясеньне нацыянальнай гі-сторыі ў ахвяру сучаснай палітыцы сталася амаль рытуальным. Затушоўваньне імёнаў нядаўняга мінулага — характэрная прыкмета нашага часу. Імя Пятра Машэрава пакінута за меншай вулачкай. Выкарыстаньне тапанімікі ў мэтах зьвядзеньня рахункаў з палітычнымі апанэнтамі (у дадзеным выпадку — з дачкой былога кіраўніка БССР) сустракалася і ў ранейшай гісторыі...

У астатнім 9 траўня было амаль такім самым, як заўжды. Начныя рэпэтыцыі параду, сьвяточныя трыбуны — вялікія й малыя, з высокім і ня надта высокім начальствам на іх, дэфіляда тэхнікі, шэрагі вэтэранаў, сагнутых пад цяжарам узнагародаў, зухаватыя суворАўцы, начны салют і гуляньні. Але ў той самы час цяжка было пазбавіцца ўражаньня, што ўсё гэта назаўжды адыходзіць у нябыт. Так бы мовіць — апошні парад наступае...

**Абы не было вайны**

Расьцяжкі й транспаранты на вуліцах: «9 мая — 60 год Вялікай Перамогі!» — усе былі на аднолькавы лад, як быццам па зацьверджанай недзе невядомымі ваеннымі цэнзарамі кальцы. На гэтым тле віншаваньне ад фірмы Velcom магло падацца нават арыгінальным. На білбордзе зь лягатыпам гэтай кампаніі можна было прачытаць: «Дзякуй за 60 гадоў мірнага жыцьця!». А з плякату ўсьміхаюцца маладыя сэксапільныя дзяўчаты... Аднак жа і тут зусім відавочна скарыстаная на новы лад старая няхітрая формула: абы не было вайны.

Дык яе й не было. І не магло быць. Проста ня можа быць тае вайны, пра якую пісалі савецкія пісьменьнікі, якую малявалі савецкія мастакі, паказвалі ў савецкім кіно, пра якую распавядалі з экранаў тэлебачаньня савецкія вэтэраны. Тая праўда аб вайне, аб якой здолелі напісаць Адамовіч, Быкаў, пахаваная пад тонамі твораў баталістаў-марыністаў, сьмершаўцаў-гэбістаў, рознага рангу запісных партыйных кіраўнікоў. Некалькі адносна праўдзівых фільмаў і тэлеперадач сталіся толькі дадаткам, заўвагай на палях шматтомнай афіцыйна-патрыятычнай эпапэі «гісторыя Вялікай айчыннай».

Клімаўская карціна «Ідзі й глядзі» паводле Адамовіча, якая выйшла ў 1985-м, была прыхільна сустрэтая часткай тагачасных кінакрытыкаў і вельмі халодна — беларускімі кінематаграфістамі. А далей, як у вядомай п'есе, — цішыня. Адзін суцэльны бясконцы кінафотарадыётэлесэрыял пра гераічных воінаў і партызанаў.

60 — лічба магічная. Ва ўсходнім календары, як вядома, ёсьць 12-гадовы цыкль, дзе за кожным

годам замацаваная назва пэўнай міталягічнай жывёлы. Кожны знак мае пяць розных праяваў — паводле колеру й прыналежнасьці да розных відаў стыхіі. Пяць 12-гадовых пэрыядаў утвараюць поўны завершаны цыкль.

З гледзішча чалавечага веку, 60 гадоў — гэта той адрэзак часу, які чалавек здольны ўсьвядоміць як нешта суцэльнае і агляднае, тое, што можна супаставіць са сваім жыцьцём. Далей пачынаецца гісторыя. Альбо міталёгія... Гэта ўжо залежыць ад таго часу, у якім жыве чалавек. І ад ягоных уласных здольнасьцяў, зразумела. Напрыклад, ад уменьня й жаданьня думаць.

Ня толькі штатныя ідэолягі ды інжынэры чалавечых душаў канструявалі міт пра вайну. Самі яе ўдзельнікі-вэтэраны ахвотна прымалі ўдзел у стварэньні ідэалізаванага (паводле савецкіх узораў) аблічча вайны. Ім не навязвалі вобразаў герояў — яны самі хацелі сябе такімі бачыць. Дакладней, лічылі, што так трэба. І не памыляліся, бо гэтага вымагала ад іх дзяржава, заснаваная на мітах. Пры гэтым вэтэраны самі добра ведаюць цану сваім расказам «на тэлекамэру».

Гераіні кнігі Алексіевіч «У вайны не жаночае аблічча» распавядалі ёй пра сваё вайсковае жыцьцё так, як распавядалі б сваім сяброўкам. Але ўбачыўшы свае апавяданьні надрукаванымі, абурыліся і нават падалі на аўтарку ў суд. Вядома, аб вайне так пісаць няможна. Яны ж павінны быць гераінямі, прыкладам для нашчадкаў...

**Склероз як сымбаль**

Апатэозам такой манеры можна лічыць 10-сэрыйную стужку, паказаную на БТ адмыслова да сёлетняга юбілею.

Фільм распачынае закадравы аповед старога чалавека, які спрабуе ўспомніць нешта пра 22 чэрвеня 1941 году, але хутка пачынае плакаць, не разумеючы цалкам, пра што і да чаго ён гаворыць. Рэжысэр, які ў адмысловай тэлеперадачы назваў яго «новым словам у дакумэнтальным кіно», без усялякага сораму выстаўляе гэты маразматычны плач як свайго роду сьцяг, эмацыйны зачын... Амнэзія выдаецца за... праўду аб вайне. Вось ужо сапраўды сымбаль сучаснай кінадакумэнталістыкі!

Рэжысэру й заказчыкам фільму не прыходзіць да галавы, што выкарыстаньне сьлёз няшчаснага склеротыка дзеля ілюстрацыі «народнага подзьвігу» ў вайне выглядае амаральна — хоць бы ў дачыненьні да саміх вэтэранаў.

Зразумела, што міты паасобку не нараджаюцца. Часьцей за ўсё яны ствараюцца парамі. Так, побач зь мітам пра савецкага, чыстага, як крышталь, воіна або партызана створаны міт пра паліцая-калябаранта. А паколькі ў сучаснай Беларусі паліцаяў не павінна было застацца, бо тады, хоцькі-няхоцькі, губляецца вобраз беларусаў, якія «ўсе як адзін» сталі на абарону Радзімы, то ворагаў шукаюць у суседняй Польшчы ці краінах Балтыі. І знаходзяць, зразумела. У асобе былых жаўнераў Вафэн-СС, напрыклад. «Гэтыя фашысты», маўляў, шпацыруюць па вуліцах Рыгі ці Таліна, прыгнятаюць расейскае насельніцтва ды пагражаюць мірнаму стваральнаму жыцьцю новай Беларусі...

Пра тое, колькі засталося тых вэтэранаў, ці могуць яны камусьці чымсьці пагражаць, гаворкі няма. Гэта трэба глытаць з тэлеэкрану, таксама як і міт пра гераічны подзьвіг савецкага народу, без разважаньняў — рэфлекторна.

Прапагандысцкія міты ствараюцца ня дзеля таго, каб у іх верылі. Міты ствараюцца дзеля зручнасьці, каб кожны хутка мог вызначыцца на практыцы: свой — чужы. Савецкі (значыць, часьцей за ўсё, расейскі) — свой, беларускі нацыяналіст — чужы. Масква — надзея і апірышча. Захад — асяродак зла й распусты...

Наколькі даўгавечнымі застануцца міты, зьвязаныя з вайной? Ці доўга ўдасца іх яшчэ выкарыстоўваць кіроўнаму рэжыму? Каб адказаць на гэтае пытаньне, варта ўспомніць гісторыю іншага міту, які яшчэ нядаўна здаваўся такім самым вечным, як міт пра Вялікую Перамогу. 60-годзьдзе Вялікага Кастрычніка таксама адзначалася надзвычай пампэзна, у становішчы «патрыятычнага ўздыму ўсяго савецкага народу». Так пісалі газэты, але ніякага ўздыму ці хоць бы падабенства на энтузіязм у сапраўднасьці не назіралася. Бо не было ўжо амаль нікога з вэтэранаў Кастрычніцкага перавароту, як называлі яго самі бальшавікі.

**«Прыйдзе Вялікая кастрычніцкая рэвалюцыя!»**

Сярод агромністай колькасьці кніг і спэктакляў на тэму Кастрычніка не было ніводнага твору, які дажыў бы, застаўся цікавым да сёньня. Чапаеў зь Леніным разышліся на анэкдоты. Мюлер з Штырліцам чакалі свайго часу. Тады ў беларускім літаратурным асяродку была папулярнай пародыя на аднаго раманіста. Селяніна, героя ягонага раману, дзеяньне якога адбываецца пасьля Рэвалюцыі 1905 году, пакрыўдзіў нейкі пан. У адказ селянін пагражае крыўдзіцелю: «Ну, пачакай ужо — прыйдзе Вялікая кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя!..»

І менавіта тады нарадзіліся абрэвіятуры для азначэньня вэтэранаў: ВОСРы і ВОВы — «ветераны Великой октябрьской социалистической революции» і «ветераны Великой отечественной войны».

75-годзьдзя рэвалюцыі ніхто ўжо ўрачыста не сьвяткаваў — нават камуністы. Бо не было ўжо тае дзяржавы, пачатак якой паклалі ў 1917-м Ленін і кампанія.

**Вайна без канца**

Упартасьць, зь якой Крэмль адмаўляецца прызнаць акупацыю балтыйскіх краінаў у 1940-м, нагадвае ўпартасьць, зь якой расейскія думцы, а таксама кіраўніцтва Беларусі спрабавалі рэвізаваць Белавескія пагадненьні ды абвесьціць развал СССР незаконным. Зрэшты, пуцінскае кіраўніцтва не хавае намераў адрадзіць Савецкі Саюз у тым або іншым выглядзе, і ключавая роля ў гэтым «адраджэньні» адводзіцца Беларусі.

І ў Маскве, і ў Менску «новыя рэваншысты» ўпарта не жадаюць заўважаць таго, што пасьля заканчэньня Другой усясьветнай вайны, Ялты й Нюрнбэргу была яшчэ Трэцяя ўсясьветная вайна. Яна называлася «халоднай» толькі таму, што падчас яе ўжываць ядравую зброю ўрэшце не спатрэбілася. Савецкі Саюз пацярпеў у той вайне, дакладней — у гонцы ўзбраеньняў, поўную і канчатковую эканамічную паразу.

Захад, аддаючы сёньня даніну мінуламу, шануючы памяць пра мільёны ахвяраў, уганароўваючы сваіх вэтэранаў вайны, даўно заняты постындустрыяльнымі праблемамі сучаснасьці. Сучаснасьці, у якой няма больш процістаяньня дзьвюх супэрдзяржаваў. Новыя праблемы, што паўсталі

перад Эўропай, ня менш, а мо й больш складаныя, чым тыя, што трэба было вырашаць у XX ст. І вось гэтым, а ня тым, што нехта на Захадзе хоча прыменшыць значэньне вайны альбо ролю ў ёй Савецкага Саюзу, тлумачыцца той відавочны факт, што гадавіна перамогі над фашызмам ня ёсьць і ніколі ўжо ня будзе галоўнай падзеяй для Эўропы. Для эўрапейцаў гэта падзея гісторыі. Але не сучаснасьці.

А Менск і Масква ўсё яшчэ жывуць настальгіяй аб Перамозе. Бо акрамя гэтага міту больш ім пахваліцца перад сьветам няма чым.

Нехта сказаў, што генэралы заўсёды рыхтуюцца да мінулае вайны. Сёньняшнія беларускія й расейскія «генэралы» рыхтуюцца нават не да мінулай, а пазамінулай вайны!

Калі верыць зьвесткам інтэрнэту, нядаўна ў нетрах Міністэрства абароны Беларусі нарадзілася ідэя выкарыстоўваць у якасьці альтэрнатывы амэрыканскім самалётам-выведнікам АВАКС... дырыжаблі, якія могуць несьці дзяжурства ўздоўж мяжы на вышыні 3—4 тысячы мэтраў. Дырыжаблі можна вырабляць з танных матэрыялаў, і яны эканамічныя ў эксплюатацыі. Карацей кажучы — наперад і вышэй! А можа, гэта чарговы крок да стварэньня новай рэальнасьці? Накшталт той, што адлюстраваная ў папулярным фільме «Авіятар».

*Наша Ніва. 2005. 13 траўня.*

# Дагары нагамі, альбо Высакародны каўбой Джо

Плякат, які я бачыў на свае вочы амаль у самым цэнтры Менску. На агромністым рэклямным стэндзе — велізарны мэдаль з выяваю Сталіна й надпіс: «За адвагу». Кампазыцыя прысьвечаная тэме 60-годзьдзя «вызваленьня Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў». Мне падалося, што плякат ня толькі ўтрымлівае фальш (бо на мэдалі «За адвагу» няма партрэту правадыра). Гэткая «вонкавая агітацыя», на маю думку, зьневажае памяць мільёнаў ахвяраў вайны, якіх трэба аднесьці на сумленьне як Гітлера, гэтак і ягонага даваеннага хаўрусьніка-«архістраціга» Сталіна.

І вось, на адным з інтэрнэт-форумаў выпадкова патрапіў на вочы водгук на маю публікацыю. Нейкі малады чалавек — людзі старога веку наўрад ці бяруць удзел у «форумах» — з сарказмам гаворыць, што калі б нацыяналісты прыйшлі да ўлады, дык адразу б зьнесьлі помнік Перамогі. Маўляў, нічога сьвятога ў цяперашніх «нацыяналістаў» і «дэмакратаў» не засталося — нават Перамогу разам са Сталіным гатовыя перакрэсьліць. Мне падалося цікавым паспрабаваць зразумець лёгіку маладога пакаленьня — прынамсі, тае яе часткі, думкі якой выказвае невядомы мне ўдзельнік дыскусіі.

Мне здаецца, што менавіта на гэтае пакаленьне, якое ведае пра вайну хіба што зь фільмаў кшталту «Вызваленьня» і «17 імгненьняў вясны», падсьвядома разьлічваюць улады. Сапраўдных удзельнікаў вайны ўжо цераз дзесяць год амаль не застанецца. Зрэшты, нічога пра яе ня ведаюць, бадай, і тыя, хто сёньня вырашыў усталяваць у беларускай сталіцы стэнд з выявай Сталіна. Для іх гэта кшталту «каўбоя Мальбара» з рэклямы цыгарэтаў, гэткі модны брэнд нашага часу. Сталін — гэта таксама свайго роду каўбой, анкл Джо (як яго называлі на Захадзе) — рэспэктабэльны дзядзька з характэрным тварам: высакародная сівізна, ласкавая ўсьмешка хаваецца ў пажаўцелых ад тытуню вусах, хітра прымружаныя вочы, пранікнёны мудры позірк. Адным словам — правадыр. Амаль што як Садам Хусэйн. Ці Бэн Лядэн, які «паказаў гэтым амэрыкосам».

Дарэчы, я не ўвыдатняю. Адзін беларускі анархіст апантана даказваў мне, што Лукашэнка — хаўрусьнік левакоў і, увогуле, антыглябалісцкага руху, паколькі ён выступае супраць амэрыканскага імпэрыялізму. Трэба думаць, папярэднікамі ў гэтай барацьбе былі «тата Док», Пол Пот, а таксама былы імпэратар-людажэрца Бакаса, які быў вялікім сябрам Леаніда Брэжнева.

Але ж я вельмі далёка адышоў ад тэмы. У разважаньнях маладога чалавека на інтэрнэт-форуме мяне зацікавіла ня тое, што ён ставіць на адну дошку Перамогу і Сталіна, а што ён сьвядома аддзяляе слова «нацыяналізм» (незалежнасьць Беларусі) ад слова «Перамога». І робіць гэта цалкам слушна. Паколькі сталінская Перамога — а менавіта так і толькі так дзесяцігодзьдзямі падавалася яна ў падручніках і мастацкіх творах — ніколі

не атаясамлівалася зь незалежнасьцю й свабодай. Усьлед за вызваленьнем ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Беларусь вярнуўся сталінскі прыгнёт. Адно рабства зьмянілася іншым. Дзень незалежнасьці не выпадкова быў перанесены шляхам маніпуляцыяў на 3-га ліпеня. Абсалютна дакладна, як у Орўэла: свабода — гэта рабства. Прыгнёт — гэта Вызваленьне. Незалежнасьць у складзе саюзнай дзяржавы.

Сымбалем такой «незалежнасьці» і такога «вызваленьня» можа быць толькі Сталін. І Лукашэнка. Але партрэты Лукашэнкі памерам з каўбоя «Мальбара» пакуль яшчэ публічна не выстаўляюцца — мабыць, час яшчэ не прысьпеў. Замест яго выстаўляецца партрэт Сталіна. Гэты партрэт замяняе адразу ўсе партрэты членаў палітбюро ЦК КПСС, а таксама бюро ЦК КПБ, якія вывешваліся падчас дзяржаўных савецкіх сьвятаў. Гэта свайго роду пароль, сыгнал усім «братам па крыві»: «Сталінград» ужо быў, цяпер толькі наперад — на Захад. Вораг будзе разьбіты, перамога будзе за намі... І ўсялякая іншая ідэалягічная лухта. Можна верыць у яе, можна ня верыць.

**Дагары нагамі...**

Галоўнае ведаць — іх час яшчэ ня скончыўся. Як казаў герой адной старой пародыі, у якога сын запытаўся, ці быў 37-мы год, — не, ня быў, сынок, але будзе...

Зразумела, усе сымбалі шматзначныя. У свастыцы можна бачыць старажытны індыйскі сымбаль і толькі. І не ўспамінаць, што пад гэтым знакам нацысты зьнішчалі мільёны габрэяў, палілі беларускія вёскі разам з жыхарамі. І наадварот, можна, як гэта зрабіла галоўная прэзыдэнцкая

газэта, напісаць, што народ нібыта не прыняў гербу «Пагоня» і бел-чырвона-белага сьцягу, таму што іх, маўляў, выкарыстоўвалі калябаранты. Як быццам і не было да гэтага многіх вякоў гісторыі Беларусі. Можна ў Сталіну бачыць, да прыкладу, героя анэкдотаў. Магчыма, для многіх маладых людзей сёньня і Чэ Гевара, і Фідэль Кастра, і Сталін — усяго толькі сымбалі эстэтыкі мінулае эпохі, якая можа падацца нават рамантычнай. Магчыма. Але са спадчынай Чэ Гевары й зь Фідэлем хай разьбіраюцца самі жыхары выспы Свабоды. А вось спадчына Сталіна зусім побач — у Курапатах, на вуліцах Менску, у падручніках зь дзяржаўнай ідэалёгіі. Сапраўды, ідэі Сталіна-Леніна жывуць і перамагаюць.

Абэліску Перамогі, прынамсі, сёньня нічога не пагражае. Ля «вечнага агню» стаіць ганаровая варта актывістаў — БРСМаўцаў. І Курапаты мясцовыя ўлады, нарэшце, зь неахвотай, але ўсё ж дазволілі патруляваць маладым валянтэрам. Каму й чаму пакланяцца, якому Богу маліцца — гэта праблема выбару, якую кожнае пакаленьне вырашае па-свойму. Тыя, хто ляжаць у брацкіх магілах, тут не дапамогуць. Як любілі паўтараць прапагандысты 1970-х, «гэта трэба ня мёртвым, гэта трэба жывым».

Дарэчы, гэта толькі ў «краіне Мальбара» каўбоі выглядаюць здаровымі й мажнымі хлопцамі. У сапраўднасьці, паленьне небясьпечнае для вашага здароўя.

*Наша Ніва. 2004. 21 траўня.*

## Горад-герой майго дзяцінства

Настальгічныя нататкі з нагоды
вайсковага параду ў Менску

Адмоўныя пачуцьці амаль ніколі не бываюць канструктыўнымі. Між тым, пачатковым штуршком да напісаньня гэтых нататак сталіся развагі аднаго вядомага журналіста. Зь ягоных развагаў вынікала, што Менск калі й быў местам, дык хіба толькі за часам Усяслава Чарадзея. А калі ўлічыць міталягічнасьць гэтага пэрсанажу — дык значыць, ніколі. Ну, а калі былі ўсё-ткі нейкія гарадзкія адметнасьці ў Менску, дык і яны зьніклі ў 1970—1980-я гады мінулага стагодзьдзя, калі сталіцай БССР канчаткова апанавалі выхадцы з разбуранай калгаснай сыстэмай й дабітай наступствамі Чарнобылю беларускай вёскі. У якасьці эмацыйнага пацьверджаньня свайго тэзісу журналіст прапанаваў, так бы мовіць, прайсьціся па спальных раёнах сталіцы — пажадана дзесьці ўвечары, паслухаць «размовы», што гучаць з расчыненых вокнаў і асабліва пад вокнамі, зазірнуць на кухні насельнікаў панэльных шматпавярховак ці ў які-небудзь тамтэйшы ўнівэрсам. І тады, маўляў, кожнаму стане ясна, што Менск ня ёсьць горадам і ня ёсьць вёскай, а ёсьць чымсьці маргінальным, небеларускім і далёкім ад цывілізацыі сонмішчам тубыльцаў.

Насамрэч, я мог бы дадаць да гэтай змрочнай карціны яшчэ колькі чорных фарбаў. Нават у цэнтры Менску, на пляцы Свабоды ля адноўленага будынку Ратушы, ці дзе-небудзь на праспэкце Скарыны, альбо ў мэтро не пакідае адчуваньне, што ты ня ў родным Менску, а ў якой-небудзь усясьветнай унівэрсальнай і безаблічнай вёсцы. Нават мой сын, мянчук, які ажаніўся зь менскай дзяўчынай ужо ў дваццаць першым стагодзьдзі, са зьдзіўленьнем кажа пра тое, што ў натоўпе ўсё меней надараецца ўбачыць знаёмыя твары. Ня твары знаёмцаў, а проста чалавечыя твары, на якіх можна было б хоць што-небудзь прачытаць, акрамя жаданьня паесьці, або задаволіць яшчэ якую фізыялягічную патрэбу.

Тут, праўда, трэба ўлічыць адну рэч. Усе самыя блізкія й родныя, прыязныя твары, твары сяброў і сяброўак мы чамусьці бачым, у асноўным, у дзяцінстве, і зь цягам часу яны маюць тэндэнцыю зьнікаць. Ёсьць і другая рэч. Напрыклад, Чэхія ёсьць краінай, якая і ў складзе Эўразьвязу не згубіла пакуль уласнага выразу нацыянальнага аблічча. Але чэская сталіца зь яе архітэктурнымі цудамі куды цікавейшая сама па сабе, чымся яе насельнікі (ня кажучы ўжо пра турыстаў). Калі ласка, праедзьцеся некалькі разоў на мэтро ці ў трамваі па Празе, і вы адчуеце, што пасажыры вакол вас у сваёй масе мала чым адрозьніваюцца ад тых, што вы бачыце штодня на станцыі мэтро «Кастрычніцкая». Больш за тое, прыкладна такое самае адкрыцьцё вас чакае ў венскім ці парыскім мэтро, з адным адрозьненьнем — там пераважаюць афрыканскія ды азіяцкія твары. Прапаную яшчэ адзін экспэрымэнт — даедзьце ў праскім мэтро да станцыі «Апатаў» і прагуляйцеся па там-

тэйшым мікрараёне. Вы ня толькі пачуеце наўкол знаёмую зь дзяцінства вялікую й магутную мову, але зможаце прачытаць лякранічныя надпісы на ёй на сьценах «панэлякаў» (так называюць у Празе шматпавярховыя дамы, пабудаваныя пры сацыялізьме).

Я тут не пра глябалізацыю кажу. Я проста хачу сказаць, што ранейшыя схемы наконт маргіналізацыі беларускага грамадзтва за кошт масавага перасяленьня вясковага насельніцтва ў гарады сёньня ўжо ня дзейнічаюць. Так, гэтыя схемы даўно разглядаюцца як аксіёмы. Але таму, з майго гледзішча, і ня дзейнічаюць. Бо што ёсьць «маргіналізацыя» й хто такія «маргіналы»? Запушчанае ў масавую сьвядомасьць публіцыстамі новай (на той час) савецкай хвалі ў канцы 1970-х гадоў, слова «маргінал» сталася чарговым ярлыком — як «калгасьнік» на побытавым узроўні ці «нацыяналіст» на ідэалягічным.

Мушу прызнацца, мой дзед быў маргіналам. Ягоная родная вёска была амаль спрэс раскулачаная, а яго самога ўратаваў, верагодна, прызыў у Чырвоную Армію. Пасьля дэмабілізацыі ён забраў сваю жонку (маю бабулю) зь вёскі ў Менск, дзе працаваў шмат гадоў на заводзе ланцугоў. Адразу пасьля вызваленьня Менску быў мабілізаваны на службу ў ваеннае будаўнічае ведамства. У пасьляваенны галодны й жабрацкі час ён вырашыў будаваць уласны дом. Зруб пабудавалі нямецкія ваеннапалонныя, якія тады часта выкарыстоўваліся ў якасьці бясплатнай рабсілы. А ўсё астатняе дзед зрабіў практычна сваімі рукамі й за свае грошы. У доме на вуліцы Старавіленскай вырасьлі ягоныя дзеці, гадаваўся і ўнук — аўтар гэтых радкоў. Дагэтуль памятаю смак сочыва з

«райскіх» яблыкаў зь дзедаўскага саду ды пах яблычнага соку ў вялізных бутлях на вэрандзе, зь якога рабілася наліўка. А яшчэ там стаяла малако ў бідоне, якое зімой зьверху замярзала, і так прыемна было (хоць і сувора забаронена бацькамі) набраць яго ў конаўку разам з аскабалкамі лёду й піць гэты сьцюдзёны напой маленькімі глыткамі, пакуль не заныюць зубы. Памятаю таксама вялізныя яркія вяргіні ў гародчыку, якія вельмі любіла бабуля, і грушы, па якіх вучыўся лазіць. (Быў і ёсьць яшчэ іншы дом — у Сельгаспасёлку, які пабудаваў мой дзед па бацькавай лініі.)

Вуліца Старавіленская, на якой цяпер месьцiцца пасольства ЗША, тады здавалася бясконцай. Яна была незаасфальтаваная і ў дождж амаль непраезная. Але самае страшнае было ісьці ёю паўз вароты ў нейкае будаўнічае прадпрыемства. Час ад часу адтуль выяжджаў нейкі мэханізм на колах — ці то бульдозэр, ці то міні-экскаватар. Нязграбны, зь непрапарцыйна вялізнымі фарамі й выскаленым тупым радыятарам наперадзе, ён мне нагадваў нейкага зьвераватага яшчара, і адно ягонае зьяўленьне, нават на адлегласьці, выклікала ў мяне ступар і ледзьве не страту прытомнасьці. Такім было маё першае знаёмства з мэханістычнай гарадзкой цывілізацыяй. Але яшчэ больш страшнай была сустрэча з каровай у Волкавічах — у вёсцы пад Менскам, дзе цяпер вадасховішча. Буйная рагатая жывёліна, якая спачатку, як мне здавалася, мірна пасьвілася ля дарогі, раптам кінулася ў мой бок. Хутчэй за ўсё, карова не зьбіралася бадацца, проста мне так падалося. Але спалох быў моцны, і мяне нават адпойвалі крынічнай вадой (як выявілася, цудоўны сродак ад стрэсу). Так у дзяцінстве я апынуўся ў сваіх нясьпелых

пачуцьцях паміж незразумелай, поўнай таямнічай сілы вёскай і яшчэ больш варожым горадам.

Гадоў дзесяць таму, увесну, патрапіўшы на Старавіленскую, дзе ня быў да гэтага, здаецца, паўжыцьця, я ўбачыў ля будынку нейкага інстытуту грушу, па якой лазіў у дзяцінстве. Гэта было адзінае дрэва, што ацалела з усяго дзедаўскага саду. Уся перакручаная, у наростах, старая груша, тым ня менш, цьвіла, нібы перадаючы прывітаньне з майго дзяцінства. Цяпер ужо няма тае грушы. А мабыць, няма нават інстытуту разам з будынкам, які вырас на месцы прыватнага сэктару. Усё новае, як правіла, недаўгавечнае. Але ж і настальгіі па былым няма. Усё, што было, стала як бы частка цябе. І нават калі не засталося ўспаміну, сам дух іх выпарыўся, выветрыўся ў прасторы, усё адно ён паслужыў некалі будаўнічым матэрыялам для твайго росту, сталеньня й станаўленьня як асобы. Так і з гарадамі.

Кажуць, ад старажытнага Менску нічога не засталося, акрамя некалькіх будынкаў ды яшчэ чыгунных кратаў дзе-нідзе на бальконах на вуліцы Карла Маркса. Але ж і сталінская архітэктура, увасобленая ў Палацы прафсаюзаў, напрыклад, хутка стане рарытэтам, гістарычнай каштоўнасьцю, кшталту помнікаў «каляніяльнай архітэктуры» дзе-небудзь у Амэрыцы. Галоўнае ня ў гэтым. Парыж зь ягоным Пантэонам і Эйфэлевай вежай знакаміты ня столькі дзякуючы гэтым архітэктурным збудаваньням самім па сабе, а тым, ХТО ляжыць у Пантэоне. Ня толькі сам Эйфэль за сваёй ідэяй важны нам, але й спрэчка вакол вежы з удзелам Мапасана, Заля ды іншых знакамітых людзей, якія выступалі супраць узьвядзеньня гэтай махіны ў цэнтры Парыжу.

Калі мы гаворым пра сёньняшнія Верхні Горад і Нямігу ці зруйнаваны гатэль «Эўропа», які зьбіраюцца цяпер аднаўляць, дык мусім успомніць Пазьняка, і «Талаку», і Купалу зь ягонай «Паўлінкай». І тое, што ў Менску, у будынку цяперашняга купалаўскага тэатру, была абвешчаная БНР. А Дом ураду адметны ня столькі тым, што ён пабудаваны ў стылі канструктывізму, колькі тым, што ў Авальнай залі гэтага гмаху была абвешчаная Рэспубліка Беларусь.

Тыя, хто сталі адэптамі Адраджэньня ў 1980-я, вучыліся ў менскіх школах 1970-х, гадаваліся на вуліцах Старажоўкі й Грушаўкі, Сельгаспасёлку і ў Зялёным Лузе, у Заводзкім раёне, «на Карла» і «на Розачцы», у Пушкінскім пасёлку. Сьпіс можна працягваць. Я не кажу пра архітэктурныя вартасьці пасьляваеннага Менску ці іх адсутнасьць. Я маю на ўвазе інтэлектуальны й маральны здабытак.

Я не кажу пра антыгітлераўскі супраціў. Супраціву такога маштабу не было ў гісторыі ніводнага эўрапейскага гораду, за выключэньнем хіба паўстаньня ў Варшаўскім гета ды самога Варшаўскага паўстаньня. Але ў сквэры ў цэнтры Менску, дзе былі павешаныя Ісай Казінец і яшчэ некалькі падпольшчыкаў, няма помніку пакараным. Ён і не патрэбны ўладам. Калі цяперашнія ўлады сьвяткуюць Дзень вызваленьня Беларусі, акцэнт робіцца не на слове «вызваленьне», а на тым, што Беларусь нехта вызваляў, едучы на танках пад чырвонымі сьцягамі.

А тым, для каго Менск быў і застаўся родным горадам, не патрэбныя пампэзныя сьвяткаваньні. 60-годзьдзе вызваленьня Беларусі насамрэч ёсьць проста другім найменьнем іншага дзяржаўнага

сьвята: 10-годзьдзя перабываньня ва ўладзе першай асобы. І ў тым, што па Менску, як і 60 гадоў таму, зноў ішлі танкі, а над горадам ляцелі бамбардавальнікі, ёсьць, калі падумаць, сымбалічны сэнс. Жаданьне прадэманстраваць вайсковую тэхніку выдае таемнае незадаволенае жаданьне ўладара скарыць сталіцу Беларусі, прадэманстраваць гораду й сьвету сваю моц. Горад гэты як быў, гэтак і застаўся для яго чужым, прынамсі, абыякавым да праяваў маніі велічы. А якім ён будзе для нас і ці будзе ён калісьці наш — гэта ўжо зусім іншая гісторыя.

*Наша Ніва. 2004. 6 жніўня.*

# Гэтае забытае слова «салідарнасьць»

«Водка шесть и водка восемь –
Все равно мы пить не бросим!
Ну, а если будет больше,
Мы устроим то, что в Польше!»

Гэты немудрагелісты вершык нарадзіўся 25 гадоў таму. Для сёньняшніх маладых людзей ён уяўляе сабой суцэльную шараду. Для тых, хто ня жыў у той час, трэба тлумачыць, што ў першым радку згадваюцца цэны на гарэлку. Шэсьць, а тым больш восем савецкіх рублёў за бутэльку пры тагачасных мізэрных зарплатах былі немалымі грашыма. У 1980-м цэны на ўлюбёны напой працоўных у мэтах «павышэньня дабрабыту савецкага народу» (як пісалася ў пастановах партыі і ўраду) павышаліся двойчы, што выклікала страшэнную нездаволенасьць масаў. Ну, а што было тады ў Польшчы й чым пагражалі савецкія грамадзяне савецкай уладзе — таксама трэба тлумачыць.

Адбылася тады абсалютна нечуваная для эпохі разьвітога сацыялізму рэч.

**Кароткае замыканьне**

У ліпені 1980-га Польшчу скаланулі страйкі, якія ўспыхнулі ў Гданьску, Шчэціне, Варшаве, а

потым пашырыліся на ўсю краіну. Паводле паліт-эканоміі сацыялізму, такога быць не магло — эксплюататацыя працоўных адбываецца толькі ў капкраінах, а пры сацыялізьме прадпрыемствы належаць працоўным. Рабочыя Гданьскай вэрфі ці варшаўскага трактарнага заводу «Урсус» палітэканомію ведалі слаба. І калі ўрад рэзка падняў цэны на мяса й мясныя прадукты, пакінуўшы ранейшыя заробкі, рабочыя спынілі працу. Савецкая прапаганда была ў шоку. Перад гэтым, у 1970-я, прыклад братняй Польшчы пад кіраўніцтвам першага сакратара ПАРП Э. Герака падаваўся як варты пераймањня ў пляне росту дабрабыту. Польшчу тады называлі «самым свабодным баракам у сацыялістычным лягеры».

Савецкае кіраўніцтва раздражняла, што лідэрам прафсаюзнага руху стаў звычайны электрык, бацька сямейства, шчыры каталік Лех Валэнса. Як потым пра яго скажуць — электрык, які зрабіў «кароткае замыканьне ў камуністычнай сыстэме».

**«Трыбуна люду» як носьбіт праўды**

Нават у савецкай таталітарнай сыстэме зь яе татальнай цэнзурай існавалі своеасаблівыя дзіркі. Так, у Менску ў шапіках «Саюздруку» ў 1980-м можна было свабодна купіць за капейкі газэту польскіх камуністаў «Трыбуна люду». У 1970-я яна мала чым розьнілася ад савецкай «Праўды». Таму ніхто з савецкага начальства не чакаў ад камуністычнага выданьня таго, што яно ўтварыла. Па-першае, газэта інфармавала чытачоў пра страйкі. Потым, калі ўлады вымушаны былі сесьці за стол перамоў з кіраўніцтвам незалежнага прафсаюзу «Салідарнасьць», газэта ня проста пісала пра сам факт перамоў, але вымушана была вык-

ладаць меркаваньне ня толькі ўрадавага боку, але й дзеячаў апазыцыі, хоць і не пагаджалася зь ім.

Нарэшце ў верасьні 1980-га «Трыбуна люду» апублікавала тэкст гістарычнага пагадненьня ў Ястшэмбе, у якім прызнавалася права незалежнага апазыцыйнага прафсаюзу на сваё існаваньне ды абарону правоў працоўных.

У той час мне давялося працаваць на БТ, дзе кожны тыдзень на занятках палітынфармацыі лектары апавядалі пра падступныя пляны імпэрыялістаў у дачыненьні да Польшчы ды прадажную польскую апазыцыю.

На занятկі я звычайна прыносіў з сабой сьвежую «Трыбуну» й чытаў пра апошнія польскія падзеі. Часам да мяне далучаліся яшчэ некалькі калегаў — з тых, што ведалі польскую мову, астатнія прасілі пераказаць, што пішуць. Старэйшыя касавурыліся, але заўваг ніколі не рабілі.

**Каб Міхнік чуў**

А пра гістарычны пленум ЦК ПАРП, на якім быў зьняты з пасады Герак, а на яго месца пастаўлены Станіслаў Каня, я даведаўся ў Горадні, з экстраннага выпуску навін польскага тэлебачаньня.

Ня стану перабольшваць і казаць, што той пленум, як і ўвогуле падзеі ў тагачаснай Польшчы, выклікалі вялікую цікавасьць у Беларусі. Нават тыя, у каго была магчымасьць глядзець польскае тэлебачаньне, цікавіліся ня столькі страйкамі, колькі забаўляльнымі перадачамі — мульцікамі, сэрыяламі, эстрадай. У застольных жа размовах калі й гаварылі пра польскія падзеі, дык часьцей за ўсё зь нейкім раздражненьнем, нават злосьцю — ат, тыя палякі, халера іх бяры! Чаго ім бракавала?!

Пасьля «Трыбуна люду» зьнікла з шапікаў. Усю інфармацыю, асабліва пасьля ўвядзеньня вайсковага становішча ў Польшчы ў сьнежні 1981-га, даводзілася атрымліваць з замежных радыёгаласоў. Гаварыць жа шчыра на польскія тэмы стала проста небясьпечна.

Між іншым, тады здарыўся эпізод, які асабліва выразна паказаў розьніцу паміж савецкім грамадзтвам і польскім. Адзін з тагачасных лідэраў КОС—КОР (падпольнай арганізацыі, што спрычынілася да стварэньня «Салідарнасьці»), цяперашні галоўны рэдактар «Газэты выборчай» Адам Міхнік, быў адпраўлены ў варшаўскую турму. Дык вось, жыхары навакольных дамоў штовечар, калі распачыналася трансьляцыя «Вольнай Эўропы», уключалі свае радыёпрыймачы на поўную магутнасьць, каб вядомы на ўсю краіну вязень змог пачуць апошнія навіны.

**Фэномэн «Салідарнасьці»**

«Салідарнасьць» працягвала дзейнічаць у падпольлі. Выстаяўшы ў самы цяжкі час, прымусіўшы камуністычныя ўлады сесьці за «круглы стол» перамоў з апазыцыяй, якія скончыліся поўнай перамогай на першых дэмакратычных выбарах, «Салідарнасьць» пачала хутка траціць свае пазыцыі ў свабодным грамадзтве. Паступова яна саступіла на выбарах — і прэзыдэнцкіх, і парлямэнцкіх — левым партыям, а потым і ўвогуле сышла з агульнанацыянальнай арэны як самастойная палітычная сіла. Прафсаюзны рух зрабіў сваю справу — гэты рух павінен быў сысьці.

Аднак хоць з моманту ўтварэньня «Салідарнасьці» мінула ўжо чвэрць стагодзьдзя, ейны фэномэн яшчэ не разгаданы цалкам гісторыкамі. За-

стаецца без адказу галоўнае пытаньне — ці была «Салідарнасьць» чыста нацыянальнай зьявай, абумоўленай польскай гісторыяй, традыцыямі, мэнтальнасьцю? Ці яна была заслугай прыўнесеных з-за мяжы паліттэхналёгій і сталася, такім чынам, далёкім папярэднікам «каляровых рэвалюцый» XXI ст.? Ні для кога не сакрэт, што на падтрымку незалежнага прафсаюзнага руху ў Польшчы вылучаліся немалыя грошы заходнімі дэмакратыямі. Але наколькі гэтая дапамога была вызначальнай для перамогі дэмакратыі ў самой краіне?

**Шляхам вызваленьня**

Наколькі можна меркаваць, падзеі 1980-х у краінах усходняга блёку адбыліся ня ў выніку экспарту рэвалюцыі. «Аксамітная рэвалюцыя» ў Чэхіі адбылася не таму, што ў Польшчы перамагла «Салідарнасьць». Вугоршчына, Усходняя Нямеччына, Баўгарыя, а потым краіны Балтыі ішлі кожная сваім шляхам да вызваленьня (выключэньнем стаў хіба падрыхтаваны спэцслужбамі пераварот у Румыніі). Хоць прыклад папярэднікаў, а таксама дапамога заходніх дэмакратый, безумоўна, мелі вялікае значэньне для народаў гэтых краін.

Варта нагадаць, што лідэры «Салідарнасьці» не аднойчы наведвалі Беларусь у 1990-я, сустракаліся з актывістамі незалежных беларускіх прафсаюзаў, нават зьвярталіся непасрэдна да менскіх працоўных на мітынгах. Аднойчы па абвінавачаньні ў агітацыі супраць уладаў быў высланы зь Беларусі лідэр «Салідарнасьці», наступнік Леха Валэнсы на гэтай пасадзе Мар'ян Кшаклеўскі.

І што ж? Дзесяць гадоў таму, 1 верасьня (яшчэ адна круглая дата!), распачаўся страйк менскіх мэтрапалітэнаўцаў. Работнікі іншых галін страйку не

падтрымалі. Страйкоўцы засталіся сам-насам з уладамі. Арганізатары былі звольненыя, пачаліся рэпрэсіі супраць прафсаюзных актывістаў, незалежных прафсаюзаў, дэмакратычных грамадзкіх арганізацый.

Акцыі салідарнасьці са сваякамі зьніклых палітыкаў зьбіраюць усё менш людзей. Пятая гадавіна зьнікненьня журналіста Зьмітра Завадзкага азначылася яшчэ адным агідным фактам. Падчас акцыі «Хочам ведаць праўду» на Кастрычніцкай плошчы ў Менску амапавец ударыў кулаком у твар жонку Зьмітра Сьвятлану. Тэлекамэры паказалі гэты брутальны акт прадстаўніка ўлады на ўвесь сьвет. Беларуская грамадзкасьць праглынула й гэта. Якая тут можа быць гаворка пра салідарнасьць?

**Гісторыя — рэч жорсткая**

Сэрыя дэмакратычных рэвалюцый не закранула, дый не магла, відавочна, закрануць краіны былога СССР, за выключэньнем балтыйскіх. Сёньня абсалютна ясна, што распад Савецкага Саюзу і атрыманьне дзяржаўнага сувэрэнітэту саюзнымі рэспублікамі стварылі ўсяго толькі перадумову, магчымасьць дэмакратычнага выбару. Але магчымасьць зусім не азначае непазьбежнасьці. Беларускі народ, па сутнасьці, зрабіў свой выбар на выбарах (прабачце за таўталёгію) 1994-га году. Ці азначае гэта, што зробленую памылку — зрэшты, цалкам заканамерную для посттаталітарнай краіны — ніколі ня ўдасца выправіць?

Між іншым — ня дзеля суцяшэньня, а дзеля праўды, — 25 гадоў таму народ зусім іншай краіны таксама зрабіў свой выбар. Шляхам дэмакратычнай рэвалюцыі й свабодных выбараў да ўла-

ды ў Іране прыйшоў аяталаг Хамэйні. Краіна добраахвотна вярнулася ў сярэднявечча, да тэакратычнага праўленьня.

Так, гісторыя — рэч жорсткая. Яна ня ведае ўмоўнага ладу. Але ж і дэтэрмінізму гісторыя ўсё-такі не прызнае. Інакш у адных і тых жа ўмовах усе народы паводзілі б сябе абсалютна аднолькава. Але ж мы бачым, што ва Ўкраіне, напрыклад, дзе ўмовы ў цэлым былі падобныя да беларускіх ці, скажам, расейскіх, народ павёў сябе інакш. Гэта, зноў жа, не азначае, што ўкраінцы зрабілі адзіна правільны выбар, высунуўшы Юшчанку. Цалкам магчыма, што заўтра яны расчаруюцца ў сёньняшнім кіраўніцтве ды прагаласуюць за Януковіча. У гэтым сэнсе ўкраінскія выбаршчыкі нічым не адрозьніваюцца ад польскіх, вялікая частка якіх яшчэ зусім нядаўна гатовая была пайсьці за папулістам Лепэрам, ці якіх-небудзь іншых.

Але ж ёсьць адна прынцыповая рэч, якую сьвядома ці несьвядома ігнаруюць разважныя крытыкі «аранжавай рэвалюцыі» ва Ўкраіне або «ружовай рэвалюцыі» ў Грузіі. Чым новыя ўлады лепшыя ад старых? — пытаюцца яны. Хіба новыя гаспадары ня робяць памылак, не змагаюцца за хлебныя пасады, не падманваюць выбаршчыкаў? Падтэкст такіх пытаньняў зразумелы: навошта ўкраінцам было выходзіць на плошчы, калі вынікамі рэвалюцыі ўсё адно заўсёды карыстаюцца адзінкі? І ці варта беларусам сёньня пратэставаць, калі невядома, ці стане лепш у выніку зьменаў заўтра?

### Маральны выбар

Але хіба сам факт выхаду на Майдан, адчуваньне адказнасьці й адзінства з тымі, хто быў побач, само чаканьне перамен і вера ў іх магчы-

масьць — хай нават і памылковая — нічога ня вартыя? Спытайцеся аб гэтым ва ўдзельнікаў мінулагодніх восеньскіх падзей у Кіеве. Або ва ўдзельнікаў абароны літоўскага Сойму ў студзені 1991-га, сярод якіх былі й беларусы.

І вось тут мы вяртаемся да тэмы Салідарнасьці — і ў канкрэтна-гістарычным пляне, і ў зьместавым, філязофскім. У гістарычным пляне сябры толькі што створанай польскай «Салідарнасьці» ня ведалі й не маглі ведаць у 1980-м годзе пра тое, што будзе ў 1989-м. Яны маглі толькі аб гэтым марыць. Але яны добра ведалі, напрыклад, хто такі генэрал Ярузэльскі і чаго ад яго можна чакаць. Яны здагадваліся, што іх чакаюць турмы, і не памыліліся. Іншага ж з актывістаў «Салідарнасьці», як ксяндза Ежы Папялушку, прычакала сьмерць ад рук карнікаў.

У 1980-м «Салідарнасьць» яшчэ не была вядомай ва ўсім сьвеце маркай магутнай ды аўтарытэтнай арганізацыі, ад якой залежыць лёс нацыі. Гэта быў усяго толькі незалежны прафсаюз, не прызнаны ўладамі, а значыць, няздольны гарантаваць сваім сябрам ніякіх выгод у будучыні. «Салідарнасьць» была для палякаў пытаньнем маральнага выбару.

За чвэрць стагодзьдзя зьмянілася шмат паняткаў, на многія рэчы беларусы пачалі глядзець па-новаму. Але пытаньне выбару па-ранейшаму застаецца для іх актуальным.

*Наша Ніва. 2005. 15 ліпеня.*

# Чароўная кніга скаргаў, альбо Дзівоснае лета 2005-га

**Дапамажы сабе сам**

Пілуючы бервяно падчас пікету ля польскага консульства, сябры БРСМ дэманстравалі сымбалічную падтрымку палітыкі ўраду ў міжнацыянальных дачыненьнях. Але яны нават і падумаць не маглі, які глыбокі сэнс набудзе гэты іхны хэпэнінг у стылі рэтра праз пару тыдняў. Пасьля жнівеньскага ўрагану беларусы ў пацярпелых ад стыхіі раёнах дружна пілавалі паваленыя ветрам дрэвы, рубілі ды цягалі бярвеньне. Пагрозьлівыя словы, якія прагучалі на самым версе, — «глядзіце, каб не пакралі лес!» — сталі свайго роду сыгналам для насельніцтва. Усе на лесанарыхтоўкі!

Адзін з дачных пасёлкаў пад Менскам у выніку ўрагану цалкам адрэзала ад вонкавага сьвету — ні праехаць, ні прайсьці, ні сьвятла, ні тэлефоннай сувязі. На другі дзень падразьдзяленьні МНС прарэзалі з дапамогай тэхнікі праз павалены лес дарогу. А яшчэ празь дзень на ёй зьявілася аўтамашына Мінсувязі. Дачнікі падумалі: цягнуць тэлефонную сувязь. Але сувязісты проста скарысталі момант, каб запасьціся дровамі. Дзеля гэтага й была задзейнічана наяўная аўтатэхніка. Але жыхары лецішчаў, як і навакольных вёсак, на сувязістаў не крыўдавалі — яны першыя пачалі на-

рыхтоўваць сабе запасы паліва на зіму. Не было б шчасьця, ды няшчасьце дапамагло.

**Імем прэзыдэнта**

Гараджанам стыхія прынесла адны непрыемнасьці. Пацяклі дахі ў жылых дамох. Пацякла столь і ў знаёмых, у доме з новым капітальным рамонтам. У ЖЭС, куды патэлефанаваў гаспадар, адмаўляцца ад таго, што рамонт давядзецца рабіць за кошт камунальнікаў, ня сталі. Толькі трэба акт скласьці. Але прыслаць супрацоўніка, каб ацаніў нанесеную дажджом шкоду, адмовіліся. «Вы ня ведаеце, што кіраўнік дзяржавы загадаў нам ліквідаваць наступствы ўрагану да заканчэньня заўтрашняга дня? — пагрозьліва запытаўся дзяжурны. — У нас людзей не хапае! На наступным тыдні тэлефануйце». «А вы хіба ня чулі, што кіраўнік дзяржавы загадаў дайсьці да кожнага чалавека?!» — зьдзіўлена запытаўся адказны кватэраздымальнік. Суразмоўца на тым канцы дроту крыху сумеўся, а потым далікатна папрасіў пачакаць да панядзелка. З кіраўніком дзяржавы не паспрачаесься. Хоць ня ўсе вышэйшыя ўказаньні выконваюцца «своечасова ды ў поўным аб'ёме».

**Чароўны куфэрак**

Іншыя знаёмыя атрымалі дом у спадчыну. Пасьля судоў ды розных інстанцыяў справа трапіла ва ўправу геадэзіі. Усе патрэбныя дакумэнты былі падрыхтаваныя ў належныя тэрміны, засталося толькі адправіць поштай у гарвыканкам. Праходзіць месяц, другі, трэці. «Мо дакумэнты не ў парадку, мо подпісу якога не хапае?» — турбуецца знаёмы. «Усё ў парадку, усяго хапае, — супакойваюць у адказ ва ўстанове. — Чакайце».

Стаміўшыся чакаць, знаёмы у адчаі пайшоў ва ўстанову, дзе запатрабаваў кнігу скаргаў. «У нас яе няма», — кажа чыноўніца. «Як няма? Ёсьць жа ўказ!» — абураецца наведнік.

Кніга была, але начальнік загадаў нікому яе не даваць. Тут у галаву знаёмцу прыходзіць думка. «Сёньня будзе прэс-канфэрэнцыя вашага міністра, то я ў яго запытаюся, хто й чаму ў яго ведамстве выдае падобныя загады», — сказаў ён і выйшаў. Не пасьпеў з чацьвертага паверху спусьціцца на першы, як яго ўнізе чакала чыноўніца й ласкава прасіла вярнуцца, каб залатвіць справу.

Падобных гісторыяў безьліч. І кніга скаргаў фігуруе амаль у кожнай, але, хутчэй, яна зьяўляецца прадметам казачным, нібы чароўны куфэрак. Распавядаючы аб розных бюракратычных праблемах ці аб выпадках звычайнага хамства — у краме, у міліцыі, на дарозе, у міністэрстве, у ЖЭС, — суразмоўца амаль ніколі не абміне тэму гэтай кнігі.

Але калі пачынаеш высьвятляць, што далей, аказваецца, адзін тую кнігу і ў руках ніколі не трымаў, другі атрымаў, але ў апошні момант перадумаў пісаць скаргу ды напісаў... падзяку, трэці напісаў нешта й чакае вынікаў. Дарэчы, правяраць скаргі мусіць дзяржкантроль. А з КДК жарты, як вядома, кепскія.

**Таварыш скаржнік**

Калі існуе падвойная бухгальтэрыя, чаму б не завесьці дзьве-тры кнігі скаргаў на розныя выпадкі жыцьця? Не на гербавай паперы тыя кнігі друкуюцца. Тым больш, што ў наш час і кніга адрадзілася, і вера ў яе жыве. Культурны чалавек як бы й разумее, што насамрэч існуе толькі адна Кніга. Яна завецца Біблiяй. Нават калі гэты чалавек атэіст,

то і ён дапускае, што недзе ёсьць Кніга лёсаў, дзе запісаныя ўсе нашыя ўчынкі — благія й добрыя. Але ж расплата ці — наадварот — узнагарода за іх чакае ўжо ў іншым жыцьці. А чалавеку ж хочацца ўведаць вынік сваіх зямных клопатаў. І ўбачыць свайго ворага пакараным за дрэнныя ўчынкі. А жыцьцё кароткае. Вось і хочацца верыць, што адным росчыркам пяра можна вырашыць усе праблемы, якімі будзе займацца нехта найвышэйшы, строгі ды справядлівы. А галоўнае — ананімны. Бо немагчыма паверыць, што нейкі Іван Іванавіч альбо Пятро Валяр'янавіч на сваіх высокіх пасадах, пры сваім узроўні інтэлекту, манерах і пачварным выглядзе твару здольны дапамагчы чалавеку ў прынцыпе. А калі скаргай займаецца абстрактная дзяржава альбо нехта невядомы, усюдыісны ды ўсёмагутны, бесстароньні й бездакорны, як прыёмная камісія ва ўнівэрсытэце, дык тады справядлівасьць абавязкова павінна перамагчы. А скаржнік будзе сьціпла зьбіраць яе плады.

Ахвярай гэткага мэханізму справядлівасьці заўсёды будуць, канечне, ворагі й зласьліўцы, а звычайныя грамадзяне-скаржнікі — ніколі! Гэта й будзе ідэальная дзяржава, Горад-Сонца, выспа Ўтопія! Утопія, як вядома, была рэалізаваная на практыцы й звалася яна краінай Саветаў. (Гісторыкі Некрыч і Гельлер кнігу пра СССР так і назвалі — «Утопія ва ўладзе».) Мільёны савецкіх грамадзянаў рэгулярна пісалі адзін на аднаго скаргі, дакладней — даносы. Можа, больш правільна было б назваць кнігу скаргаў кнігай даносаў?

**Парадак у галовах**

Вядомы бюракратычны прынцып «дзеля таго каб скараціць, трэба павялічыць» ёсьць насамрэч

законам фізыкі: нішто зь нічога не зьяўляецца і нікуды бязь сьледу не зьнікае. Камуністычныя ідэі, нават самыя заманлівыя, таксама нікуды не зьнікаюць. Некалі Маскву абвесьцілі ўзорным камуністычным местам. Цяперашні Менск вырашыў ні ў чым не саступаць колішняй Маскве і стаць адным з найпрыгажэйшых — і найдаражэйшых — герадоў Эўропы. Праблема дэфіцыту харчу цяпер не стаіць — цэны ў менскіх крамах амаль ні ў чым не саступаюць маскоўскім. Што датычыць чысьціні на вуліцах беларускай сталіцы, дык бліжэй да ідэалаў Гораду-Сонца знаходзіцца хіба што Пхеньян. Праўда, згаданы вышэй ураган папсаваў-ткі карціну дабрабыту на вуліцах Менску. Але ж парадак быў наведзены сапраўды ўдарнымі тэмпамі, і толькі пянькі ў дварох цяпер нагадваюць пра навальніцу.

Навесьці парадак на вуліцах і ў дварох, асабліва калі ў гэтым зацікаўленыя самі жыхары, значна прасьцей, чым у галовах грамадзянаў. А галава сёлета нават у самага выпрабаванага менчука можа пайсьці кругам. Хоць і кажуць, што ад перамены назваў вуліц зьмест (інакш кажучы, іхны выгляд) не мяняецца, ад гэтага не лягчэй. Галоўны праспэкт сталіцы хоць і перастаў насіць імя Скарыны, але ж застаўся праспэктам, хоць і з назвай Незалежнасьці. А вось ці стала вуліца Варвашэні праспэктам пасьля перайменаваньня яе ў Машэрава?

Цікава, дарэчы, што ў Варвашэні — у адрозьненьне ад Машэрава — не знайшлося актыўных абаронцаў сярод жыхароў Менску. Барэльеф з выявай аднаго з былых савецкіх кіраўнікоў партызанскага руху Беларусі прыбралі з вуліцы ў цэнтры гораду ў іншае месца «бяз шуму й пылу».

На мапе Менску яшчэ застаюцца вуліцы Камуністычная, Інтэрнацыянальная, Калініна, Куйбышава, Ландэра, Мясьнікова, іншых дзеячаў, якія ў лепшым выпадку ня маюць ніякага дачыненьня да Беларусі, а ў горшым — спрычыніліся да рэпрэсіяў супраць беларусаў. Але гэтыя імёны мала што гавораць менчукам, і ўсе пераймenaваньні спатрэбіліся адно толькі дзеля самога працэсу перайменаваньня. Рух ёсьць усё, канчатковая мэта — нішто. Пры адсутнасьці зрухаў у грамадзкім жыцьці, калі самай высокай марай становіцца запіс у кнізе скаргаў, функцыю аздараўленьня грамадзкай атмасфэры часам бярэ на сябе прырода. Жнівеньская віхура ня толькі дазволіла частцы беларускага насельніцтва назапасіць дроваў, а камунальнікаў прымусіла наводзіць «парадак на зямлі». Яна таксама праветрыла мазгі некаторых грамадзянаў, разьвеяўшы непатрэбныя ілюзіі ды марныя спадзяваньні.

*Наша Ніва. 2005. 19 жніўня.*

# Іншым разам яны вяртаюцца

Герману Гёрынгу, чалавеку нумар два ў гітлераўскім Райху, які сярод іншых быў асуджаны трыбуналам у Нюрнбэргу да павешаньня і скончыў самагубствам у камэры, біёграфы прыпісваюць вясёлы нораў і пачуцьцё гумару. Вядома, напрыклад, што Гёрынгавым намесьнікам быў генэралфэльдмаршал люфтвафэ Эргард Мільх. Ягоная маці была габрэйкай, і таму фармальна Мільх ня мог займаць ніякіх пасад у нацысцкай Нямеччыне. Калі ж ворагі кіраўніка люфтвафэ сталі абвінавачваць Гёрынга ў тым, што той пакрывае габрэя, ён нібыта публічна заявіў: «У маім ведамстве я буду вырашаць, хто габрэй, а хто не!»

**Хто габрэй?**

Гэтая фраза набыла анэкдатычную вядомасьць. Але сэнс анэкдоту насамрэч ня ў тым, што Гёрынг дапамагаў сваім падначаленым, якія прыносілі карысьць справе, а ў тым, што кіраўнікі Райху сапраўды маглі вырашаць і вырашалі, каго лічыць габрэем, а каго — не. Вядома іншая фраза, якую прыпісваюць Гітлеру: «Калі б габрэяў не было, іх давялося б выдумаць». Сказанае не азначае, зразумела, што Гітлер і Гёрынг не былі антысэмітамі (хоць Гёрынг, магчыма, ня быў ідэйным антысэ-

мітам). Антысэмітызм быў падмуркам ідэалёгіі трэцяга Райху, ажыцьцяўленьне якой на практыцы азначала зьнішчэньне мільёнаў людзей. Мы памятаем, аднак, што, паводле расавай тэорыі гітлераўцаў, быў народ, які займаў яшчэ больш нізкае за габрэяў месца ў расавай герархіі, — цыганы. Крыху вышэй за габрэяў ставіліся нэгры й славяне (асобы славянскай нацыянальнасьці?). Такім чынам, практычныя немцы як бы пакідалі сабе «поле дзейнасьці» на той выпадак, калі б «габрэйскае пытаньне» было сапраўды «канчаткова вырашана» ў тым сэнсе, як гэта разумелі нацысты.

Але хіба толькі немцы вызначаліся падобнай прагматычнасьцю? Напрыклад, «савецкі інтэрнацыяналізм» пры Сталіну пасьля вайны мірна спалучаўся з барацьбой супраць «бязроднага касмапалітызму» — г. зн. дзяржаўным антысэмітызмам. Да вайны Сталін пасьлядоўна «прызначаў габрэямі» трацкістаў-зіноўеўцаў, беларускіх і ўкраінскіх сялян, а падчас і пасьля вайны ў ролі габрэяў-выгнаньнікаў па чарзе апынуліся немцы Паволжа, крымскія татары, калмыкі, чачэнцы ды іншыя народы і народнасьці. Потым знайшліся й лекары-забойцы з габрэйскімі прозьвішчамі. У той самы час Ільля Эрэнбург мог атрымаць Сталінскую прэмію, а акадэмік Мінц — загадваць марксісцка-ленінскай навукай. Сталін сам вызначаў, хто ёсьць хто.

Ня ён, зразумела, і ня немцы выдумалі антысэмітізм. Да пачатку мінулага стагодзьдзя габрэйскія пагромы рэгулярна адбываліся ў Расейскай імпэрыі па ўсёй так званай мяжы аселасьці. Палякі, вядома, таксама зрабілі свой «унёсак» у гісторыю перасьледу габрэяў. Апошняя хваля габрэйскай эміграцыі з Польшчы была інсьпірава-

ная кіраўніцтвам ПАРП і органамі дзяржбясьпекі ў 1968 г.

Ня так даўно польская грамадзкасьць успамінала трагедыю Ядвабнага — мястэчка, у зьнішчэньні габрэйскага насельніцтва якога падчас вайны ўдзельнічалі палякі. Сучаснае кіраўніцтва Польшчы знайшло ў сабе мужнасьць прызнаць і ўвекавечыць гэты факт, папрасіць дараваньня ў нашчадкаў ахвяраў.

**Чаравікам па трыбуне**

Як бы парадаксальна гэта ні гучала, самі палякі, у сваю чаргу, не аднойчы ператвараліся ў, так бы мовіць, «бязродных касмапалітаў» — у вачах расейцаў, прынамсі. Слова «пшэк» нярэдка гучала ў іхных вуснах амаль гэтак жа зьняважліва, як слова «жыд» (дарэчы, ні ў польскай, ні ў беларускай мове, у адрозьненьне ад расейскай, гэтае слова ніколі ня мела зьняважлівага сэнсу).

Не ў XIX ст. у царскай Расеі, не ў 20-я гады стагодзьдзя мінулага, калі Чырвоная Армія была ўшчэнт разьбітая пад Варшавай, але ўжо ў наш час па расейскім тэлебачаньні з вуснаў расейскіх інтэлектуалаў ізноў гучаць зьняважлівыя выказваньні накшталт таго, што дзяржаўнасьць Польшчы вымяраецца апошнімі шасьцюдзесяцьцю гадамі, у крайнім выпадку — васьмюдзесяцьцю... Разам з польскай дзяржаўнасьцю закрэсьліваецца, зразумела, і ўся гісторыя ВКЛ, якога нібыта і не было. Прэзыдэнт Расеі дэманстратыўна адмаўляецца сустракацца з сваім польскім калегам, дазваляе сабе кпіны ў ягоны бок. А кіраўнік суседняй дзяржавы, карыстаючыся слэнгам правадыра сацыялістычнай рэвалюцыі, які той ужываў у адносінах да свайго канкурэнта Лява Троц-

кага, называе Польшчу «палітычнай прастытуткай».

Гэтак некалі Мікіта Хрушчоў стукаў па трыбуне ААН сваім чаравікам, абяцаючы «закапаць» капіталістычны сьвет. Пры гэтым генсек лаяўся ды паграджаў прадстаўніку Гішпаніі, які не спадабаўся савецкаму кіраўніку. Праз яго Хрушчоў як бы апэляваў тады да ЗША ды астатніх заходніх дзяржаў. Кажуць, што трагедыя паўтараецца ў гісторыі ў выглядзе фарсу. А што калі паўтараецца фарс? Сьмяяцца ці плакаць? Калі не пускаюць у Эўропу, адмаўляюцца сустракацца на вышэйшым узроўні, не прызнаюць ня тое што за дэмакратычную — за цывілізаваную дзяржаву, значыць, трэба ўзьняць гістэрыку на самым высокім узроўні і тым самым прыцягнуць увагу да сябе і на Ўсходзе, і на Захадзе? Прымусіць лічыцца з сабой хоць бы такой цаной. Абсурд?

**Грошы ад польскага консула**

Абвінавачаньні прадстаўнікоў Саюзу палякаў у Беларусі, а таксама польскіх дыпляматаў і ўвогуле Польшчы як дзяржавы ў спробах дэстабілізацыі грамадзтва, расколу краіны, шпіянажы, правакацыях і г. д. сапраўды сёньня гучаць абсурдна.

У паэта Міколы Хведаровіча, якога ў 1937-м абвінавацілі ў шпіянажы на карысьць панскай Польшчы, сьледчы патрабаваў прызнацца ў злачынстве і расказаць, як яно адбывалася. Хведаровіч на допыце вырашыў «расказалоцца»: маўляў, ён сустракаўся з польскім консулам... у сквэрыку ў самым цэнтры Менску, на лавачцы, і той кожнага разу ўручаў яму пэўную суму злотых у абмен на сакрэтную інфармацыю. Паэту здавалася, што сьледчы толькі пасьмяецца з такіх паказаньняў.

Але той не зразумеў жарту, і Хведаровіч адседзеў у лягерах амаль 20 гадоў...

Калі прыблізна ў той самы час арыштавалі ксяндза касьцёлу на Залатой Горцы, па Менску папаўзьлі чуткі: ксёндз хаваў у касьцёле золата ды зброю, якія перапраўляліся праз падземны ход проста з польскага консульства. Тады ў гэта верылі. Сёньня беларускі абываталь таксама ахвотна верыць ва ўсё, што гавораць з экранаў тэлебачаньня пра палякаў. Тым, хто ўзгадаваны на расейскай мане, псэўдагісторыі й шавіністычнай папсе, прыемна, калі «гэтых палякаў» ставяць на месца. Тое, што Польшча больш як дзесяць апошніх гадоў давала магчымасьць тысячам беларускіх чаўнакоў зарабіць грошай на дробным гандлі, — ня важна. Важна, што ёсьць тыя, хто за ўсё адказвае, праз каго ўсё кепска. З каго можна спытаць за нявыкананыя абяцаньні. Вядома ж, не з кіраўніцтва Беларусі. Не, да польскіх пагромаў або закрыцьця касьцёлаў, дзякаваць Богу, яшчэ не заклікаюць, але глеба, без таго добра ўгноеная, узмоцнена паліваецца жыжай у дзяржаўных СМІ.

**«Прыйшоў час вайны»**

Адна зь дзяржаўных газэт, напрыклад, напісала, што польскі ўрад падрыхтаваў і зьдзейсьніў у Беларусі правакацыю накшталт Гляйвіцкага інцыдэнту, які выкарыстала Нямеччына для разьвязваньня Другой усясьветнай вайны. Газэта, праўда, забылася нагадаць чытачам, што адбылося ў Гляйвіцы на пачатку жніўня 1939 г. Гэта была апэрацыя нямецкіх спэцслужбаў, якія выкарысталі некалькіх крымінальнікаў для нападу на радыёстанцыю, што месьцілася на тагачаснай польска-нямецкай мяжы. Нападнікі былі апранутыя

ў польскую вайсковую форму. У этэры прагучаў заклік на польскай мове: «Грамадзяне Польшчы! Прыйшоў час вайны паміж Польшчай і Нямеччынай! Яднайцеся ды забівайце ўсіх немцаў!» Наступным днём Гітлер заявіў, што Польшча напала на нямецкую тэрыторыю і што Нямеччына знаходзіцца ў стане вайны з Польшчай.

Такім чынам, спроба Саюзу палякаў у Беларусі зьмяніць кіраўніцтва шляхам выбараў параўноўваецца з захопам спэцслужбамі радыёстанцыі! Асаблівую пікантнасьць параўнаньню надае той факт, што менавіта Польшча сталася першай ахвярай вайны і што менавіта на яе тэрыторыю ў верасьні 1939 г. увайшлі нямецкія войскі з Захаду і савецкія часьці з Усходу. У Берасьці за некалькі месяцаў да пачатку вайны паміж СССР і Нямеччынай адбыўся сумесны парад нямецкіх і савецкіх войскаў. Такая была лінія Сталіна...

Але вернемся ў нашы дні. Арышты некалькіх лідэраў СПБ, высылка польскіх дыпляматаў, дэпартацыя журналістаў, пікеты ля будынку СПБ у Горадні і ля амбасады Беларусі ў Варшаве, трэба разумець, таксама ёсьць суцэльнай правакацыяй з мэтай... пачаць вайну паміж Польшчай і Беларусяй? У магчымасьць такога варыянту ня вераць, мабыць, ня толькі ў Варшаве, але, відавочна, і ў Менску. У чым жа сэнс такога сцэнару, напампоўваньня антыпольскай гістэрыі?

**Сон Брэжнева**

На гэтае быццам бы рытарычнае пытаньне можна даць два адказы. Першы — гістэрыя патрэбная дзеля самой гістэрыі, бо атмасфэра страху стварае тую самую ілюзію стабільнасьці ў краіне. Гэта стабільнасьць, заснаваная на маўчаньні.

Другі адказ палягае ў тым, што афіцыйны Менск усяго толькі выконвае спэцзамову Масквы — выпрабоўвае ня толькі Варшаву, але і Эўразьвяз у цэлым на ўменьне «трымаць удар». Надзвычай рэзкая рэакцыя на зьбіцьцё дзяцей расейскіх дыпляматаў у Варшаве хуліганамі гаворыць аб магчымасьці скаардынаванай палітыкі.

Такую вэрсію вылучаюць цяпер большасьць польскіх мас-мэдыяў. Некаторыя зь іх робяць выснову, што ўдару ні Польшча, ні Захад ня вытрымалі, яны сагнуліся ў жаху ад нахабства з боку беларускага кіраўніцтва й паныла чакаюць цяпер наступных удараў. Іхны дэвіз — кепскі мір лепшы за добрую сварку. Аднак для такіх высноў усётакі, відаць, час яшчэ не насьпеў.

Урэшце, хто і што будзе рабіць там, за Бугам, і тут, у Беларусі, — не галоўнае.

Бо справа датычыць не палякаў. У ролі палякаў заўтра могуць апынуцца літоўцы, латышы, украінцы, чэхі. Справа датычыць не гісторыі. Узаемадачыненьні беларусаў і палякаў ніколі не былі, мякка кажучы, бясхмарнымі. Але ж і падымаліся на барацьбу з прыгнятальнікамі яны часьцей за ўсё разам.

Справа датычыць ня толькі нядаўняга мінулага. Хоць варта памятаць, што сярод тысяч ахвяр Катыні ёсьць, без сумневу, нараджэнцы Беларусі, а ў Курапатах ляжаць і палякі.

Справа датычыць нас саміх. Ці ёсьць мы ўжо сёньня кімсьці, а ня тым, што з нас хочуць зрабіць, — нейкім фарпостам Масквы на Захадзе, савецкім электаратам ці проста ўгнаеньнем на палях гісторыі? Сёньняшняя рэчаіснасьць не дае падстаў для аптымізму, але часам гісторыя падносіць неспадзяванкі. Хто б мог падумаць у 1980 г., што

ПНР хутка зьнікне, а сьледам зьнікне й камунізм?

Тады быў папулярны анэкдот. Брэжнеў бачыць жудасны сон. На Краснай плошчы сядзіць чэх, есьць кітайскімі палачкамі габрэйскую мацу й сьпявае «Ешчэ Польска не згінэла...». Іншым разам сны вяртаюцца.

*Наша Ніва. 2005. 12 жніўня.*

# Тры бакі аднаго мэдаля

1 верасьня адзначаецца гадавіна трагічных падзей у Бэслане. На гэты дзень таксама прыпадаюць 66-я ўгодкі пачатку Другой усясьветнай вайны. 2 верасьня — 60-я гадавіна яе заканчэньня. Ці ёсьць сувязь паміж гэтымі датамі? Прыхамаць чалавечага розуму дазваляе, у прынцыпе, зьвязаць паміж сабой якія хочаш падзеі ды эпохі. У гэтым выпадку даводзіцца згадваць вядомую ісьціну: на ўроках гісторыі ніхто ня вучыцца. Асабліва слушна гэта гучыць для тых краін, улады якіх ня толькі ня хочуць вучыцца ў гісторыі, але разглядаюць яе проста як дапаможнік у прапагандзе. Нейкія старонкі можна перапісаць на патрэбны ўладам капыл, нейкія — проста выкінуць...

**Злачынства й пакаяньне**

60-я ўгодкі заканчэньня Другой усясьветнай вайны, у адрозьненьне ад 60-годзьдзя Перамогі, у Беларусі наўрад ці будуць адзначацца. Гэта й зразумела. Інакш давялося б гаварыць і пра ролю антыгітлераўскай кааліцыі, і аб унёску ў перамогу над Нямеччынай ды Японіяй Злучаных Штатаў. Зразумела, гэтая роля па-рознаму ацэньваецца ў ЗША і ў тых краінах, што пацярпелі паразу ў вайне, а ў сьвядомасьці японцаў 1945-ты год аса-

цыюецца перш за ўсё з бамбаваньнем Хірасімы й Нагасакі. Тым ня менш, японцы памятаюць ня толькі пра гэта, стараючыся засвоіць урокі мінулага. Так, прэм'ер-міністар Каідзумі нядаўна выказаў ад імя свайго народу шкадаваньне ды прынёс выбачэньні ўсім народам Азіі за тыя пакуты, што прынесла ім японская акупацыя.

Нямецкі народ, які таксама заплаціў страшную цану за палітыку Гітлера, у асобе найлепшых прадстаўнікоў інтэлігенцыі, палітыкаў і проста сумленных людзей не аднойчы пакаяўся за ваенныя злачынствы мінулага. І ня проста пакаяўся. Нямеччына выплаціла кампэнсацыі нашчадкам ахвяраў галакосту, былым вязьням лягераў, цягам некалькіх гадоў была сярод першых у розных дабрачынных ініцыятывах у дачыненьні да краін былога СССР, у тым ліку Беларусі. З свайго боку, праз 60 гадоў пасьля вайны немцы маюць права разьлічваць на гуманнае стаўленьне да загінулых салдат вэрмахту. Парэшткі многіх тысяч палеглых у Беларусі салдат усё яшчэ чакаюць свайго пахаваньня на прыстойных могілках. Усім вядома выказваньне аб тым, што вайна можа лічыцца завершанай толькі тады, калі пахаваны апошні з загіблых на ёй салдатаў.

**Паліткарэктнасьць па-нямецку**

Тым больш недарэчнымі, невытлумачальнымі й недапушчальнымі падаюцца выпадкі, калі афіцыйныя прадстаўнікі нямецкага народу пачынаюць гаварыць з прадстаўнікамі беларускага народу зьняважлівай мовай — так, як гавораць іншым разам зь недарослымі дзецьмі. Назваць заяву пасольства ФРН «у сувязі з паступаючымі на імя Пасла Нямеччыны лістамі» хоць бы паліткарэктнай

не выпадае. Цяжка сказаць, ці зьяўляецца заява плёнам канцылярскай думкі супрацоўнікаў нямецкага пасольства ды асабіста пасла Нямеччыны, ці яна адлюстроўвае стыль нямецкай дыпляматыі ў дачыненьні да Беларусі ў цэлым. У апошняе вельмі не хацелася б верыць, бо гэта азначала б, што Другая ўсясьветная вайна сапраўды яшчэ не завершана — прынамсі, у галовах некаторых эўрапейцаў.

Пакідаючы ўбаку стыль дакумэнту, варта зьвярнуць увагу на апошні абзац, дзе робіцца спасылка на апытаньні грамадзкай думкі, якія «пацьвярджаюць важную ролю расейскай мовы як адной зь дзьвюх афіцыйных моў, асабліва ў палітычнай сфэры». Фантастычным чынам мова тытульнай нацыі нідзе не названая роднай мовай беларусаў. То бок у пасольстве прызнаюць яе толькі ў якасьці «адной зь дзьвюх афіцыйных моў». Гэта сапраўды жалезная лёгіка, калі гаворка вядзецца пра абгрунтаваньне вяшчаньня перадач радыё «Нямецкая хваля» па-расейску.

Але калі нямецкія дыпляматы хочуць паказаць, што яны законапаслухмяныя, што яны пасьлядоўна імкнуцца строга выконваць беларускі закон аб мовах, дык чаму б тады не прапанаваць варыянт вяшчаньня «Нямецкай хвалі» на дзьвюх мовах — расейскай і беларускай?

Найперш удакладнім некаторыя рэчы. «Нямецкая хваля» як нямецкая радыёстанцыя мае права «ажыцьцяўляць сваё вяшчаньне на мовах, колькасьць якіх абмежаваная», — хоць на расейскай, хоць на кітайскай, хоць на урду ці дары. Гэтаксама прадстаўнікі розных народаў маюць права або ня слухаць перадач «Нямецкай хвалі», або слухаць і пры гэтым крытыкаваць іх. Безумоўнае

права крытыкаваць перадачы й вяшчальную палітыку «Нямецкай хвалі» маюць і беларускія слухачы. Хацелася б верыць, што хоць бы ў гэтым праве (у адрозьненьне ад права карыстацца роднай мовай) кіраўніцтва радыёстанцыі сваім слухачам не адмаўляе.

**«Заграница нам поможет...»**

Пратэст інтэлігенцыі ў сувязі з тым, што «Нямецкая хваля» мае намер новую праграму, прызначаную для Беларусі, трансьляваць па-расейску, выглядае дзіўным. Рэч ня ў сутнасьці пратэсту, а ў адрасаце. Чаму з аналягічным зваротам яго ініцыятары не зьвярнуліся раней да беларускага кіраўніцтва? Чаму не выступалі з крытыкай расейскамоўнай этэрнай палітыкі БТ і радыё, ці хоць бы адной з FM-станцый? Апазыцыя ды інтэлігенцыя стаміліся змагацца за мову, праводзіць пікеты, акцыі пратэсту ў яе падтрымку? Уся надзея ў справе выратаваньня беларускай культуры засталася толькі на заходнія дзяржавы? Тады гэтыя дзяржавы і будуць дапамагаць апазыцыі такім чынам, які будзе падавацца ім зразумелым і лягічным. Таму і гучаць адказы ў стылі «Бярыце што даюць!».

Калі самі апазыцыйныя лідэры ня могуць дамовіцца ня толькі наконт адзінага кандыдата, але і наконт прыярытэтаў (у тым ліку прыярытэту беларускай мовы) — дык ці варта чакаць ад эўрапейскіх палітыкаў, што яны за апазыцыю будуць праводзіць беларускую, а не расейскую культурную палітыку, займацца культуртрэгерствам?

Фактычна кіраўніцтву «Нямецкай хвалі» і Эўрасаюзу трэба падзякаваць за рашэньне зрабіць праграму для беларусаў на расейскай мове.

Гэта проста дазволіла паглядзець на моўную сытуацыю Беларусі збоку. І, убачыўшы яе чужымі вачыма, жахнуцца з уласнай бездапаможнасьці, канфармізму ды проста абыякавасьці беларусаў. Ніякая «Нямецкая хваля» ці нават усе разам узятыя замежныя радыёгаласы сытуацыі, зразумела, ня зьменяць, нават калі ўсе яны пачнуць вяшчаць па-беларуску. Але ж і адсутнасьць хоць якой-небудзь альтэрнатывы расейскамоўнаму вяшчаньню канчаткова кансэрвуе цяперашнюю палітычную сытуацыю ў Беларусі, пры якой яна застаецца ўсяго толькі пэрыфэрыяй расейскай палітыкі.

**Самая папулярная мова**

І тут узьнікае наступнае пытаньне, скіраванае ўжо да тых, хто разглядае расейскую мову ў СМІ, у тым ліку замежных, як панацэю ад палітычнай адсталасьці Беларусі, як адзіны спосаб данесьці да масаў дэмакратычныя каштоўнасьці й перадавыя думкі апазыцыі. Няўжо шаноўнае спадарства ўсур'ёз лічыць, што само па сабе веданьне расейскай мовы (а многія палітыкі й журналісты, на жаль, ня надта добра яе ведаюць, хоць і карыстаюцца) дазваляе пазбавіцца палітычнага правінцыялізму, заваяваць сапраўдную папулярнасьць у масах, прапанаваць прывабную праграму дзеяньняў? Аднаго такога палітыка мы ўжо маем. Ці, можа, стаўка робіцца на новых палітыкаў-клонаў, для якіх культура свайго народу, будучыня нацыі — пусты гук?

І яшчэ. Няўжо нехта ўсур'ёз думае, што мова — гэта ўсяго толькі набор граматычных правілаў, фанэтыка й правапіс? Няўжо не зразумела, што мова — гэта яшчэ і лад жыцьця? Калі б эўрапей-

скія палітыкі гэтага не разумелі, дык Нямеччына, напрыклад, даўно загаварыла б па-ангельску. А таксама Францыя, Польшча, Чэхія.

Навязваньне расейскай мовы азначае навязваньне расейскага ладу думак, стэрэатыпаў у палітыцы, культуры, манеры паводзінаў. Прайдзіцеся ўвечары вуліцамі Менску й паслухайце, на якой мове і што гавораць маладыя людзі. Вы на такой мове хочаце размаўляць з выбарцамі, спадары палітыкі й палітолягі? Закіды ў абарону расейскай мовы як адзінай мовы, на якой толькі й можна размаўляць зь беларускім электаратам, па сутнасьці, нічым не адрозьніваюцца ад прапановы ўзаконіць мат у этэры. Ну чаму ж, калі большасьць нашых суграмадзян карыстаюцца матам у жыцьці, не зрабіць мацернае радыё? Яно пабіла б усе рэкорды папулярнасьці й зрабілася б прывабным для інвэстараў і рэклямадаўцаў. Чамусьці здаецца, што «Нямецкая хваля», напрыклад, адмовілася б ад такой ідэі. Але ж спасылацца на сацыялягічныя апытаньні, паводле якіх большасьць насельніцтва слухае радыё па-расейску, ня ёсьць больш карэктным мэтадам перакананьня.

Як бы гэта ні адмаўлялі нямецкія палітыкі й дыпляматы, а таксама прадстаўнікі Эўразьвязу, усё-такі ў рашэньні зрабіць менавіта расейскамоўную перадачу для Беларусі бачыцца саступка ня толькі й ня столькі цяперашнім беларускім уладам, колькі ўладам расейскім. Прынамсі, тым палітычным колам, якія хацелі б зьмены цяперашняга беларускага рэжыму, але толькі такім чынам, каб сама Беларусь заставалася ў арбіце ўплыву Крамля. Карацей кажучы, каб ня сталася так, як ва Ўкраіне, дзе ўкраінская мова адыграла найважнейшую ролю ў кансалідацыі грамадства ва-

кол дэмакратычнага і праэўрапейскага, а не прарасейскага кандыдата.

**Палітыка рэвэрансаў**

Самы час вярнуцца да ўрокаў гісторыі. 1 верасьня 1939 г. Польшча была пакінутая заходнімі дзяржавамі на разбор Гітлеру й Сталіну. Але яшчэ раней, у 1938-м, быў Мюнхэн, дзе Чэхія, разам з чэхамі й чэскай мовай, была прынесена ў ахвяру Гітлеру дзеля яго супакаеньня. А таксама ў ахвяру самазаспакаеньню заходніх палітыкаў. Цяперашняя палітыка рэвэрансаў некаторых заходніх краін перад Крамлём прымушае іншым разам аб гэтым успомніць. Даволі доўгі час на Захадзе гаварылі пра Пуціна як пра цывілізаванага палітыка, зь якім можна й трэба мець справу. Тым больш што ад Расеі шмат у чым залежыць, напрыклад, паліўная бясьпека Нямеччыны, іншых краін Заходняй Эўропы.

Здавалася б, пасьля Бэслану, дзе падчас штурму школы з закладнікамі-дзецьмі выкарыстоўваўся напалм, Захад павінен быў больш цьвяроза паглядзець на палітыку Пуціна. Але ж год пасьля Бэслану прайшоў пад знакам пуцінскай прапаганды аб неабходнасьці сумеснай з Захадам барацьбы зь міжнародным тэрарызмам. Маўляў, у Расеі і ў заходніх краінаў адны й тыя ж мэты. Злачынствы фэдэральных войскаў у Чачэніі, саму злачынную вайну на Каўказе ўсім прапанавана забыць. А вось пра нібыта законныя інтарэсы Расеі ў блізкім замежжы, наадварот, прапанавана памятаць і абавязкова ўлічваць іх — асабліва расейскія інтарэсы ў Беларусі.

Зразумела, усе аналёгіі й параўнаньні кульгаюць, прынамсі, на адну нагу. Палітыка, як вядо-

ма, — мастацтва магчымага. Але ж рабіць выгляд, што палітыка робіцца на роўным месцы, з нуля — так, як быццам не было гісторыі й няма будучыні, а ёсьць толькі сёньняшні дзень, — ня варта. Калі такую палітыку й называюць рэальнай, дык параўнаць яе можна хіба толькі з адным вядомым мэтадам у мастацтве — сацыялістычным рэалізмам.

*Наша Ніва. 2005. 26 жніўня.*

# Ціха! Ідзе інфармацыйная вайна!

Беларускія ўлады ў сваёй інфармацыйнай палітыцы ставяцца да замежнікаў, як і да беларусаў. Эўрапейцы ж да беларусаў ніяк ня ставяцца — яны іх не заўважаюць.

Выбух у Віцебску, у выніку якога пацярпелі некалькі дзясяткаў чалавек, выклікаў на дзіва млявую рэакцыю ўладаў. Рада бясьпекі краіны пасьпяшалася заявіць, што інцыдэнт ні ў якім выпадку не тэракт. МУС і КДБ абмежаваліся няўцямнымі тлумачэньнямі. Кіраўнік дзяржавы ў самым агульным пляне выказаў думку, што міжнародны тэрарызм усё-ткі ня можа не закрануць і спакойнай сінявокай Беларусі. Праўда, нічога канкрэтнага пра віцебскія выбухі не сказаў.

Прапагандысцкая машына ня здольная працаваць з фактамі — яна можа толькі выдаваць за факты ўласныя інсынуацыі ды прапагандысцкія штампы... Калі факты ня ўкладваюцца ў афіцыйна зацьверджаную схему — тым горш для фактаў!

**Генэралы мінулай вайны**

Кажуць, што генэралы заўсёды рыхтуюцца да мінулай вайны. Гэта слушна і ў адносінах да войнаў інфармацыйных. У сёньняшняй Беларусі

штатныя ды пазаштатныя прапагандысты ўсіх чыноў і званьняў займаюцца тым, што даюць адпор ідэалягічным падкопам Захаду, паколькі гэтым займаліся некалі ідэалягічныя органы ў Савецкім Саюзе. СССР прынята лічыць за ўзор дзяржавы, а яго распад — галоўнай трагедыяй мінулага стагодзьдзя. Пры гэтым чамусьці ніхто не задаецца пытаньнем, чаму ён разваліўся, калі быў такі добры. Зрэшты, сыстэма была пабудаваная акурат на тым, каб ніхто ніякіх пытаньняў не задаваў. На гэтым базуецца й цяперашняя сыстэма ў Беларусі.

Міністэрства замежных справаў, Міністэрства інфармацыі і шэраг іншых, так бы мовіць, зацікаўленых ведамстваў — кожнае паасобку і ўсе разам — устурбаваныя вяшчаньнем на Беларусь з-за яе межаў. МЗС, напрыклад, пашкадавала, што дзяржаўнае радыё не запрасілі паўдзельнічаць у тэндэры на арганізацыю такога вяшчаньня, які быў абвешчаны нядаўна Эўразьвязам. Дарэчы, чаму б і не паўдзельнічаць?

Па-першае, конкурс фармальна ні для кога не зачынены. Па-другое, радыёстанцыя «Нямецкая хваля», напрыклад, якая ўжо выйграла перад тым тэндэр на вытворчасьць паўгадзіннай перадачы для Беларусі, ёсьць, па сутнасьці, дзяржаўнай установай, якая існуе на грошы падаткаплатнікаў. Чаму б беларускай дзяржаўнай ідэалёгіі празь дзяржаўнае радыё наўпрост не памерацца сіламі ў этэры з палітычнымі прынцыпамі нямецкай дзяржавы? Праўда, у сьвятле апошніх выбараў у Нямеччыне некаторыя прынцыпы яе дзяржаўнай палітыкі, у прыватнасьці, замежнай, застаюцца пакуль не зусім яснымі. У Беларусі ж палітыка ў апошнія дзесяць гадоў застаецца стабільнай і прадказальнай,

што, несумненна, павінны былі б улічыць арганізатары конкурсу ў Брусэлі. Таксама Эўразьвязу трэба было б станоўча ацаніць і той факт, што ўсе выдаткі на вяшчаньне пакрываліся б зь беларускага прэзыдэнцкага фонду.

**У чаканьні кіно**

Калі верыць сумежнаму з МЗС ведамству — Міністэрству інфармацыі Беларусі — у кожным выпадку глушыць замежныя радыёстанцыі ўздоўж беларускіх межаў беларускія ўлады намеру ня маюць. Бо гэта пярэчыла б духу добрасуседзтва, узаемакарыснага супрацоўніцтва і ўвогуле джэнтэльмэнства, якім, маўляў, заўсёды вызначаліся беларускія ўлады ў дачыненьнях з суседнімі краінамі. Замест гэтага прапануецца ўзмацніць вяшчаньне на чужую тэрыторыю — у прыватнасьці, выпускаць больш радыёчасопісаў, у якіх будзе праўдзіва асьвятляцца шчасьлівае жыцьцё ў Беларусі. Так і хочацца дадаць — Савецкай Беларусі. У памяці міжволі ўсплываюць кіначасопісы з аднайменнай назвай, якімі за савецкім часам распачыналіся сэансы ў кінатэатрах. Большасьць гледачоў, праўда, старалася падчас паказу тых часопісаў бавіць час у буфэце.

З пазьнейшых часоў успамінаюцца фільмы «Дзеці хлусьні» ды «Найноўшая гісторыя». Гэтыя творы ў адукаванага гледача (скажам, у братняй Польшчы) выклікаюць гамэрычны рогат. У менш адукаванага — пазяханьне. Праблема ў тым, што беларускія ўлады, у прыватнасьці, ідэалягічныя работнікі, ставяцца да грамадзянаў замежных краінаў як да грамадзянаў краіны ўласнай. Іншымі словамі, трымаюць іх за дурняў. Такая звычка, выпрацаваная дзесяцігодзьдзямі савец-

кай улады, у Беларусі ўспрымаецца як цалкам натуральная. Бо цягам дзесяцігодзьдзяў тэлевізійнае, радыйнае, газэтнае ды іншае начальства ніякім чынам не адказвала за прадукт, які зьяўляўся ў этэры або ў друку. Бо кіраўнікі СМІ ўсіх узроўняў падпарадкоўваліся ня рынку, не жаданьням чытача, але адзінаму Богу — начальству. У канчатковым выніку ня проста начальству, а пэрсанальна галоўнаму слухачу (чытачу, гледачу) прызначаліся ўсе творы, сюжэты й сюжэцікі. Усе астатнія начальнікі, кожны на сваім узроўні, намагаліся даведацца або адгадаць, якім чынам можна патрафіць вышэйшай асобе.

Нельга забываць, што журналісцкі корпус недзяржаўных СМІ сфармаваўся, у асноўным, у тых самых умовах, што і дзяржаўнай. І таму ня проста самацэнзура, але звычка пісаць не для чытача, а для рэдактара або заснавальніка ці спонсара (альбо для таго, хто, на думку журналіста, мусіць быць спонсарам) застаецца невыкараняльная. Калі чытаеш тэксты нават у найбольш прафэсійных, сучасных, інфармацыйна насычаных беларускіх выданьнях, цяжка пазбавіцца ўражаньня, што многія зь іх напісаныя на замову. Ня ў тым сэнсе, што напісаныя за грошы — хто ж адмовіцца ад ганарару! Але ў тым сэнсе, што матэрыялы, здаецца, не цікавяць ні аўтара, ні тым больш чытача, але ж яны патрэбныя з гледзішча так званай палітычнай каньюнктуры. Зьяўленьне партыйнай прэсы ці хоць бы адной партыйнай газэты было б, насамрэч, рэальным крокам да свабоды слова ў параўнаньні зь беспартыйнымі выданьнямі, палітычныя прыхільнасьці якіх залежаць ад асабістых упадабаньняў рэдактара. Але напачатку, праўда, трэба было б мець рэальныя партыі...

**Свабода ўнутранага карыстаньня**

Дзесяцігодзьдзе Беларускай асацыяцыі журналістаў, сьціпла адзначанае вузкай грамадзкасьцю, засьведчыла, сярод іншага, што журналісцкая салідарнасьць калі яшчэ і засталася, дык толькі не ў асяродку выдаўцоў і галоўных рэдактараў незалежных мэдыяў. Бо аб якой салідарнасьці можаісьці размова, калі розныя выданьні маюць часам адны і тыя ж крыніцы фінансаваньня? У такой сытуацыі, нават застаючыся фармальна на агульных дэмакратычных пазыцыях, тыя выданьні будуць непазьбежна канкураваць паміж сабой. І хай бы толькі паміж сабой! Пачынаюцца канкурэнтныя войны за цэлыя галіны СМІ. Так, адны даводзяць, што сёньня нельга стварыць незалежнае беларускае радыё, бо, бачыце, у Беларусі не засталося здольных радыёжурналістаў! Другія пярэчаць, што непатрэбныя, акурат, друкаваныя выданьні, паколькі наклады ў іх маленькія. Трэція даводзяць, што радыё і друк — ніштo ў параўнаньні з мажлівым уплывам тэлебачаньня.

Узьнікае пытаньне: якога ўплыву, уплыву зь якой мэтай? Кіраўнікі мэдыяў спрабуюць гуляць у вядомую гульню: «так» і «не» не гаварыць, чорнага й белага не апранаць. Але ўлады ім усё адно ня вераць ды падазраюць, што мэтай СМІ, якія фінансуюцца з-за мяжы, ёсьць дэстабілізацыя грамадзтва і адхіленьне ад улады існага рэжыму. Але ж нідзе, ні ў адной краіне сьвету дыктатура яшчэ ня ляснула, дзякуючы выключна прэсе. Даводзіцца нагадваць усім вядомы прыклад. У Савецкім Саюзе замежныя радыёгаласы слухалі нават у самыя лепшыя для гэтых станцыяў часы некалькі адсоткаў слухачоў. Аўдыторыя іх была непараўнальна меншая за аўдыторыю, напрыклад,

Цэнтральнага тэлебачаньня і дзяржаўнага радыё. І што, гэта ім дапамагло? А ці дапамаглі ў пазьнейшыя часы Беларускаму тэлебачаньню рэпартажы, у якіх выкрываўся нейкі апазыцыйны кандыдат у прэзыдэнты?

Іншая справа, што на пераломе, у самы момант змаганьня, калі яшчэ не вядома, хто каго, — СМІ могуць адыгрываць вельмі важную ролю. Так гэта было ў Баўгарыі ў 1997-м, у Югаславіі ў 1999-м, ва Ўкраіне ў 2004-м. У Беларусі падобнага змаганьня, відавочна, няма і ў бліжэйшай пэрспэктыве не прадбачыцца. Ці азначае гэта, што Беларусі непатрэбная вольная прэса? Вольная прэса таму й завецца вольнай, што ні ў кога не пытаецца дазволу на сваё існаваньне. І на гэтым можна было б паставіць кропку — маўляў, каму патрэбная свабода слова, няхай той за яе і змагаецца. Можна было б, калі б гэта тычылася толькі Беларусі.

Калі свабода слова патрэбная толькі краінам Эўрапейскага Зьвязу, так бы мовіць, для ўнутранага карыстаньня — дзеля таго каб прыносіць даход уладальнікам прэсы, рэклямадаўцам і задавальняць амбіцыі кіраўнікоў буйных карпарацыяў ды палітыкаў, тады сапраўды няма праблемы. Тады тэндэр на радыё для Беларусі, абвешчаны ЭЗ, ёсьць вяршыняй палітычнай і юрыдычнай думкі. Беларусь, паводле гэтага тэндэру, папросту ад праекту адсякаецца, разам зь беларускай мовай. Умовы сфармуляваныя так, быццам у Беларусі даўно пануюць дэмакратыя й рынкавыя адносіны. А новая радыёстанцыя павінна ўсяго толькі ўпісацца ў гэты рынак, заняць на ім сваю нішу і прыносіць дывідэнды — прынамсі, палітычныя. Такое ўражаньне, што кіраўніцтва ЭЗ, гэтаксама, як і беларускае кіраўніцтва, жыве верай у сьвет-

лую будучыню, якая абавязкова наступіць ці то ў 2007-м ці ў 2010-м годзе. Наступіць сама сабой, бязь лішніх намаганьняў...

**Хто там, пад бел-чырвона-белым сьцягам?**

Няма чаго крыўдаваць на тое, чаго няма. Не змагла беларуская апазыцыя дагэтуль ясна сфармуляваць, чаго яна хоча ад аб'яднанай Эўропы і ад ЗША – простага спачуваньня ці чагосьці большага. Нават у адносінах да Саюзу палякаў Беларусі не была выпрацаваная агульная стратэгія. Калі не лічыць стратэгіяй пазыцыю неўмяшаньня. Як можна разьлічваць на сапраўдную салідарнасьць і падтрымку Польшчы, калі асобныя беларускія апазыцыйныя палітыкі раздумвалі — а ці варта ўвогуле падтрымліваць палякаў? Сваіх праблем у беларусаў хіба не хапае?

Многія, напэўна, памятаюць яскравы эпізод, пра які пры канцы жніўня пісалі нават замежныя газэты. На сьвяточным канцэрце ў Варшаве, прысьвечаным юбілею польскай «Салідарнасьці», на сцэне зьявіўся бел-чырвона-белы сьцяг — сьцяг «вольнай Беларусі». Гэтыя словы вядучага пайшлі ў жывы этэр на шматмільённую аўдыторыю.

Парадаксальным чынам для таго, каб у Беларусь прыйшло вольнае слова, трэба, каб беларусаў спачатку пачулі ў Эўропе, каб яны гаварылі ва ўвесь голас, гаварылі на сваёй роднай мове, у абарону сваіх правоў і правоў нацыянальных меншыняў. Гаварылі ня толькі аб Беларусі, але і аб Эўропе ў цэлым. Так, сёньня яны адно аднаму неабходныя. Толькі ані ў Беларусі, ані ў Эўропе многія гэтага пакуль так і не ўсьвядомілі.

*Наша Ніва. 2005. 30 верасьня.*

# На вайне як на вайне

Канстытуцыйны суд Гішпаніі пастанавіў, што суды гэтай краіны могуць разглядаць справы аб ваенных злачынствах альбо злачынствах супраць чалавечнасьці, незалежна ад таго, хто стаў ахвярай гэтых злачынстваў, і ад таго, дзе яны былі зьдзейсьнены.

*З газэт*

Мой бацька любіць часам паўтараць: «Далі б мне аўтамат! Я б з усімі гэтымі нягоднікамі не размаўляў бы — паставіў бы да сьценкі і... тра-та-та!» Гаворыцца гэта жартам, але калі ўлічыць партызанскае дзяцінства бацькі, то як бы і не зусім.

Прыходзіць на памяць сучасны анэкдот. Хто ёсьць беларус? Патрыёт. А два беларусы? Партызанскі атрад. Тры? Партызанскі атрад і... здраднік. Таксама нясьмешны нейкі жарт. Дый не да жартаў увогуле. Хто — з маладзейшага нават, «непартызанскага» пакаленьня — ня марыў калі-небудзь узяць у рукі той аўтамат? І не нямецка-фашысцкіх захопнікаў пайсьці страляць, а некаторых сваіх суайчыньнікаў? Лекары кажуць, што гэта ў нас натуральная, прыроджаная агрэсіўнасьць. Але ёсьць амаль у кожнага яшчэ адна мара, нават саладзейшая за аўтамат. Гэта суд. І не вышэйшы, завоблачны нейкі суд, а самы сапраўдны, зямны — з прысяжнымі засядацелямі, судзьдзямі ў чорных мантыях і з буклямі, строгімі ахоўнікамі з аўчар-

камі, сумнымі шматтомнымі пратаколамі допытаў ну і, зразумела, лавай падсудных.

**Калі б Чаўшэску быў жывы**

Мужа ды жонку Чаўшэску, расстраляных у баязьлівай мітусьні ў нейкім двары, ня так ужо й шкада. Асабліва румынам, якім давялося жыць пад ягонай уладай. Шкада, што не было суду, што не змаглі паглядзець у вочы дыктатару былыя ахвяры. Напрыклад, Юльюс Пііп — работнік, які насьмеліўся ўвосень 1980-га адправіць з Румыніі прывітальную тэлеграму на адрас польскай «Салідарнасьці». За гэты свой учынак Піліп адседзеў шэсьць з паловай гадоў у вязьніцы, закаваны ў кайданы. Праз 25 гадоў Піліпа вітала воплескамі, стоячы, шматлюдная заля ў Варшаве, дзе праходзіла канфэрэнцыя, прысьвечаная спадчыне «Салідарнасьці». Шкада, што Чаўшэску да гэтага не дажыў. Але нават калі б і дажыў, ці ўбачыў бы нешта? Ці зразумеў, што зьмянілася ў сьвеце за апошнія 15 гадоў?

На той канфэрэнцыі заля авацыямі вітала вядомага праваабаронцу Сяргея Кавалёва, былога вязьня ГУЛАГу, потым — паплечніка Андрэя Сахарава. У Расеі імя Кавалёва сёньня згадваюць у самым нэгатыўным кантэксьце: здраднік, што прадаўся заходнім імпэрыялістам і чачэнскім бандытам.

У Расеі напачатку 1990-х нібыта быў суд над КПСС. Хоць які там суд? Няма чаго ўспомніць. Сярод абаронцаў «гонару й годнасьці» КПСС — ніводнага запамінальнага твару, ніводнага сапраўднага Насфэрату. Судзьдзі сёньня засядаюць у Думе альбо працуюць у Адміністрацыі прэзыдэнта. Суд «над сыстэмай» загадзя быў наканаваны

на правал. Судзіць сыстэму не выпадае, як і любую абстракцыю. Судзіць можна толькі людзей — з імёнамі, прозьвішчамі, фактамі біяграфіі. Таксама яны ёсьць у ахвяр. І гэтым — тым, што жылі або выжылі насуперак усяму, — страшныя яны сваім катам і іхным нашчадкам.

**Нож у сэрцы**

Катынь, як і Курапаты, ім як востры нож у сэрцы. Ня хочуць нічога чуць, ня хочуць прызнаваць факты, ня хочуць нават называць лічбаў закатаваных. Пра імёны тых, хто расстрэльваў, даваў загады, гаварыць няма чаго — пільнуюць як вока ў лобе. Лепей за ўсё — зваліць віну на каго-небудзь іншага.

Але калі на ўвесь экран бульдозэр закопвае ў траншэі тысячы трупаў закатаваных вязьняў канцлягеру, тады арганізатары й натхніцелі злачынстваў адварочваюцца, адчуваюць сябе брыдка, але мусяць глядзець, мусяць адказваць на пытаньні, мусяць гаварыць хоць нешта ў адказ.

Але ці адчувалі падсудныя на лаве Нюрнбэрскага трыбуналу згрызоты сумленьня? Юліюс Штрайхэр, адзін з галоўных функцыянэраў Райху, якія адказвалі за вырашэньне «габрэйскага пытаньня», абяцаў трыбуналу, калі яго пакінуць у жывых, верай і праўдай да скону дзён служыць «сусьветнаму габрэйству». Але гэта быў гнюсны псыхалягічны выверт. Ва ўсялякім выпадку, ня каяньне. «Злачынцы ня хочуць прызнаць сваёй віны» — так называецца кніга польскага публіцыста Караля Малцужыньскага, якому давялося асьвятляць Нюрнбэрскі працэс. Дастаткова паглядзець на тое, як нахабна паводзіць сябе былы прэзыдэнт Югаславіі Слабадан Мілошавіч у га-

аскай турме, як бессаромна зацягвае працэс, павучае ды абвінавачвае заходнія дэмакратыі, дзякуючы інстытутам якіх ён так утульна ды ўпэўнена адчувае сябе ў зьняволеньні. Усе ягоныя правы як абвінавачванага абароненыя, і былы дыктатар ахвотна карыстаецца прынцыпамі міжнароднага права, пры гэтым абвінавачваючы суд у беззаконьні.

**Пакараньне на курорце**

Наіўна спадзявацца, што Мілошавіч, ці Хусэйн, ці яшчэ нехта з былых дыктатараў пад цяжарам абвінавачаньняў і фактаў раскаюцца ва ўчыненым. Яны ўсе, падобна да Патрыярха з раману Гарсія Маркеса, служылі толькі свайму народу... Палацы, рахункі ў замежных банках ня трэба згадваць — яны ў сваім служэньні народу заслугоўвалі большага, на іх думку. Суды, міжнароднае права прыдуманыя не для таго, каб перавыхоўваць злачынцаў. Для гэтага ёсьць царква, псыхааналіз ды іншыя інстытуты. Пакараньне злачынстваў патрэбна, як гэта ні сьмешна гучыць, не злачынцам, а іх ахвярам. Дзеля таго каб існавала надзея. Хоць бы ейны агеньчык — на тое, што злачынцы будуць пакараныя яшчэ пры жыцьці. І што гэта хоць некалі некага ды стрымае...

Ня так даўно былы эсэсавец Эрых Прыбке, асуджаны на пажыцьцёвае пакараньне за тое, што падчас вайны па яго загадзе былі расстраляныя 335 італьянцаў, быў заўважаны на беразе возера, на віле сябра, таксама эсэсаўца. Выявілася, што дазвол вязьню на адпачынак даў рымскі суд — той самы, які судзіў Прыбке. Фармальна і на віле ў свайго сябра былы эсэсавец знаходзіўся пад «хатнім арыштам» — за вілай назіралі карабінэ-

ры. Суд кіраваўся нібыта гуманнымі матывамі. Прыбке споўнілася 92 гады, вось і было вырашана трохі аслабіць рэжым старому. Але як быць з памяцьцю ахвяраў? Гісторыя выклікала абурэньне ва ўсёй Італіі — зразумела, найперш сярод былых удзельнікаў Супраціву. Сам жа Прыбке, калі меркаваць па ягоных інтэрвію, лічыць, што ўжо даўно расплаціўся за «грахі юнацтва». Цяпер можна і на заслужаны адпачынак. А што, былыя чыны НКВД-КГБ на «заслужанай пэнсіі» думаюць інакш?

Былы чылійскі дыктатар Піначэт, якому споўнілася дзевяноста, напэўна, ня надта разумеў, што зь ім адбываецца, калі яго затрымлівалі. За што яго, заслужанага генэрала, можна судзіць? У 1998 г. гішпанскі судзьдзя Бальтазар Гарсон, які адстойвае прынцып вяршэнства міжнароднага права над нацыянальным заканадаўствам, выдаў ордэр на арышт Піначэта, які ў той час быў у Лёндане. Англія адмовілася тады выдаць чылійскага генэрала гішпанскаму правасудзьдзю на падставе кепскага стану здароўя Піначэта. Між тым, дзякуючы намаганьням Гарсона ў Мадрыд былі дастаўленыя некалькі былых афіцэраў, якія спрычыніліся да выкраданьня тысяч людзей у 1970-я гады ў Аргентыне. Адзін з афіцэраў асуджаны на пажыцьцёвае зьняволеньне.

**Справядлівасьць бязь межаў**

Цяпер чарга за ваеннымі злачынцамі з Гватэмалы, на сумленьні якіх масавыя забойствы падчас грамадзянскай вайны 1978—1986 гг. Ляўрэатка Нобэлеўскай прэміі міру Рыгабэрта Мэнчу, якая не змагла дабіцца справядлівасьці ў сваёй краіне, зьвярнулася ў гішпанскі суд з позвай аб

пакараньні ўдзельнікаў нападу на пасольства Гішпаніі ў 1980 г. Падчас яго былі забітыя 37 праціўнікаў гватэмальскага рэжыму, якія спрабавалі схавацца ў дыпмісіі. Канстытуцыйны суд Гішпаніі прызнаў, што «важнейшымі за нацыянальныя інтарэсы ёсьць прынцыпы міжнароднага права й справядлівасьці», таму краіны, якія падпісалі канвэнцыю аб перасьледзе за злачынствы супраць чалавечнасьці, могуць судзіць абвінавачаных у такіх злачынствах незалежна ад таго, дзе яны былі ўчыненыя.

Усё гэта гучыць у Беларусі як нейкая прыгожая казка, зусім далёкая ад рэчаіснасьці, як нейкая фантастычная мара. Што значыць для амонаўца, які ўдарыў жонку зьніклага журналіста, а потым яшчэ й выйграў у судзе маральную кампэнсацыю ў сваёй ахвяры, міжнароднае права й прынцыпы справядлівасьці? Ці чуў ён калінебудзь у сваім жыцьці гэтыя словы? Што тым людзям, якія выкрадалі Захаранку, Ганчара, Красоўскага або прыкрывалі выкрадальнікаў, да дзясяткаў тысяч зьніклых у Гватэмале? Ім цяжка вымавіць імя кіпрыёта Хрыстаса Пургурыдэса, які займаецца расьсьледаваньнем зьнікненьняў палітычных апанэнтаў рэжыму ў Беларусі, а словазлучэньне «Парлямэнцкая асамблея Рады Эўропы» наўрад ці ўвогуле нешта ім гаворыць.

Ёсьць, праўда, іншая катэгорыя людзей. Яны з усьмешкай на вуснах растлумачаць вам усё пра палітыку «двайных стандартаў». Пра тое, што ў Гішпаніі ўсё яшчэ ня знойдзеныя ўсе ўдзельнікі страшных тэрактаў на вакзале ў Мадрыдзе. Што гішпанская паліцыя бесчалавечна абышлася зь нелегальнымі імігрантамі-афрыканцамі. Што ў Іраку гінуць і зьнікаюць штодня дзясяткі людзей.

Што ўмовы ўтрыманьні вязьняў у Гуантанама невыносныя, а ў Амэрыцы ад ураганаў гінуць нэгры. Што тысячы людзей зьнікаюць штодня ў розных кутках сьвету. А гэта значыць, што Беларусь для гэтых спадароў, якія любяць усё тлумачыць, таксама ўсяго «нейкі куток», дзе жывуць тубыльцы. Праўда, асабліва спрытным зь іх дазваляюць няблага карміцца і нават займаць некаторыя пасады. І за гэта трэба быць удзячнымі ўладзе. А каго звольнілі ці адправілі на хімію за «паклёп» — туды ім і дарога. Судзіць за гэта нельга. Але памятаць будуць. І хай спадарства паспрабуе нешта растлумачыць наконт двайных стандартаў і двайной маралі сваім дзецям...

**Суд ідзе...**

Гэты фэномэн вядомы ды апісаны ў літаратуры, у тым ліку айчыннай, не аднойчы. Людзі, якія падчас вайны праяўлялі дзівосы сьмеласьці, якія не згіналіся пад кулямі, пасьля вайны зноў ператвараліся ў звычайных людзей. Яны зноў, як некалі, пачыналі баяцца выступіць на сходзе, запярэчыць начальніку, сказаць праўду. Мабыць, адна з прычын такіх паводзін была даволі простай. На вайне не было чаго губляць — акрамя ўласнага жыцьця. Пасьля ў людзей зьявіўся хоць і прымітыўны, але дабрабыт. Пакойчык у камунальнай кватэры, сякая-такая зарплата, на якую можна пракарміць сям'ю, бясплатныя школьныя сьняданкі.

Зь цягам часу жыцьцёвыя стандарты вырасьлі. Сёньня можна і катэдж пабудаваць, і дзяцей у элітную школу ўладкаваць. Адно засталося нязьменным. У мірным жыцьці ня тое што праявіць сябе героем — проста зьдзейсьніць мужны ўчынак неймаверна складана.

Ці можна абвінавачваць у гэтым людзей? Ці варта шкадаваць аб тым, што вайна скончылася 60 гадоў таму і няма ў руках аўтамата? Не ў лясах і не на вуліцах ідзе сёньня вайна — яна ў галовах і сэрцах людзей. І чым меншая тэрыторыя сэрца застаецца вольнай і незалежнай, не захопленай хамскай уладай, тым больш жорсткім і адчайным робіцца змаганьне. Бо няма іншага выйсьця.

Суд над злачынцамі паводле міжнародных працэдур застаецца далёкай марай. Але судзіць паводле законаў сумленьня не забаронена нікому. І таму яны ўжо сёньня асуджаныя. Яны прайгралі працэс, нават калі сёньня яны яшчэ на свабодзе і мараць закаваць нас у кайданкі.

*Наша Ніва. 2005. 14 кастрычніка.*

# Што мне рабіць?

## Трохі пра рок гісторыі й гісторыю року

Калі нехта думае, што назву артыкулу падказала савецкая школьная праграма, то памыляецца. Мікалай Чарнышэўскі са сваім раманам, як і Ўладзімер Ленін, якога той раман «глыбока перапахаў», тут ні пры чым. Натхніў мяне, хутчэй, музычны жарт Зьміцера Бартосіка, які паклаў купалаў верш «Мужык» на кампазыцыю рок-гурту Smokie «What Can I Do?». Мне падаецца, што аўтар жарту, выбачайце за нявольную гульню словаў, і сам не зразумеў, што ён зрабіў. Нехта ўбачыў у «Што мне рабіць?» пародыю на культавы рок-гурт, нехта — зьдзек з клясычнага тэксту. Мне ж бачыцца ў гэтым спантанны культурніцкі акт, поўны глыбокага сымбалічнага сэнсу. Але, зноў жа, гаворка пойдзе не пра Купалу і не пра Smokie. Хоць часткова гаворка тычыцца рок-музыкі. Але пра яе — крыху пазьней.

**Простая гісторыя**

Беларускі дзяржаўны тэлеканал «Лад» быў задуманы як свайго роду аналяг расейскага каналу «Культура». Ён павінен быў паказваць лепшыя перадачы гэтага каналу, трансьляцыя якога ў Беларусі была спыненая, а таксама — яшчэ лепшыя перадачы ўласнай вытворчасьці. У выніку «Лад»

стаў нагадваць, у лепшым выпадку, расейскі тэлеканал «Спорт». А большасьць перадач расейскай «Культуры» ў Беларусі можна назіраць цяпер толькі праз спадарожнік — на канале РТР-Плянэта. Кажу пра гэта са шкадаваньнем не таму, што Беларусь, нібыта, апынулася ў ізаляцыі ад расейскай культуры. Тэлебачаньне, у прыватнасьці — расейскае, да культуры ў высокім сэнсе слова мае вельмі ўскоснае дачыненьне. Аднак часам чужыя непалітычныя тэлепрагарамы, зробленыя дзеля чыста ўнутранага культурніцкага спажываньня, дапамагаюць паглядзець на сябе як бы звонку.

Расейская перадача цыклю «Тым часам» была прымеркаваная гэтым разам да 100-годзьдзя царскага маніфэсту 17 кастрычніка. Маніфэст, які ўпершыню абвесьціў некаторыя грамадзянскія свабоды для насельнікаў імпэрыі, папярэднічаў, як вядома, першай расейскай рэвалюцыі. Але размова за круглым сталом вялася ня столькі аб рэвалюцыйных падзеях 1905-га году, колькі аб тым, ці ёсьць гісторыя сама па сабе шматварыянтнай, альбо яна разьвіваецца паводле прадвызначанага аднойчы ды назаўсёды шляху. Іншымі словамі, ці зьяўляецца суб'ектам гісторыі чалавек, які мае свабоду волі й свабоду выбару, альбо гэтыя катэгорыі ня маюць значэньня? Адзін з удзельнікаў круглага стала — прадстаўнік расейскай акадэмічнай навукі, сфармуляваў адказ вельмі лякапічна й шчыра. У расейскай гісторыі, на ягоны погляд, ніколі не было альтэрнатывы — тым больш, лібэральна-дэмакратычнай. Яна, гісторыя Расеі, паводле мудрага гісторыка, заўсёды была й назаўсёды застанецца гісторыяй імпэрскай ды праваслаўнай. І на гэтым палягае веліч дзяржавы. Што ж тычыцца свабоды выбару, дык, на думку

расейскага навукоўца, чалавек можа, канечне, разглядаць айчынную гісторыю зь іншага — скажам так, не імпэрска-праваслаўнага гледзішча. Але тады гэты чалавек ня мае права называцца рускім і лічыць сябе патрыётам. Яго трэба разглядаць як ворага народу.

Цудоўным чынам расейскі прафэсар, сам таго ня ведаючы, сфармуляваў тыя прынцыпы, на якіх грунтуецца ня толькі расейская афіцыйная гісторыя, але ж і сучасная дзяржаўная ідэалёгія ў Беларусі. Альбо ты прымаеш дзяржаўную ўладу на чале з прэзыдэнтам як нейкую дадзеную звыш, адзіна магчымую рэальнасьць і пры гэтым падзяляеш праваслаўныя каштоўнасьці (у крайнім выпадку, лічыш сябе праваслаўным атэістам), альбо ты — вораг народу.

**Тое, аб чым хацелі сказаць, але саромеліся**

Шаноўны прафэсар шчыра сказаў аб тым, што пераважная большасьць расейскіх палітыкаў, палітолягаў, журналістаў і г. д. заўсёды мела на ўвазе, але аб чым звычайна саромеецца адкрыта казаць. Расея ёсьць імпэрскай праваслаўнай дзяржавай, народу якой дэмакратыя не патрэбная і нават шкодная. А патрэбны бізун і царква. Можна падзякаваць прафэсару за такую шчырасьць. Аднак, напэўна, ён вельмі зьдзівіўся б, калі б яму сказалі, што акрамя рускага, існуе беларускі народ, у якога ёсьць свая ўласная гісторыя й свой погляд на яе. Што нават пры наяўнасьці ў Беларусі падручнікаў па гісторыі, на якіх ясна адбіўся сьлед абэцэдаршчыны, усё-ткі пераважная большасьць беларускіх гісторыкаў — дасьледчыкаў, выкладчыкаў, настаўнікаў — не атаясамліваюць гісторыі Беларусі з гісторыяй Расеі і ня лічаць, што Беларусі

наканавана быць у складзе «адзінай і непадзельнай» расейскай імпэрыі.

Удзельнікі згаданага тэлевізійнага круглага стала дружна сышліся на тым, што падзеі 1991 г. неяк ня ўпісваюцца ў слаўную гісторыю вялікай расейскай дзяржавы. Адсюль выводзілася думка, што менавіта дэмакратычныя рынкавыя рэформы, пераняты на Захадзе, сталі згубнымі для імпэрыі. Магчыма, гэта так і ёсьць. Але ж не даводзіцца спрачацца і з тым, што распад СССР, які стаў магчымы ў выніку дэмакратычных пераўтварэньняў, даў Беларусі магчымасьць стаць незалежнай дзяржавай, што перад ёй зьявілася альтэрнатыва — заставацца ў імпэрыі ці знайсьці свой шлях у гісторыі.

Няўжо ў каго-небудзь з сучасных беларускіх дзяржаўных ідэолягаў ёсьць сумненьні ў тым, што згортваньне дэмакратыі ў Расеі, вяртаньне яе на шлях праваслаўнае імпэрскасьці ёсьць непасрэднай і рэальнай пагрозай для Беларусі? Няўжо застаўся хоць адзін сур'ёзны палітоляг ці палітык, здольны паверыць, быццам менавіта з Расеі прыйдуць да беларусаў парлямэнцкая дэмакратыя, свабода слова й веравызнаньня? Расейскія палітолягі й гісторыкі самі даўно ў гэта ня вераць. А ў Беларусі — ўсё яшчэ вераць?!

**Бязьядравы шантаж**

Як бы ні ставіўся кіраўнік Расеі да кіраўніка Беларусі, ён усё адно будзе бачыць Беларусь усяго толькі васальнай тэрыторыяй. Так яго вучылі ў школе. Дакладней, так іх абодвух вучылі ў школе. Урокі ўсходняга царадворства й падхалімства, здрадніцтва й крывадушнасьці. У асманскай імпэрыі некалі быў такі звычай. Доўгія гады пер-

шы візір служыў у літаральным сэнсе слова падстаўкаю для ног султана, калі той сядзеў на троне. Але прыходзіў тэрмін, візір рабіўся султанам, і тады ўжо наступала чарга былога султана служыць падстаўкаю для ног уладара.

Ну а народ, вядома, захоўвае маўчаньне. У гэтым палягае, так бы мовіць, сэнс расейскае гісторыі — у тым выглядзе, як яе падаюць расейскія гісторыкі ва ўнівэрсытэтах і ў самых інтэлектуальных расейскіх тэлепраграмах. З гледзішча такой гістарычнай навукі, Захад ёсьць носьбітам разбурэньня мітычных духоўных якасьцяў ды саборнасьці, а дэмакратыя ёсьць смутай, зачыншчыкаў якой трэба саджаць на кол.

Таму спадзявацца, што Расея зь нейкай фантастычнай прычыны падтрымае раптам на якіх заўгодна выбарах у Беларусі дэмакратычную апазыцыю — значыць страціць пачуцьцё рэальнасьці. Па-першае, перамога дэмакратыі ва ўсё яшчэ палітычна залежнай ад Крамля Беларусі азначала б для яго самае страшнае — канчатковую перамогу нацыяльна-вызвольнага руху на апошняй саюзнай тэрыторыі, крах дэспатыі. Што, як мы высьветлілі, і ёсьць квінтэсэнцыяй праваслаўнай цывілізацыі.

Зь іншага боку, баяцца сёньня ЗША і НАТО, баяцца паўтарыць лёс Іраку, ці былой Югаславіі — значыць заставацца на самой справе былой Югаславіяй альбо Іракам, заставацца на ўзбочыне эўрапейскай гісторыі. Стаць клясычнай тыраніяй усходняга кшталту ў Беларусі наўрад ці ўжо атрымаецца. Стаць Паўночнай Карэяй у цэнтры Эўропы — таксама. У Беларусі няма ядравай зброі. Бог зьлітаваўся.

Замест зброі масавага зьнішчэньня можна, праўда, пагражаць суседзям наркатрафікам, па-

токамі нелегальнай міграцыі, распаўсюдам СНІДУ й птушынага грыпу. Гэтак некалі ў сярэднявеччы некаторыя бадзягі зараблялі на жыцьцё тым, што пагражалі сустрэчным на дарозе тым, што дакрануцца да іх сваімі язвамі ад праказы (часам фальшывымі), пранцаў або якой іншай хваробы. Маўляў, плаці грошы, а то заражу! Што і казаць, шантаж — годны занятак для эўрапейскай дзяржавы на пачатку трэцяга тысячагодзьдзя.

**Вынас муміі**

Ну і нарэшце, наконт цывілізацыі. Наконт саматоеснасьці нацыі, мовы, індывідуальнасьці чалавека і г. д. Нам ужо шмат гадоў даводзяць, што ўсяму гэтаму пагражае Захад. Ён, Захад, ёсьць пагрозай цывілізацыі. Якой цывілізацыі? Савецкай, якая адыходзіць у нябыт? Праваслаўнай? Мусульманскай? Можа, асманскай, ці старажытна-эгіпецкай? Адну мумію, дарэчы, так і пакінулі ляжаць на Краснай плошчы ў праваслаўнай сталіцы. Кажуць, што вынас муміі з маўзалею абразіў бы пачуцьці мільёнаў людзей, якія служылі ідэалам камунізму. Іншымі словамі — гэта абразіла б, сярод іншых, былых ахоўнікаў сталінскага ГУЛАГу і чэкістаў, катаў і сэксотаў, судзьдзяў і пракурораў, якія выносілі няправедныя прысуды. Хіба можна чапаць такіх людзей у краіне, якая ганарыцца сваім імпэрскім мінулым?

На пачатку новага тысячагодзьдзя група брытанскіх лінгвістаў правяла кампутарнае дасьледаваньне самых розных тэкстаў — ад старажытных летапісаў да сучасных зонгаў і рэклямных брашураў з мэтай высьветліць, якое слова можна лічыць найбольш папулярным і характэрным для апошняга тысячагодзьдзя, стагодзьдзя, дзесяцігодзь-

дзя. Словам другога тысячагодзьдзя ў ангельскай мове было прызнанае слова «she» — яна. Бо да гэтага ангельскія джэнтэльмэны абыходзіліся ў размове без жаночага роду. Словам дваццатага стагодзьдзя прызнанае слова «jazz». І словам дзевяностых стала слова «web», што супала з глябальным распаўсюдам Інтэрнэту.

Думаю, што калі б дасьледаваньне адносна папулярнасьці таго або іншага слова, запазычанага з ангельскай мовы, праводзілася ў краінах СНД, слова «джэз» апярэдзіла б іншае слова — «рок».

Я, маё пакаленьне расло пад знакам прыслоўя: «сегодня он танцует джаз, а завтра родину продаст». Але джэз і рок не ўдалося вытруціць з жыцьця ніякімі сродкамі. Рок-музыку — дакладна так, як сёньня, — дазвалялі слухаць толькі ў абмежаванай колькасьці, пад наглядам цэнзараў і штатных ідэолягаў. Даводзілі, што рок разбурае слых, здароўе, жыцьцё. Рок, сапраўды, як выявілася, меў разбуральную сілу. Ня толькі на сцэне, дзе крышыліся музычныя інструмэнты, і ў залях, дзе ламаліся крэслы. Ён разбурыў стэрэатыпы й бар'еры паміж людзьмі розных сацыяльных, расавых і рэлігійных групаў, фальшывыя каштоўнасьці й крывадушнасьць грамадзтва спажываньня. Ён разьняволіў мільёны людзей. Не ў палітычным ці эканамічным сэнсе, але ў самым непасрэдным. Насуперак марксісцкай максыме аб тым, што свабода ёсьць усьвядомленай неабходнасьцю, рок-музыкі даводзілі сваёй творчасьцю, што свабода — гэта калі чалавек адчувае сябе вольным і нічога не навязвае астатнім.

Рок утварыў рэвалюцыю ў розумах і ў Амэрыцы, і ў Ангельшчыне, і ў Чэхаславаччыне, і ў Польшчы. У ЧССР гурт The Plastic People of the Universe,

музыкі якога адседзелі некалькі год у турме за «падрыў сацыялістычнага ладу», зрабіўся культавым для некалькіх пакаленьняў чэхаў. Варта згадаць, што Марэк Глаўса і ягоныя сябры сьпявалі пачэску. Таксама, як у Польшчы па-польску сьпявалі «Чэрвонэ гітары», «Скальды», Чэслаў Немэн. Усе гэтыя прыклады альбо прыклад нямецкага Rammstein'у абвяргаюць міт пра тое, што фэномэн року быў і ёсьць выключна ангельскім ці амэрыканскім. Рок належаў і належыць усім свабодным людзям.

**Разам нас багата**

Зразумела, я далёкі ад таго, каб назваць рокмузыку галоўным дасягненьнем цывілізацыі дваццатага стагодзьдзя. Але калі мне прапануюць выбар: лічыць галоўнай падзеяй мінулага стагодзьдзя сусьветныя войны, канцлягеры, крэматорый, атамную бомбу, кампутар ці нешта падобнае, я выберу... Beatles. Ну, і яшчэ Pink Floyd, зразумела. I Deep Purple. I Led Zeppelin. I «Краму» з N.R.M. I Neurodubel. Кожны сам можа прапанаваць свой сьпіс гуртоў розных кірункаў — ад гард-року да рэгі й рэпу.

Для мяне і майго пакаленьня рок асацыюецца з падзеньнем Бэрлінскага муру й вызваленьнем ад таго кашмару, які панаваў над сьветам і называўся «процістаяньнем дзьвюх грамадзкіх сыстэмаў». Калі я кажу пра маё пакаленьне, то маю на ўвазе, зразумела, ня ўзрост. Я маю на ўвазе тых, хто слухае рок. Ня так ужо й важна, на якой мове. Рок — гэта таксама мова.

Але нездарма кажуць, што «пасьля трыццаці з музыкай нешта адбываецца». Яна ўжо не прыносіць былога задавальненьня. Для мяне й майго

пакаленьня, якому выпала жыць у Беларусі ў другой палове дваццатага стагодзьдзя ва ўмовах «стабільнасьці», надышоў час выпрабаваньня. Выпрабаваньне тычыцца ня музыкі, бо ўсё напісанае, акрамя папсы, застаецца. Гэта выпрабаваньне на ўласную сапраўднасьць. Мана, фальш, няшчырасьць, дэмагогія, ілжывы патас — усё, што выклікала нашае непрыняцьце, супраціў, ярасьць, усё гэта вяртаецца цяпер, нібы кпіны, нібы ў пакараньне за наш канфармізм, ляноту й разбэрсанасьць. Не, мы не зрабілі ўсяго, што маглі. Не зрабілі нават і сотай долі. Бо заўсёды лічылі палітыку бруднай справай, якой не павінны займацца нармальныя людзі. Мабыць, так і ёсьць. Пакінем палітыку палітыкам. Але аднойчы нават палітыкі становяцца чымсьці большым, чым звычайна, — напрыклад, калі яны выходзяць на Майдан Незалежнасьці разам з тысячамі простых людзей, і над майданам гучыць: «Разом нас богато — нас не подолати»!..

«Фронт, фронт, фронт!» — гучалі некалі рэфрэнам на мітынгах словы Сержука Сокалава-Воюша, якія ён сьпяваў пад гітару. Так хочацца зноў некалі ўбачыць дзе-небудзь на вуліцы Менску або Горадні ягоную нязьменную бел-чырвонабелую стужку на галаве. Па гэтай стужцы заўсёды можна было яго пазнаць яшчэ здалёк. Сяржук некалі прызнаўся ў гутарцы, што ня любіць і не разумее рок-музыкі. Падобна мальераўскаму пэрсанажу, які ня ведаў, што ўсё жыцьцё гаворыць прозай, паэт і не здагадваўся, што ягоныя песьні маюць дачыненьне да року — калі не паводле формы, дык паводле зьместу.

Сілу можна зламіць сілай. Але тады на зьмену тырану прыходзяць іншыя тыраны. Сілу інэрцыі

й агульнай паныласьці, якая ёсьць апірышчам дыктатуры, можна зламіць толькі ironiяй, разьняволенасьцю ды адчуваньнем унутранай свабоды.

Можа быць, для пачатку прыдасца «Што мне рабіць?».

*Наша Ніва. 2005. 28 кастрычніка.*

## Хто вы?
### Думкі ў рэанімацыі пра «маўклівую большасьць» і «думаючую меншасьць»

**Дзень прымірэньня**

4 лістапада, у дзень, які ў Расеі сёлета вырашылі адзначаць як сьвята адзінства й згоды, у адным са шпіталёў беларускай сталіцы ледзьве не дайшло да бойкі. Адбылося гэта ў палаце нумар пяць — велізарнай, на чатырнаццаць ложкаў. У прынцыпе, нават пры бясплатнай мэдыцыне такіх ужо не бывае. Проста з-за рамонту шпітальнага будынку давялося часова перарабіць пад патрэбы хворых адміністрацыйнае памяшканьне.

Народ у палаце сабраўся спакойны, пераважна сталага веку. Так што спачатку нішто не прадвяшчала навальніцы. Як заўсёды, у «ціхі час» ішла ціхамірная калектыўная гутарка. Гаварылі пра цэны на гародніну — пра тое, што ўсё стала дарага, што на базары сёлета нічога, акрамя бульбы, таньней за «адзін рубель» ня купіш. Потым сталі распавядаць пра ўласныя гароды і пра тое, хто ды што там вырошчвае. Кожны выхваляўся якім-небудзь адмысловым сортам альбо рэцэптам прыгатаваньня якога-небудзь рэдкага адвару...

Паступова размова перакінулася на больш шырокую тэму сельскай гаспадаркі й вясковага жыцьця. Нехта выказаў думку, што жыць на вёсцы даўно стала немагчыма. Тыя, хто там яшчэ застаўся,

дажываюць свой век альбо сьпіваюцца. Усе пагадзіліся, і кожны прывёў свой прыклад на гэтую тэму. Нехта завёў гаворку аб неверагоднай колькасьці начальства, у тым ліку ў аграсэктары, якое нічога ня робіць, кіраваць ня ўмее, а толькі крадзе й вымагае грошы. Астатнія з гэтым пагадзіліся. Нейкі сьмяльчак пачаў гаварыць і пра найвышэйшае начальства, пра «магілёўскі клан», карупцыю й бязладзьдзе ў краіне. Пра тое, што пры камуністах можна было хоць кватэру бясплатна атрымаць, а цяпер грошай на тую кватэру за ўсё жыцьцё не заробіш. І зь ім таксама пагадзіліся.

Парушыў быў спакой адзін пацыент, які пачаў трэсьці газэтай ды абурацца. «Вы паглядзіце, што робіцца! Трэці Райх ім падавай!» Выявілася, што хваляваньне хворага выклікала нататка ў газэце аб тым, што нейкія маладзёны вывесілі ў цэнтры Менску транспарант з надпісам «Трэці тэрмін — Трэці Райх». «У калгас іх усіх! У калгас!» — абураўся пацыент. Суседзі па палаце зь ім моўчкі пагаджаліся. Бо калгас, вядома ж, самае страшнае пакараньне з усіх...

Адным словам, у палаце панавалі кансэнсус і згода.

Але тут да хворых завітала праваслаўная сястра-манашка. Ялейным голасам яна паведаміла: «Братья, сегодня у нас великий праздник! Праздник Казанской иконы Божьей матери!» Далей манашка прапанавала тым, хто не спавядае праваслаўнай веры, пайсьці пагуляць, а астатнім — паслухаць цудоўную гісторыю, зьвязаную з гэтай сьвятой іконай. Свой аповед манашка завершыла словамі аб тым, што копія іконы Казанскай Божай маці ў 1612 г. дапамагла цудоўнаму вызваленьню... «ад белапалякаў». Тут нехта з пацыен-

таў спачатку хмыкнуў, а потам голасна сказаў: «Дык белапалякі — гэта ж мы! Мы, беларусы!» Сэкунду ў палаце панавала ціша. Потым цішыня ўзарвалася. «Заткніся, быдла!..» «Сам ты быдла, гісторыі ня ведаеш!» «Маўчы, бо заб'ю!» «Дубіна ты!» «Хто, я дубіна?! Ну пачакай, я да цябе дабяруся...» Праваслаўнай сястры давялося зваць на помач сястрычак шпітальных, бо некаторыя хворыя пачалі ўжо ўскокваць з ложкаў і хапаць адзін аднаго за шманты. Урэшце, абышлося карвалолам. Але сяму-таму давялося ўшпіліць і ўкол.

Неяк незаўважна спрэчка сярод хворых перайшла на вечную тэму — ці ёсьць Бог, ці няма, і ўва што верыць? Выявілася, што ніхто з насельнікаў палаты ні ў царкву, ні ў касьцёл ня ходзіць, хоць большасьць лічаць сябе праваслаўнымі. Усіх суцешыў стары камуніст, які сказаў: «Ня важна, якой ты веры. Галоўнае, каб Бог быў у душы...»

Канчаткова прымірыла насельнікаў палаты паведамленьне пра тое, што прывезьлі вячэру. Пацыенты паўставалі са сваіх ложкаў, забразгалі лыжкамі й кубкамі ды пачалі займаць чаргу за пайкай — гэта значыць, маннай кашай і чаем.

### Ad absurdum

За некалькі дзён да апісанага здарэньня адна цэнтральная газэта надрукавала матэрыял, жанр якога вызначыць даволі цяжка. Паколькі імя аўтара ў газэце не названае, а робіцца спасылка на інтэрнэт, можна было б лічыць гэты матэрыял звычайнай ананімікай (спасылацца на інтэрнэт у якасьці крыніцы — прыкладна тое самае, што замест выходных зьвестак кнігі пазначыць, што яна ўзятая зь бібліятэкі). Уражвае, аднак, памер публікацыі — цэлая паласа, а таксама яе навуковапа-

добны, псэўдааб'ектывісцкі стыль. Справа, аднак, ня ў жанрах ці стылях. Справа ў зьмесьце. А зводзіцца ён у згаданай публікацыі да нескладанай думкі аб тым, што незалежныя сродкі масавай інфармацыі, як і ўвогуле праўдзівая інфармацыя аб тым, што дзеецца ў краіне, насельніцтву Беларусі непатрэбныя. Бо ніхто ня ведае й ня хоча ведаць ні пра якія незалежныя выданьні ці замежныя радыёстанцыі, не чытае іх і ня слухае.

Дакладна, як у старым анэкдоце. Калі замежны журналіст запытаўся ў савецкага чыноўніка, чаму ў савецкіх крамах няма крупчастай ікры, той адказаў: «А вы калі-небудзь чулі, каб нехта з пакупнікоў пытаўся ў прадаўцоў пра тую ікру?» «Не», — шчыра сказаў журналіст. «Ну, вось бачыце, проста на гэты прадукт у нас няма попыту», — усьміхнуўся чыноўнік.

Але калі нават згадзіцца з тэзай аб адсутнасьці патрэбы ў аб'ектыўнай інфармацыі — тэзай, пабудаванай паводле сярэднявечнага схалястычнага прынцыпу «Ad absurdum» (верую, бо абсурдна), дык і тады застаецца пытаньне. Навошта? Калі беларускае насельніцтва, згодна з публікацыяй у афіцыйнай газэце, ня верыць недзяржаўным мэдыям, а верыць выключна дзяржаўным сродкам масавай інфармацыі, навошта перасьледаваць гэтыя недзяржаўныя мэдыі? Навошта папярэджваць і зачыняць недзяржаўныя газэты, спаганяць зь іх фантастычныя штрафы, выкідваць са сьпісаў дзяржаўнай сыстэмы падпіскі ды распаўсюду? Калі нават «Народная Воля», скажам, ці «Салідарнасьць» ды «Згода» не прыносілі чаканага даходу Белпошце (арганізацыі, як можна здагадвацца, ня самай беднай у краіне), навошта было ісьці на надзвычайныя захады — датэрмінова

касаваць дамовы, рызыкуючы судовымі працэсамі ды скаргамі падманутых чытачоў? Навошта патрэбныя гучныя заявы Міністэрства замежных справаў аб недапушчальнасьці ўмяшаньня ва ўнутраныя справы краіны ў сувязі зь меркаванымі (!) плянамі Эўразьвязу наладзіць замежнае вяшчаньне для Беларусі? Навошта дэпартаваць замежных журналістаў, а айчынных — «перавыхоўваць» на лесапілках на падставе абвінавачаньняў у зьняваze гонару й годнасьці прэзыдэнта?

«Закон суровы, але гэта закон», — могуць мне адказаць старажытнай лацінскай прымаўкай. Маўляў, ня важна, што там пішуць «нячэсныя журналісты» ў сваіх «нячэсных выданьнях», — іх усё адно ніхто не чытае. Важна, каб яны датрымоўвалі закон і не выходзілі за ягоныя рамкі. Цудоўна! Толькі як тады быць са свабодай слова і забаронай на цэнзуру СМІ, зафіксаванымі ў дзеючай Канстытуцыі Беларусі?

Яе таксама не чытаюць жыхары Беларусі? Магчыма, большасьць людзей сапраўды ніколі ў жыцьці яе не чыталі — як не чыталі Дэклярацыі правоў чалавека. Але ж мы памятаем, што няведаньне закону не выбаўляе ад адказнасьці.

**Лёгкая цяжарнасьць**

Дазволю сабе сьцьвярджаць, што і Біблію ў сваім жыцьці чытаў далёка ня кожны чалавек. Ці ставіць гэты факт пад сумнеў біблейскія ісьціны й запаветы? Між тым, аўтар ці аўтары згаданай публікацыі ў дзяржаўным выданьні, ставяць пад сумнеў каштоўнасьць свабоды слова на той падставе, што хатнія гаспадыні альбо ўладальнікі легкавых аўтамабіляў больш любяць слухаць музыку, чымся даўгія размовы. Што ж, дайце ім хоць бы

магчымасьць слухаць тую музыку, якую яны хочуць, а ня тую, што прайшла празь сіта «75 працэнтаў».

Але ж не! Немагчыма быць крыху цяжарным. Свабода слова альбо існуе, альбо яе няма. А ўжо як выкарыстаць яе — дзеля высакародных мэтаў ці ў мэтах распаўсюду чалавеканенанавісьніцкіх ідэяў, залежыць ад саміх людзей. Людзі, грамадзтва маюць права абараняцца ад чалавеканенавісьнікаў, забойцаў і тэрарыстаў? Безумоўна. Дзеля гэтага існуюць закон, карны апарат, меры прымусу... І самае галоўнае — суд, які толькі й можа вырашаць, ці парушае закон або правы іншага чалавека тая або іншая публікацыя.

Калі заткнуць рот прэсе, тады становяцца непатрэбнымі ні суд, ні парлямэнт. Які сэнс у іх існаваньні, калі аб тым, што гавораць дэпутаты, ці аб тым, што робіцца ў судзе, усё адно ніхто не даведаецца? Ці даведаюцца толькі з афіцыйных выданьняў, дзе інфармацыя падаецца ў выгодным для ўладаў сьвятле. Рабі што хочаш, — імем закону, так бы мовіць.

Калі ў турме ў Гуантанама да зьняволеных сапраўды ўжываліся катаваньні, як і ў турме Абу-Грэйб, гэта ляжа чорнай плямай на рэпутацыю амэрыканскага ўраду. Такія дзеяньні ня могуць быць апраўданыя ніякімі спасылкамі на нацыянальную бясьпеку й барацьбу зь міжнародным тэрарызмам. Усё вельмі проста. Калі можна ўжываць катаваньні, тады ня можна здабыць ісьціны — гэта вядома яшчэ зь сярэдніх вякоў. Фанатыка ня зломяць ніякія катаваньні. А невінаваты чалавек можа прызнацца пад страхам у тым, чаго ніколі рабіў. А гэта азначае, насамрэч, канец юстыцыі і... нацыянальнай бясьпекі.

У рэшце рэшт, чалавек існуе для нацыянальнай бясьпекі ці нацыянальная бясьпека для чалавека? Гэтым пытаньнем, відаць, задаліся дэпутаты палаты гаспадаў брытанскага парлямэнту, калі адкінулі законапраект, прапанаваны прэм'ер-міністрам. Законапраект даваў магчымасьць трымаць падазраваных у тэрарызьме без высоўваньня абвінавачаньня тры месяцы. (Зусім звычайная практыка для Беларусі — прычым у выпадках, ніяк не зьвязаных з тэрарызмам.) Ні папулярнасьць Тоні Блэра, ні партыйная дысцыпліна (супраць законапраекту галасавала частка лейбарыстаў) не засланілі ад дэпутатаў важнасьці захаваньня правоў чалавека.

Калі адзін з брытанскіх часопісаў напісаў, што ў турме ў Гуантанама ахоўнікі апаганілі Каран і публікацыя выклікала масавыя хваляваньні ў мусульманскіх краінах, а інфармацыя ў выніку не пацьвердзілася, рэдакцыя пастанавіла, каб падобнага роду важныя паведамленьні друкаваліся толькі з дазволу галоўнага рэдактара ці ягонага намесьніка. Але размова вялася пра неабходнасьць правяраць інфармацыю, а не забараняць яе. Права журналістаў пісаць пра Ірак, Гуантанама і якія заўгодна тэмы гарантуе права амэрыканскіх грамадзянаў на ўласную бясьпеку — у тым ліку і тых грамадзянаў, якія ня хочуць ведаць праўды, ня любяць журналістаў і не чытаюць прэсы.

Хіба ў Расеі цэнзура інфармацыі, зьвязанай зь дзеяньнямі тэрарыстаў і антытэрарыстычнымі апэрацыямі дапамагла прадухіліць нядаўнія крывавыя падзеі ў Нальчыку ці гарантуе ад паўтарэньня падобнага ў будучым?

У колішнім СССР тэракт у маскоўскім мэтро, арганізаваны армянскімі нацыяналістамі, наглу-

ха замоўчваўся прэсай. Празь дзесяць гадоў пасьля таго тэракту ўзарваўся Нагорны Карабах, з чаго пачаўся развал Савецкага Саюзу. Ня робячы ніякіх параўнаньняў зь нядаўнімі выбухамі ў Віцебску, даводзіцца канстатаваць, што цяперашнія ўлады паводзяць сябе ў адносінах да свабоды слова гэтаксама, як паводзіла сябе савецкае кіраўніцтва, — акурат да таго моманту, пакуль ня выбухнуў Чарнобыль.

**Сталін і дыскурс**

Зразумела, у свабоды слова ёсьць і адваротны бок. Масавы чытач ва ўсім сьвеце чытае толькі тое, што яго цікавіць. І журналіст піша аб тым, што цікавіць чытача ягонага выданьня. Як заўважыў аднойчы адзін вядомы брытанскі выдавец, чытачы якой-небудзь Sunday Chronicle, хутчэй за ўсё, нават і не здагадваюцца, што недзе ў Іраку ідзе вайна. Яе чытачоў цікавяць адно пікантныя падрабязнасьці з жыцьця каралеўскай сям'і, рэцэпты печыва, спорт і надвор'е. Але ж у Ангельшчыне існуюць дзясяткі іншых выданьняў зь немалымі накладамі — такія, як The Daily Telegraph, The Guardian альбо The Independent. Чытачоў гэтых значна больш строгіх і сур'ёзных выданьняў цікавіць палітыка, і яны таксама, як і выдаўцы, ведаюць цану аб'ектыўнай інфармацыі, у тым ліку для бізнэсу.

У Беларусі ж салідныя дзяржаўныя газэты й паводле вёрсткі з агромністай колькасьцю каляровых здымкаў, стракатым дызайнам ды агромністымі загалоўкамі, і паводле зьместу ўсё больш нагадваюць заходнюю бульварную прэсу, разьлічаную на самы прымітыўны густ. Зразумела, чаго няма ў жоўтых выданьнях на Захадзе — дык

гэта афіцыйных дакумэнтаў, кіруючых указаньняў і палосных матэрыялаў, у якіх даводзіцца непатрэбнасьць свабоды друку.

Адваротны бок ёсьць, вядома, і ў дэмакратыі. Пра яго пісаў выдатны брытанскі пісьменьнік і філёзаф Джон Фаўлз, які зусім нядаўна памёр. На ягоную думку, самы непрыемны бок дэмакратыі палягае на тым, што ў выбарах удзельнічаюць усе — у тым ліку тыя самыя кухаркі, на якіх Ленін ускладаў вялікія спадзяваньні ў справе кіраваньня дзяржавай. Гэта значыць, што палітычная эліта грамадзтва й будучыня дзяржавы залежыць ад меркаваньня шырокіх масаў, якія могуць памыляцца, зь лёгкасьцю паддавацца падману й пасулам, купляцца на папулізм правадыроў. У выніку на самым версе могуць апынуцца ня самыя лепшыя й здатныя, але наадварот — самыя шэрыя, абмежаваныя, але хітрыя й больш зразумелыя так званаму простаму люду асобы.

Але дэмакратыя — прынамсі, разьвітая дэмакратыя — нідзе і ня зводзіцца да працэсу выбараў. Дэмакратычныя выбары — неабходная, але недастатковая ўмова дэмакратычнай дзяржавы. Няма патрэбы казаць пра галіны ўлады, сыстэму стрымальных мэханізмаў — усё тое, што ў Беларусі адсутнічае. Паказальна, што Аляксандар Лукашэнка, пры ўсёй быццам бы неабдымнасьці асабістай улады, нядаўна яшчэ далей пашырыў яе, дабавіўшы сабе права аднаасобна прыпыняць паўнамоцтвы судзьдзяў Канстытуцыйнага суду, а таксама прызначаць на гэтую пасаду.

Але варта сказаць пра тое, што ў Беларусі пакуль яшчэ захавалася і чаго нельга імгненна пазбавіць ніводную нацыю нават пры самай страшнай тыраніі. Гэта «думаючая меншасьць», пра якую

пісаў ангельскі гісторык Тойнбі, — меншасьць, якая паводле вызначэньня заўсёды знаходзіцца ў апазыцыі да дзеючай улады. Прычым яна ёсьць нават у шэрагах уладнай эліты, і з гэтым нічога нельга зрабіць, як ня можна забараніць сам працэс думаньня.

Можна, як гэта зрабіў Ленін у 20-я гады мінулага стагодзьдзя, пасадзіць усіх найбольш выдатных філёзафаў ды іншых навукоўцаў на параход і адправіць іх за акіян. Наступствы гэтага Расея адчувае на сабе дагэтуль, адчайна спрабуючы дагнаць ЗША, на долю якіх штогод выпадае найбольшая колькасьць нобэлеўскіх ляўрэатаў. Можна, як гэта зрабіў Сталін у 1930-я гады, перастраляць амаль усіх беларускіх настаўнікаў, навукоўцаў і літаратараў. Гэтыя дзеяньні, трэба прызнаць, прынесьлі свой катастрафічны эфэкт. «Думаючая меншасьць» у беларускім грамадзтве складае, мабыць, яшчэ меншую праслойку, чым дзе-небудзь у сучаснай Эўропе. Цемрашальства ў сёньняшняй Беларусі працьвітае ў самым непрыстойным выглядзе. Толькі ў сёньняшняй Беларусі рэдактар дзяржаўнай газэты можа пасьміхацца над словам «дыскурс», не разумеючы ягонага сэнсу. Трэба думаць, словы «антытэза», «постмадэрнізм» альбо «гіпэртэкст» павінны выклікаць у такога рэдактара прыступы нястрымнага рогату.

Але думаючая меншасьць у сёньняшняй Беларусі ўсё ж такі ёсьць. Для таго каб пераканацца ў яго існаваньні, няма сэнсу чытаць дзяржаўныя газэты ці глядзець БТ. Трэба зазірнуць, напрыклад, на сайт радыё «Свабода» і прачытаць на ім хоць бы адзін з выпускаў «Вострай брамы» Сяргея Дубаўца. Дзеля таго каб спрачацца з аўтарам перадачы, недастаткова ведаць слова «дыскурс»

альбо ўмець вышчарацца ды пасьмяхацца. Дзеля гэтага трэба, як мінімум, ведаць клясычны беларускі правапіс (які захаваўся, дарэчы, у агромністай ступені дзякуючы асабістым намаганьням Дубаўца, што адстаяў права «Нашай Нівы» ім карыстацца праз суд). Трэба ведаць гісторыю Беларусі, яе літаратуру, філязофію. Трэба любіць прадмет, аб якім ідзе гаворка. І трэба яшчэ ўмець думаць і ўмець спрачацца.

А цяпер пайдзіце на вуліцы і правядзіце апытаньне: колькі людзей слухае «Вострую Браму»? Колькі людзей ведае Сяргея Дубаўца? Колькі зь іх ведае ці чытала Акудовіча, Бабкова, Разанава, Роўду? Колькі зь іх ведаюць, хто такі Пазьняк, ці Хадыка? Колькі зь іх ведаюць беларускую мову? Колькі вераць у Бога? І што, на іх думку, ёсьць ісьціна? Аднойчы, між іншым, у гэтых людзей ужо запытвалі — ці патрэбная ім нацыянальная сымболіка? Большасьці выбарцаў, пазбаўленых элемэнтарных ведаў, яна да лямпачкі. Што й пацьвердзіў рэфэрэндум.

Калі ў чалавека ў галаве нуль інфармацыі — гэта ягоная асабістая праблема. Але, як казаў Станіслаў Ежы Лец, калі скласьці мільёны нулёў, вынік атрымаецца жахлівы.

На заканчэньне правядзем экспэрымэнт у думках: успомніце ўсе тыя імёны, якія згадваюцца ў дзяржаўных газэтах на самых відных месцах, штодня гучаць па радыё і тэлебачаньні і ўявіце, што прайшло сто гадоў. Якія з гэтых імёнаў застануцца вартымі таго, каб іх помнілі? Думаю, адказ відавочны нават для тых, хто сёньня гэтыя імёны ўслаўляе.

У рэанімацыі, калі стала крыху лягчэй, цяжэй за ўсё было прызвычаіцца да дзьвюх рэчаў. Да

неабходнасьці мачыцца ў вутку, прылюдна. І да стогнаў іншых хворых. Праз некаторы час, праўда, прывыкаеш да ўсяго.

Толькі вось старая алькагалічка, якая ляжала побач, здаецца, дастала ўсіх, у тым ліку мэдпэрсанал. Увесь час, з ранку да вечара, яна працягла паўтарала толькі адное слова, якое цяжка было разабраць. Але варта было прыслухацца — і ўсе сумненьні зьнікалі. Гэта было слова «б...». Пажылы лекар, перахапіўшы мой позірк у бок жанчыны (усё-ткі гэта была жанчына), з сумам заўважыў: «Вось і ўсё, што засталося ад ейнага жыцьця. У яе цыроз печані...» Потым лекар запытаўся: «Хто вы паводле прафэсіі?» Крыху падумаўшы, я адказаў: «Нячэсны журналіст». Лекар на імгненьне сумеўся, потым усьміхнуўся й падміргнуў... Жыцьцё працягвалася.

*Наша Ніва. 2005. 18 лістапада.*

# Адваротны бок месяца

**Сярэднявечча на пачатку стагодзьдзя**

Брытанская крымінальная паліцыя — Скотланд-Ярд — распачала афіцыйнае сьледзтва ў справе атручаньня былога афіцэра ФСБ Аляксандра Ліцьвіненкі ў Лёндане. Па сустрэчы са сваім італьянскім інфарматарам у рэстарацыі, падчас якой Ліцьвіненка разьлічваў атрымаць важныя зьесткі наконт забойства расейскай журналісткі Ганны Паліткоўскай, ён быў дастаўлены ў шпіталь зь цяжкім атручаньнем. У крыві Ліцьвіненкі быў выяўленыя сьляды талію і яшчэ аднаго яду, склад і паходжаньне якога пакуль што невядомыя.

Ліцьвіненка вядомы тым, што ў свой час публічна заявіў аб замаху, які, нібыта, рыхтавала ягонае ведамства супраць Барыса Беразоўскага. На эміграцыі ў Англіі Ліцьвіненка выпусьціў кнігу, у якой піша, быццам да выбухаў у жылых дамах у Маскве пры канцы 1990-х таксама мела дачыненьне ФСБ.

Успамінаецца даўняя гісторыя з расейскім пісьменьнікам Уладзімерам Вайновічам, якая здарылася зь ім перад тым, як той вымушаны быў эміграваць на Захад. Паводле Вайновіча, супрацоўнік КГБ падчас гутаркі зь ім незаўважна для суразмоўцы падмяніў пачак цыгарэт. Пасьля гэтага пісьменьнік адчуў на сабе моцнае псыхатропнае

ўзьдзеяньне нейкага рэчыва. Самае цікавае ў тае гісторыі, што знаёмыя Вайновіча адмаўляліся тады верыць яму й нават пасьміхаліся — лічылі, што ён стаў ахвярай уласнай параноі.

Успамінаецца й больш блізкая ў часе трагічная сьмерць Генадзя Карпенкі, аднаго зь лідэраў беларускай апазыцыі, чалавека, які карыстаўся высокім маральным аўтарытэтам. Лекары назвалі прычынаю сьмерці інсульт, які напаткаў Карпенку неўзабаве пасьля вячэры са знаёмымі журналістамі ў менскай рэстарацыі. Што стала непасрэднай прычынаю інсульту — невядома. Няма доказаў таго, што Карпенка мог быць атручаны. Тым больш, няма доказаў датычнасьці да раптоўнай сьмерці апазыцыянэра спэцслужбаў. Як, дарэчы, няма доказаў, што да атручаньня Ліцьвіненкі ў Лёндане спрычынілася ФСБ.

Выпадкі з атручаньнем, як паказвае старадаўняя ды найноўшая гісторыя, цяжка раскрываць. Досыць узгадаць выпадак зь Віктарам Ючанкам, які быў атручаны падчас выбарчай кампаніі ва Ўкраіне. Нягледзячы на тое, што Ючанка стаў прэзыдэнтам, сьледзтва ў гэтай справе дагэтуль не дало вынікаў.

Відавочна, што ва ўсіх гэтых выпадках арганізатары замахаў не абавязкова ставілі на мэце забіць сваіх ахвяраў. Куды больш важная для іх задача — запалохаць. І ня толькі канкрэтных асобаў, але й грамадзтва ў цэлым.

**Нішто безь нічога не зьнікае**

З гэтай задачай спэцслужбы, трэба прызнаць, спраўляюцца пасьпяхова. У часе перабудовы быў папулярны такі вершык: «У нас сейчас эпоха гласности, свобода слова нам дана. Но комитет гос-

безопасности запомнит наши имена». Тады гэты вершык выклікаў сьмех. А пасьля таго як з Лубянскай плошчы ў Маскве прыбралі помнік Дзяржынскаму, многім падалося, што разам зь ім адышла ў нябыт эпоха КГБ. Але ёсьць закон захаваньня рэчыва. Нішто бясьследна не зьнікае.

Яшчэ да таго, як копія таго помніка зьявілася ў Беларусі (а ўсьлед за ёй — і бюст Сталіна), перабудовачны вершык пачаў успрымацца ня як гумар, але як сумнае прароцтва.

Зноў, як у даперабудовачны час, людзі пачынаюць размаўляць паміж сабой з аглядкай. Яшчэ адзін стары савецкі жарт перастаў быць сьмешным: «Ты чытаў сёньняшнія газэты?» — пытаецца чалавек па тэлефоне ў свайго знаёмага. «Ціха, ціха! Гэта не тэлефонная размова!» — у страху адказвае суразмоўца. Дзяржаўныя газэты — нават «СБ», дазваляецца толькі выпісваць ці купляць. У крайнім выпадку, іх можна чытаць. Але ні ў якім выпадку не цытаваць і не камэнтаваць, тым больш публічна. Інакш можна чакаць непрыемнасьцяў. Сытуацыю прадбачыў Оруэл у рамане «1984» . (Больш за дваццаць гадоў мінула, як назва антыўтопіі састарэла, але сам зьмест раману — ні трохі!) У Міністэрстве праўды, разумеючы небясьпеку старых газэт, штодня цалкам перапісвалі іх, каб яны адпавядалі патрабаваньням моманту.

Аднак Оруэл недаацэньваў узровень цынізму ўлады ў будучыні. Ніхто ў дзяржаўнай прэсе не баіцца сёньня казаць адно, заўтра — процілеглае. Сёньня няважна, ці вераць людзі ў тое, што гавораць газэты і тэлебачаньне. Галоўнае — каб баяліся выказваць свае думкі, каб трымалі іх каля сябе. (Вось пішу гэтыя радкі, а ўнутраны рэдактар нашэптвае — лягчэй, лягчэй. Можа, ня трэба пісаць на гэтыя тэмы?)

Падпіска на выданьні, выкінутыя з каталёгаў «Белпошты», ператвараецца ў акт грамадзянскай мужнасьці. Таксама як і маўленьне па-беларуску ў публічным месцы.

**Аматары чапляць пагоны**

Але паралізуе волю людзей і грамадзтва ня толькі страх і вера ва ўсёмагутнасьць органаў бясьпекі. Ёсьць яшчэ другі бок мэдаля — узаемны недавер людзей, усеагульная падазронасьць і гатовасьць верыць у горшае.

Калі ў якой-небудзь грамадзкай арганізацыі насьпявае раскол — няйначай да гэтага спрычыніліся спэцслужбы.

Не пасьпеў Беларускі ліцэй прыпыніць зь нейкіх прычынаў заняткі, як папаўзлі чуткі — «да гэтага яўна спрычыніліся органы». Пра каго толькі не даводзілася чуць ад самых аўтарытэтных людзей — вось той, без усялякага сумненьня, служыць у КГБ. У таго пад цывільнай вопраткай пагоны лейтэнанта, а ў таго — нават палкоўніка. Такое гавораць часьцей за ўсё пра тых, хто больш навідавоку. Называць імёны няма сэнсу — кожны, хто хоць чымсьці вылучаецца на шэрым фоне, можа быць завочна «ўганараваны» рознымі званьнямі. А чаму, калі гэты апазыцыянэр такі сьмелы, яго дагэтуль не пасадзілі? А чаму, калі газэта сапраўды беларуская, яе яшчэ не забаранілі? А чаму гэты піша крытычныя артыкулы пра ўладу — напэўна, яшчэ недзе атрымлівае зарплату.

Яскравы прыклад такой псыхалёгіі — пытаньне, зададзенае галоўнаму рэдактару «ARCHE» Валеру Булгакаву падчас анлайнавай канфэрэнцыі на радыё «Свабода». Сэнс пытаньня зводзіўся да наступнага: ці не таму прыпынілі выхад вашага

часопісу, што вы разьлічваеце атрымаць грант? Спэцслужбы ў дадзеным выпадку ня згадваюцца, але яны як бы трымаюцца на ўвазе ў падтэксьце (хіба можна ў наш час атрымаць фінансавую падтрымку бяз згоды ці ведама ўладаў?).

Можна дапусьціць думку, што падобныя пытаньні ў часе анлайнавых канфэрэнцыяў задаюць супрацоўнікі спэцслужбаў. Але й гэтае цьвярджаньне з разраду спэкуляцыяў, якія толькі затуманьваюць сутнасьць справы.

Чаму так зацягнуўся працэс люстрацыі ў некаторых постсавецкіх краінах — напрыклад, у Латвіі? Не таму што КГБ захаваў там былую магутнасьць. Проста латвійскія палітыкі ня хочуць паўтараць чужыя памылкі. Усе, хто ў свой час трапляў у поле зроку органаў дзяржбяспекі, заносіліся ў картатэку. Нават імёны тых, каго «апрацаваць» не ўдавалася, засталіся ў адпаведных архівах, пад адпаведнымі мянушкамі. Так здарылася ў Польшчы, дзе ў ролі агента ГБ апынуўся нават... Лех Валэнса. А цень супрацы з СБ упала ледзь не на ўсіх былых лідэраў апазыцыйнага прафсаюзу і дзеячаў КОС-КОР. Тыя ж, хто нічым асаблівым не вылучаўся ў падпольлі, альбо ўвогуле трымаўся ўбаку ад нелегальнай дзейнасьці, аказаліся цяпер ледзьве не героямі нацыі.

### Адваротны бок месяца

Гэта звычайны вынік усіх рэвалюцыяў, пладамі якой, як вядома, карыстаюцца зусім ня тыя, хто іх ажыцьцяўляе.

Нядаўна былі абнародаваныя дакумэнты, зь якіх вынікае, што ня хто іншы, як Берыя, распачаў пасьля сьмерці Сталіна шырокую амністыю. І тычылася яна не «крымінальнікаў», як запэўнівалі

афіцыйныя гісторыкі, а непаўналетніх дзяцей, жанчын і старых — усяго ў 1953-м было вызвалена з ГУЛАГу амаль мільён чалавек.

Органы партыйнай і савецкай ўлады пачалі тады закідваць лістамі — што ж такое робіцца, чаму выпускаюць ворагаў народу? Абураліся тыя, каго прынята называць «простымі савецкімі людзьмі» — дворнікі, прыбіральшчыцы, дробныя службоўцы, настаўнікі ды хто заўгодна. Грамадзтва не было гатовае да рэабілітацыі ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў, і Берыя быў скінуты й абвешчаны... брытанскім шпіёнам. У што ахвотна паверылі масы. А вось у даклад Хрушчова на XX з'ездзе доўга не хацелі верыць.

Гэты факт я згадаў таму, што і ў беларускім грамадзтве таксама хапае добраахвотных памочнікаў улады, заўсёды гатовых напісаць данос на знаёмых і нават на сваякоў. «Усёмагутнасьць» сакрэтных службаў ва ўсе часы грунтавалася на тым, што яны зьвярталіся да цёмнага боку чалавечай душы. Гэты бок, як і ў Месяца, застаецца нябачным звычайнаму назіральніку.

Што з гэтага вынікае? Калі стваралася польская «Салідарнасьць», яе актывісты ведалі, што сярод іх ёсьць агенты спэцслужбаў. Але яны вырашылі ігнараваць гэты факт і дзейнічаць так, быццам усе аднолькава служаць супольнай справе. Яны паставілі на сьветлы бок чалавечай натуры. І ў канчатковым выніку выйгралі.

А што пладамі іх перамогі скарысталіся ўсе, у тым ліку й нягоднікі, — ня страшна. Прынамсі, гэтым людзям давялося прыкідвацца прыстойнымі людзьмі і хаваць да пары ад усіх цёмны бок сваёй душы. А гэта ўжо нядрэнна для пачатку.

*Наша Ніва. 2006. 24 лістапада.*

# Суцэльныя непрыемнасьці, альбо Антыапалёгія інтэрнэту

## Дурні ў бібліятэцы

Мой бацька прызвычаіўся друкаваць свае тэксты на пішучай машынцы. Шмат дзесяцігодзьдзяў нямецкая, яшчэ гэдээраўская «Эрыка» служыла яму верай і праўдай. Калі яна ламалася, бацька аддаваў яе майстру, і той рамантаваў яе за невялікую плату. Нядаўна яна зламалася чарговы раз, і цяпер гэта абярнулася сапраўднай драмай. Раптам выявілася, што не засталося ўжо майстроў, якія рамантуюць машынкі. А калі б нехта й узяўся — усё адно няма запчастак. Нават стужкі для машынак даўно ўжо не выпускаюць. Некаму сітуацыя можа падацца сьмешнай. Вось дзівак — друкаваў бы на кампутары, якія праблемы?

Для некаторых людзей гадоў майго бацькі трагедыі, сапраўды, няма. Яны асвоілі і кампутар, і электронную пошту, і з інтэрнэтам даўно на «ты». Але для майго бацькі, у якога зь дзяцінства былі праблемы зь любой тэхнікай (рыса, якую, на жаль, атрымаў у спадчыну і я), гэтая задача аказалася не пад сілу. Кампутар яго ня слухаецца, пачынае «глючыць» і капрызіць, як толькі бацька да яго падыходзіць. (Здаецца, фізыкі калісь назвалі гэта «сындромам Паўлі». Кажуць, як толькі выдатны нямецкі тэарэтык Паўлі ўваходзіў у экспэрымэн-

тальную лябараторыю, дык адразу ўсе прыборы там ламаліся.)

Тым ня менш, навінамі, якія зьяўляюцца ў інтэрнэце, на грамадзка-палітычных сайтах, бацька жыва цікавіцца, просіць для яго раздрукоўваць публікацыі. І ўсё ж да інтэрнэту як зьявы ён ставіцца зь вялікім падазрэньнем. (Як, дарэчы, і выдатны пісьменьнік-фантаст Станіслаў Лем, які папярэджваў, што інтэрнэт прынясе чалавецтву непрыемнасьці, у параўнаньні зь якімі ядзерная катастрофа падасца дзіцячай гульнёй.)

Асаблівы недавер і іронію выклікаюць у майго бацькі звыклыя параўнаньні інтэрнэту са своесаблівай гіганцкай бібліятэкай, дзе захоўваюцца амаль усе сучасныя веды (прычым сусьветная літаратура займае досыць невялікую частку гэтых ведаў). На ягоную думку, невук альбо дурань, якога пусьцілі раптам у бібліятэку Кангрэсу, не перастане быць ад гэтага невукам альбо дурнем. А чалавек, у якога ёсьць думкі, можа данесьці іх да сьвету неабавязкова праз пасярэдніцтва глябальнага сеціва. Галоўная ўмова — каб яны былі.

І тут, рызыкуючы падацца безнадзейным рэтраградам, я мушу пагадзіцца з маім бацькам. Найвялікшае вынаходніцтва апошняй трэціны мінулага стагодзьдзя — інтэрнэт — дагэтуль не прынесла людзям ані сапраўдных ведаў, ані шчасьця. Як не прынесьлі яго перад тым, карыстаючыся словамі Ільфа й Пятрова, прымус і аўтаручка.

**Пакаленьне «гэймэраў»**

Хай сучасныя маладзёны, якіх ужо назвалі пакаленьнем «геймэраў», раней асвойваюць кампутар, чым ровар (калі ўвогуле яго асвойваюць), і маюць хуткую рэакцыю, натрэніраваную ўдум-

лівай гульнёй у «Дум». Гэта не азначае, што яны спрэс навучыліся думаць ці хаця б чытаць і пісаць. Асабліва пісаць. Я ня маю на ўвазе «падонкаўскую мову», прыдуманую групай юных геніяў расейскага ЖЖ («Превед, Медвед!», «Аффтар жжот!» і «Аффтар, выпей йаду», «В Бабруйск, жывотнае!» зрабіліся неад'емнай часткай жывой мовы ў сеціве). У параўнаньні з мовай пераважнай большасьці чатаў і форумаў на ўсіх без выключэньня сайтах мова «падонкаў» выглядае ўзорам прыгожага пісьменства.

Перапіска на форумах мне асабіста больш за ўсё нагадвае «графіці» ў грамадзкіх прыбіральнях, дзе фантазія і сьмеласьць ананімных аўтараў насьценных надпісаў абмежаваная няразьвітым густам і мізэрным наборам моўных сродкаў.

Справа ў тым — і аб гэтым папярэджваў Лем, — што ўся summa tehnologiae Зямлі ёсьць ня чым іншым, як усяго толькі мыліцамі для чалавецтва, свайго роду ягонымі пратэзамі. Калі патрэбныя больш сучасныя аналёгіі — калі ласка, можна ўспомніць мэханічныя маніпулятары, з дапамогай якіх працуюць, напрыклад, з радыяактыўнымі дэталямі ў адмысловых боксах. Калі чалавек ня ўмее граць на фартэпіяна, дык гэтыя маніпулятары яму нічым не дапамогуць. А калі ідыёту даць у рукі мікрафон...Самі ведаеце, што з гэтага выйшла.

Так, інтэрнэт ня можа замяніць сабой камунікаваньня паміж людзьмі, якія ня ўмеюць і ня любяць камунікаваць з сабе падобнымі. Інтэрнэт дае магчымасьць імітацыі чалавечай камунікацыі, чагосьці кшталту «ананімнага сэксу» замест каханьня. Не выпадкова пераважную частку сеціва складаюць парнасайты і блогі.

Зразумела, усё сказанае пакуль у найменшай ступені тычыцца беларускага інтэрнэту — дакладней, беларускамоўнае яго часткі. Для таго каб у наш час карыстацца беларускай мовай у сеціве, трэба, як мінімум, ведаць яе хаця б у аб'ёме пачатковых клясаў, а па-другое — імкнуцца да чагосьці, што не ўваходзіць у сучасны стандартны набор матэрыяльных выгодаў.

Дарэчы, менавіта пакаленьне «гэймэраў» у Беларусі ўспрыняло сёлета ў сакавіку маральны імпэратыў усур'ёз і выйшла пасьля выбараў на Плошчу, рашуча адарваўшыся ад крэслаў ля кампутараў.

**Немаўля ў пустыні**

Зразумела, і валоданьне беларускай мовай таксама яшчэ ня робіць чалавека адукаваным, інтэлектуальным ці хаця б ветлівым і прыстойным. Водгукі на публікацыі на інтэрнэт-старонцы «Нашай Нівы», як правіла, даволі хутка надакучвае чытаць. І не таму, што ўдзельнікі дыскусіі амаль адразу забываюцца на прадмет гутаркі і зь лёгкасьцю пераскокваюць з аднае тэмы на іншую. А таму, што, як правіла, іх увогуле не цікавіць нічые думкі, акрамя ўласных. (Хаця многія аўтары, за адсутнасьцю ўяўленьня аб лёгіцы, за думку прымаюць меркаваньне ці проста сьцвярджэньне.) Далёка не ва ўсіх спрэчках нараджаюцца ісьціны. Ананімны водгук у інтэрнэце, як і надпіс у прыбіральні, мае на мэце зусім не высьвятленьне, хто мае рацыю, а хто — не. Іхная супольная мэта — самасьцвярджэньне любой цаной. За кошт бліжняга, зразумела.

Вось нехта Litvin (наколькі можна меркаваць, ён жа — Язэп Сыч) піша, што ён ніколі ня будзе

называць сябе прыніжальным словам «белорус», як ня будзе называць родную Літву «Беларусьсю». Бо гэта, на ягоную думку, рабскае слова, і ўсе, хто ім карыстаецца, — рабы, альбо калябаранты. Гісторыя Літвы, натуральна, сканчваецца XVII стагодзьдзем, пасьля чаго пачынаецца гісторыя акупацыі Бацькаўшчыны. (Я наўмысна ўтрырую і аб'ядноўваю розныя выказваньні розных аўтараў у адну тэзу, паколькі не зьбіраюся зь імі спрачацца — гэтыя выказваньні, спатрэбіліся мне толькі дзеля ілюстрацыі.) Такім чынам, у гісторыі не застаецца месца ні для БНР, ні для беларусізацыі, ні для Інбелкульту, ні для беларускіх акадэмікаў, ці пісьменьнікаў (асабліва тых, хто загінуў у гады Ўсясьветнай вайны ад нямецкіх куль — бо акупацыяй жа, паводле вызначэньня, можа быць толькі расейская). Нікога й нічога не было — ні ў XIX стагодзьдзі, ні ў XX-м. Чаго зьдзіўляцца, што і 100-годзьдзе «Нашай Нівы» прайшло амаль нікім не заўважаным.

Не было нічога добрага, вядома, і ў Рэспубліцы Беларусі на пачатку 1990-х гадоў, паколькі не было інтэлігенцыі, а кіраўніцтва Саюзу пісьменьнікаў Беларусі было «самым згодніцкім» (гэта ўжо з выказваньняў Андрэя Дынька). Не гісторыя, а суцэльная культурніцкая пустыня. Nihil.

І толькі аднаму пакаленьню — сучаснаму, іншымі словамі — «сабе, любімым» робяць выключэньне аўтары падобных інвэктываў. Нехта даўно заўважыў парадокс: няма нічога больш аднастайнага і кансэрватыўнага ў літаратуры і мастацтве за авангард. Кожнага разу новае пакаленьне «мадэрністаў» скідвае з «параходу сучаснасьці» Байрана, Пушкіна, Багушэвіча, Коласа з Купалам, Быкава. (Дарэчы, Быкаў, як бы на гэтым ні на-

стойваў адзін зь віртуальных наведнікаў «Нашай Нівы», ніколі не называў беларусаў «тупаватымі». Тыповы беларускі пэрсанаж Рыбак — здраднік, але ён зусім не тупы, у тым і трагедыя.)

Пачынаць кожнага разу зь сябе, то бок — з нуля, са сваёй уласнай творчасьці, быццам нікога і нічога вартага ўвагі не было да цябе на зямлі — гэта рыса, тлумачальная і даравальная ў падлетка. Дзіцячы нэгатывізм. У пераходным узросьце, як вядома, найбольш цэніцца фізычная сіла, а не інтэлект. Асаблівасьць нашага часу палягае на тым, што пад сілай разумеюцца ўжо ня толькі мускулы, але ўменьне карыстацца «маніпулятарамі» — напрыклад, тым самым інтэрнэтам. Любая нацыя праходзіць цераз хваробу росту.

Вось толькі хвароба зацягнулася. Біцэпсы і нават другасныя полавыя прыкметы ўжо зьявіліся, а твар — як у немаўляці, якому не даюць цукерку.

*Наша Ніва. 2006. 8 сьнежня.*

# Закон выпадковасьці

**Сонцаварот**

Пры канцы году засьпяшаліся на той сьвет дыктатары. Піначэт, Туркмэнбашы... Зразумела, два — гэта яшчэ не тэндэнцыя. Гэта ясна нават герою анэкдота пра чукчу і аленяў.

Але ёсьць яшчэ шэраг цікавых супадзеньняў. Ніязаў памёр 21 сьнежня — адразу пасьля свайго дня нараджэньня, у дзень нараджэньня Сталіна. 20 сьнежня ў Беларусі й Расеі дагэтуль адзначаецца як Дзень чэкіста. 19 сьнежня нарадзіўся Брэжнеў, 100-годзьдзе якога сёлета шырока адзначалася беларускай і расейскай грамадзкасьцю.

А ўжо 22 сьнежня, як вядома з астраноміі, — самы кароткі дзень у годзе, Сонцаварот, пасьля якога наступае Раство Хрыстова, Каляды.

Можна ўсё гэта назваць гульнёй у пэрліны. Выпадковыя супадзеньні можна знайсьці колькі і ў чым заўгодна. Але парадокс, ці наадварот — закон жыцьця, палягае на тым, што выпадковасьці ёсьць часткаю сыстэмы. (Як той казаў — у кожным шаленстве ёсьць свая сыстэма.) Кожны чалавек з уласнага досьведу ведае, што ў жыцьці можа тыднямі нічога не адбывацца, а потым наступаюць дні, калі самыя розныя падзеі сыплюцца адна за адной.

Вось прыклад, добра зразумелы журналістам: сёлета 28 лістапада адначасова адбываліся саміт кіраўнікоў дзяржаваў СНД, саміт NATO і візыт Папы ў Турэччыну. Кожная з гэтых падзеяў паасобку магла стаць цэнтральнай тэмай дня для мэдыяў. І нават саміт у Менску, ад якога нічога не чакалі, завершыўся скандалам. Для большасьці людзей у сьвеце тыя падзеі маглі нічога асаблівага ня значыць (калі не лічыць каталікоў і мусульманаў, для якіх візыт Папы ў Стамбул усё-ткі ня быў ардынарнай паездкай пантыфіка). Кожны сам для сябе вызначае, якія падзеі лічыць важнымі, а якія — не. Але незалежна ад таго, ці багатая біяграфія ў чалавека, ці яна бедная на падзеі і здарэньні, агульнае для іх тое, што яны не разьмяркоўваюцца раўнамерна.

Нобэлеўскі ляўрэат, хімік і філёзаф Ільля Прыгожын знайшоў гэтаму тлумачэньне. (Дарэчы, вось задачка для роздуму: Прыгожын — валёнскі навуковец або флямандзкі ці бэльгійскі навуковец-габрэй расейскага паходжаньня?) Вывучаючы тэрмадынаміку адкрытых нераўнаважных сыстэмаў (да якіх належаць большасьць сыстэмаў у сьвеце — ад газаў, якія пры награваньні пашыраюцца, да біялягічных папуляцыяў і грамадзтваў), навуковец прыйшоў ды высновы, што ўсе гэтыя сыстэмы нестабільныя. Бо заўсёды прысутнічаюць флюктуацыі — выпадковыя адхіленьні ад сярэдняга значэньня фізычных велічыняў. І яны будуць заўсёды. Нават калі тэмпэратура сусьвету ўпадзе да абсалютнага нуля, знойдзецца пара-тройка звар'яцелых часьцінак (атамаў альбо электронаў), якія будуць рухацца хаатычна, то бок непрадказальна. І менавіта ў хаосе, паводле тэорыі Прыгожына, любая сыстэма становіцца пасьлядоўнай і

стабільнай. Прычым, як у мікрасьвеце, на ўзроўні малекулаў, гэтак і ў сьвеце галяктык. З гледзішча гэтай тэорыі сьмерць дыктатара — усяго толькі дробная флюктуацыя ў маштабах сусьвету.

**І пажыцьцёвыя паміраюць**

Зразумела, гэтага не патлумачыш дыктатарам, якія жыцьцё бачаць як пасьлядоўнае нанізваньне перамог над ворагамі на стрыжань уласных інтарэсаў. Той жа Туркмэнбашы быў некалі нікому не вядомым бязбацькавічам. Стаў уладаром Туркмэністану, чалавекам-сонцам, помнікі якому з чыстага золата паставілі пры жыцьці. Іншая справа, ці надоўга застануцца гэтыя помнікі? Ці не пераплавяць іх для розных патрэбаў? Ці застанецца імя Ніязава ў гісторыі гадоў на дзесяць? А калі застанецца, дык што будуць распавядаць пра яго падручнікі? Магчыма, па-ранейшаму будуць славіць яго імя, раўнаючы з Богам. Магчыма — будуць ганіць. Магчыма, не ўспомняць ані словам. Ніхто гэтага зараз дакладна прадказаць ня возьмецца. І ў гэтым — таксама спадчына ўсходняга дэспата, які замкнуў усе мэханізмы дзяржаўнага і нават у многім прыватнага жыцьця сваіх падданых на сабе.

Праўда, самога Ніязава гэта ўжо ня тычыцца. Цяпер гэта не ягоная, так бы мовіць, праблема. Ён пражыў сваё жыцьцё так, як яму хацелася, наеўшыся салодкай улады поўнай лыжкай. Раскоша і занадта тлустая ежа спарадзілі павышаны ўзровень халестырыну ў крыві і сардэчную недастатковасьць. Жыў як Бог. Памёр як звычайны чалавек, як мільёны людзей да яго і пасьля яго. І гэта — галоўная непрыемнасьць, якая бянтэжыць дыктатараў усіх часоў і народаў.

Яны стараюцца аб гэтым ня думаць. Кіраўнік Беларусі, які першым выказаў спачуваньне туркмэнскаму народу ў сувязі са сьмерцю Ніязава, не паехаў на ягонае пахаваньне. Відаць, невясёлыя думкі наводзяць хаўтуры «пажыцьцёвага прэзыдэнта», які пражыў на сваёй «вечнай» пасадзе ўсяго сем гадоў. А яшчэ больш непрыемным падалося, што пахаваньне пакажуць усяму сьвету, і твайму народу таксама. А раптам ён убачыць і зразумее, што ніякая ўлада не бывае бязьмежнай і бясконцай, нават калі ты «ўсенароднаабраны» і ў цябе ўсё пад кантролем? Ніякія папраўкі ў Канстытуцыі не гарантуюць, што аднойчы нейкі жыцьцёва важны орган — ныркі, вантробы, сэрца альбо мозг — не адмовяцца служыць свайму гаспадару, першай асобе ў дзяржаве, наколькі б таленавітай гэтая асоба ні была. Сама думка аб непазьбежнасьці сьмерці падаецца гэтай асобе кашчуннай, здрадніцкай, няправільнай у сваёй аснове.

Дарэчы, гэта праблема зусім ня толькі «першых асобаў». Сярод маіх знаёмых сталых гадоў ёсьць вельмі адукаваныя і разумныя людзі, якія болей за ўсё на сьвеце баяцца размоваў пра сьмерць. Дакладней — пра сваю ўласную сьмерць, якая, у адрозьненьне ад сьмерці дыктатараў, экс-прэзыдэнтаў ці нават калегаў і сваякоў, выклікае пачуцьцё першабытнага жаху. Гэта спараджэньне таго самага атэізму, які з наваяўленай падвойнай страсьцю прапагандуе цяпер акадэмік Рубінаў ды іншыя дзяржаўныя ідэолягі. Атэізм як няверʼе ў чалавека і свабоду волі.

Старыя савецкія акадэмікі, як і іхны маладзейшы патрон, ня могуць не адчуваць, што чалавечы дух, маральныя каштоўнасьці ня так проста пад-

парадкаваць ідэалёгіі, і тым больш — начальству, якое спавядае толькі адзін прынцып: «Я — начальнік, ты — дурань». Яны, у тым ліку начальнікі сярэдняй рукі, адчуваюць, што пытаньні сьмерці вырашаюцца не ў высокіх кабінэтах, а недзе ў іншым месцы, недзе вышэй. Толькі яны баяцца ў гэтым прызнацца. Таму нават царква, таксама моцна сапсаваная дзесяцігодзьдзямі набліжанасьці й залежнасьці ад улады сьвецкай рознымі прывілеямі, імкнецца бліжэй стаць да людзей, чым улада адміністрацыйная. І таму яна ўспрымае царкву як канкурэнта.

Ці выпадкова сустрэча найвысокага кіраўніцтва з Сынодам Праваслаўнае царквы ў Беларусі і «ўшчуваньне» Філарэта адбылася наступным днём пасьля сьмерці Туркмэнбашы? Мабыць, гэтая сустрэча была даўно заплянаваная? Але, як мы памятаем, выпадковасьць — усяго толькі праява заканамернасьці.

**У чым соль?**

Зразумела, сьмерць дыктатара можа служыць слабым суцяшэньнем для сваякоў рэпрэсаваных і ўсіх пакрыўджаных уладаю.

Сама па сабе сьмерць ня ёсьць пакараньнем ці актам адплаты. Пры нармальнай хадзе гісторыі дыктатары сыходзяць самі, і помста прыходзіць да іх не зь нябёсаў, але ад жывых людзей, шляхам правасудзьдзя. Так здарылася зь Пінахэтам, так здарылася сёлета раней з Мілошавічам. Так можа здарыцца хутка з Хусэйнам.

Тут гаворка не аб тым, наколькі справядлівым быў суд над іракцкім дыктарам і ці можа быць маральнае апраўданьне сьмяротнаму пакараньню ў цывілізаваным сьвеце. Гэта, зноў жа, праблема,

якая павінна найбольш хваляваць саміх дыктатараў і іхных сваякоў.

Для людзей, якія жылі альбо працягваюць жыць пры дыктатуры, значна важней, што будзе далей зь імі самімі, з грамадзтвам у цэлым.

Расейскі прыдворны блазан Жырыноўскі, захлынаючыся сьлінай, крычаў з экранаў тэлебачаньня, што Туркмэнбашы быў ідэальным уладаром для Сярэдняй Азіі, што іншы туркмэнскаму народу і не патрэбны. «Туркмэнскаму» — чытай беларускаму, расейскаму, любому іншаму...

Але нават калі пагадзіцца з жырыноўскімі, быццам усялякага роду «башы» несьлі й нясуць свайму народу адно толькі дабро, што яны па-бацькоўску клапоцяцца аб ім, неразумным, дык і тады застанецца адно надзвычай важнае пытаньне. А што далей? Вось пабудаваў Ніязаў ідэальную дэспатычную дзяржаву, горад Сонца на чале з сабой любімым. І што? Чаму сёньня трасе многіх начальнікаў ня толькі ў Ашгабадзе, але ў Маскве і нават Кіеве? І чаму дзе-небудзь на Лёнданскай ці Такійскай таварна-сыравіннай біржах ня ўсе адчуваюць сябе спакойна?

Ды таму, што так званая «стабільнасьць» і «ўсеагульнае працьвітаньне», пра якія ўвесь час цьвердзяць дзяржаўныя ідэолягі постсавецкіх дыктатураў, усяго толькі адваротны бок нестабільнасьці і няпэўнасьці, якія нясуць народам аўтарытарныя рэжымы.

Вось чаму так нэрвуецца расейская палітычная (дый ня толькі палітычная) эліта з набліжэньнем прэзыдэнцкіх выбараў. Ва ўмовах амаль поўнай адсутнасьці дэмакратыі, прыкрытай, як фігавым лістком, дэкарацыямі Думы і Грамадзкай палаты,

асоба, у руках якой засяроджаная гіганцкая і практычна бескантрольная ўлада, становіцца вырашальным фактарам для ўсіх падначаленых, для ўсяе палітычнае канструкцыі.

Справа ня ў тым, што ўсе дыктатары ўсіх краінаў, якія прыгожыя словы яны б ні казалі, пры першай магчымасьці набіваюць кішэні грашыма і адкрываюць рахункі ў швайцарскіх банках ці ў філіялах на Кайманавых выспах. Усе людзі, асабліва калі яны выбіваюцца зь нізоў, паводзяць сябе ва ўладзе прыкладна аднолькава. Справа ня ў тым, што яны затыкаюць рот усім сваім крытыкам. Урэшце, бескантрольная ўлада ні з кім ня будзе цырымоніцца. З чаго б?

Справа ў тым, што дыктатура адбірае ў людзей будучыню і права самім вырашаць свой лёс. І калі сыходзіць дыктатар, для іх рушыцца сьвет. Яны рэальна ня ведаюць, што рабіць, паводле якіх правілаў іх цяпер прымусяць гуляць, якому богу служыць. Таму яны адразу, загадзя гатовыя аддаць права вырашаць за іх — а значыць сваю свабоду — іншым. Самы яскравы прыклад апошніх дзесяцігодзьдзяў — тое, што адбылося пасьля распаду СССР.

Толькі народы краінаў Балтыі змаглі рэальна скарыстацца шанцам, які дала ім гісторыя ў 1991-ым. Астатнія народы СССР палічылі за лепшае заставацца там, дзе яны былі на момант сьмерці Брэжнева. І з настальгічным надрывам успамінаць пра танную каўбасу. Нездарма адзін палітоляг назваў 100-годзьдзе з дня нараджэньня генсека 100-годзьзем бутэрброда з каўбасой.

Усе правы і свабоды мы самі зь лёгкасьцю і без шкадаваньня саступілі ў абмен на стабільныя пэнсіі і зарплаты. А дзе-нідзе — на бясплатныя газ і соль.

Магчыма, неабходнасьць плаціць за газ сапраўдную цану ў новым годзе дапаможа многім людзям у Беларусі ўпершыню задумацца і аб цане дыктатуры, і аб цане сваёй маўклівай зь ёй згоды.

У Беларусі, як і ў Расеі, трэба жыць доўга...

*Наша Ніва. 2006. 29 сьнежня.*

# Звыклае зло

**«Калі табе камсамолец імідж»**

Дачка нашых знаёмых, дзесяціклясьніца — разумная, таленавітая дзяўчына — нядаўна ў размове згадала, што яна ўступіла ў БРСМ. Згадала весела, нібы паміж іншым. Але паўза, якая павісла ўсьлед за гэтым паведамленьнем, сьведчыла аб тым, што дзяўчына чакала рэакцыі на яго. Не дачакаўшыся, яна ўздыхнула і сказала: некаторыя змаглі вытрымаць прэсінг у школе, я — не. І дадала нешта ў тым сэнсе, што такіх, як яна, — большасьць.

Я не знайшоў, што сказаць. Шчыра кажучы, ня ведаю гэтага й да сёньня. Бо разумею, што нават у тым выпадку, калі камунікацыя паміж людзьмі магчымая ў прынцыпе, наўрад ці я магу нешта патлумачыць. Мой уласны маральны досьвед ці погляд на жыцьцё застануцца толькі маім уласным досьведам. У лепшым выпадку — досьведам майго пакаленьня, калі на пакаленьне можна глядзець як на нешта цэласнае. І абсалютна бяз сэнсу навязваць свае погляды маладому пакаленьню, а тым больш павучаць яго.

Занадта шмат давялося б тлумачыць, браць пад увагу.

Напрыклад — тое, што ў 70-я гады мінулага стагодзьдзя камсамол быў дадзенасьцю для 16-га-

довых. Гэта была ўсяго толькі ўмова — адна з многіх — для таго, каб паступіць пасьля школы ў інстытут ці нават у ПТВ. Хто не хацеў нікуды паступаць, у абавязковым парадку ўступаў у камсамол у войску. Можна было рабіць кар'еру, можна было не рабіць. Камсамол да гэта не прымушаў, далёка ня кожны камсамолец уступаў у партыю. У камсамол ня бралі адзінак — напрыклад, калі гэтага не хацелі бацькі-баптысты. І пры гэтым ніякага ідэйнага фанатызму. У 80-я гады самі камсамольцы зь сябе весела зьдзекаваліся: «Если тебе комсомолец имидж — имидж крепи делами своимидж».

Але ўсё гэта не апраўданьне масавага савецкага канфармізму. Знаёмая дзяўчына значна разумнейшая, а значыць — лепшая за сваіх пагодкаў 70-х — 80-х гадоў. Яна ўсьведамляе, што саступіла чужому прэсінгу. Больш за тое, яна разумее, што зрабіла няправільна, саступіўшы, хоць і шукае маральнага апраўданьня.

Чаму я ўвогуле ўспомніў тую прыватную размову? Відаць, яна прыйшла мне на памяць паводле псыхалягічнага кантрасту, калі я чытаў палеміку ў ЖЖ на тэму будучай гадавіны сакавіцкіх падзеяў на Плошчы, а таксама рэакцыі на затрыманьні маладафронтаўцаў. Маю, найперш, на ўвазе палеміку на minsk_by, ну, і зразумела, інтэрнэт-камэнтары на сайце «Нашай Нівы».

**Рассоўваньне даляглядаў**

Першая рэакцыя нармальнага чытача — як добра, што ў нас так шмат патрыятычнай беларускай моладзі, неабыякавай да таго, што адбываецца і што адбудзецца ў краіне! Але пры больш уважлівым прачытаньні «пастоў» узьнікаюць падставы і для невясёлых думак.

Мне ўжо даводзілася выказвацца на гэтую тэму раней, але, рызыкуючы зноў выклікаць абурэньне заўсёднікаў ЖЖ, паўтаруся. Тэхнічны прагрэс сам па сабе (summa technologiae), павелічэньне спосабаў і хуткасьці камунікацыяў практычна мала што мяняюць у псыхалёгіі й сыстэме маральных каштоўнасьцяў чалавека. Тое, што колькасьць блогаў, дзёньнікаў і аўтараў у іх расьце з кожным днём у геамэтрычнай прагрэсіі, не вядзе аўтаматычна да зьяўленьня большай колькасьці сапраўдных літаратурных твораў. «Zianon-hop» тут, хутчэй, выключэньне, якое пацьвярджае правіла.

Магчымасьць выстаўляць і спампоўваць у сеціве зробленыя рознымі аўтарамі фатаграфіі і відэафільмы, музыку і г.д. — гэта цудоўна, гэта сапраўды рассоўваньне даляглядаў. Але гэта не вядзе, як пасьпяшаліся заявіць некаторыя філёзафы й культуролягі, да стварэньня нейкай новай рэальнасьці. Гэта, хутчэй, уцёкі ад яе.

Нездарма назва «пакаленьне геймэраў» даволі трывала ўвайшло ва ўжытак сацыёлягаў і сацыяпсыхолягаў на Захадзе. Для найбольш тыповых прадстаўнікоў гэтага пакаленьня характэрнае стаўленьне да жыцьця, як да нейкай гульні, дзе галоўнае — набраць як мага больш пунктаў. Зьмест яе можна мяняць, адвольна мяняючы парамэтры. Ды яшчэ мець пры гэтым у запасе некалькі прэміяльных «жыцьцяў».

Калі мы сьцвярджаем, што інтэрнэт ёсьць апошняй свабоднай зонай ў беларускім грамадзтве, мы гаворым паўпраўду. Так, інтэрнэт дае больш магчымасьцяў для праяваў свабоды, але ён ня робіць грамадзтва і чалавека больш свабоднымі, чым яны ёсьць. ЖЖ стварае ўнікальныя, неаб-

межаваныя магчымасьці для дыскусіі. Але ці шмат ад яе карысьці, калі ўсе яе ўдзельнікі застаюцца ананімнымі? Я зусім не заклікаю «раскрываць псэўданімы», у чым папракалі мяне некаторыя аўтары. Больш за тое, я лічу ананімнага аўтара (ці аўтараў) «Зянон-хопа» сапраўды вольнымі людзьмі. Але ананімнасьць як прынцып існаваньня, як ухіленьне ад маральнай адказнасьці, як права казаць толькі тое, «што хачу», як адсутнасьць зваротнай сувязі я лічу прыкметай нашага часу. Прыкметай канфармізму, узьнятай на шчыт, прыкметай аморфнасьці ідэалаў і прынцыпаў, прыкметай грамадзянскай анэміі.

**Пасьля Плошчы**

Мне могуць нагадаць вядомую байку пра тое, што няма сэнсу наракаць на люстэрка. Цалкам пагаджуся з гэтым. І нават, насуперак таму, што казаў вышэй, хачу сказаць, што не заўважаць гэтага адлюстраваньня ня можна. Трэба і заўважаць, і вывучаць, і намагацца зразумець. З гэтага гледзішча мне падаецца асабліва важным прыгледзецца да інтэрнэт-дыскусіі вакол меркаванай даты выхаду на Плошчу ў сакавіку. У тым і справа, што ў віртуальным дзёньніку абмяркоўваецца справа. Абмяркоўваецца пытаньне — што рабіць? Якое мае абсалютна канкрэтны сэнс для многіх маладых людзей.

Перад імі паўстала дылема: ісці на плошчу 19-га (альбо 20—23-га) ці 25 сакавіка?

25 сакавіка — гэта ня проста дата, выбраная аргкамітэтам па правядзеньні масавай акцыі. Гэта ня толькі той дзень, калі Казулін павёў людзей на Акрэсьціна. Гэта Дзень Волі. Для многіх маладзёнаў, як паказвае дыскусія, гэта ўсяго толькі

гісторыя. Гісторыя нейкай БНР. Можна абурацца адсутнасьцю павагі да гісторыі, неразуменьнем важнасьці гэтае даты — 25 сакавіка 1918 году — для Беларусі. А можна задацца пытаньнем: хто вінаваты ў тым, што ў патрыятычнай беларускай моладзі сфармавалася такое стаўленьне да Дня Волі?

Толькі ня трэба ва ўсім абвінавачваць БТ і дзяржаўную прапаганду ў цэлым.

Хто за дзесяць зь лішнім гадоў незалежнасьці Беларусі зьвёў сьвяткаваньне гэтай даты да сьціплых імпрэзаў у Доме літаратара ці тэатральных залях (калі яшчэ можна было дамовіцца аб іх арэндзе)? Лідэры дэмакратычных партыяў, дзеячы адраджэньня па чарзе адзначалі Дзень Волі ў Празе, прамаўляючы над магіламі Крэчаўскага і Захаркі, у той час як у Менску звыкла арыштоўвалі чарговых маніфэстантаў на чарговай маніфэстацыі пад бел-чырвона-белымі сьцягамі. Да пэўнага часу гэта здавалася натуральным і звыклым. Але пасьля Плошчы, дзе купка моладзі здьзейсьніла акт непакоры, пасьля таго як Казуліна засудзілі на 5 гадоў няволі, калі маладзёнаў пачалі кідаць у турму ўсяго толькі за прыналежнасьць да незарэгістраваных арганізацыяў, падобныя рэчы пачалі ўспрымацца інакш.

Вядома, свабода перасоўваньня ёсьць неад'емнай і натуральнай часткай грамадзянскіх свабодаў. Вядома, так званы сьпіс «Д», паводле якога вядомых палітычных і грамадзкіх дзеячаў на беларускай мяжы надглядаюць, так бы мовіць, па поўнай праграме, распранаючы да трусоў, ёсьць грубым парушэньнем гэтай свабоды й зьдзекам над чалавечай годнасьцю. Аднак, калі пра канфіскацыю грошай альбо нейкай апаратуры памежнікамі ў вядомага грамадзкага дзеяча паведамля-

юць на дэмакратычным сайце як пра галоўную навіну, ледзь не як пра злачынства супраць чалавечнасьці, гэта спараджае пытаньні. Напрыклад, а ці ня зьбіўся, часам, прыцэл у некаторых дзеячаў апазыцыі? Ці пачалася ў іх абэрацыя зроку?

**Значкі ці сымбалі?**

Ёсьць і іншыя пытаньні да лідэраў апазыцыі. Чаму БНФ і іншыя партыі разам з іх лідэрамі маўкліва паглядалі на тое, як бел-чырвона-белыя сьцягі паступова зьмяняюцца «джынсавай сымболікай», нібыта больш блізкай і зразумелай моладзі? Нават тэрмін «джынсавая рэвалюцыя» быў ухвалены на высокім узроўні. Прыдумляліся ўсё новыя знакі й значкі з эмблемамі — у той час, як гістарычныя сымбалі разам зь беларускай мовай як галоўным сымбалем і набыткам нацыі ўсё больш адыходзілі на маргінэс. І нават калі моладзь выйшла на абарону падручнікаў гісторыі на роднай мове, «вяршынька» дэмсілаў знайшла ўсяго некалькі словаў ухвалы для гэтае акцыі, ясна даючы зразумець. што ў яе ёсьць справы больш важныя.

Больш важнай справаю, як хутка высьветлілася, стала вылучэньне ды адстойваньне прынцыпу «ратацыі лідэра». (Прасьцей кажучы: парулііў — дай паруліць іншаму.) Выглядае, менавіта з гэтай мэтай, а не дзеля таго, каб разабрацца ў тым, што адбылося ў грамадзтве за апошні год, прааналізаваць уласныя памылкі і галоўнае — зразумець, што рабіць далей, склікаецца чарговы кангрэс.

Усё гэта бачыла, не магла ня бачыць тая моладзь, якая выйшла на Плошчу ў 2006-м.

Прынцып «ювэнільнасьці» тут ні пры чым. Прыналежнасьць да маладога пакаленьня само

па сабе нічога ня значыць, нікога не апраўдвае і не дае ніякіх прывілеў. Маладосьць, як вядома, гэта такі недахоп, які хутка выпраўляецца. У палітыцы дзейнічае той самы прынцып, што і ў паэзіі — калі ты пачаў, дык ужо не пачатковец, і пра цябе будуць думаць паводле агульных крытэраў.

Але ёсьць яшчэ адна рэч, якая з узростам толькі расьце, — гэта адказнасьць. Большая палова ўдзельнікаў дыскусіі ў ЖЖ выказвае не прэтэнзіі, а жорсткае патрабаваньне да Мілінкевіча, Лябедзькі, Вячоркі, іншых дэмакратычных лідэраў (і моладзевых — таксама!) — даць справаздачу перад тымі людзьмі, перад якімі яны выйшлі на Кастрычніцкую плошчу 19 сакавіка. Якім абяцалі пасьля разгону намётавага лягеру працяг барацьбы, стварэньне шырокага руху і шмат чаго яшчэ. Не «дзякуй, сыходзьце!» — такі лёзунг мог быць актуальны яшчэ год таму. А — справаздача. І не ў кулюарах кангрэсу, а на Плошчы.

Гэтая ідэя мне асабіста падаецца ўтапічнай. Нават трошкі наіўнай. Ніхто зь беларускіх дзеячаў яшчэ ніколі не прызнаў сябе вінаватым у тым, што нешта не ўдалося, ці атрымалася ня так, як яны абяцалі. Заўсёды ў гэтым былі вінаватыя іншыя — Лукашэнка, Пуцін, Зімоўскі, Мілінкевіч з Казуліным, Захад...

Я ўпэўнены, што заўтра з вуснаў каго-небудзь з апазыцыянэраў прагучыць сакрамэнтальнае «палітычна нясьпелая моладзь не разумее...»

Так, моладзь ня хоча шмат чаго разумець. Але яна вучылася ў нас — больш не было ў кога. Так што прэтэнзіі да настаўнікаў.

Нават у самых сьмелых прапановах у ЖЖ не гаворыцца пра тое, што трэба нешта мяняць. Гаворыцца толькі аб тым, калі і куды выйсьці на

Плошчу з найменшым уронам для маніфэстантаў. «Каб ня надта білі». Адчуваецца нявер'е ў свае сілы, адсутнасьць ініцыятывы, часам нават адчай. Хто ў гэтым вінаваты?

І якія словы тут могуць дапамагчы?

Толькі справа. Нічога, акрамя справы.

*Наша Ніва. 2007. 9 лютага.*

# Канец антыўтопіі

**Мюнхэнскі сьпіч**

Амаль усе камэнтатары й палітолягі, у тым ліку — расейскія, сыходзяцца на тым, што Ўладзімер Пуцін у сваёй прамове на міжнароднай канфэрэнцыі бясьпекі ў Мюнхэне не сказаў нічога новага. Заходніх аглядальнікаў (але толькі не сур'ёзных палітыкаў) уразілі, хутчэй, тон прамовы, чымся ейны зьмест. Некаторыя згадалі нават Хрушчова, які грукаў чаравікам па трыбуне ААН. Але галоўнае было нават ня ў тым, як прамаўляўся сьпіч, а ў тым, каму ён быў прызначаны.

Прыкладна тое самае паводле сэнсу Пуцін заўсёды раней прамаўляў перад унутрырасейскай аўдыторыяй: Захад нас падмануў, ЗША праводзяць аднапалярную, імпэрыялістычную палітыку, скіраваную супраць інтарэсаў Расеі, NATO наш вораг, АБСЭ ёсьць заслонай заходніх інтарэсаў, хопіць нас вучыць дэмакратыі і г.д. Але дагэтуль Пуцін вызначаўся ўменьнем гаварыць тое, што аўдыторыя чакала ад яго пачуць. Для расейскай аўдыторыі — адно, для замежнай — нешта іншае. У сьпічы ў Мюнхэне ўсё зьмяшалася.

Пасланьне расейскім «сілавікам» і полісамэйкерам, пасланьне свайму электарату, у якога папулярнасьць Пуціна і без таго, калі верыць сац-

апытаньням, зашкальвае за 80 адсоткаў, і пасланьне лідэрам «вялікай сямёркі» — той самай семкі вядучых краінаў сьвету, якую прэзыдэнт Расеі яшчэ нядаўна прымаў у Санкт-Пецярбургу на правох краіны-гаспадара сустрэчы G-8.

Сьпіч прамаўляўся ў маленькай залі, дзе прадстаўнікі заходніх краінаў, у тым ліку міністры і прэмьеры сядзелі, як школьнікі, радком, ледзь не судакранаючыся плячыма, а дыстанцыя паміж імі і прамоўцам на трыбуне была ўсяго пару мэтраў. Гэтая аўдыторыя прызначаная была для нефармальнай, давяральнай размовы на тэмы сучаснай палітыкі, а не для гучнай афіцыёзнай рыторыкі ў стылі «халоднай вайны». Менавіта гэтае несупадзеньне месца й стылю паводзінаў у першую чаргу й выклікала ў міжнародных аглядальнікаў шок. Навошта крычаць у мэгафон у твар суразмоўцы, калі можна спакойна пагаварыць на любыя тэмы?

Тлумачэньне можа быць толькі адно — ад суразмоўцы не чакалі адказу. Калі праўду кажуць, што замежная палітыка ёсьць працягам унутранай, дык нічога іншага ад Пуціна нельга было чакаць. Ён даўно, амаль зь першых дзён свайго прэзыдэнцтва, адмовіўся ад дыялёгу з грамадзтвам. У КГБ, канечне, прывучалі супрацоўнікаў слухаць грамадзянаў — што і дзе яны кажуць, і нават запісваць сказанае, але зусім не дзеля таго, каб да іх прыслухоўвацца, ці ўступаць у дыялёг. Хіба допыт у сьледчага можна назваць дыялёгам? А можа, дыялёгам у Расеі цяпер лічацца шматгадзінныя прэс-канфэрэнцыі, падчас якіх журналістам дазваляецца называць прэзыдэнта «непараўнальным»?

Адказу заходніх палітыкаў на інвэктывы Пуціна не было таму, што гэта было ўспрынята як

правакацыя. І нават ня тое, каб сапраўдная правакацыя ў духу «халоднай прапагандысцкай вайны», а проста як свайго роду мавэтон. Справа ў тым, што ў сьпічы расейскага прэзыдэнта прысутнічаў яшчэ адзін малапрыемны момант...

Вядома, што адміністрацыя Буша і ён сам перажываюць цяпер не найлепшы пэрыяд. Вайна ў Іраку і стаўленьне да яе раскалола амэрыканскае грамадзтва, найперш — ягоныя эліты, прычым большасьць ужо не на баку Буша. Злучаныя Штаты за апошні час страцілі пазыцыі, іх ранейшы ўплыў і аўтарытэт ня толькі на Блізкім Усходзе, ці ў Азіі ў цэлым, але нават у саюзнай Эўропе саслабеў.

І як бы ні разьвіваліся падзеі далей, якой бы ні была палітыка дэмакратаў у кангрэсе, ясна, што палітычная кар'ера цяперашняга прэзыдэнта хіліцца да завяршэньня. Нездарма ўжо цяпер, за два гады да заканчэньня прэзыдэнцкага тэрміну, у ЗША фактычна пачалася поўнамаштабная перадвыбарчая кампанія.

У гэтай сытуацыі крытыкаваць саюзьніка ў барацьбе зь міжнародным тэрарызмам, «сябра Буша», які некалі разгледзеў у вачох «сябра Пуціна» душу, — гэта ня проста здраджваць сябру. У палітыцы, як вядома, сяброў не бывае. Але гэта тое самае, што пінаць мёртвага льва.

Тое, што Пуцін потым апраўдваўся, быццам у яго захоўваюцца добрыя стасункі з Бушам, толькі падкрэсьлівае цынізм расейскага кіраўніка. А тое, што Буш вельмі спакойна й міралюбна адгукнуўся на выпады расейскага калегі, выглядала таксама вельмі натуральна і галоўнае — прыстойна. Яшчэ раз пацьвердзілася старая ісьціна наконт прыстойных людзей, якія ставяцца да нягоднікаў, як

да прыстойных людзей, і нягоднікаў, якія ставяцца да прыстойных людзей як да нягоднікаў.

**Выбарнае самаўладзьдзе**

Справа, зразумела, ня ў Пуціну. Ён зрабіўся закладнікам аўтарытарнай сыстэмы, пабудаванай у Расеі — праўда, пры ягоным непасрэдным актыўным удзеле. Расейская паліталягіня Лілія Шаўцова вельмі трапна назвала гэтую сыстэму выбарным самаўладзьдзем. Пуціну вельмі хацелася б сысьці, зьняць зь сябе груз дзяржаўнай адказнасьці — гэта відавочна. Але ж паплечнікі, лёс якіх разам зь іхным дзяржаўным бізнэсам залежыць ад таго, хто будзе уладарыць у Крамлі, сысьці яму не дадуць. І гэта таксама відавочна. Пуцін, напэўна, гэта ўжо зразумеў ці вось-вось зразумее.

Аднак, дакладна прадказаць, як будуць разьвівацца далейшыя падзеі ў непрадказальнай Расеі сёньня, відаць, ніхто ня ў стане, у тым ліку й Пуцін. Але, падпарадкуючыся інстынкту, ён робіць прэвэнтыўныя захады, каб прадухіліць магчымую (а можа, і цалкам рэальную) небясьпеку для ўласнай пэрсоны. Тым больш што гісторыя расейскай дзяржавы, у якой самаўладзьдзе сталася выбарным зусім нядаўна, сьведчыць — уладары яе часта сыходзілі не па сваёй волі, асабліва ў XX стагодзьдзі. Таму Пуцін, як чалавек адукаваны й дасьведчаны, дакладна ведае — галоўнае не паказаць слабасьці патэнцыйным спаборнікам. Інакш — парвуць на шматкі, як сабакі. Таму ён і вымушаны пазыцыянаваць сябе як жорсткі лідэр супэрдзяржавы, хоць тае супэрдзяржавы няма і на ўспаміне.

А тое, што гэтая дзяржава ніколі ня будзе лібэральнай ці хоць бы дэмакратычнай, ужо даўно

ўсім зразумела, у тым ліку й на Захадзе. Сувэрэнная дэмакратыя гучыць гэтак сама пераканаўча, як некалі — сацыялістычная, альбо рабоча-сялянская дэмакратыя. Яна, калі памятаеце, была найвышэйшай формай дэмакратыі ў сьвеце, вось толькі на Захадзе ніхто яе дэмакратыяй не лічыў.

Відавочна, пануючай клясе — прынамсі, яе вяршыньцы, у Расеі надакучыла пераконваць Захад у тым, у чым яго немагчыма пераканаць, — быццам Расея працягвае ісьці дэмакратычным шляхам. Паводле расейскага прыслоўя — палюбіце нас чорненькімі, а беленькімі нас кожны палюбіць.

Гэта сьведчыць яшчэ і аб тым, што расейскай эліце няма справы да расейскіх грамадзянаў і да будучыні сваёй краіны. Нафтадаляры забясьпечваюць будучыню прадстаўнікоў гэтай эліты, якія трымаюць грошы пра запас на Захадзе, і будучыню іхных дзяцей, якія там навучаюцца й жывуць. Усё астатняе эліты ня тычыцца.

А дзеля таго, каб забясьпечыць надалей свой спакой і магчымасьць неабмежавана высмоктваць энэргарэсурсы з расейскіх нэтраў, народу трэба кінуць костку — але ня ў выглядзе псэўдадэмакратыі ці правоў чалавека, у якія расейскія грамадзяне ніколі ня верылі й ня вераць, а ў выглядзе нацыянальнай ідэі. Гэтая ідэя неяк амаль незаўважна трансфармавалася апошнім часам у «расейскую ідэю» альбо ў «расейскі праект», які раскручвае цяпер па заданьні «Адзінай Расеі» яе актывіст, праваслаўны тэлепрадусар, колішні вядоўца «Музобоза» Іван Дзямідаў.

Ня трэба мець багатай фантазіі, каб уявіць, да чаго гэты «праект» можа прывесьці ў краіне, дзе ксэнафобскія настроі без таго дасягнулі высокага градусу.

Лідэр думскай фракцыі «Радзіма» Бабурын нядаўна заявіў з экрану тэлебачаньня, што ў Расеі ніколі не было пагромаў. Гэтаксама герой аднае савецкае літаратурнае пародыі 1970-х гадоў— палкоўнік КГБ, казаў свайму сыну пра 1937-мы год: «Яго не было, але будзе». Цікава, што вядучы тэлепраграмы, у якой выступаў Бабурын, прамаўчаў, хаця мог бы тое-сёе распавесьці пра габрэйскія пагромы пачатку XX стагодзьдзя ў Адэсе, Кіеве, Гомелі ды іншых гарадах Расейскай імпэрыі.

**Шматпалярнасьць апраметнай**

Што тычыцца імпэрыі, дык насамрэч для яе, кажучы словамі Эвангельля, «няма ні эліна, ні юдэя». Ёй няма справы да нацыянальнасьці салдата, які гіне за інтарэсы мэтраполіі на палях вайны. Мала таго, замежная экспансія Рымскай імпэрыі ў пэрыяд яе росквіту, як мы ведаем зь гісторыі, грунтавалася на дэмакратыі — наяўнасьці свабодных грамадзянаў і выбарнага сэнату. Разлажэньне рэспублікі і пераход да тыраніі імпэратараў азначаў блізкі заняпад імпэрыі.

Расейская імпэрыя заўсёды была імпэрыяй асобага тыпу. Яе замежная экспансія заўсёды дапаўнялася тыраніяй і гвалтам супраць усіх народаў, якія ўсе амаль у аднолькавай ступені былі яе рабамі.

«Росквіт» гэтай імпэрыі пры Сталіну працягваўся зусім нядоўга паводле гістарычных мерак. Спроба абвесьціць расейскі народ «народам-пераможцам», якому ўсе астатнія народы вінныя да скону свайго існаваньня (а некаторыя зь іх — кшталту крымскіх татараў, чачэнаў, туркаў-мэсхэтынцаў, габрэяў — абвяшчаліся народамі-здраднікамі, каб апраўдаць іхнае пагалоўнае высяленьне), гэ-

тая спроба ні да чога не прывяла. Савецкая паводле формы й ксэнафобская паводле зьместу камуністычная дзяржава ня вытрымала спаборніцтва з Захадам.

Ні да чога не прывялі й сутаргавыя спробы аднавіць СССР (хаця б у межах Беларусі й Расеі). Ініцыятарам іх парадаксальным чынам выступіў першы прэзыдэнт незалежнай Беларусі Аляксандар Лукашэнка. Але пра гэта — крыху ніжэй.

Ня маючы былой ядравай моцы, саступаючы ў эканамічнай моцы дзясятку краінаў, нават значна меншых за яе паводле прыродных і людзкіх рэсурсаў, Расея сапраўды спрабуе знайсьці сабе новую нішу ў геапалітычнай структуры сьвету. Каб зь ёй зноў пачалі лічыцца — так, як лічыліся з атамным монстрам, з ракетамі ў 1960-я.

Нядаўна Генштаб РФ у адказ на плянаванае разьмяшчэньне элемэнтаў ПРА ў Польшчы й Чэхіі прыгразіў выхадам Расеі з Дамовы аб ліквідацыі стратэгічных ракет сярэдняй і меншай адлегласці. І што, вельмі ён гэтым напалохаў Пэнтагон?

Дастаткова ўзгадаць, што пры канцы 1980-х, калі пачаўся вывад гэтых ракет — дарэчы, найперш, з тэрыторыі Беларусі, — іх было ў савецкага войску нашмат больш, чым цяпер ёсьць у Расеі. Але ж тагачаснае савецкае кіраўніцтва цьвяроза разумела, што ня ў колькасьці ракет перавага, а ў найноўшых тэхналёгіях.

І цяперашнія цьмяныя заявы расейскага галоўнага камандуючага пра нейкую таямнічую звышэфэктыўную зброю новага пакаленьня, здольную процістаяць амэрыканскім ракетам, выклікаюць на Захадзе ўсьмешкі.

(Між іншым, калі журналісты ў Мюнхэне зьвярнуліся да міністра абароны ЗША Гейтса па ка-

мэнтар да выступу Пуціна, той толькі ўсьміхнуўся ў адказ.)

Аб якой вайсковай моцы можна казаць, калі амаль кожнага дня ў расейскім войску каго-небудзь катуюць, нявечаць, расстрэльваюць, кідаюць у печку, гвалтуюць, дзе ўсяляк зьневажаюць шараговых салдатаў, а міністра абароны пераводзяць за гэта на павышэньне? Пра які маральны дух і патрыятызм тут можна гаварыць?

Калі Расея і можа знайсьці годнае для сябе месца ў сьвеце — дык гэта сьвет усходніх дэспатыяў, аўтарытарных фундамэнталісцкіх рэжымаў. Пуцін і не хаваў гэтага, накіраваўшыся пасьля Мюнхэну ў Саўдаўскую Арабію, дзе зноў паўтарыў свае антыамэрыканскія тэзы. І што з таго, што лёнданская газэта «Аль-Гаят», якая фінансуецца з Арабіі, іранічна адазвалася пра спробы расейскага кіраўніцтва адрадзіць колішнюю араба-савецкую дружбу? Унутраны складнік новага старога курсу Масквы ў замежнай палітыцы гэта не мяняе.

З другога боку, фундамэнталізм не абавязкова мусіць быць ісламскім. Калі ўлічыць той імпэт, зь якім апошнім часам Расейская праваслаўная царква ўмешваецца ў навучальны працэс у школе (спроба адрадзіць Закон Божы), спрабуе кіраваць адборам працаў на мастацкія выставы, цэнзураваць ці хоць бы рэцэнзаваць творы мастацтва, ня кажучы пра зьмест тэлепраграм, а таксама адбракоўвае навуковыя тэорыі (напрыклад, тэорыю Дарвіна), калі ўлічыць усё гэта, размовы аб праваслаўнай дзяржаўнасьці не выглядаюць ужо толькі размовамі.

Напэўна, Расея ўжо ня вернецца ў стан сярэднявечнага цемрашальства. Неяк у час інтэрнэту й трансгеннай інжынэрыі ў гэта слаба верыцца.

Але ж у сукупнасьці з камуністычнымі Кітаем, КНДР і Кубай, іранскай тэакратыяй, шыіцкім войскам Аль-Садра, з талібамі, «Хамасам», «Хізбалагам», іншымі тэрарыстычнымі рухамі, міжнароднымі тэрарыстамі, пралазамі й авантурыстамі featureнага калібру ды афарбоўкі Расея сёньня складае той самы «шматпалярны сьвет», які павінен, на думку Пуціна, процістаяць заходняй цывілізацыі.

**У чым яго крыўда?**

Усё гэта варта браць пад увагу перад тым, як разглядаць цяперашнюю сытуацыю ў Беларусі.

Усім відавочна, што апошнім часам яе кіраўнік сваімі выказваньнямі й паводзінамі дэманструе пэўную нэрвовасьць і разгубленасьць. Але выкліканая яна ня столькі дзеяньнямі «Газпрому» і «Раснафты», ня столькі магчымымі наступствамі падвышэньня цэнаў на энэрганосьбіты для беларускай эканомікі, колькі іншымі, больш важкімі прычынамі. Справа у тым, што эканоміка заўсёды мае пэўны інэрцыйны запас. І вынікі рашэньняў, нават самых кардынальных, прынятых сёньня, насельніцтва, спажыўцы могуць рэальна адчуць ў сваім жыцьці значна пазьней. Акрамя таго, ніхто ня ведае, да якой ступені павінен упасьці ўзровень жыцьця беларусаў, каб гэта падбухторыла іх да нейкіх усьвядомленых дзеяньняў супраць уладаў. І яшчэ ня факт, што расчараваньне ў сацыяльна-эканамічнай палітыцы Лукашэнкі кіне ягоную электаральную масу не пад сьцягі нацыянальнае апазыцыі, а на падтрымку расейскіх пуціністаў і камунафашыстаў. Намаганьнямі дзяржаўнай тэле- і радыёпрапаганды ў Беларусі глеба для гэтага ўгноеная.

Галоўная бяда для рэжыму палягае сёньня не ў эканоміцы, а ў тым, што Крэмль гвалтоўна забраў у яго галоўную міталягему, любімую цацку — саюзную дзяржаву. У рамках саюзнай дзяржавы — такой, якой яна марылася і ў нейкай ступені была на самой справе, — Беларусь бачылася раўнапраўным партнэрам Расеі, а Лукашэнка быў роўны Пуціну. Кіраўніку Беларусі мроіўся ня столькі адроджаны СССР, колькі канфэдэрацыя — свайго роду новае ВКЛ, толькі манструозных памераў, ад Балтыйскага мора да Ціхага акіяну, — утварэньне, у якім Лукашэнка пачуваў бы сябе Вялікім князем і прэтэндэнтам на Карону.

Менавіта гэта не задавальняла Крэмль. Ягоны цяперашні кіраўнік, які хутчэй за ўсё, застанецца там на трэці ці невядома на які яшчэ тэрмін, ня можа ні зь кім дзяліць уладу. Лукашэнка ня можа больш пазыцыянаваць сябе як «апошні фарпост» Расеі на Захадзе. Бо «надёжа и опора», заступнік інтарэсаў расейскага народу можа быць толькі адзін — вялікі і ўсёдзяржаўны. Усе астатнія — самазванцы.

Кіраўнік Беларусі, які стаяў ля вытокаў саюзнай дзяржавы, яшчэ гэтага не зразумеў, ён усё яшчэ паводле старой звычкі спрабуе шукаць хаўрусьнікаў у Маскве — такіх, як Праханаў, напрыклад. Але ж час Праханавых прайшоў. Ён са сваім сталінска-імпэрскім рамантызмам састарэў і ня ўпісваецца ў новы афіцыйны патрыятызм цынічнага ўзору. Не Праханаў зь ягонай любоўю да расейскага авангарду ды састарэлымі ўяўленьнямі пра «афіцэрскі гонар» сёньня ў пашане, а Поткіны і Якіменкі, Маркавы ды Пушковы, рознага кшталту ідэйныя пагромшчыкі, якія яшчэ й зарабляюць на патрыятызьме грошы (што зробіш —

час такі), не заўважаючы, што рыюць сваёй краіне й сваім дзецям калектыўную магілу.

Рыторыка пра «саюзную дзяржаву» яшчэ пакуль жыве. Але Пуцін і ягонае атачэньне, ягоныя тэлеканалы ўжо далі ясна зразумець — Беларусь патрэбная Расеі толькі ў якасьці Северо-Западного Краю. А йнакш — «аўчынка вычынкі ня вартая». Калі кіраўнік Беларусі гэтага не разумее — тым горш для яго.

Ніхто, вядома, ня будзе пасылаць расейскі спэцназ у Драздны. Ці падліваць яго насельнікам радыяактыўны палёній у гарбату. Расея пакуль ня можа сабе такога дазволіць, хоць многія там, напэўна, ужо аб гэтым мараць. І гісторыя зь Літвіненкам ёсьць таму сьведчаньнем.

Але галоўнай зброяй Крамля ў дачыненьнях з Лукашэнкам стане, ужо становіцца, не палітыка эканамічных санкцыяў, а — адсутнасьць належнай павагі. Інтэрвію яго Праханаву — гэта енк і скаргі на тое, як над ім зьдзекваюцца ня толькі Пуцін, але рознага роду прыходзькі, з гледзішча Лукашэнкі — лёкаі расейскага калегі, якім ня можна дазваляць брахаць на прэзыдэнта суверэннай дзяржавы. Ягоная крыўда нявыдуманая. Няважна, ці сапраўды Лукашэнка не паляцеў пад Новы год у Маскву з-за таго, што там не знайшлі памяшканьня для ягонай прэс-канфэрэнцыі (так звычайна робяць у Менску ў дачыненьні да апазыцыі), ці з-за таго, што Пуцін накрычэў на яго па тэлефоне. Важна тое, што ў Маскве перасталі выяўляць да яго знакі павагі — як гэта рабілі Ельцын і, некаторы час, Пуцін. Гэта для палітычнага дзеяча, які прайшоў шлях ад дырэктара саўгасу да вышэйшай дзяржаўнай пасады, надзвычай важна. Вось чаму так хваравіта ўспрымаюцца абме-

жаваньні Захаду на ўезд кіраўніка дзяржавы і яго-ных саноўнікаў. Якому-небудзь камандантэ Фідэлю на забарону прыехаць у Вашынгтон заўсёды было напляваць, сёньняшняму прэзыдэнту Вэнэсуэлы Чавэсу — таксама. А для кіраўніка Беларусі важныя знакі пашаны, асабліва ў Эўропе, паколькі ён атаясамлівае сябе са сваёй дзяржавай. І пакуль яго прымалі на вышэйшым узроўні ў Маскве, ён яшчэ мог дазволіць сабе звысок глядзець на палякаў і «разных прочих шведов». Некалі ён выгнаў у каршэнь амэрыканскага пасла разам з пасламі Вялікай Брытаніі, Нямеччыны й Францыі зь іхных рэзыдэнцыяў.

А цяпер ён вымушаны прыслухоўвацца да пасла нейкай Літоўскай Рэспублікі. І прэсавую канфэрэнцыю гэтага пасла паказваюць на Першым канале БТ як першую навіну.

Але справа, зразумела, ня толькі ў гонары й ганарлівасьці. Упершыню за апошнія гады ўзьнікла такая сытуацыя, што пагроза незалежнасьці Беларусі нясе пагрозу асабістай бясьпецы яе кіраўніка. Гэта не азначае, што гэтыя дзьве пагрозы трэба атаясамліваць. Проста яны супалі.

**Выйсьці з кола**

Гэта не азначае таксама, што апазыцыя павінна цяпер згуртавацца вакол прэзыдэнта ды безумоўна яго падтрымаць. Зусім наадварот. Працяг ранейшага курсу кіраўніка Беларусі на збліжэньне з найбольш рэакцыйнымі, шавіністычнымі, камунанацыяналістычнымі коламі ў Расеі нясе ўсю большую пагрозу беларускай незалежнасьці, будучыні нацыі.

Зразумела, Лукашэнку вельмі цяжка пераступіць цераз усё тое, на чым будавалася дагэтуль

дзяржаўнасьць Беларусі, адмовіцца ад савецкай спадчыны, павярнуцца тварам на Захад, які дагэтуль успрымаўся як вораг, у лепшым выпадку — як інструмэнт шантажу ў дачыненьнях з Крамлём.

Адзіны, хто можа дапамагчы яму (і сабе) ў гэтай сытуацыі, паспрабаваць наладзіць кантакт з Захадам — гэта беларуская апазыцыя. І першым гэта зразумеў Мілінкевіч.

Хай са спазьненьнем, але лідэр дэмакратычных сілаў Беларусі ў апошнія дні праявіў сябе сапраўды як лідэр, здольны рабіць учынкі, здольны браць на сябе адказнасьць. Менавіта ўчынкаў чакалі ад Мілінкевіча амаль год пасьля выбараў ягоныя выбарцы, ягоныя прыхільнікі. Значная іх частка па-ранейшаму зьвязвае зь ім свае спадзяваньні на лепшую будучыню для Беларусі. Менавіта зь ім, а не з палітычнай радай, асобнымі партыямі ці іх кіраўнікамі, у якіх ужо быў час заявіць аб сабе.

Мілінкевічу ўдалося пераступіць заганнае кола, у якім апынуліся дэмакратычныя сілы, у якім яны круціліся гадамі — кола «ратацыі», калі чарговага «лідэра», вылучанага пад выбары, потым выкідалі за адсутнасьцю далейшай патрэбы ды закідвалі каменьнем дзеля захаваньня «кансэнсусу» й «парытэту». У жыцьці апазыцыі панаваў той жа прынцып, што ў жыцьці беларускага грамадзтва: не высоўвайся!

Яскравай ілюстрацыяй яго можа служыць лёс Казуліна, якога былыя аднапартыйцы й хаўрусьнікі, выглядае, ужо выкрасьлілі са сваіх палітычных плянаў і разьлікаў на будучыню.

Паказальным у гэтым сэнсе падаецца артыкул Паўла Шарамета «Я в смятении» на сайце «Беларускі партызан». Сама назва, бадай, яскравым чынам апісвае рэакцыю ў стане ворагаў Мілінкеві-

ча. Расейскі журналіст называе яго «прагматычным, занадта асьцярожным», «народжаным не для барацьбы і не для палітыкі». Урэшце, ён абвінавачвае лідэра дэмсілаў нават у «асабістай баязьлівасьці». Але галоўнае абвінавачваньне палягае на тым, што ён «трымае касу, на ім завязаныя асноўныя фінансавыя патокі», «за ім стаяць палякі» й г.д. Падобныя характарыстыкі выглядаюць зьнятымі пад капірку з дыктарскіх тэкстаў у праграмах «Панарама» і «У цэнтры ўвагі»!

Зрэшты, чаго зьдзіўляцца? Хіба не ў такім самым стылі робяцца й праграмы ОРТ, дзе працуе журналіст? Дарэчы, хіба падобныя абвінавачаньні нельга вылучыць і супраць лідэраў партыяў, якія ўваходзяць у палітраду? І калі ў гэтых абвінавачаньняў ёсьць доказы, чаму б не давесьці справу да канца і ня выкласьці іх у інтэрнэце, як кнігу Алкаева?

Інакш можа скласьціся ўражаньне, што агульны сэнс абвінавачаньняў на адрас Мілінкевіча зводзіцца да вельмі знаёмай формулы: «трэба дзяліцца».

Трэба зазначыць, што гэты артыкул зьявіўся вельмі своечасова. Чэскі міністар абароны на ўжо згаданай канфэрэнцыі ў Мюнхэне падзякаваў Пуціну за тое, што ягоны выступ бліскуча патлумачыў эўрапейцам, дзеля чаго патрэбны блёк NATO.

Публікацыя ў «Беларускім партызане» засьведчыла, што аўтараў гэтага інтэрнэт-выданьня не абыходзіць лёс Беларусі. Яны крытыкуюць рэжым Лукашэнкі, найперш, з гледзішча яго карыснасьці, альбо шкоднасьці для інтарэсаў Расеі. Разьвіцьцё нацыянальнай эканомікі, культуры й мовы іх цікавіць куды ў меншай ступені. Што ж, яны маюць права на ўласны погляд.

Але варта сёньня задумацца тым унутры Беларусі, хто яшчэ зусім нядаўна выказваў думку, быццам краіне няблага было б далучыцца да Расеі, паколькі ўзровень дэмакратыі там вышэйшы. І гэта, маўляў, падвысіла б узровень дэмакратыі ў беларускім грамадзтве, якое да расейскага ўзроўню яшчэ не дарасло.

Гэтая крапленая карта цяпер бітая крамлёўскім кіраўніцтвам. Ніякай дэмакратыі, акрамя сувэрэннай (гэта значыць — дэкаратыўнай) у расейскай палітычнай пэрспэктыве не прадугледжваецца.

Беларусам даўно насьпеў час самім пачаць адбудоўваць дэмакратыю для ўласнай краіны, абапіраючыся на эўрапейскую гісторыю і традыцыі. Расейскія інтэлектуалы-дэмакраты празаходніцкай арыентацыі, загнаныя, як і ў Беларусі, у рэзэрвацыі ў выглядзе некалькіх інтэрнэт-выданьняў, газэт і тэлерадыёстанцыяў, нічым ужо тут не дапамогуць беларусам.

А вось дэмакратычныя пераўтварэньні ў Беларусі, наадварот, могуць паслужыць выразным сыгналам для руху ў бок пазытыўных зьменаў у Расеі, прынамсі, да больш адэкватнага ўспрыманьня ёй свайго месца і ролі ў сучасным сьвеце.

Вольная дэмакратычная Беларусь можа паспрыяць і адраджэньню ідэалаў «аранжавай рэвалюцыі» ва Украіне, больш хуткай інтэграцыі і адзінству Эўропы, што зусім немалаважна ў сьвятле пагрозаў XXI ст.

Для таго каб іх адолець, важна разьвітацца са спадчынай мінулага. Дэмакратызацыя Беларусі павінна стаць фінальным акордам вызваленьня Ўсходняй Эўропы ад расейскага камунізму, якое пачалося пасьля падзеньня Бэрлінскай сьцяны.

Магчыма, сёньня гэта падаецца ўтопіяй. Але ж XX стагодзьдзе — разам з антыўтопіямі Замяціна, Кёстнэра і Орўэла, кожная зь якіх спраўдзілася ў яшчэ больш жудаснай рэчаіснасьці, — павінна некалі скончыцца, каб саступіць месца новай эпосе.

І чаму б гэтаму ня здарыцца ў Беларусі?

*Наша Ніва. 2007. 23 лютага.*

# Personalia

## Рожденный под знаком Водолея

Ода отцу (К 75-летию со дня рождения Валентина Тараса)

Написать об отце еще труднее, чем написать о самом себе. Ведь вопреки законам логики, отец — это та часть души, которая бесконечно больше тебя самого. Для меня это целая вселенная, вне которой даже трудно себя представить. Да и трудно оценивать объективно родного человека, которого знаешь всю свою жизнь, и черты которого стали настолько знакомыми и привычными, что как бы перестаешь их уже замечать.

Но разве задача в том, чтобы описать какие-то бытовые привычки и пристрастия моего отца, нарисовать его психологический портрет? Для этого нужно быть мастером слова — по крайней мере, не меньшего масштаба, чем он сам.

Мне посчастливилось наблюдать, как отец вместе с Карлосом Шерманом переводил на русский язык роман одного из величайших писателей современности Габриеля Гарсиа Маркеса «Осень патриарха». (Он был впервые опубликован в журнале «Неман» при Андрее Макаенке.) Отец, не зная ни слова по-испански, заставил своего соавтора, для которого испанский был родным, зачитывать вслух целые главы из романа, чтобы почувствовать ритмику этой необыкновенной латиноамериканской прозы. А уж как он работал

со словом в поиске наиболее адекватного перевода... Видеть и слышать это было иногда мучительно, а иногда — просто подлинным наслаждением!

Отец до сих скромно именует себя не поэтом, не прозаиком, а «просто» литератором. Но не каждый литератор так чувствует слово и так мастерски владеет им. Повесть «Первая молния», напечатанная когда-то в журнале «Юность», мне не очень понравилась — наверное, «не оправдались» мои подростковые ожидания прочитать что-то более приключенческое, более наполненное драматическими событиями — в моем тогдашнем представлении, разумеется. А тут, в сущности, история первой мальчишеской любви... Но на самом деле, описание войны как чего-то обыденного и в то же время — полного ощущения гигантской, нечеловеческой беды, всенародной трагедии осталось во мне после прочтения той повести. Осталось надолго, навсегда — так же, как от отцовских рассказов «Последняя корова» и «Необыкновенная смерть».

Конечно, не только проза, но и устные рассказы отца — о том, как он ушел в партизаны, как воевал (в одном из рассказов описано, как он убил первого и, наверное, единственного в своей партизанской биографии фрица), фотография отца — тогда еще четырнадцатилетнего пацана, смеющегося, в пилотке набекрень, формировали мое понимание о минувшей войне. Войне такой далекой и такой близкой. Благодаря отцу, в первую очередь, я понял, что война — это не блеск медалей и погон, не экранный героизм, не выспренний патриотизм казённых речей, а просто «чёрная работа». Так об этом поется в одной из песен,

что вошли в его литературную композицию «Через всю войну». Он работал над этой композицией вместе с Владимиром Мулявиным, и она стала потом одной из лучших концертных программ «Песняров».

Именно это понимание трагизма войны как противоестественного насилия и жестокости и в то же время — обязанности сражаться с фашизмом как морального императива кажется мне подлинным, непридуманным героизмом.

Его лучшим другом много лет был поэт-фронтовик Наум Кислик. Когда-то мне трудно было представить себе их не вместе. И только предательски ранняя, нелепая смерть друга сумела разлучить их. Да, они всегда спорили между собой. Да, в последние годы, особенно после падения советской империи, они все чаще не находили взаимопонимания по самым, казалось бы, простым и ясным прежде вопросам. Но эти вопросы мучили и мучают, наверное, всех людей старшего поколения — по крайне мере, тех из них, кто не потерял способность чувствовать и мыслить. Но они всегда были предельно честны перед собой и перед другими. И это то, чего, быть может, так не хватает поколению нынешнему...

Из-за этой черты, из-за бескомпромиссности характера, из-за привычки говорить правду в глаза, невзирая на лица, у отца всегда были и есть враги. Они добивались запрета на его повести, его киносценарии. Последний, совсем недавний запрет, коснулся телесериала, посвященного юбилею Победы. Запрета добились... ветераны, которым не по нутру оказалась правда о войне.

Так называемые «братья по цеху» (писательскому) не любят его острый язык. Да если бы

только это... Кто-то ставит в упрек отцу его еврейские корни, кто-то видит в нем «белорусского националиста», кто-то, наоборот, считает слишком русским. Да Бог с ними. Куда важнее, что к его слову прислушивались, высоко ценили дружбу с ним Алесь Адамович и Василь Быков. Этих людей называют «совестью нации». И я, нисколько не покривив душой, могу сказать, что и мой отец принадлежит к этой замечательной когорте. Отец учил меня никогда не юлить. Не пытаться сглаживать противоречия, стараться смотреть правде в глаза, какой бы страшной она ни была.

Трагическая правда состоит в том, что поколение моего отца уходит... Говорят, минувшая историческая эпоха была эпохой Водолея.

Сохранить бы хоть частичку того светлого, исполненного высокого благородства, что передали нам наши отцы...

*Газета «Авив», февраль 2005 г.*

## Быкаў у Празе
Рэмінісцэнцыя

Гэта не ўспамін. Год — занадта малы тэрмін, каб канчаткова звыкнуцца з думкаю, што Быкава больш няма, і што гаварыць аб ім трэба ў мінулым часе. Ды й увогуле гэта толькі лічыцца, што мэмуары пішуцца, каб пакінуць нашчадкам праўду аб падзеях ці асобах. Часьцей за ўсё, сьвядома ці падсьвядома, аўтар успамінаў зьвяртаецца да сваіх сучасьнікаў. Таму даведваемся мы з успамінаў больш не пра тых, каму яны прысьвечаныя, а пра таго, хто іх пісаў. І тут ужо ўсё залежыць ад маштабу асобы аўтара. Чым меней маштаб — тым болей на першы плян выходзяць эгаістычныя мэты альбо інтарэсы асобных партыяў ці груповак.

Ёсьць і яшчэ адна акалічнасьць, якая не дазваляе называць гэтыя нататкі ўспамінам. У тыя некалькі тыдняў, цягам якіх давялося больш-менш часта й шчыльна кантактаваць з Васілём Быкавым у Празе, я не рабіў ніякіх запісаў — нават на паперы. (Застаўся толькі відэазапіс, зроблены падчас шпацыру Быкава ў каралеўскім парку «Стромаўка».) Напэўна, гэта была памылка. Але паколькі я ведаў ужо тады аб характары хваробы пісьменьніка, мяне чамусьці перасьледавала прымхлівае пачуцьцё, што занатоўваць словы Быкава на будучыню, «для гісторыі» — значыць нейкім

чынам «выкарыстоўваць момант» і тым самым, міжволі, думаць не аб жыцьці, але аб сьмерці, як бы прысьпешваць яе.

У кожным разе не прэтэндую на дакумэнтальнае апісаньне апошніх дзён перабываньня Быкава на чужыне. Пра гэтыя дні не аднойчы пісалі ўжо і яшчэ не аднойчы, пэўна, напішуць журналісты беларускай рэдакцыі радыё «Свабода». Частка матэрыялаў, датычных таго пэрыяду, знайшла адлюстраваньне ў кнізе «Быкаў на «Свабодзе». Пра той пэрыяд ёсьць успаміны майго бацькі — Валянціна Тараса.

Трэба зазначыць, што да вясны 2003 г. мне даводзілася разам зь іншымі супрацоўнікамі радыё сустракацца з Быкавым усяго некалькі разоў. У асноўным гэта тычылася творчых абавязкаў. Але ў тую вясну воляю абставінаў здарылася так, што нам з жонкаю пашчасьціла некалькі разоў дапамагаць Васілю Быкаву і ягонай жонцы Ірыне ў вырашэньні некаторых побытавых і мэдычных праблемаў. (Калі я кажу «нам», дык прыпадабняюся пэрсанажу вядомай байкі, які казаў: «Мы аралі». Бо, насамрэч, усімі практычнымі справамі займалася мая жонка Алена, а я толькі прысутнічаў пры гэтым ці выкарыстоўваўся ў якасьці насільшчыка.)

Зноў жа, не хачу й ня маю права апісваць гісторыю хваробы пісьменьніка ці яе фізыялягічныя праявы. Магу толькі засьведчыць выключную мужнасьць Васіля Быкава. Пры гэтым ягоны стаіцызм ня меў нічога агульнага зь нейкай позай альбо патасам. Як і яго літаратурныя героі, ён быў абсалютна пазбаўлены чагосьці напускнога, разьлічанага на публіку.

За некалькі дзён перад тым, як легчы ў шпіталь на апэрацыю, Васіль Быкаў з жонкай запрасіў

нас — майго бацьку, зь якім даўно сябраваў, а таксама мяне з маёй жонкай — павячэраць. Ён прапанаваў нам самім выбраць рэстарацыю, за сталом увесь час настойваў, каб мы выбіралі тое, што нам найбольш падабаецца. Сам ён у той вечар еў у сваё задавальненьне, піў піва, якое яму лекары апошнім часам піць забаранялі, ды й ня толькі піва. Ірына Міхайлаўна, натуральна, была гэтым вельмі ўстрывожаная, увесь час спрабавала спыніць гэткае злоснае парушэньне рэжыму. Быкаў тыя спробы рашуча спыняў. Рабіў ён гэта зь мяккай усьмешкай на твары, але досыць жорстка. Увогуле, пры больш блізкім знаёмстве рабілася ясна, наколькі няпросты быў гэты чалавек у побыце. За мяккасьцю ды інтэлігентнасьцю нярэдка хавалася ўпартасьць, нежаданьне саступаць першым, часам нават капрызьлівасьць. Канечне, свой адбітак на яго накладала тады ўжо цяжкая хвароба.

Але ў той вечар, хоць пакута й смуга чыталася недзе ў глыбіні быкаўскіх вачэй, у нейкай амаль незаўважнай запаволенасьці ягоных рухаў, сьмяяўся й жартаваў ён зусім шчыра. Было відаць, што ў Празе яму вельмі не хапае, акрамя іншага, звычайнага нефармальнага застольля, у якім можна разьнявоціцца й крышку расслабіцца, пабыць самім сабой. Пасьля таго застольля здарылася тое, чаго баялася Ірына Міхайлаўна, — у Быкава ўначы быў прыступ, у чым ускосна былі вінаватыя, канечне, і мы. Але ж такім ажыўленым і, можна сказаць, лёгкім, як пры апошнім разьвітаньні (так яму тады здавалася) зь сябрам маладосьці ды ягонымі сваякамі, я Быкава ні перад тым, ні пасьля таго ня бачыў.

Адчувалася (ці, можа, так здавалася), што Быкаў быў трошкі абцяжараны заўсёдным стаўленьнем да яго ў Празе з боку суайчыньнікаў як да

жывога клясыка, карыфэя прозы, героя беларускага адраджэньня ды яшчэ мудрага філёзафа. Пры гэтым, як часта бывае, вонкавыя знакі пашаны, на жаль, у некаторых спалучаліся з адсутнасьцю такту й жаданьня ахвяраваць уласным часам. Гэтая акалічнасьць, а таксама прыродная сьціпласьць Быкава заміналі яму гаварыць аб рэчах сапраўды празаічных. Напрыклад, жыць яму з Ірынай Міхайлаўнай давялося ў зусім маленькай кватэрцы, якую вылучыў Быкавым магістрат Прагі пры дапамозе чэскай праваабарончай арганізацыі «Чалавек у нядолі». Гэта для суайчыньнікаў ці, скажам, для экс-прэзыдэнта Чэхіі Гавэла Быкаў быў жывы клясык, а для чэскіх уладаў ён быў усяго толькі імігрант, які прыехаў з адной з краінаў былога СССР, — пэнсіянэр, якіх у Чэхіі без таго хапае.

У аднапакаёвай кватэрцы, куды ўехалі Быкавы, перад тым зрабілі касмэтычны рамонт, але скрозь сьвежы пабел дзе-нідзе адразу ж праступілі ржавыя пісягі ад шматлікіх працяканьняў трубаў дапатопнае каналізацыі. У вакно першага паверху былі відаць панэльны будынак на процілеглым баку вуліцы й каляровыя кантэйнэры для сьмецьця, заўсёды перапоўненыя. Вось такі краявід з «кабінэту» пісьменьніка. Абстаноўка ў пакоі была зусім спартанская, пакуль Быкаў сам сабе не купіў працоўны стол, лямпу й канапу. Відаць па ўсім, ён рыхтаваўся, нягледзячы ні на што, жыць і працаваць тут. Ані разу ні ад Быкава, ні ад яго жонкі мы ня чулі нараканьняў ні на якасьць жытла, ні на тое, што дабірацца ў цэнтар Прагі й назад на трамваі даволі доўга й цяжка, ці на нейкія іншыя побытавыя праблемы.

У адным з рэпартажаў на «Свабодзе», яшчэ пры жыцьці Быкава, падрабязна апісваўся пра-

цоўны стол пісьменьніка, рэчы, якія засталіся ляжаць на ім, газэты, рукапісы, дакумэнты — так, як бы пісьменьніка ўжо ня стала. Але ж і ў тае няўтульнае кватэрцы заставалася й застаецца цяпер часьцінка ягонай душы, часьцінка біяграфіі. Ня ведаю, хто жыве цяпер пад адрэсай Вршовіцкага Надражы, 22... Ня ведаю таксама, ці павесяць калінебудзь на тым доме шыльду: «Тут жыў вялікі беларускі пісьменьнік Васіль Быкаў». У гэты раён Прагі турысты рэдка наведваюцца...

Пасьля апэрацыі Быкаў на некаторы час вярнуўся ў кватэрку.

Пісаць ён ня мог, бо быў зусім зьнясілены, ляжаў увесь час на канапе, але ўвесь час чытаў і прасіў прыносіць кнігі. Адной зь іх была невялічкая кніжка Ўладзіміра Вайновіча пра Салжаніцына. Салжаніцына Быкаў ня вельмі любіў, але й пра кніжку Вайновіча, дзе той моцна спляжыў расейскага «прарока», адазваўся ня надта прыязна, убачыўшы ў ёй, найперш, падсумаваньне нейкіх асабістых рахункаў паміж двума пісьменьнікамі.

Прынесьлі мы Быкавым і некалькі відэакасэтаў. Фільм Сакурава «Малох» пра Гітлера Быкаў глядзець ня стаў — яму адразу не спадабалася творчая манера рэжысэра. А вось дакумэнтальныя стужкі — сярод іх фільм «Ля вытокаў авангарду», прысьвечаны Шагалу, — паглядзеў зь цікавасьцю. Па тэлевізіі часьцей за ўсё Быкаў глядзеў навіны на чэскіх каналах.

Адна з апошніх нашых сустрэч перад адлётам Быкавых у Менск адбылася на Бабе, што на Ганспалцы, падчас шпацыру. Ёсьць такі прыгожы раён у Празе — на ўзвышшы над Влтавай, адкуль адкрываецца цудоўны краявід. Падчас гэтых прагулак заўсёды гаварыў Быкаў, калі адчуваў сябе

больш-менш нармальна. Я толькі слухаў. Выключэньне была толькі тэма вайны ў Іраку, якой Быкаў вельмі цікавіўся і распытваў у мяне пра ўсё, што я на той момант на гэтую тэму ведаў. Пры гэтым ён не даваў ніякіх, у тым ліку й маральных, ацэнак падзеяў. Аднак, нягледзячы на тое, што на той момант да падзеньня Багдаду яшчэ заставалася даволі шмат часу, Быкаў выказваў поўную ўпэўненасьць у хуткаплыннасьці самой вайсковай апэрацыі, а таксама і ў хуткім падзеньні рэжыму Садама Хусэйна. Адносна цяперашняга рэжыму ў Беларусі Быкаў адгукаўся значна больш пэсымістычна.

Неяк, углядаючыся ў навакольны пэйзаж, Быкаў сказаў, што краявіды ў Чэхіі, як і ўвогуле ў Цэнтральнай Эўропе, выглядаюць больш лагоднымі, абжытымі й прыстасаванымі для чалавека, чым, скажам, у Беларусі. Ён назваў гэтыя пэйзажы «гуманістычнымі». Пагледзеўшы яшчэ раз на высокія ўзгоркі над Влтавай, Быкаў — мабыць, пад уплывам нейкай асацыяцыі — раптам загаварыў пра сваю «Альпійскую баляду». Ён згадаў колішняе сваё інтэрвію адной італьянскай журналістцы. У тым інтэрвію Быкаў «прызнаўся», што ў гераіні аповесьці Джуліі быў рэальны прататып у жыцьці. «А ведаеце, не было прататыпу. Гэта цалкам прыдуманы пэрсанаж», — сказаў пісьменьнік з сумнай, крыху сарамлівай усьмешкай. Быкаў даў зразумець, што яму тады проста захацелася зрабіць як бы нешта прыемнае для італьянцаў.

У гэтым нечаканым прызнаньні мне бачыцца ня толькі арганічнае для Быкава імкненьне гаварыць праўду, але ж і своеасаблівы спосаб давесьці, што праўда літаратуры вышэй за так званую «праўду жыцьця». Разуменьнем гэтай ісьціны, уласна кажучы, вялікі пісьменьнік адрозьніваецца ад про-

ста таленавітага. Я думаю, таксама, што ўнутры Васіля Быкава ў тыя дні, а мабыць, і да самой сьмерці, працягваўся паглыблены самааналіз. Безумоўна, ня ўсё, што хацелася яму сказаць, увайшло ў «Доўгую дарогу дадому». Дзякуючы сваім цьвёрдым пераканаsuccessfulнем ён, тым ня менш (а можа — менавіта таму), зноў і зноў вяртаўся да маральнай самаацэнкі сваіх учынкаў, сваёй творчасьці.

Адчувалася, што рашэньне ляцець у Менск далося Быкаву ня так проста. Нейкія маральныя акалічнасьці прыносілі яму ня менш, а ў нейкім сэнсе, нават і больш пакутаў, чымся хвароба. Ня выключана, што нябачная сьвету ўнутраная душэўная барацьба з самім сабой паскорыла ейны бег. Зрэшты, гэта толькі маё адвольнае дапушчэньне.

У кожным разе на многія пытаньні мы ўжо ніколі, відаць, не атрымаем адказу. Чаму Быкаў апынуўся на эміграцыі менавіта ў Чэхіі? Наколькі быў падрыхтаваны пераезд у Прагу? Што сталася вырашальнай прычынай рашэньня Быкава ляцець пасьля апэрацыі ў Менск? Як надоўга ён ляцеў і ці сапраўды зьбіраўся вяртацца ў Прагу? Мабыць, сёньня, гэта ўжо ня так і важна, як здавалася ўчора. Гэта, хутчэй, важна для гісторыкаў, для будучых біёграфаў Быкава.

Для сучасьнікаў больш важна зразумець, што Быкаў ужо не належыць нікому пэрсанальна. Ні прэзыдэнту, ні партыям, ні былым сябрам, ні нават сваякам і крэўным. Ён належыць усім беларусам — у тым ліку тым, хто пра яго ніколі ня чуў ці нават яшчэ не нарадзіўся. Ён належыць родным Бычкам, Менску, Беларусі, належыць таксама й Празе. Быкаў належыць чалавецтву.

*Наша Ніва. 2004. 18 чэрвеня.*

# Урокі пэсымізму

## Пасьляслоўе да незавершанай дыскусіі

У Доме літаратара ў Менску адбылася прэзэнтацыя кнігі «Вострая Брама: беларускі культурны кантэкст на мяжы стагодзьдзяў». У зборнік увайшлі тэксты лепшых перадач аднайменнага цыклю радыёэсэ Сяргея Дубаўца апошніх сямі гадоў. Удзельнікам прэзэнтацыі — а гэта былі галоўным чынам тыя, хто мае або некалі меў дачыненьне да перадачы, — было прапанавана ў нефармальнай абстаноўцы падыскутаваць на тэму быкаўскага пэсымізму. Мелася на ўвазе цьверджаньне Васіля Быкава аб тым, што «народ беларускі зьнік, яго няма...»

*Народная Воля. 2005. 17 траўня.*

Вядомыя і іншыя падобныя выказваньні пісьменьніка на гэтую тэму. Але згаданае выказваньне набыло асабліва шырокую вядомасьць у выніку публікацыі эсэ вядомага кінадзеяча, які прыводзіць, сярод іншага, вялікі фрагмэнт запісу прыватнай гутаркі з Быкавым, што адбылася некалькі гадоў таму. Адтуль узятая й прыведзеная вышэй цытата. Ці не былі тыя словы пісьменьніка прадыктаваныя ягоным эмацыйным настроем або нейкімі іншымі, больш-менш выпадковымі прычынамі, зьвязанымі з канкрэтнымі тагачаснымі абставінамі, у якой адбывалася згаданая гутарка?

Ці можна выняць гэтыя словы з агульнага кантэксту творчасьці Быкава, кантэксту ўсяго ягонага жыцьця? Тут могуць быць розныя меркаваньні. Аднак, сапраўды, пэсымізм Быкаву як асобе заўсёды быў уласьцівы, а з гадамі відавочна ўзмацняўся. Сам пісьменьнік гэткай уласьцівасьці свайго характару ніколі не хаваў. Хоць і казаў не аднойчы, што прагне, каб ягоны пэсымізм — прынамсі, у адносінах да будучыні Беларусі — быў абвергнуты.

Але ж калі зьвярнуцца да творчасьці Быкава, дык можна пераканацца, што папулярны тэзіс пра быкаўскі пэсымізм губляе сэнс. Ці можна назваць творы пісьменьніка адназначна пэсымістычнымі альбо аптымістычнымі? Такі спрошчаны падыход у адносінах да сапраўднай літаратуры проста не спрацоўвае. Літаратура, як і жыцьцё, ня зводзяцца да школьнай дыдактыкі. Больш за тое, так званая аптымістычная літаратура — накшталт вершаў пра сьветлую камуністычную (або якую заўгодна іншую) будучыню — наагул ня мае дачыненьня да літаратуры. Пра гэта сур'ёзныя крытыкі даўно ўжо не спрачаюцца. Як не спрачаюцца й над тым, што сапраўдная літаратура ні да чога не заклікае, нікуды ня кліча, нікога не выхоўвае і не зьмяняе чалавека, бо выхаваньне ня ёсьць прызначэньнем літаратуры, мастацтва, альбо, скажам, навукі. Яна, літаратура, яе творы каштоўныя самі па сабе, як само жыцьцё ёсьць безумоўнай каштоўнасьцю. А ўжо як глядзець на жыцьцё, у тым ліку ўласнае, і што зь ім рабіць — гэта справа сьветапогляду ды асабістага выбару. Яго няма сэнсу навязваць іншым, яго можна зрабіць толькі самастойна.

Быкаў свой маральны выбар зрабіў і затым пацьвярджаў яго ўсё сваё жыцьцё. Але ён не хацеў і

ня мог зрабіць яго за нас, за сваіх чытачоў — хоць эмацыйна й «прагнуў быць абвергнутым». Пэсымізм або аптымізм тут ні пры чым. Гэтая катэгорыя па-за маральлю й нават па-за сэнсам. Можна з аптымізмам і радасным настроем здраджваць уласным прынцыпам, пісаць даносы на сяброў і сваякоў і пры гэтым верыць у несьмяротнасьць уласнае душы, а таксама ў сьветлую будучыню Бацькаўшчыны. (Нездарма нехта напісаў пра патрыятызм як пра апошняе прыстанішча нягодніка, бо больш высокага, а значыць, зручнага, апраўданьня любым сваім дзеяньням не прыдумаеш.)

Можна быць абсалютным скептыкам, мізантропам і мэлянхолікам і пры гэтым — нястомна працаваць на карысьць свайго народу, дзеля ягонай будучыні. Тут ёсьць, без сумневу, супярэчнасьць. Калі літаратура нікога ні ў чым ня здольная пераканаць — значыць, праца пісьменьніка, літаратара ёсьць марнай працай? Адказ на гэта можна шукаць у «Міце пра Сізыфа» экзыстэнцыяліста Камю, ідэйным нашчадкам якога ў значнай ступені адчуваў сябе Быкаў. Калі казаць зусім спрошчана, сэнс працы ў тым, каб яе рабіць, незалежна ад вынікаў. З гэтага гледзішча вызначэньне Быкава як пэсыміста выглядае абсурдным, бо цяжка знайсьці прыклад чалавека, які б гэтулькі шмат і ўпарта працаваў.

І тут самы час вярнуцца да дыскусіі наконт быкаўскага пэсымізму што да Беларусі й беларускага народу. Калі б Быкаў увесь час толькі й разважаў над тым, ці ёсьць у іх будучыня, ці няма; ці страчаны гістарычны шанц, ці не, дык мы ня мелі б вялікага беларускага пісьменьніка. Прычым вялікага (гэта яшчэ больш выразна відаць сёньня, праз два гады пасьля ягонай сьмерці) ня толькі

ў маштабах Беларусі, але й сьвету. Ён працаваў на будучыню ў самыя цяжкія часіны, працаваў да апошняга, пакуль ставала сіл. І калі зьвяртацца да клясыка па адказ на самыя балючыя пытаньні сучаснасьці, дык вось ён — гэты адказ. Ён палягае ня ў быкаўскім пэсымізьме і не ў ягонай творчасьці нават, але ў ім самім. У тым, што ў Беларусі быў Быкаў.

Іншая справа, што факт існаваньня Быкава, тое, што ён быў і застаўся ў літаратуры, у гісторыі, нашай памяці, не зьяўляецца індульгенцыяй для астатніх беларусаў. Так сама, як і быкаўскі пэсымізм (ці тое, што мы называем пэсымізмам) ня можа быць апраўданьнем для нашага ўласнага бязьдзеяньня. Што ж датычыць самога прадмету — гэта значыць беларускай нацыі, дык для таго каб зразумець гэты прадмет, патрэбны не пэсымізм ці нешта гэткае ж эмацыйнае, патаснае, але патрэбныя перадусім веды. Інакш кажучы — веданьне прадмету, аб якім пішаш. І ў гэтым яшчэ адзін відавочны ўрок Быкава-пісьменьніка.

Ён заўсёды пісаў толькі пра тое, што ведаў асабіста — пра вёску, пра сялян, пра вайну, пра пакуты чалавечай душы, трагізм чалавечага існаваньня. Сяргей Дубавец у адной са сваіх «Вострых Брамаў» прыводзіць заўвагу знаёмага пісьменьніка ў зьвязку з быкаўскай «Ваўчынай ямай», дзе апісваецца Чарнобыльская зона. Быкаў, паводле тае заўвагі, піша пра «хмызьнякі ды ўзгоркі» — гэта значыць, апісвае... родныя віцебскія краявіды, а не палескія. Мабыць, так. Можна прыгадаць таксама зорку Сірыюс, якая ў адным з быкаўскіх твораў зьзяе ў тую пару году, калі на небасхіле ў тутэйшых шыротах яе ўжо не відаць. Калі зьвярнулі ўвагу на гэтую недарэчнасьць, Быкаў спачатку

абяцаў памылку выправіць, але потым пакінуў усё, як было. А інакш, відаць, давялося б перапісваць усё наноў, ад пачатку да канца. Быкаў, відавочна, апісваў не краявіды ці зорнае неба, ён апісваў стан душы, і адпаведна з гэтым мастацкі сьвет ягоных твораў будаваўся паводле ўласных законаў, дзе краявіды, мабыць, адыгрываюць падпарадкаваную ролю.

Сказанае зусім не азначае, што Быкаў, ягоны творчы мэтад мусяць усім падабацца, што клясык мусіць заставацца па-за крытыкай. Наадварот, некрытычнае, так бы мовіць, талмудычнае стаўленьне да творчай спадчыны пісьменьніка, спроба фэтышызацыі ягоных выказваньняў, у тым ліку выпадковых або памылковых, ёсьць праявай непавагі да пісьменьніка. У кожным разе гэта былі ягоныя ўласныя памылкі, прадыктаваныя ўсім ягоным жыцьцём, няпростымі абставінамі жыцьця, а потым і невылечнай хваробай. Хавацца за словамі клясыка, які ўжо ня можа ўступіць ні ў якія дыскусіі, недарэчна. А тым больш недарэчна выкарыстоўваць імя Быкава дзеля падтрымкі, скажам, аднаго з кандыдатаў у «адзіныя кандыдаты» ад апазыцыі, зь якім ён, мабыць, пры жыцьці не пажадаў бы нават павітацца за руку. Але ж хіба ў яго запытаесься цяпер? Мёртвым не баліць...

Не, ні Быкаў, ні Гарэцкі, ні Купала з Коласам не дадуць нам адказу на тое, ці застанецца беларуская мова, ці будзе некалі годная й незалежная краіна Беларусь. Яны пакутліва вырашалі гэтае пытаньне для сябе, кожны ў сваім часе й абставінах. І кожнае новае пакаленьне беларусаў наканаванае на тое, каб вырашаць яго зноў і зноў — пакуль нацыя альбо сапраўды ня зьнікне, альбо пытаньне стане трывіяльным і клясыкі беларус-

кае літаратуры застануцца ўсяго толькі клясыкамі, а не прарокамі. І мейсца ім будзе на пыльных кніжных паліцах ды на школьных уроках, але не ў дыскусіях на тэмы сучаснасьці. Толькі наўрад ці каму з сучасьнікаў Быкава давядзецца да гэтага дажыць.

Нехта сказаў, што аптыміст памірае аднаго разу, пэсыміст — бясконцую колькасьць разоў. Але ж справа ня ў тым, як памерці. Справа ў тым, як жыць...

*Наша Ніва. 2005. 24 чэрвеня.*

# Апорыі Зянона

Да юбілею лідэра БНФ

Нейк мне давялося напісаць пра Зянона Пазьняка ў «Нашай Ніве» («Байкот не партызанка»). Гэта не была палеміка. Я нават прывёў тады вобраз прыроднае зьявы — навальніцы, плыні ракі альбо ўсходу сонца, зь якімі няма сэнсу спрачацца. Некаторыя ўбачылі ў гэтым апалягетыку. Маўляў, аўтар прапануе ўслаўляць Зянона Пазьняка на паганскі манер і ні ў якім разе не крытыкаваць яго, каб толькі не раззлаваць.

Насамрэч, я хацеў сказаць зусім іншае. Можна колькі заўгодна спрачацца з Пазьняком, крытыкаваць яго альбо ўслаўляць — усё гэта не касуе таго факту, што Зянон Пазьняк ужо даўно стаўся зьявай беларускай гісторыі, адным са свайго роду апазнавальных знакаў сучаснай Беларусі. Як, скажам, пляц Свабоды ў Менску, крыжы ў Курапатах ці зубар (толькі ня той «Зубр», які дагэтуль не зарэгістраваны, але старажытны зьвер, які пакуль жыве ў Белавескай пушчы).

Зразумела, пакуль чалавек жыве на грэшнай зямлі, ня трэба рабіць зь яго помнік — ні рукатворны, ні які-небудзь яшчэ. Думаю, гэта й самому юбіляру было б не даспадобы. Калі Зянон Пазьняк дасылае з-за мяжы факсы з памылковымі ацэнкамі ці дырэктывамі (альбо яны падаюцца

нам памылковымі), мы можам зь імі спрачацца, альбо папросту не згаджацца. Зразумела, я ня маю на ўвазе тых, для каго Пазьняк па-ранейшаму як чырвонаяануча для быка — тых, хто зрабіў зь яго жупел, карыкатуру, вобраз «інтэлігентнага фашыста» (выраз, ужыты некалі на БТ). Усім астатнім раіў бы ў запале крытыкі ўсё ж не забывацца, што зрабіў Пазьняк на чале Беларускага народнага фронту для вызвольнага руху Беларусі.

У старажытнай Эладзе жыў такі філёзаф Зэнон. Ён вылучыў тэорыю (апорыі) дыскрэтнасьці руху, паводле якой Ахілес, напрыклад, ніколі ня змог бы дагнаць чарапахі. Тэорыю лёгка абвергнуць на практыцы, што, як ні дзіўна, не касуе яе каштоўнасьці. Імя Зэнона засталося ў гісторыі чалавецтва. Што датычыць Зянона Пазьняка, дык ня будзем сьпяшацца з высновамі, адзнакамі і тым больш рэвэрансамі. Бо ў палітыка ў 60 гадоў, насамрэч, усё яшчэ наперадзе.

*Радыё «Рацыя». 2004. 24 красавіка.*

## Юра

Памяці сябра

Юра клапаціўся пра іншых людзей (пры абсалютнай адсутнасьці клопату пра сябе) гэтаксама натуральна, як піў каву ці паліў сваю ўлюбёную «Астру», якую амаль ніколі не выпускаў з рук. А ўвогуле ягоныя рукі заўсёды былі чымсьці занятыя — голкай зь ніткай, малатком, іншым інструмэнтам. Ён усё жыцьцё нешта рабіў для каго-небудзь — блізкіх, сяброў, знаёмцаў, знаёмцаў знаёмцаў. Заўсёды гатовы быў зьняць зь сябе апошнюю кашулю і аддаць яе табе. Без усялякай рысоўкі, бязь лішніх словаў. Бесьсярэбранік. Ці захавалася яшчэ гэтае слова ў сучаснай мове?

Адэсіт, выпускнік ВГИК (ягоная дыплёмная работа была прысьвечаная Высоцкаму ў ролі Гамлета), рафінаваны інтэлігент, джэнтэльмэн да мозгу касьцей, здавалася, ён будзе зусім чужым на «Беларусьфільме». У Беларусі, куды ён пераехаў з Масквы разам зь юнай жонкай (яна родам зь Дзярэчына), яму заўсёды, сапраўды, не хапала сонца, цяпла, мора. Але ён ня проста любіў жыцьцё ва ўсіх ягоных праявах, ён быў арганічнай часткай гэтага жыцьця. Нягледзячы на свой далёка не анёльскі, выбуховы характар, ён быў як магніт для нармальных, добрых, інтэлігентных людзей. І таму праз трыццаць гадоў ягонага жыцьця ў

Менску ніхто ўжо ня можа паверыць, што яго няма. У гэта немагчыма паверыць...

Хударлявы, зь сівымі валасамі й бародкай, ён заўсёды выглядаў крыху старэйшым за свой узрост. Але гэта толькі вонкава. У ім заўсёды кіпела нейкая ўнутраная энэргія, ён быў маладзейшы за шмат каго з маладых. Калі за тры дні да сьмерці ён сядзеў у нас у двары ў Вішні, рамантаваў каляску для нашай унучкі Верачкі, радаваўся нечаканаму для гэтай пары восеньскаму цяплу, пацягваў самаробнае малінавае вінцо, ён не зьбіраўся паміраць. Ён казаў пра тое, што вінаград на ягонай дачы сёлета, здаецца, сасьпее, і зь яго можна будзе прыгатаваць добрае хатняе віно... Ён умеў і любіў яго рабіць.

Паехаў ён ад нас на сваім старэнькім «Вольва», які прыносіў яму адно толькі клопат. Мы заўсёды хваляваліся, калі ён сядаў за руль свайго аўто, бо ён яшчэ толькі вучыўся на ім езьдзіць па-сапраўднаму.

Але памёр ён ад інфаркту, на лецішчы, дзе не было нават валідолу, бо ён ніколі ня скардзіўся на сэрца. Перад гэтым патэлефанаваў дадому жонцы і сказаў, што ўсё ў парадку. Памёр, кажуць лекары, амаль імгненна, а значыць, не пакутаваў. Але хто гэта можа ведаць...

## Рэжысэр, якому шанцавала

Гэтае інтэрвію зь Юрам Аксанчанкам я запісаў церазь некалькі дзён пасьля таго, як ня стала Элема Клімава. Ён памёр 26-га кастрычніка 2003 г. Зь імем гэтага выдатнага рэжысэра зьвязаная агромністай важнасьці частка жыцьця Юры.

Амаль дваццаць гадоў таму на экраны выйшаў фільм «Ідзі і глядзі» паводле «Хатынскай аповесьці» Алеся Адамовіча. Як казаў тады сам рэжысэр, гэта была галоўная карціна ў ягоным жыцьці. Дэбютам сталася сатырычная камэдыя «Ўваходзьце, калі ласка! альбо Чужынцам уваход забаронены!» на тэму лягернага жыцьця (праўда, піянэрскага). «Ідзі і глядзі» застаўся шостым і апошнім поўнамэтражным фільмам Элема Клімава.

У працы над стужкай «Ідзі і глядзі», які здымаўся ў Беларусі, прымаў удзел кінарэжысэр Юры Аксанчанка.

**— Як вы пазнаёміліся з Клімавым?**

— Мне проста хацелася папрацаваць у яго стажорам. Хацелася паглядзець, як ён працуе з акторамі. Я ведаў, што Клімаў ня хоча браць «зорак» у свой новы фільм, у адрозьненьне, скажам, ад «Агоніі», дзе ў яго здымалася шмат знакамітых артыстаў.

Кінагрупа была напалову маскоўская, напалову менская. У Менску тады жыў Адамовіч, тут ішла дапрацоўка сцэнару паводле ягонай «Хатынскай аповесьці». Я прыйшоў да Клімава і сказаў, што хачу працаваць у яго на карціне. Ён спачатку адмовіўся. Відаць, яго насьцярожыў нечаканы візыт: а раптам незнаёмца неадкуль «прыслалі»? Але праз некаторы час група пераехала ў Маскву, і мяне туды выклікалі. Там усе атрымалі заданьне шукаць кандыдатаў на ролі. Мы езьдзілі па розных гарадах і здымалі, напрыклад, дзяцей на відэа без усялякіх загадзя падрыхтаваных для іх тэкстаў. У фільме, дарэчы, няма ніводнага колькі-небудзь вядомага актора.

Выканаўца галоўнай ролі — Флёры — знайшоўся пад Ленінградам. Гэта быў Алёша Краўчанка. Тады ён вучыўся, здаецца, у восьмай клясе звычайнай школы. Удзел у фільме Клімава, дарэчы, гарантаваў яму паступленьне ў Ленінградзкі інстытут кінематаграфіі. Але ён адмовіўся. Тым ня менш, урэшце ён-ткі стаў акторам. Цяпер яго можна бачыць у папулярным тэлесэрыяле «Спэцназ» у ролі Дока.

**— Ці ўдалося пабачыць, як Клімаў працуе з акторамі? Як ён працаваў на здымачнай пляцоўцы?**

— Элем вельмі рупліва ставіўся да сваіх прафэсійных сакрэтаў. Хадзілі, напрыклад, чуткі, што зь некаторымі акторамі на ягоных фільмах працавалі гіпнатызэры. Ня ведаю. З акторамі ён, сапраўды, працаваў індывідуальна, асабліва з выканаўцам галоўнай ролі. Мы ведалі, што з хлопчыкам працуюць таксама псыхіятар і выхавацелька. Прычым выхавацелька карысталася нетрадыцыйнымі на той час мэтадамі: вучыла, скажам, зараджацца энэргіяй ад дрэваў, ад прыроды ўвогуле. Але мы

гэтых людзей на здымках ня бачылі — яны заставаліся ў гатэлі для актораў.

Усё гэта не была рэжысэрская прыхамаць. У сваім фільме Клімаў дамагаўся, каб выканаўца галоўнай ролі ня проста ўжыўся ў ролю, а менавіта пражыў яе эмацыйна. Таму ўсе эпізоды фільму здымаліся пасьлядоўна — так, як гэта адбываецца ў аповесьці Адамовіча, дзе драматызм нарастае ад эпізоду да эпізоду і завяршаецца трагедыяй. Для кіно, дзе нярэдка спачатку здымаюць фінал, а потым ужо іншыя эпізоды, такі падыход быў абсалютна незвычайны. І ў гэтым была складанасьць — таму што ўсю карціну трэба было зьняць за адзін сэзон.

Пры гэтым, кожны кадар адпрацоўваўся да дэталяў перад тым, як пачаць здымаць. Кожная дэталь — салдацкая вопратка, зброя, адзеньне вяскоўцаў і партызанаў — павінныя былі максымальна адпавядаць рэчаіснасьці. За савецкім часам якасная кінастужка была дэфіцытам, і таму «Кодак» на здымкі выдалі практычна адзін да аднаго. А гэта азначала, што кожны эпізод трэба было здымаць бяз дубляў, зь першага разу! Клімаў быў гранічна інтэлігентным чалавекам, грубага слова ад яго ніхто ня чуў ніводнага разу. Ніякіх спрэчак ці дыскусіяў на здымачнай пляцоўцы проста не ўзьнікала. Ён нікому нічога не дыктаваў — усё адбывалася як бы само сабой.

Бывалі, зразумела, і збоі. На беразе Бярэзіны купілі некалькі хатаў, яшчэ некалькі прывезьлі з навакольных вёсак. Такім чынам, узьнікла як бы цэлая вуліца, прызначаная для таго, каб згарэць на здымках ключавога эпізоду карціны. Дык вось, падчас адной з рэпэтыцыяў, калі здымачная група яшчэ не была гатовая, нехта памылкова зага-

даў усё гэта спаліць напалмам. Чакалі, што віноўніка чакае немінучае звальненьне. Але Клімаў нічога тады нават сказаў, ён як бы не заўважыў таго, што здарылася...

**— А як складваліся адносіны Клімава з Адамовічам падчас працы над фільмам?**

— Яны былі сябрамі. Адамовіч прысутнічаў на вельмі многіх здымках. Вельмі часта ён прасіў мясцовых жыхароў, якія прымалі ўдзел у здымках у якасьці масоўкі, расказваць, што яны памятаюць з часоў вайны, нейкія эпізоды, альбо сам расказваў пра тое, што яму было вядома. Пачатковы сцэнар, які называўся «Забіце Гітлера!», безумоўна, дапрацоўваўся, і не аднойчы. Але ў цэлым, я лічу, фільм атрымаўся вельмі блізкім да сцэнару Адамовіча. А тыя зьмены, што ўносіліся, былі прадыктаваныя тым, што ад моманту напісаньня сцэнару і да пачатку здымак прайшло амаль дзесяць гадоў.

**— Першы канал Беларускага тэлебачаньня паведаміў пра сьмерць Элема Клімава некалькімі словамі. У навінах прагучала інфармацыя, што ў 1976 г. на «Беларусьфільме» выйшаў фільм «Забіце Гітлера!», які потым паслужыў падставай для здымак фільму «Ідзі і глядзі». Ці так гэта?**

— Гэта проста абсурдная інфармацыя, якая абсалютна не адпавядае рэчаіснасьці. Да Адамовіча ўзьніклі прэтэнзіі ў ЦК КПБ і ў Дзяржкіно яшчэ на этапе працы над сцэнаром. Нават сама назва не задавальняла начальства. Фільм ня толькі ня выйшаў, ён нават ня быў тады запушчаны ў вытворчасьць!

Карціна «Ідзі і глядзі» выйшла на экраны ўжо пры Гарбачову. У мяне няма прэтэнзіяў да тых, хто цяпер зрабіў сюжэт пра Элема Клімава на БТ. Гэта, напэўна, проста нядбайнасьць. Але я не разумею,

чаму мае калегі-кінематаграфісты ў Беларусі ніколі ня згадваюць фільму «Ідзі і глядзі». Праходзіць шмат канфэрэнцыяў, фэстываляў, але нідзе гэтай стужкі нават ня згадваюць, як быццам яе й не было. Чаму так? Таму што фармальна фільм здымаўся пад маркай «Масфільму»? А да Беларусі, да трагедыі яе народу фільм хіба ня мае дачыненьня? А мо пасьля ад'езду Алеся Адамовіча ў Маскву ягонае імя згадваць проста сталася нямодна?

**— Нямодна, як вы кажаце, у апошнія гады было згадваць і Васіля Быкава, які з Адамовічам быў у блізкіх адносінах. Пахаваны ён, дарэчы, на бацькаўшчыне. Такой была воля Адамовіча. Такой была, як мы ведаем, і апошняя воля Быкава. Тут яшчэ адна пераклічка ўзьнікае, паміж іншым. Вельмі рана пайшла з жыцьця жонка Элема Клімава Ларыса Шапіцька, якая зьняла «Ўзыходжаньне» паводле быкаўскага «Сотнікава». І гэты фільм застаўся, бадай, лепшым у яе творчай біяграфіі...**

— Я бы хацеў вярнуцца да «Ідзі і глядзі». Там, калі памятаеце, дзеяньне адбываецца ўлетку — на пачатку восені. Як я ўжо казаў, усё здымалася пасьлядоўна, цягам аднаго сэзону, і таму фінальную сцэну давялося здымаць ужо ў лістападзе. Мы тады вярнуліся пасьля выходных у Бярэзінскі запаведнік, і ўбачылі, што ўсё зьмерзла. Лёд на лужынах давялося разьбіваць сякерамі й вылоўліваць крыгі рыбацкімі падхватнікамі. Увесь лес засыпала сьнегам. Яго давялося змываць з дрэваў з дапамогай пажарных машынаў. Але ў глыбіні лесу сьнег, зразумела, застаўся. Вось так і атрымалася, што партызанскі атрад адыходзіў з восені ў зіму. Гэта апошні кадар фільму. Можна сказаць, што рэжысэру проста выпадкова пашанцавала. Але ведаеце — шанцуе таму, хто шукае.

# Расчараваны вандраўнік

## Каменьчыкі ў чужым гародзе

Праз вакно кватэры, дзе я жыву, можна бачыць пяцёх старых. Чацьвёра зь іх стаяць непахісна, крыху апусьціўшы суворыя барадатыя твары долу, са скрыжаванымі на грудзёх рукамі. У нагах у кожнага — сава (сымбаль мудрасьці?). Яшчэ адзін стары, у адрозьненьне ад сваіх каменных суседзяў, — безбароды і жывы, стаіць на бальконччыку. Мой сусед заўсёды, нават улетку, апрануты ў швэдар. Увесь ягоны бальконччык упрыгожаны кветкамі, каляровымі дзіцячымі флюгерамі й лялькамі-марыянэткамі. Сярод іх можна пазнаць Гурвінка — пэрсанажа чэскіх казак. Аднойчы — 9 траўня — увесь балькон будзе ўвешаны нацыянальнымі чэскімі сьцяжкамі: іх будзе ажно 9, і яны будуць трымцець на ветрыку некалькі дзён запар, нават тады, калі ўсе астатнія ўжо забудуцца пра сьвята.

Стары абыякава пазірае ўніз, на бясконцы ў ранішні час паток машынаў на самай шумнай вуліцы ў Празе. Гэта цалкам адпавядае назьве вуліцы — Чэскаславенскай Арматы (Чэхаславацкага войска). І яму, і, мабыць, старым каменным балванам хацелася б крыху разьмяцца ці зайсьці ў рэстаранчык «Эльвуд», дзе заўсёды можна зьесьці смачную чэскую поліўку з таркаваным сырам і

добра прыгатаваны стэйк. Усё гэта, зразумела, пад куфаль-другі піва, які падасьць даўгалыгая чарнявая афіцыянтка, што гаворыць нечакана хрыплым для маладой прыгожай дзяўчыны голасам (прычынай таму, мабыць, цыгарэты, якія яна смаліць адна за адной). Афіцыянтка заўсёды ветліва ўсьміхаецца, што ня так часта бывае ў сярэдняй рукі рэстарацыях у Празе. А малады, яшчэ бязвусы кухар можа прыгатаваць на замову фантастычную страву зь мяса ягняці.

На ўсё гэта я магу пазіраць крыху зьверху, бо жыву ў доме насупраць каменных істуканаў на пятым паверсе. Мне нават відаць рог рэзыдэнцыі амэрыканскага пасла, каля якога заўсёды маячыць марскі пехацінец. Насамрэч, усе дамы тут — чатырохпавярховыя. Нашая кватэра знаходзіцца на пятым паверсе, ці дакладней сказаць — на гарышчы (па-чэску гэта называецца «пудла»), пераабсталяваным пад жытло. Гаспадар, пан Чапэк (Чапэкаў у Чэхіі ўсё адно што Дранчукоў у Беларусі), пабудаваў кватэру ажно ў двух узроўнях. Так што ў вокны другога праверху гэтай надбудовы можна бачыць Град ва ўсёй ягонай прыгажосьці. А з балькону — Бабу. Але пра яе крыху пазьней.

Падобных кватэраў цяпер у Празе вельмі шмат, і прыбытак ад іх арэнды замежнікамі добры. Пан Чапэк будуе кватэры. Зразумела, ня сам — іх будуюць наёмныя работнікі-ўкраінцы за вельмі малыя грошы. У адрозьненьне ад пані «інжынэркі» — гаспадыні дому, дзе давялося жыць перад тым два гады, мільянэр пан Чапэк зусім просты і ветлівы чалавек. Ясная справа, ён сабе на ўме. Гэта бачна па ягоных заўсёды хітра прымружаных вачах на круглым твары. Чымсьці ён падобны да

Швэйка з малюнкаў Ёзэфа Лады. А можа, гэта мне толькі здаецца...

**Ноеў каўчэг**

Здаецца, зусім нядаўна пачаў я гэтыя нататкі (хоць, насамрэч, спакваля рыхтаваўся я да іх напісаньня некалькі гадоў і нават зрабіў некалькі няўдалых прыступаў). Але ж час — рэч дзіўная. Яе ж не апішаш у катэгорыях — даўгая яна ці зусім кароткая. Ды й катэгорыі прасторавыя тут як бы ні пры чым. Тое, што быццам зусім далёка ад цябе — дзе-небудзь у тваім раньнім дзяцінстве, яно тут, зусім побач. А тое, што здарылася ўчора — здаецца, было вельмі даўна. Ды й ці было ўвогуле?

Нікуды за апошнія некалькі дзён Прага не падзелася, і каменныя балваны за маім вакном са свайго мейсца не скрануліся. Тая ж Прага — ды ня тая. Паводка пакінула свой адбітак на ўсім. І гэта ёсьць ня толькі вонкавым адбіткам, які кідаецца ў вочы гурбамі сьмецьця ўздоўж Влтавы, учора яшчэ разьюшанай і нястрыманай, а сёньня ледзь не санлівай. Гэты адбітак ляжыць на пражанах, якія зрабіліся крыху больш стрыманымі ў эмоцыях. І хоць увечары ў гасподах, як заўсёды, гучыць музыка, чуваць людзкія галасы й сьмех, гучаць яны неяк прыглушана — нібы ў радыёпрыймача крыху павярнулі тумблер гуку. Пачуцьцё трывогі, разьлітае ў паветры, нібы воды па зямлі Чэхіі, зьнікла — але не зусім, як бы ператварыўшыся ў навязьлівы ўспамін.

І што мяне пагнала ў той дзень у заапарк? Сам ня ведаю. Дагэтуль быў я там толькі аднаго разу, адразу па прыезьдзе ў Прагу. Памятаю, зьдзівіла мяне амаль поўная адсутнасьць у горадзе рэкля-

мы аднаго, відаць, з найлепшых заапаркаў у Эўропе. Але ж пражанаў ды й турыстаў сюды прываблiваць ня трэба — iх i так тут заўсёды шмат. I ў тую нядзелю ад бацькоў зь дзецьмi ды параў рознага веку адбою не было...

Каб патрапiць з Градчанаў у раён з антычнай назвай Троя, дзе знаходзiцца заапарк i цудоўны Тройскi замак, трэба прайсьцi вялiзным каралеўскiм паркам Стромаўкай («стромы» па-чэску, уласна, ёсьць дрэвы), а потым пешаходным мостам праз Влтаву, якая ў гэтым месцы зусiм нешырокая. Звычайна. Але ў той дзень мяне ўразiла, што некаторыя дрэвы па абодвух берагох ракi былi затопленыя па самыя кроны. Карцiна крыху нагадвала вясновую паводку ў Беларусi. Аднак каб летам, у жнiўнi? Надвор'е пасьля некалькiх дажджлiвых дзён стаяла цудоўнае, i нiшто не абяцала бяды. Праўда, па тэлебачаньнi паказвалi ўжо карцiны затопленых Чэскiх Будэёвiцаў — але ж гэта недзе там, на поўднi, блiзу мяжы з Аўстрыяй. Калi там тая паводка дойдзе да Прагi... Усяго празь дзень прайсьцi праз Стромаўку будзе немагчыма — увесь парк будзе затоплены, вада размые глебу пад дрэвамi i яшчэ доўгiя месяцы на ўваходзе ў парк будуць стаяць шыльды з надпiсамi «Уваход строга забаронены! Небясьпечна для жыцьця!».

Дарэчы, у тыя жнiвеньскiя днi можна было адчуць — не прачытаць на фiзычнай карце цi ў кнiзе, а ледзьве не фiзычна адчуць геаграфiю Чэхii. Влтава падзяляе краiну на два няроўныя кавалкi — заходнi i ўсходнi берагi. Вада ў рацэ, апетай Бедржыхам Сьметанам, цячэ, як i ўсе астатнiя, зьверху ўнiз — у дадзеным выпадку з гораў у паўднёвачэскiм краi ў раўнiнную Багемiю, i зьлiва-

ецца з Лабай, адкуль ужо пад назвай Эльбы коціцца ў Ніжнюю Саксонію ў Нямеччыне. Але перад гэтым Влтава працякае праз шэраг адмысловых гідракаскадаў ды праз бэтоннае жэрла ў сталічным густа населеным горадзе. Многія са шматлікіх мастоў цераз Влтаву падчас паводкі былі непраезныя, таму і ўзьнікла адчуваньне, так бы мовіць, землепадзелу.

Пабадзяўшыся бяз мэты па заапарку, на разьвітаньне пастаяў ля басэйну зь сям'ёй бэгемотаў. Старэйшы бэгемот раўніва паглядаў на свайго дзіцёнка (на вока — цэнтнэры тры вагой). Той падстаўляў сваю пашчу пад струмяні вады ў адмыслова зробленым вадаспадзе і яўна лавіў ад гэта кайф, а бацька часу ад часу адганяў малога ды зьлёгку, амаль пяшчотна, падштурхоўваў туды сваёй агромністай пысай самку. Але бэгемоціха была, што называецца, не ў гуморы. На наведнікаў яна паглядала насьцярожана, амаль варожа. Самка з малым падчас паводкі загінулі. А вось самец, як ні дзіўна, выжыў — дзе ён хаваўся, ніхто так і не зразумеў.

Слана па мянушцы Кадыр, які, нібыта, паводзіў сябе агрэсіўна і нікога да сябе не падпускаў, застрэлілі. Ён стаяў у загоне, пакуль вада не падступіла да вачэй... Забілі таксама мядзьведзя, ільва і яшчэ некалькі драпежнікаў. Яны таксама паводзілі сябе агрэсіўна — зьвяры, яны не маглі ўразумець, што людзі ж, канечне, хацелі ім дабра. Не зразумелі чагосьці й марскія коцікі, якія памкнуліся плыць у бурлівыя воды Влтавы, нібы ў мора. Адзін неўзабаве вярнуўся, аднаго вылавілі ажно ў Нямеччыне...

Потым дырэктар заапарку ва ўсім будзе вінаваціць гідрамэтэаролягаў, якія прадказвалі напя-

рэдадні ўсяго толькі «пяцідзесяцігадовую» ваду, але ўзровень Влтавы перавысіў стогадовы, таму большасьць вальераў была залітая вадой. (Дарэчы, здаецца, толькі ў чэхаў і славакаў ёсьць такі тэрмін — дзесяцігадовая, пяцідзесяцігадовая, стогадовая вада. Гэта значыць, узровень той або іншай ракі ўмоўна дасягнуў максымальнай адзнакі, скажам, за апошнія сто гадоў назіраньняў. У самы пік паводкі лічыльнікі перасталі лічыць, колькі кубамэтраў вады ў Влтаве працякае за сэкунду — яны проста не былі разьлічаныя на такую хуткасьць і аб'ём плыні.)

Вось такі Ноеў каўчэг, на якім людзі забіваюць жывёл.

Большасьць насельнікаў заапарку усё-ткі здолелі ўратаваць.

Паводка ў Чэхіі ўнесла жыцьці 13 чалавек. Кожны зь іх, канечне, быў унікальнай і непаўторнай асобай. Але большасьць загіблых сталіся ахвярамі пачварнай чалавечай упартасьці ці неверагоднага глупства — напрыклад, адзін чалавек загінуў, калі гарматным стрэлам затапілі яхту, якую плынь несла на мост. Паліцыя шмат разоў папярэджвала, каб усе зявакі пакінулі месца абстрэлу. Пры выбуху аскабалак яхты патрапіў аднаму зь іх у голаў...

Па-сапраўднаму жудасна было толькі аднаго разу — калі я яшчэ нічога ня ведаў пра «стогадовую ваду». Усю ноч напярэдадні ліў лівень — і не такі, як бывае ў навальніцу ў Беларусі, а нейкі, я сказаў бы, па-нямецку мэтадычны і жорсткі. Дождж ішоў і ішоў бязьлітасна, з упартасьцю параноіка. А потым сярод ночы пачалі выць сырэны...

Ля Музэўму, на Вацлаўскай плошчы, што ў цэнтры Прагі, было бясьпечна. Так здавалася, па-

куль не спынілі мэтро на адрэзку ад Мустэка да Дэйвіцаў на левым беразе. Вада да самага чэрава сярэднявечнай Прагі — Старамесцкай намесьці, не дайшла. Праўда, толькі на паверхні. Дарэчы, у некаторыя сярэднявечныя будынкі, вада ўсё адно не пранікла б з паверхні, бо, як выявілася, раствор, якім пакрывалі сьцены тагачасныя будаўнікі і які захаваўся да нашых дзён, мае водаадпорныя ўласьцівасьці.

Наступствы паводкі ў Празе зблізку давялося пабачыць ужо на трэці дзень, калі перастала дзейнічаць мэтро ў цэнтры.

Станцыі мэтро «Старамесцка», як і «Маластранска», а потым і «Мустэк» ды яшчэ з добры тузін станцыяў былі затопленыя або падтопленыя. Да гэтага здавалася, што больш небясьпечнае мейсца ў Празе, як мэтро, цяжка знайсьці. Але ж дасягненьне горнаінжынэрнай думкі (тунэлі мэтро тут пракладаліся ў гранітных пародах на вялікай глыбіні, у тым ліку пад рэчышчам Влтавы) ня вытрымала спаборніцтва з ракой. Трамваі да гэтага часьцяком злавалі сваёй няшпаркасьцю: у Празе трамвай для кіроўцаў іншых відаў транспарту ніякі не прыярытэт, па трамвайных рэйках аўтамабілі часам едуць, як па звычайнай дарозе. А тут, у дні паводкі, трамвай зрабіўся ці не галоўным відам транспарту. Быў момант, калі берагі Влтавы злучаў усяго адзін аўтамабільны мост. І другі, па якім хадзілі трамваі. Усе астатнія былі пад пагрозай затапленьня — у тым ліку славуты Карлаў Мост, які бачыў на сваім вяку, напэўна, і не такія паводкі — але ж вельмі даўна.

Дык вось, на трэці дзень нешта здарылася на трамвайных лініях — усе трамваі паварочвалі кудысьці ня ў той бок, і давялося ісьці на працу пеш-

кі ўздоўж Влтавы. Хоць вады ў рацэ ўжо трошкі паменела, зь неверагоднай хуткасьцю плынь несла самае рознае сьмецьце — дрэвы, гальлё, траву, нейкія скрынкі, плястыкоўкі, аўтамабільныя шыны ды іншыя прадукты чалавечай цывілізацыі.

Многім запомнілася тэлекарцінка тых дзён — чалавек на нейкім драўляным шчыце з даўгім кіем у руках плыве па рацэ. Некаторым спачатку падалося, што гэта нейкі спартовец — аматар «экстрыму» (слоўца гэтае сталася апошнім часам вельмі модным). Самае дзіўнае, што гэтак падалося і паліцыянтам, якія стаялі на беразе й пасьміхаліся. Небарака, праплываючы пад мостам, неяк зачапіўся за яго і падвіс. Толькі тады ратавальнікі кінуліся яму на дапамогу. Потым выявілася, што чалавек цудам не патануў ва ўласным двары — у апошні момант пасьпеў ускочыць на дзьверку брамы, якую сарвала вадой, ды схапіць кій. У першыя ж дні паводкі нарадзіліся жарты. Напрыклад: прадаецца дом у Чэскіх Будэёвіцах з выглядам на Карлаў Мост (гэты мост, нагадаю, знаходзіцца ў Празе, на трыста кілямэтраў ніжэй за Чэске Будэёвіцэ).

Ну, а праз некалькі дзён пасьля піку паводкі, нават зблізку, Влтава выглядала не такой ужо страшнай, а на вуліцах гораду, бліжэй да цэнтру, наагул амаль не відно было наступстваў паводкі. Калі не лічыць дэталяў.

Каля супэрмаркету прысела на прыступцы немаладая жанчына на мыліцах. Некалькі жанчынаў адпойваюць яе лекамі — магчыма, бабульчын дом апынуўся пад вадой, а можа, нешта здарылася са сваякамі... Блізу Старамесцкай плошчы вокны сутарэньняў, што выходзяць на вуліцу, закла-

дзеныя мяхамі зь пяском. На самой плошчы, да якой, дзякаваць Богу, вада не дайшла, — шмат турыстаў. Многія спадзяюцца ўбачыць, як б'е старадаўні гадзіньнік, што на будынку Старамесцкай Рады. Але гадзіньнік стаіць, быццам і на яго нейкім чынам паўплывала паводка: дванаццаць апосталаў схаваліся недзе за прыадчыненымі акенцамі, сьмерць з касой побач па-ранейшаму чакае свайго часу.

Увогуле, жыцьцё ў цэнтры, дзе знаходзіцца турыстычная Мэка — Вацлаўская плошча, віравала да канца лета па-ранейшаму. Адно толькі былі зачыненыя некаторыя рэстарацыі й крамы. Затое канкурэнты ў тыя дні атрымлівалі падвойны прыбытак. Што зробіш — капіталізм. Але што ў гэтым кепскага? Не было б у Празе такой колькасьці прыватных рэстарацыяў, кавярняў, крамаў і крамачак — нармальнае жыцьцё пасьля катастрофы наладзіць было б куды як цяжэй і даўжэй.

Куды больш за паводку пражанаў напалохаў саміт НАТО. Усе, хто мог, зьехаў за горад — адпачываць у горы ці куды-небудзь яшчэ далей. Многія фірмы ледзь не прымусова адправілі ў кароткі адпачынак. Падчас саміту спынілі працу філіі ўсіх банкаў у цэнтры Прагі, многія фірмовыя крамы кшталту «Макс і Спэнсэр». А трэба сказаць, «Макс і Спэнсэр» для заходняга пакупніка — тое, што Маркс і Энгельс для камуніста.

І ў раніцы, і ўвечары па горадзе хадзілі паўпустыя трамваі, паўпустое мэтро, што для заўсёды люднай Прагі ўвогуле нонсэнс. Адным словам, ня места, а «горад-прывід». Дапаўняюць карціну рэдкія картэжы аўтамабіляў у суправаджэньні машынаў зь міргалкамі, што віхурай праносяцца па амаль бязьлюдных вуліцах, паліцыянты на

скрыжаваньнях у ярка-зялёных «фартухах» паверх бронекамізэлек і пастаянны, назойлівы гук паліцэйскіх сырэнаў, які ад часу да часу перакрываецца грукатаньнем гелікоптэраў.

Пражане баяліся ня столькі тэрарызму, на барацьбу зь якім былі кінутыя ўзмоцненыя сілы паліцыі з усяе Чэхіі, колькі паўтарэньня беспарадкаў, учыненых анархістамі пару гадоў перад тым. Але пра гэта — крыху далей.

**За шклом**

Вядома, жыцьцё і ў дні катастроф — прыродных, альбо тэхнагенных, ці нават палітычных — не спыняецца. Недзе сыходзяць пад ваду цэлыя паселішчы, дамы, хімічныя заводы, мастацкія галерэі зь бясцэнным скарбам, людзей вывозяць ратаўнікі на чаўнах і гелікоптэрах, недзе б'юць дэманстрантаў, а недзе побач людзі сядзяць за столікамі, п'юць каву.

У дні саміту НАТО найбольш запомніўся такі тэлесюжэт: каля Кангрэсавага цэнтру, які пільна ахоўвалі спэцслужбы адразу некалькіх краінаў, улучна з ЗША, і куды патрапіць можна было толькі са спэцпропускам, маленькая рэстарацыя «Ў прынца» ўвечары, як і заўсёды, поўная людзей. Барадатыя месьцічы гуляюць у карты, пацягваюць «півечка», гуляюць у «дартс» і ўвогуле жывуць сваім заўсёдным жыцьцём. «НАТО? А што НАТО — нам да яго справы няма», — кажуць яны ў камэру. «На цо НАТО» — плякат з такім надпісам трымалі дэманстранты падчас акцыяў пратэсту.

Дазволю тут сабе кароткі экскурс у блізкую гісторыю. У верасьні 2000-га антыглябалісты падчас саміту МВФ і Ўсясьветнага банку ў Пра-

зе на кароткі час апанавалі горад (асноўныя сілы паліцыі былі кінутыя на непасрэдную ахову замежных удзельнікаў). Позна ўвечары давялося стаць сьведкам таго, як некалькі хлопцаў у скуранках крышаць жалезнымі стрыжнямі адмысловае легіяванае шкло ў рэстарацыі Макдоналдс — ненавіснага сымбалю амэрыканскага імпэрыялізму. Невялічкая купка маладых людзей падбадзёрвае іх воклічамі. (Недзе там, як потым давedaўся, былі й беларускія анархісты з Чырвонага Жонду. У аднаго зь іх я неяк запытаўся: «Вы супраць НАТО ды МФВ, і Лукашэнка супраць іх. Дык што — атрымліваецца, вы падтрымліваеце Лукашэнку?» «У некаторых момантах нашыя пазыцыі могуць і супадаць», — з годнасьцю адказаў юны анархіст.)

Крыху большая купа мінакоў здаля моўчкі назірала за пагромам. Потым натоўп антыглябалістаў пачаў расьці на вачах. Натоўп запружвае, нібы паводкай, Вацлаўскую плошчу ды прылеглыя вуліцы. На адной зь іх, за шклом рэстарацыі «KFC» (яшчэ адзін ненавісны сымбаль), можна бачыць зусім ужо фантасмагарычную карціну. У памяшканьні з выключаным сьвятлом нерухома сядзяць за столікамі паліцыянты. Не хацелі выдаваць сваёй прысутнасьці? Гэта ўжо потым праская паліцыя, выклікаўшы падмогу, пачне разганяць ды арыштоўваць удзельнікаў беспарадкаў, а за адно — журналістаў, якія трапяць пад руку. Ну, а ў дні паводкі, трэба аддаць належнае, паліцыя паводзіла сябе мужна і галоўнае — эфэктыўна.

Большую частку таго, што тады і пазьней адбывалася на вуліцах Прагі, давялося, як і большасьці пражанаў, назіраць на тэлеэкране.

Часам цяжка бывае вызначыць — ці сам, на свае вочы ты нешта бачыў, ці ў тэлевізары, у нейкім шоў, кшталту славутага «За шклом».

Першы канал Чэскага тэлебачаньня, дарэчы, працаваў у крызісныя дні жніўня 2002-га ня горш за CNN: суткі за суткамі рэпартэры ў Празе ды іншых местах Чэхіі выходзілі ў этэр наўпрост зь месца падзеяў. Пры гэтым на этэр працавалі журналісты ня толькі з рэдакцыяў навінаў ці публіцыстыкі, але і іншых рэдакцыяў, улучна са спартовай.

Першаму каналу ЧТ у тыя дні проста не было роўных. Абодва камэрцыйныя каналы хоць і імкнуліся таксама інфармаваць сваіх гледачоў — відавочна прайгравалі ў апэратыўнасьці ды прафэсійнасьці. І я ня мог тады ня ўспомніць, як яшчэ раней, у сьнежні 2000-га, сто тысячаў пражан выйшлі на Вацлаўскую плошчу, каб падтрымаць тэлежурналістаў, якія трымалі страйк у тэлестудыі на Каўчых Гарах. Новае кіраўніцтва Чэскага тэлебачаньня, прызначанае, фактычна, Кляўсам — тагачасным сьпікерам парлямэнту і лідэрам правацэнтрысцкай ОДС (Грамадзянскай дэмакратычнай партыі), хацела зрабіць з грамадзкага тэлебачаньня сучасную камэрцыйную тэлестанцыю ў заходнім стылі. А для пачатку, у стылі зусім савецкім, звольнілі тых, хто адмовіўся падпарадкоўвацца новаму начальству, ды й перакрылі этэр «неляяльным» журналістам. Неляяльным апынуўся ўвесь прафсаюз супрацоўнікаў тэлебачаньня. Мэнэджар Іржы Годач, адмыслова выпісаны з эміграцыі ў Лёндане наводзіць парадак на «старым» ЧТ, не знайшоў нічога лепшага, як замест «карцінкі» даваць у этэр чорную застаўку з уласным тэкстам, дзе абвяшчалася: канал адключаны

на ягоны асабісты загад, на падставе адпаведнага закону з указаньнем артыкулаў і параграфаў. У газэтах адразу зьявіліся карыкатуры на Годача і Кляўса. Кляўс і ягоныя прыхільнікі ў парлямэнце адстойвалі Годача і Бабашыкаву — жонку вядомага ў Чэхіі «піўнога барона», якая ўзначаліла рэдакцыю «паралельных», правільных навінаў.

Лідэраў прафсаюзу і журналістаў парлямэнтары абвінавачвалі ў «падрыве дзяржаўнай улады», анархіі ды іншых сьмяротных грахах. Але тэлегледачы чамусьці ім не далі веры. Яны выйшлі на плошчу. У мітынгу ўдзельнічалі самыя папулярныя ў Чэхіі рок-зоркі, вядомыя інтэлектуалы, тэлевядоўцы, акторы.

Дарэчы, у «правільных» навінах удзельнікаў таго статысячнага мітынгу назвалі «купкай падманутых таннай дэмагогіяй грамадзянаў». Літаральна як у рэпартажах Беларускага тэлебачаньня пра мітынгі апазыцыі ў праграме «Панарама»! Толькі чэскага варыянту «Панарамы» не атрымалася. У падтрымку тэлежурналістаў у парлямэнце аднадушна выступілі сацыял-дэмакраты (партнэры ОДС у кіроўнай кааліцыі!). Урэшце, абсьвістаны ўсімі Годач вярнуўся ў Лёндан. Бабашыкава вярнулася працаваць на камэрцыйны тэлеканал «Нова». У перадачы, якую яна вядзе, ёсьць свой глядач. А Кляўс... Кляўс разам са сваімі паплечнікамі праз паўтара году прайграў выбары ў чэскі парлямэнт і фактычна сышоў з палітычнай арэны. Пра інцыдэнт з тэлебачаньнем чамусьці тады ніхто не згадаў.

**На Бабе, альбо Паляваньне на соваў**

Вось ужо сто гадоў зь лішкам Празе шанцуе. А як жа — ні Першая, ні Другая ўсясьветная войны

шнараў на абліччы гораду не пакінула. У некаторых рэстарацыях у цэнтры можна пасядзець на мэблі часу «сэцэсіі» (у нас гэты стыль больш вядомы як мадэрн). У дні апошняй з паводак — а іх надарылася ажно дзьве ўсяго за пяць год — вада спынілася ў некалькіх сантымэтрах ад верхняга краю шчытоў, якімі абставілі па пэрымэтры Старое Места. Добраахвотнікаў, якія суткамі насыпалі пясок у мяхі і рабілі зь іх супрацьпаводкавыя бар'еры, было больш, чым рэальна патрабавалася. Празе пашанцавала з пражанамі. Яны любяць свой горад — не напаказ, а спакойна і аддана, усё сваё жыцьцё.

І хай гавораць, што ў цяперашнім стане Прага існуе і ўтрымліваецца выключна дзеля турыстаў і адпаведна — грошай. Пры ўсёй сваёй новай пазалоце «злата Прага» застаецца местам куды больш утульным, мілым і сьціплым, чымся, скажам, колішняя сталіца Аўстра-Вугоршчыны Вена. Самі аўстрыйцы жартуюць, што Вена — занадта вялікі горад для іхнай маленькай краіны. Мне асабіста горад запомніўся пампэзнай (хоць і шыкоўнай) архітэктурай, агромністай колькасьцю конных статуяў кайзэраў (імпэратараў) на адносна малой плошчы, неверагодна дарагой кавай і клясычнай дыхтоўнасьцю клеркаў. Аднаго зь іх я бачыў улетку на Рынзе (самы папулярны раён Вены ў цэнтры) зашпіленым на ўсе гузікі ў літаральным сэнсе слова. І гэта ў амаль трыццаціградусную сьпёку!

Аднак Прага, якая заўсёды была больш вольнай і дэмакратычнай (хоць, зразумела, у нейкім сэнсе і больш правінцыйнай) — гэта ня толькі Стары Горад, Град ці Вышэград. Я хачу распавесьці крыху пра іншую Прагу.

Міленіюм (Новае тысячагодзьдзе) мы ўсёй сям'ёй сустракалі на Бабе.

Баба — гэта раён такі: ціхі, зялёны. Адна з вуліцаў, якая вядзе сюды, так і завецца — Зелена. Чымсьці нагадвае Нікіцкі батанічны сад у Крыме. Столькі тут розных экзатычных відаў хвояў, соснаў, гіганцкіх рададэндранаў, туяў, гінкга! Зусім побач, за Шарэцкім Патокам (які, трэба зазначыць, ніякага дачыненьня да былога беларускага сьпікера ня мае), пачынаецца дзікая прырода. У рысе гораду можна ўбачыць і ліс, і касуляў, і аленяў, і дзікоў. Не кажу ўжо пра агромністую колькасьць птушак.

Першыя некалькі месяцаў нашага жыцьця на Бабе, калі часам уначы ня спалася і было зусім сумна ды ніякавата, падбадзёрваў сваімі сьпевамі дрозд. Сьвятло ад ліхтароў ён, напэўна, прымаў за сонечнае ці што, але ж сьвістаў самааддана, нягледзячы на халодныя зімовыя ночы. А ўжо як ён заліваўся летам, седзячы на даху і ловячы апошнія промні сонейка на захадзе! Уражаньне такое, што рабіў ён гэта ня дзеля сваёй сяброўкі ці іншых навакольных самак, але асабіста для гаспадара дому, побач зь якім жыў. Вельмі дружалюбная і прыязная да чалавека птушка.

Наш кот-зладзюга на іх, канечне, паляваў. Праўда, упаляваць ніводнага дразда яму, здаецца, не ўдалося, чаго ня скажаш пра няшчасных сінічак. Але аднаго разу ўначы давялося назіраць, як птушкі палююць на... нашага ката. Гэта былі агромністыя совы, якія выдаваліся зусім белымі ў сьвятле поўні. Кату здавалася, канечне, што гэта ён на іх палюе, падскокваючы і спрабуючы ў паветры дастаць адну зь іх кіпцямі. Совы бясшумна ўзносіліся ўверх, а потым моўчкі пікіравалі на

ворага ўніз ды зноў узьляталі. Пабачыўшы чалавека, яны адразу зьніклі ўначы. А ў ката засталіся глыбокія шнары на пысе, якія доўга потым не загойваліся.

Нам здавалася, што наш кот — чорны, зь белай манішкай на грудзёх, белымі пальчаткамі на лапах і чорна-белым носам, народжаны ў Слоніме, унікальны паводле свайго раскрасу. Нават гаспадыня дому, дзе мы жылі, — прагная да грошай, пыхлівая і незгаворлівая пані-інжынэрка адразу раставала, калі бачыла нашага ката і пачынала мармытаць пра яго нешта ласкавае.

Хутка выявілася, праўда, што на Бабе амаль усе каты такія самыя. Аднак нашыя суседзі, у якіх былі свае сабака-лябрадор і котка, чамусьці нашага ката таксама ўпадабалі. І гэта нягледзячы на тое, што кот-злодзей унадзіўся красьці ежу ў суседзкай коткі проста са сподачка, пад носам у сабакі. Лябрадор — парода абсалютна мірная, выведзеная, здаецца, выключна для таго, каб дзеці беспакарана рабілі зь ёй усё, што хочацца, а дарослыя захапляліся ейнай бязьмежнай адданасьцю ды прыроджанай інтэлігентнасьцю. Лябрадор, выглядае, самая ўлюбёная парода сярод уладальнікаў сабак у Празе. Калі не лічыць таксаў, канечне. Гэтыя, у адрозьненьне ад мілых, але бесхрыбетных лябрадораў, амаль заўсёды маюць характар, і нярэдка даволі дрэнны. Пры гэтым яны абсалютна пазбаўленыя страху і гатовыя змагацца за свае правы й свайго гаспадара з праціўнікам, які перавышае іхную вагу разоў у сто.

Адна такса круглы год будзіла нас уначы сваім брэхам (сучка была такая злая, што выводзіць яе гуляць удзень гаспадыня не насьмельвалася). У адказ звычайна адгукаўся голас нашай суседкі на-

супраць, падобны на ерыхонскую трубу. Зрэшты,. голас яе цалкам адпавядаў ейным неабхватным габарытам, і нярэдка мы прачыналіся ад таго, што яна мірна на ўвесь голас размаўляла пра жыцьцё з кімсьці на процілеглым баку вуліцы.

Колькасьць сабак у Празе, і ў прыватнасьці на Бабе, даўно пераўзышла, выглядае, колькасьць людзей. На жаль, расьце і колькасьць прадстаўнікоў байцовых пародаў — усякіх там пітбуляў і ратвэйлераў, а разам зь іхным пагалоўем расьце і колькасьць пакусаных на сьмерць людзей, у тым ліку, што раней здавалася неверагодным, — маленькіх дзяцей. Праўда, трэба адзначыць, што сустрэць сабаку без намордніка ў грамадзкім транспарце, або на ходніку, альбо ў парку ў Празе амаль што неверагодна.

Дык вось, новы, 2000-ны год, мы вырашылі сустракаць на Бабе. А трэба сказаць, што слова Баба мае ня толькі тапанімічнае, але пэўнае фізычнае ўвасабленьне. Так называюць руіну, што стаіць на высокім беразе Влтавы, на Астрозе. Вакол ляжаць раскіданыя сапраўдныя альпійскія лугавіны, дзе летам пасьвяцца авечкі. Панарама Прагі адсюль такая, што сюды штовечар прыяжджаюць на машынах, каб толькі палюбавацца наваколь- ным відарысам. На процілеглым беразе высяцца дамы мікраraёну Троя і пагорак з заапаркам, пра які я ўжо распавядаў. Унізе — Влтава, чыгунка, аўтамагістраль і ўся даліна, у якой месьціцца, уласна, асноўная частка Прагі. І нават ачышчальныя збудаваньні на рацэ ў раёне, які завецца Пад Бабай (ня трэба блытаць з Бабай), не псуюць агульнага пэйзажу.

Паглядзець навагодні вагняструой з Бабы тады прыйшло нямала людзей. Многія, як і нашая ся-

м’я, прынесьлі з сабой шампанскае, закуску. Моладзь біла ў бубны і тамтамы, гудзела ў горны. Акурат апоўначы пад агульныя воклічы паляцелі ў неба коркі ад шампанскага. Аднак хутка заўважаю, што большасьць публікі — а гэта тутэйшыя жыхары — захоўвае маўклівы спакой. Ніхто зь іх ня п’е, не крычыць. Паглядзеўшы бясплатнае відовішча — вагнястрой, старыя пары, узяўшы адно аднаго пад руку, паволі разыходзяцца па дамах.

Сустрэўшы перад гэтым Новы год у раёне Вацлаўскай плошчы, я быў пераканаты, што чэхі шалёна любяць весяліцца. Апоўначы ад разрываў пэтардаў і звону бутэлек з-пад шампанскага, бразнутых аб брукаванку, і дзікага гарланьня можна было аглухнуць. Шкло ад бутэлек засьцілала Вацлаўскую плошчу, як лёдам. Але ж раніцой ад сьмецьця не засталося й сьледу. Гэта папрацавалі адмыслова нанятыя магістратам студэнты. Весяліцца й шумець на вуліцах Прагі любяць. Але гэта турысты. Чэхі робяць гэта ў гасподах і яшчэ на восеньскіх балях, якія называюцца Бурчак — ад назвы маладога шумлівага віна (дакладней, брагі) новага ўраджаю. Апошнім часам, праўда, у Празе пачалі прадаваць францускае Бажале. Аднак тутэйшыя знаўцы па-ранейшаму аддаюць перавагу чэскаму віну — Бзэнецкаму, напрыклад, ці якому-небудзь яшчэ з мараўскіх вінаў.

Чэская прэса тым часам б’е трывогу — усё меней людзей захоўваюць вернасьць чэскім вінам, піву, кнэдлікам, гэрмеліну і шпэкачкам. Ды й сапраўдныя шпэкачкі (сьвіныя сасіскі, адмыслова падсмажаныя над вогнішчам ці на адкрытым вагні) пакаштаваць становіцца ўсё цяжэй. Усё больш людзей аддаюць перавагу фаст-фуду ці вэгетарыянскім стравам. Усё меней людзей прыходзяць у

гасподы, дзе, як у часы Швэйка, можна зьесьці «печэнэ коляно» (па-нашаму, сьвіную рульку — толькі з паўкілі, ня менш, вагой), выпіць куфаль-другі-трэці піва Старапрамен ці Крушовіцэ ды гадзінамі размаўляць на розныя агульначалавечыя тэмы. Я адмыслова назваў менавіта гэтыя гатункі піва, бо ў кожнага места ёсьць свая фірмовая марка. У Пльзене, акрамя славутага «Праздрою», гэта «Гамбрынус». У Чэскіх Будэёвіцах — «Будвар». А ёсьць яшчэ знакаміты «Велькапаповіцкі Козел». Праўда, расейцы менавіта гэтага гатунку чамусьці ня любяць. Можа, з-за назвы, у якой ім чуецца нейкі намёк?

**Дзядзька Ваня, Швэйк і іншыя**

Чэхі кажуць, што некаторыя зь непаўторных якасьцяў «Казла» былі страчаныя за савецкім часам, калі піва гналі на экспарт у іншыя сацыялістычныя краіны вялікімі партыямі й ня надта дбалі пра якасьць.

Дарэчы, мой далёкі сваяк — нябожчык Іван Каранкевіч, які шмат гадоў працаваў на менскім піўзаводзе інжынэрам-тэхнолягам, у 70-я гады прыяжджаў набірацца вопыту да чэскіх півавараў. (Зь песьні слова ня выкінеш. Быў ён мянчук, гарадзкі чалавек, і Янкам яго ніколі ня звалі, а звалі выключна дзядзькам Ванем.) Пра сваю паездку і пра чэхаў ён успаімнаў з замілаваньнем. Высокі, мажны, з ружовым тварам, блакітнымі вачыма й рэдкімі бялявымі валасамі на галаве, з круглым, «піўным» жыватом, лагодны ад натуры чалавек, ён і сам быў чымсьці падобны да чэха. А што датычыць чэскіх тэхналёгіяў ды вопыту — тут дзядзька Ваня разводзіў рукамі. Дзе ж было ўзяць тую культуру працы, як у чэхаў? Ад яго я ўпершыню

пачуў байку пра тое, як чэскія піваварьі ў мінулым правяралі якасьць напою, упершыню звараная чаляднікам: аблівалі півам лаву й сядалі на яе ў скураных штанах. Калі лава падымалася разам з майстрамі — значыць, піва добрае.

На думку дзядзькі Вані, лідзкае піва ня шмат у чым саступала лепшым чэскім сартам, бо адзін з галоўных сакрэтаў, і пра гэта казалі яму чэхі, — вада, якасьць якой залежыць ад глыбіні артэзіянскіх западзінаў і нават пародаў, сярод якіх яна залягае. Калі гранітныя пароды — якасьць адна. Калі пясок — зусім іншая.

Але ж на тое, каб пашырыць асартымэнт прадукцыі ці павялічыць выпуск аднаго нейкага гатунку, трэба было найвышэйшае дазваленьне з Масквы. Таму і гналі пераважна «Жыгулёўскае». Хітра-мудра і нядорага. А што былі ў беларусаў і свае традыцыі бровараў, дык пра тое ўспомнілі толькі зусім нядаўна, калі ўжо на рынку пачала дамінаваць «Балтыка». Далёка ня лепшая марка піва, але ж побач зь півам, атрыманым на дапатопным абсталяваньні паводле старых, «плянавых» прынцыпаў, яно часам выйграе ў якасьці.

Дарэчы, ад таго, што «Пльзенскі праздрой» выкупіла нядаўна паўднёваафрыканская фірма, смак знакамітага піва не пагоршыўся. Але чэхам гэта ўсё-ткі не падабаецца: піўныя бровары заўсёды лічыліся нацыянальным здабыткам Чэхіі, часткай нацыянальнай культуры. Варта нагадаць, што нямецкае слова «пільзнэр» пайшло ад чэскага «пльзеньскага».

Цяпер, калі Чэхія рыхтуецца ўступіць у Эўрапейскі Зьвяз, некаторыя пабойваюцца, што піва можа быць выціснутае амэрыканскімі (!) Кока-колай, ці Пэпсі. Парадокс, але кавярням і рэстара-

цыям піва прадаваць няма сэнсу — яно таньней за мінэралку, ня кажучы пра колу. На «півечку» прыбытку ня зробіш. Зь іншага боку, турысты, асабліва зь Нямеччыны, і едуць сюды найчасьцей толькі дзеля таго, каб танна выпіць і закусіць.

Многія чэхі, асабліва інтэлектуалы, ня любяць Гашкавага Швэйка. Яны лічаць яго карыкатурай на чэха, абразай для ўсяго чэскага грамадзтва, у лепшым выпадку — прынадай для даверлівых турыстаў. Напэўна, для турыстаў так яно і ёсьць — Швэйк выклікае асацыяцыю недалёкага гулякі і заўсёдніка піўнухаў. Мала хто, я думаю, з замежных турыстаў, у тым ліку і з былых савецкіх рэспублік, узяў на сябе працу прачытаць раман Гашка. Дарэчы, купіць «Прыгоды зухаватага ваякі Швэйка» на мове арыгіналу ў Празе — праблема. Давялося купляць славацкае выданьне.

Мяне асабіста Швэйк, чытаць якога падлеткам дарослыя катэгарычна забаранялі, навучыў з іроніяй і недаверам ставіцца як да вайскоўцаў, гэтак і да службы ў войску — у якім заўгодна. Яшчэ ў школе, клясе ў 9-й, тэмай сачыненьня на вольную тэму я выбраў «Прыгоды Швэйка». Наша клясная кіраўніца — выкладчыца расейскай мовы, захварэла. Ну, а я, што называецца, выкарыстаў момант. Настаўніца, якая часова замяніла «русалку», прыйшла, натуральна, у жах ад тэмы. Аднак, каб не прыцягваць непатрэбнай увагі і не ўсчыняць скандалу, яна абмежавалася тым, што праверыла толькі памылкі, не паглыбляючыся ў сэнс сачыненьня, ды вывела пяць за граматыку і чацьверку за зьмест.

А я, на свой падлеткавы розум, пісаў тады тое, ад чаго не адмаўляюся і цяпер. На маю думку, больш антываеннай, мілітарысцкай кнігі ў сьве-

це, бадай, няма. Нават у Рэмарка пры ўсёй нібыта рэалістычнасьці апісаньняў жахаў вайны «На Заходнім фронце бязь зьменаў» і тым больш «Тры таварышы» ахутаныя пэўным рамантычным флёрам, флёрам легенды аб «сапраўднай мужчынскай дружбе». У Гашка ніякай рамантыкі няма. І нават «Бывай, зброя!» Гэмінгўэя нясе на сабе адбітак інтэлектуальнай рамантыкі, настальгіі ці чагосьці падобнага.

Войска, паводле свайго вызначэньня, ёсьць абсалютна тупой машынай, якая патрабуе ад усіх падначаленых зьверху да нізу аднаго: не разважаць!!! Як сказаў адзін старшына: «Калі вы такія разумныя — чаго ж вы строем ня ходзіце!»

«Тупой і яшчэ больш тупы» — гэтак, сапраўды, можна сказаць і пра герояў раману пра Швэйка. На тле татальнай і жорсткай тупасьці «недалёкасьць» Швэйка робіць яго амаль Дыягенам.

Адна з найбольш моцных карцінаў, якія мне давялося бачыць, — «Шукаю чалавека» Ярданса, дзе ў жывёлаў абсалютна чалавечыя вочы, а ў людзей, акрамя Дыягена, замест твараў зьвярыныя пысы. «Шукаю чалавека! Агу-у!» Няма нікога. Хіба што «вольнавызначальны» Марак, у якім Гашак вывеў ці не самога сябе?

А вайна — гэта чалавечая мясарубка. І ўсё. На старонках раману рэальна гіне, здаецца, толькі адзін чалавек — жаўнер, які вызірнуў з вагону і выпадкова начапіўся на чыгуначны сэмафор. Загінуў за некалькі сот кілямэтраў ад лініі фронту — з-за чыёйсьці тупасьці ды абыякавасьці. Кішкі вонку, і ніякай рамантыкі. Але ж абсалютна ясна, што цэлыя эшалёны везьлі тады тысячы людзей на фронт, якіх чакаў пры канцы шляху падобны лёс.

Скажаце — ня сьмешна. А хто сказаў, што Гашак сьмяецца з кагосьці? Калі і так, дык робіць ён гэта вельмі своеасабліва. Прынамсі, амаль ніхто зь ягоных герояў не сьмяецца наўмысна і нават не жартуе. У тым ліку і Швэйк. Ён жа не выдумляе сваіх гісторыяў — ён бярэ іх з жыцьця. А хіба жартаваў той афіцэр, які даводзіў курсантам, што «фасад ёсьць пярэдняй часткай будынку», і ўрэшце загінуў пад калёсамі аўтамабіля, спрабуючы спраўдзіць тэорыю практыкай ды паглядзець нарэшце, раз у жыцьці, на той самы фасад? А хіба вы не сустракалі хоць аднойчы ў жыцьці, хоць бы на ваеннай катэдры ў інстытуце паручніка Дуба зь ягоным: «Вы мяне яшчэ ня ведаеце — вы мяне яшчэ ўведаеце!»

Так што, «асьмелюся дакласьці», мая завочная любоў да Чэхіі пачалася яшчэ ў падлеткавым узросьце.

**Мадона й турысты**

На самым пачатку 60-х мая маці зьезьдзіла ў турпадарожжа ў сацыялістычныя краіны: Баўгарыя, Югаславія, Чэхія, ГДР. Вярнулася ў поўным захапленьні — асабліва ад Чэхіі. Памятаю ейны аповед пра тое, як у нейкім рэстаране ў Празе іх, групу турыстаў з СССР, нечакана сустрэлі авацыяй. Разгубленыя турысты не маглі зразумець, у чым справа, пакуль не пачулі: «Гагарын! Гагарын у космасе!» ( Хачу зазначыць, жарт «Маскалі ў космас паляцелі! — Як, усе?» народзіцца значна пазьней).

Тады многія падыходзілі да «рускіх», паціскалі рукі, сувалі ім у рукі цукеркі. Магчыма, савецкіх турыстаў вадзілі па нейкіх асаблівых рэстаранах, магчыма, дом, куды іх вадзілі ў госьці да

звычайнай чэскай сям'і, доўга падбіраў які-небудзь «капітан Зэман». Але ж калі маці пасьля гасьцей знайшла ў кішэні свайго плашча некалькі чэскіх кронаў, падкладзеных туды цішком чэскай гаспадыняй, — яна расплакалася. Бо чэхі жылі тады не нашмат лепей за «славянскіх братоў».

Ад тае паездкі засталіся альбом з чорна-белымі фатаграфіямі Прагі, драўляны флякон з ружовым алеем зь Вялікага Тырнава і каталёг «Дрэздэнская галерэя» з рэпрадукцыямі на шыкоўнай крэйдавай паперы. І сярод іх — гэта было чараўніцтвам! — каляровыя «Сікстынская Мадона» Рафаэля і «Сьпячая Вэнэра» Тыцыяна. Дагэтуль памятаю адчуваньне мяккага цяпла, якое, здавалася, сыходзіла ад тых рэпрадукцыяў. Усяго толькі рэпрадукцыяў. Тыя карціны наяве мне давядзецца ўбачыць толькі гадоў праз трыццаць, у самой Дрэздэнскай галерэі. А яшчэ праз два гады прыйдзе жахлівая навіна: Дрэздэн затапіла, і шэдэўрам жывапісу пагражае гібель. Які фантастычны лёс у карцінаў! Схаваныя ў штольнях гітлераўцамі, якія зьбіраліся іх затапіць, палотны былі знойдзеныя савецкімі вайскоўцамі, вывезеныя ў Маскву, потым вернутыя ў Дрэздэн.

Пры мне група турыстаў з Ізраілю, відавочна эмігрантаў з былога СССР, многія зь іх — напэўна, нашчадкі ахвяраў Галакосту, дапытвалася ў гідэсы: колькі каштуе «Сікстынская Мадона»? Мадона пяшчотна ўсьміхалася сваёй крыху трывожнай усьмешкай. Мабыць, карціны геніяльных майстроў здольныя нешта прадчуваць ці аб нечым папярэджваць?

Не магу тут не згадаць яшчэ адной загадкавай па сваёй моцы карціны — гэта «Мона Ліза». Хоць Леанарда пісаў жанчыну зусім зямную й сьвец-

кую, узьдзеяньне партрэта на гледача ўражвае. Нехта можа сказаць, што на нас узьдзейнічае не сама карціна, а яе папулярнасьць, легенда, якая даўно разышлася ў мільёнах рэпрадукцыяў. Але так можа сказаць толькі той, хто ня бачыў арыгіналу.

Звычайна, непасрэдны кантакт з шэдэўрам крыху расчароўвае — прынамсі, у першы момант, калі выяўляецца, што твае чаканьні не супадаюць з уражаньнямі, і табе становіцца нават крыху сорамна за гэта. Але гэтым разам усё было наадварот.

Уявіце сабе звычайную белую сьцяну зь невялічкай карцінай на ёй. Перад карцінай мітусіцца натоўп, заднія, як заўсёды, налягаюць на пярэдніх, каб тыя ішлі далей. А пярэднія шэрагі не расступаюцца, не — яны расьцякаюцца пад націскам, нібы пратаплязма, якую не прапускае нейкае нябачнае магнітнае поле. Ніштo — ні штучнае электрычнае сьвятло, ні адмысловае браніраванае шкло, у якое запакаваная карціна, ні шоргат сотняў ног, ні шэпт соцень галасоў, ні ўспышкі фотаапаратаў, ні мітусьня і штурханіна — ніштo не перашкаджае гледачу ў спатканьні з карцінай. З Монай Лізай? Ня ведаю. Я ня ведаю, хто пазірае на нас з партрэту, напісанага Леанардам. Гэта ня ёсьць важна. Я ведаю адно і абсалютна дакладна — карціна выпраменьвае калясальную фізычную энэргію. Вакол яе існуе нейкае станоўчае біяполе высокага напружаньня. Тысячы людзей ідуць паглядзець на ўсьмешку Моны Лізы, як матылькі ляцяць на сьвятло. Альбо як пацукі ідуць на гук чароўнай дуды, забываючыся на ўсё...

На падлозе пад карцінай поўна сьмецьця: уваходныя білеты ў Люўр, схемы-паказальнікі, цу-

керкі, фанцікі, дробныя купюры, яшчэ нейкая драбяза... Людзі ня ведаюць, як выказаць тое, што яны адчуваюць. Яны агаломшаныя, як пасьля дозы нейкага наркотыку. А ў Люўры ж яшчэ некалькі тысяч шэдэўраў!

Праўду кажучы, варта было б стварыць асобны музэй Моны Лізы.

Не абавязкова губляць час у гіганцкай шматгадзіннай чарзе, якая зьмяёй уецца вакол славутай шкляной пірамідзы перад Люўрам. Хоць бы таму, што зусім побач ёсьць яшчэ адзін уваход, дзе заўсёды зусім няшмат людзей. Але дзе гэты ўваход — не скажу, бо, па-першае, няма гарантыі, што пасьля гэтага і там ня ўзьнікнуць даўжэзныя чэргі. А па-другое, можа быць, і варта хоць раз у жыцьці пастаяць у чарзе за чымсьці такім, на што цяжка знайсьці тлумачэньне. Вось, кажуць, амэрыканцы і японцы ходзяць у музэі толькі дзеля таго, каб адзначыцца. Маўляў, калі-небудзь, у старэчым узросьце прыемна будзе сказаць сваім праўнукам: а ведаеце, я бачыў «Мону Лізу» зблізку! А больш нічога ў маім жыцьці і не было. А што можа быць БОЛЬШ за гэта?

**Усьмешка без ката**

Між іншым, наконт мастацтва сакральнага й сьвецкага. У Ватыкане, у залі з росьпісамі Мікеланджэлё на тэму Страшнага суду ўвесь час стаіць неверагодны шум. І гэта пры тым, што на кожным кроку строгія надпісы «Сілянс!» (Цішыня). Пагрозьлівае шыканьне наглядніка дзейнічае, але нядоўга. Праз пару сэкундаў зноў пачынаецца чалавечы гоман. У чарзе да Чорнай Мадоны ў Мансэраце чамусьці найбольш разьвязна й шумна паводзяць сябе турысты з каталіцкай Польшчы.

Ля «Моны Лізы» ўсе замаўкаюць — нават гаманлівыя японцы.

Аляксандар Генісі ў сваёй «Бабілёнскай вежы» проціпастаўляе эўрапейскаму жывапісу старажытны кітайскі пэйзаж — зь ягоным культам прыроды, недасказанасьцю і вокамгненасьцю. Паводле лёгікі аўтара, вечны сэнс шэдэўрам заходняй культуры надае «рама»: карціны старых майстроў для нас тым больш каштоўныя, чым больш раскелінаў пакрывае ляк на паверхні палатна і чым больш цьмянымі становяцца фарбы. А вось усходнія майстры імкнуліся зафіксаваць імгненьне, і таму іх творы жывуць дагэтуль.

Мне, напрыклад, не зусім зразумела, да якой культуры належыць геніяльная драўляная скульптура пісца, выстаўленая ў Люўры, — да культуры Старажытнага Эгіпту (хто ўспомніць адразу, якой менавіта эпохі або царства?) ці да сучаснай заходняй культуры таксама? І ці дадаюць нешта да эстэтычнай асалоды ад гэтага шэдэўру нейкія раскеліны, калі яны (крый Божа!) утварыліся ў матэрыяле, зь якога зроблены?

Чаму твары з палотнаў Гальбэйна-малодшага ці ван Эйка гэтак нагадваюць твары сучасьнікаў? (Здаецца, сёньня раніцай побач са мной у трамваі ехаў юнак, які быццам сышоў з тагачаснай карціны). Можа, таму што чалавек за апошнія пяцьсот гадоў зусім не зьмяніўся? Ці мастакам удалося адлюстраваць родавыя рысы чалавека?

Узяць малюнак Дзюрэра «Дзядоўнік». (Ён, дарэчы, шмат гадоў таму выстаўляўся ў Менску. Так што, сапраўды, ня ўсё толькі кепскае было ў Савецкім Саюзе за камуністамі.) Дасканаласьць малюнка ўражвае — ён можа быць ілюстрацыяй у падручніку батанікі. Але хіба расьліну маляваў

Дзюрэр? У сучаснага гледача пры поглядзе на малюнак узьнікаюць асацыяцыі з кустом дзядоўніку ў Талстога ў ягоным «Хаджы-Мураце». Зусім не хачу сказаць, што Талстой натхняўся малюнкамі Дзюрэра. Я аб тым, што рэалістычнае мастацтва таксама ёсьць тайнай, пры ўсёй быццам бы «даступнасьці» яго для гледача. Дзядоўнік у Дзюрэра — гэта больш, чым расьліна ці характар. Гэта цэлы сусьвет.

Ня ўпэўнены, што Леанарда зафіксаваў на партрэце Моны Лізы менавіта імгненьне — выпадковую ўсьмешку сваёй знаёмай, дамскі капрыз, так бы мовіць. А што да пэйзажу, на тле якога сядзіць дама, дык ён абсалютна невыразны. Кожны мастацтвазнаўца прызнае, што да Вінчы ня быў вытанчаным майстрам пэйзажу. Ды й наагул сучасьнікі вялікага мастака мала ўвагі надавалі гэтаму жанру. Леанарда гэтая дэталь карціны цікавіла найменш. Тут увогуле няма прывязкі да часу й мейсца — нават адзеньне знатнай дамы не прыцягвае асаблівай увагі гледача. Толькі твар. І чым больш на яго глядзіш, тым болей страчвае значэньне, ці ёсьць гэта менавіта жаночы партрэт. Усе вядомыя спэкуляцыі на тэму, ці не маляваў Леанарда пад выглядам Моны Лізы свой аўтапартрэт, ідуць ад нашай нядольнасьці спасьцігнуць таямніцу. Тую самую тайну, пра якую піша і Геніс, але ў якой ён чамусьці адмаўляе заходняму клясычнаму мастацтву.

У выявах сьвятых пол ня меў значэньня. Парадаксальнае выключэньне — Мадона, якая корміць Хрыста-немаўляці. На партрэце дзёрзкага Леанарда да Вінчы гэта цалкам рэальная, зямная жанчына. А вось у нібыта сьвецкім партрэце Мо-

ны Лізы пол зноў траціць сваё значэньне і сэнс. Ну, амаль што траціць...

Па-сутнасьці, Леанарда ўдалося, кажучы мовай Льюіса Кэрала, выявіць «усьмешку без ката».

Дарэчы, нехта зь вялікіх фізыкаў — Нільс Бор, здаецца, — ужыў гэтае паняцьце да элемэнтарнай часьцінкі, якая завецца «нэўтрына». Нэўтрына мае нулявую масу і ня мае зараду. Пры гэтым яна мае цалкам выразную характарыстыку, якая называецца «сьпінам» — гэта значыць кірунак вярчэньня. Інакш кажучы, нешта, што немагчыма выявіць, ці адчуць звычайнымі прыборамі — тое, «чаго няма», тым ня менш, круціцца вакол сваёй восі ў строга вызначаным кірунку. Сьпін — гэта і ёсьць усьмешка без ката.

Моны Лізы таксама даўно няма (ды й ці была яна ўвогуле?). А яе ўсьмешка ёсьць. А тое, што яна растыражаваная ў мільёнах асобнікаў «шырспажыву», нічога ня значыць. Пра існаваньне нэўтрына ведае кожны школьнік. Што не азначае, што кожны школьнік можа мець паняцьце пра сьветабудову.

Але ж вярнуся яшчэ на хвіліну ў Дрэздэн. Акрамя каралеўскага комплексу Цьвінгер, у які ўваходзіць і Дрэздэнскай галерэя, у сталіцы былога каралеўства ад таго часу, бадай, не засталося нічога. Ёсьць, праўда, малочная XVII ст., пра якую напісана ва ўсіх даведніках. Мы неяк з жонкай вырашылі пайсьці туды. Перайшлі праз мост, дайшлі да нейкага трамвайнага кальца. Старое саксонскае места скончылася, пачаўся стары «гэдээраўскі» горад. Дзесяцігодзьдзямі не рамантаваныя дамы ў расколінах, з аблупленай фарбай, шэрыя жалезабэтонныя баракі, трава прабівае асфальт, ліхтары з разьбітымі шкельцамі, сьмецьце

на вуліцах... Малочную мы распазналі па турыстычных аўтобусах. Добра апранутая публіка фляніравала па краме, якую можна параўнаць з музэем, ды й тое далёка ня з кожным. Ляпніна з пазалотай у стылі ракако, вадаграйчык з кранікам, адкуль можна наліць шклянку сьвежага малака за адзін эўра, што, дарэчы, зусім ня танна. Фірмовыя сыры з розных эўрапейскіх краінаў.

А на вакзале ў Дрэздэне можна сустрэць зусім старэнькіх, схуднелых бабулек у жабрацкай, зацыраванай, заношанай вопратцы і стаптаных чаравіках. Такога жабрацтва мне ніколі не даводзілася бачыць, напрыклад, у Празе.

То былі не арабскія жанчыны. (Арабы, дарэчы, трымалі да паводкі тут, на вакзале, некалькі кавярняў і крамаў. Што сталася зь імі, а таксама з жабракамі, для якіх вакзал быў заўсёдным прытулкам, мне сказаць цяжка.) Гэта былі немкі. І не ў разбураным бамбёжкамі саюзьнікаў горадзе Трэцяга Райху, але ў сучаснай ФРГ, якая заўсёды славілася сваёй заможнасьцю і клопатам пра старых людзей. Калі глядзіш на калясальнае будаўніцтва, якое ідзе ў Бэрліне ад моманту ўзьяднаньня Нямеччыны (практычна, увесь усходні Бэрлін вось ужо больш за дзесяць гадоў уяўляе сабой гіганцкую будаўнічую пляцоўку), на супэрсучасныя супэрмаркеты і гандлёвыя цэнтры, а таксама шматлікіх туркаў, якія акупавалі ўлюбёны імі раён Тыргартэн, міжволі задумваесься. Чаму дасканалая сыстэма сацыяльнай падтрымкі ў Нямеччыне дапамагла арабам, туркам, тысячам былых савецкіх габрэяў, але не заўсёды дапамагае ўсходнім немцам?

Можа быць, гэта своеасаблівая помста «заходнікаў» — маўляў, жылі пакорліва ў ГДР пры ка-

мунізьме, дык і заставайцеся ў жабрацтве? А можа быць, эканоміка ўсходняй Нямеччыны пра сацыялізьме прыйшла ў такі заняпад, што аднавіць нармальнае жыцьцё на ўсходніх землях ужо немагчыма ніякімі інвэстыцыямі? Што ж тады казаць пра розьніцу паміж эканомікай Захаду і ўсімі астатнімі краінамі Ўсходняе Эўропы?

**«Вы маеце радыёстанцыю»**

Розьніца паміж мной і маім родным дзядзькам — амаль дзесяць гадоў. Цяпер мне здаецца, што гэта ня так і шмат. А калі мне было дванаццаць, дык здавалася, што дзядзька — зусім дарослы чалавек, які жыве сваім таямнічым і надзвычай цікавым жыцьцём. У яго, дарэчы, быў чэскі матацыкл — «ЧЗ». Ня «Ява», заўважце, якая была ў многіх, а «ЧЗ» — «Чэске Зброёвэ». І гэта рабіла маё захапленьне дзядзькам-матацыклістам, які іншым разам вазіў мяне з сабой, проста бязьмежным.

Часам паводзіў ён сябе, як я пазьней зразумеў, не зусім па-даросламу. Аднойчы прынёс аднекуль у хату (а мы жылі ў сапраўднай драўлянай хаце, зь яблычным садам і бэзам у двары, хоць і ў горадзе) рацыю з антэнай. Сапраўдную, скрадзеную зь нейкага сьпісанага ваеннага самалёту.

Як некалі жартаваў літаратурны крытык Рыгор Бярозкін: «Вы маеце радыёстанцыю!»

Сваякі былі ў шоку. Асабліва не падабалася маці, што ўначы ейны брат уключаў рацыю і круціў ручку наладкі — наладка была дакладная, круціць трэба было доўга, але ж якая была якасьць! Усе радыёгаласы было чуваць, нібы «Маяк». Мне «галасы» слухаць не дазвалялася, але ж бацькоўскія забароны на тое і існуюць, каб родныя дзядзькі

ад часу да часу падбухторвалі пляменьнікаў іх парушаць...

Адзін з самых яскравых успамінаў жыцьця, зьвязаных з радыё — забойства Робэрта Кенэдзі. «Голас Амэрыкі» перадаваў рэпартаж аб перадвыбарчым мітынгу сэнатара. І раптам стрэлы, шум, крыкі... Хрыплы ад хваляваньня голас журналіста — Кенэдзі паранены. Я ня ўпэўнены, што гэта было, як цяпер гавораць, «наўпроставае ўключэньне». Хутчэй за ўсё, гэта быў запіс, які ўвесь час паўтаралі. Але ўражаньне было такое, што ты толькі што стаў сьведкам надзвычайнай і трагічнай падзеі.

Хутка я прыахвоціўся слухаць галасы па начах. Ну, не па начах — гадзіны гэдак да 11-й вечара... Але ўварваньне ў Чэхаславаччыну (а гэта здарылася ўсяго праз два з паловай месяцы пасьля забойства Кенэдзі-малодшага) я праспаў.

Натуральна, ня я адзін... Адразу пасьля гэтага бацькі паспрабавалі мне нешта патлумачыць — ня так, як тлумачылі ў школе пра магчымасьць агрэсіі ФРГ і пагрозу «ўстоям сацыялізму». Маці сказала тады вельмі проста, успомніўшы народнае прыслоўе: «Сілай у рай не загоніш».

Даволі доўга ўсё ўспрымалася на ўзроўні эмоцыяў — прычым, пераважна спартовых. Бацькі і іхныя сябры зьбіраліся ў нас дома, каб паглядзець чэмпіянат сьвету па хакеі і пазаўзець — за чэхаў, натуральна. Калі чэхі прымудраліся перайграваць СССР — гэта было сапраўднае сьвята. Вельмі хутка імёны Недаманскі, Фарда, Глінка, Аўгуста пачалі гучаць для мяне такой самай цудоўнай музыкай, як для маіх пагодкаў — Старшынаў, Фірсаў або Трацяк. Аднойчы маладзенькая мэдсястра, што прыходзіла бацьку калоць уколы ад сэр-

ца, саромеючыся, папрасіла ўключыць тэлевізар: «Як там нашы гуляюць?»

«Ведаеце, — казала яна, — кладуся спаць і сьню Міхайлава, Пятрова, Харламава: усю тройку. А то сама гуляю ў хакей». Адкуль ёй было ведаць, ХТО для нашай сям'і тады былі «нашы»?

Што датычыць чэхаў, дык гэта яшчэ трэба паглядзець — хто заўсёды падтрымліваў сваіх больш зацята: савецкія ці чэскія заўзятары. Прынамсі, савецкіх «фанаў» ужо няма. Як і чэхаславацкіх. Пэўны час мне здавалася, што большых заўзятараў, як чэхі, немагчыма сабе ўявіць. Не кажу нават пра хакей. Калі італьянскі судзьдзя не прызначыў пэнальці ў вароты спаборнікаў чэскай каманды на чэмпіянаце Эўропы, наступным днём вядучыя чэскія газэты на поўным сур'ёзе распачалі дыскусію — а ці трэба Чэхіі далучацца да Эўрапейскага Зьвязу, калі эўрапейцы гэтак варожа і нахабна паводзяць сябе з чэскімі футбалістамі? Але ж калі славакі выйгралі чэмпіянат сьвету ў чэхаў... Жыцьцё ў Славаччыне тады спынілася дзён на пяць. Першыя два дні на славацкім інфармацыйным канале «ТА 3» не было навінаў — увесь час нон-стопам ішлі толькі кадры з праявамі шалёнай радасьці славакаў у Братыславе ды іншых местах краіны. Хакеіст Шатан у адзін момант стаўся ня тое што нацыянальным героем, але богам (прабачце за міжвольную гульню словаў).

Але ж я адхіліўся ад тэмы.

Маім бацькам «размовы» пра Чэхаславаччыну каштавалі працы. А я нешта зразумеў толькі ў годзе 70-м, калі пайшоў у кінатэатар «Новости Дня». Быў такі кінатэатар каля Цэнтральнай плошчы ў Менску — там цяпер малая сцэна Купа-

лаўскага тэатру ды тэатральная кавярня. У тыя дні ў тым самым будынку, дзе потым на кароткі час нелегальна разьмесьціцца бюро радыё «Свабода», у асноўным круцілі дакумэнтальныя фільмы. Савецкія стужкі рэдка бывалі цікавымі, але ж прагульваць школу было даволі зручна: сустрэць знаёмых ці сваякоў — ніякіх шанцаў.

Той фільм называўся «Чэхаславаччына: год выпрабаваньняў». Кепскай якасьці чорна-белая хроніка, стандартны «тасаўскі» тэкст. Але ж менавіта кантраст паміж дыктарскім тэкстам і «відэашэрагам» мяне ўразіў.

Хлопцы-студэнты з доўгімі валасамі хапаюцца рукамі за тракі савецкіх танкаў... Хто, які цэнзар гэта прапусьціў тады? «Частка чэхаславацкай моладзі, падманутая варожай прапагандай...» — гугнявіў дыктар. Потым нечакана натыкнуўся на знаёмыя словы ў Маркеса, у «Восені патрыярха»: «бедныя падманутыя хлопцы».

Узрост 14 гадоў, як вядома, лічыцца парой сэксуальнага высьпяваньня. Я не хачу сказаць, што падзеі ў тагачаснай Чэхіі, у СССР, забароненыя размовы «пра палітыку» засьцілі перада мной усё астатняе і што дзяўчаты мяне зусім не цікавілі. Але палітыка была яшчэ больш забароненай тэмай, «табу», чым нават сэкс, а таму здавалася цікавейшай і саладзейшай.

Таму, мабыць, 68-мы год і слова Прага запомніліся мне як нешта інтымнае, глыбока асабістае. Чэхі доўгі час здаваліся мне людзьмі незвычайнымі, як «камісары ў пыльных шлемах» у Акуджавы — сьмелымі, чыстымі, прыгожымі. У рэальным жыцьці яны аказаліся проста людзьмі.

Праз трыццаць гадоў пасьля тых падзеяў мы з жонкай паехалі ў Італію разам з чэскай турыс-

тычнай групай. Экскурсавод — гісторык па адукацыі, як ён сам сказаў, з глыбока правінцыйнымі манерамі, увесь час нэрваваўся. Яму яўна не падабалася, што ў групе ёсьць чужынцы, якія, да таго ж, ня надта добра разумеюць па-чэску. І вось на высьпе Капры ягоныя асьцярогі нарэшце спраўдзіліся.

Мы забыліся, ад якога прычалу адыходзіць катэр на Нэапаль і доўга блукалі ў пошуках нашай групы. Наш гід, выпадкова ўбачыўшы нас на суседняй прыстані, адразу пачаў выгаворваць нам за спазьненьне. Жонка адказала на гэта, што мы ня дзеці і ня трэба нам чытаць мараль.

Тады наш гід вымавіў сакрамэнтальную фразу: «Пасьля таго, што ВЫ зрабілі з Чэхаславаччынай, вам наагул лепей маўчаць!» Заўважце, гэтак экскурсавод зьвяртаўся да кліентаў фірмы, на якую ён працаваў.

А што было яму адказаць? Што мы зь Беларусі, а не з Расеі, і тым болей, не з СССР? А беларускія салдаты хіба не служылі ў савецкіх акупацыйных войсках? Сказаць яму, што мой бацька пацярпеў за спачуваньне Дубчэку і іншым дзеячам «праскай вясны»? А колькі чэхаў пазбавіліся працы на дзесяцігодзьдзі або нават трапілі ў астрог толькі за тое, што не схацелі быць савецкімі й заставаліся проста чэхамі?

Адзін зь іх зваўся Вацлаў Гавал. Сёньня яго многія чэхі ненавідзяць, як Гарбачова — расейцы. Ня спраўдзіў Гавал спадзяваньняў на цуд, на тое, што з адыходам саветаў і кампартыі адразу пачнецца добрае заможнае жыцьцё. Ды й сам Гавал зьмяніўся на пасадзе прэзыдэнта. Да ўлады прызвычайваюцца хутка. Падчас паводкі Гавал, які пакутуе на цяжкую хваробу, усяго на некалькі

дзён затрымаўся ў адпачынку і прыляцеў у Прагу, калі пік навалы ўжо мінуў. 75 % чэхаў скажуць потым падчас апытаньня, што прэзыдэнт ня справіўся з выкананьнем сваіх абавязкаў.

Многія ў Чэхіі цяпер падсьмейваюцца з «аксамітнай рэвалюцыі», зь яе ідэалаў. У тым, што спадзяваньні ня спраўдзіліся, вінавацяць найчасьцей чужынцаў — расейцаў, украінцаў, беларусаў, якіх агулам па-ранейшаму называюць «русамі». Ёсьць яшчэ, праўда, цыганы, якіх большасьць чэхаў і за людзей ня лічаць. І зноў пра Гаўла: калі ў горадзе Вусьці-над-Лабэм мэрыя ўзьвяла сьцяну, каб адгарадзіць цыганскі квартал, прэзыдэнт заявіў: «Альбо сьцяну зьнясуць адразу, альбо я сыходжу ў адстаўку». Сьцяну зьнесьлі — але далёка не адразу. А прэзыдэнт, што называецца, згубіў твар.

У Расеі, зь яе традыцыйным антысэмітызмам, цяпер да ворагаў далучыліся яшчэ «чачэнцы».

У адрозьненьне ад расейцаў чэхі пры ўсёй іхнай ксэнафобіі не патрабуюць, каб іх усе любілі. Яны — самадастатковая нацыя. Прынамсі, чэхі хацелі б так думаць.

**9-11**

Як падзеі «чорнага аўторка» 11 верасьня 2001 г., калі адбыўся напад на Ўсясьветны гандлёвы цэнтар у Нью-Ёрку, былі ўспрынятыя ў Чэхіі? Спачатку — пра маё ўласнае ўражаньне. Як і пераважная большасьць насельнікаў плянэты, я ўбачыў напад па тэлебачаньні, на канале CNN. Паколькі ў гэты момант я быў на працы і займаўся сваімі звычайнымі журналісцкімі справамі, дык у першы момант не надаў пільнай увагі надзвычайнаму здарэньню. Ну, урэзаўся пасажырскі «Боінг»

у адну зь «вежаў-блізьнятаў» у Нью-Ёрку. Жахлівая катастрофа. Але ж, як у вядомым анэкдоце пра падзеньне самалёта й казьляняці, што звалілася ў рэчку: катастрофа — гэта яшчэ не трагедыя. Ды яшчэ калі гэтая катастрофа здарылася за акіянам.

Праз дваццаць хвілін пасьля першага паведамленьня пра самалёт, заходжу ў кабінэт шэфа зь нейкай бягучай справай й бачу на тэлеэкране неверагодную карціну: дымяцца ўжо два хмарачосы. У абодвух зеўраюць калясальнага памеру прабоіны. Пры гэтым над Нью-Ёркам, нягледзячы на слупы чорнага курадыму, — блакітнае неба. Уражаньне такое, што бачыш фрагмэнт нейкага галівудзкага баевіка ў жанры *science fiction*. Прытым баевіка хоць і буйнабюджэтнага, але ж адначасова таннага і безгустоўнага...

Старонку CNN у інтэрнэце ў першыя некалькі гадзін немагчыма было адчыніць: сайт ня быў разьлічаны на такую колькасьць «гітоў».

У Чэхіі, натуральна, як і ў большасьці эўрапейскіх краінаў, быў шок. Былі й кветкі са сьвечкамі ля амэрыканскае амбасады. І чамусьці ля коннай статуі Вацлава на Вацлаўскай плошчы — таксама. Вечаровы, экстраны выпуск «Лідовых Навінаў» разышоўся імгненна. Наступным днём — неверагодная для Прагі рэч — усе штодзённыя газэты былі раскупленыя раніцай. Нават у дні паводкі такога ня будзе.

Аднак пройдзе час, і чэскія сацыёлягі ўсё падлічаць. На пытаньне: «Як доўга вы абмяркоўвалі са сваякамі, сябрамі або калегамі тэрарыстычны напад на ЗША — некалькі дзён запар, увесь дзень 11 верасьня, некалькі гадзінаў, ці меней?» — большасьць адказалі: «Некалькі гадзінаў».

Тут наклалася і яшчэ адна акалічнасьць. У тыя дні каля Вацлаўскай плошчы, упершыню амаль за дваццаць пяць гадоў зьявіліся бэтээры. Асьцерагаючыся, што радыё «Свабода» стане аб'ектам нападу тэрарыстаў, чэскі ўрад выставіў вакол радыёстанцыі, якая была разьмешчаная на запрашэньне Вацлава Гаўла ў будынку чэхаславацкага парлямэнту, ахову зь пяці бэтээраў. Улады хваляваліся ня столькі за супрацоўнікаў «Свабоды», зразумела, колькі за пражанаў, бо ў цэнтры гораду шмат камунікацыяў — станцыі мэтро, вакзал, аўтамагістраль. Але ж клясьці пражане пачалі пасьля гэтага менавіта «Свабоду», бо праехаць ці прайсьці каля радыёстанцыі стала справай складанай, калі не сказаць — марнай.

Не абышлося спачатку і без кур'ёзаў. Зь пяці бэтээраў, узьнятых па трывозе на другім канцы краіны, у Прагу даехалі спачатку тры. Два зламаліся ў дарозе. Адзін зь іх прыехаў пазьней. Але на гэтым злыбеды для чэскіх дэсантоўцаў ня скончыліся. Праз колькі тыдняў у адной з машынаў адкруцілі люстэрка і яшчэ пару дэталяў. Юнакі, якія зрабілі гэта дзеля «прыколу», потым дэталі вярнулі й папрасілі прабачэньня. У чэскіх газэтах з нагоды тых выпадкаў стаяў гамэрычны рогат. Але «Свабоду» пачалі ўсё больш настойліва «прасіць» знайсьці сабе іншы кут — напрыклад, былыя савецкія казармы за горадам. Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя, якая наўрад ці зацікавіць чытача.

Пасьля нападу ЗША на Аўганістан, акрамя прысутнасьці ў цэнтры Прагі бэтээраў і больш дасканалага кантролю машынаў блізу заходніх амбасадаў, нічога ў горадзе не зьмянілася. Толькі заходнія турысты пачалі з задавальненьнем фата-

графавацца й здымацца на відэа на тле вайсковай тэхнікі. Скуль ім было ведаць, што падобнай экзотыкі можна наглядзецца на вуліцах ці ў падваротнях Менску падчас вялікіх сьвятаў альбо гадавінаў Чарнобылю. Хоць вялікае пытаньне — ці ўдалося б ім нешта зьняць без дазволу?

Ну, а сьціплыя паліцэйскія бэтээры, якія зь цягам часу зьмянілі каля радыё сваіх вайсковых папярэднікаў, вельмі хутка ўвогуле перасталі цікавіць публіку. Падчас саміту НАТО і гэтыя бэтээры некуды адправілі — відаць, ахоўваць іншых людзей, каштоўнасьць жыцьця якіх вышэйшая за жыцьцё журналістаў.

Адчуваньня вайны тады, увосень 2001-га, не было. Але тое, што нешта ў агульнай атмасфэры мяняецца, і мяняецца ня ў лепшы бок, было ясна. Упершыню, мабыць, у жыцьці зьявілася пачуцьцё вострай трывогі за блізкіх. І яшчэ — адчуваньне няпэўнасьці.

У Савецкім Саюзе кожны чалавек мог быць упэўненым у адным — заўтра нічога ня зьменіцца. Ня зьменіцца і пасьлязаўтра, і праз гады таксама. Празь дзесяць гадоў працы ты мог разьлічваць на пуцёўку ў Баўгарыю, праз 20 — зьбярэш грошы на «Запарожац», пры канцы жыцьця атрымаеш кватэру. Ну, ня ты, дык твае дзеці. Калі, канечне, не прап'еш усе ашчаджэньні разам са здароўем.

Пачуваньні пэўнасьці было, як цяпер становіцца зразумелым, ияўнае. Урэшце, што ёсьць дваццаць гадоў «застою»? Хіба не ідылічная карцінка «прывалу» ў бясконцай і жахлівай дарозе, спрэс забітай галоднымі ўцекачамі, разьбітымі вайсковымі часткамі, «заградатрадамі», амонаўскімі патрулямі й марадэрамі?

Прыкладна тое самае было ў Амэрыцы дый Эўропе 90-х. «Залатое дзесяцігодзьдзе», калі нейкія там талібы, Садам і Кастра з Лукашэнкам здаваліся ўсяго толькі рэліктамі каменнага веку. Яшчэ крыху — і настане эра ўсеагульнага дабрабыту. Наіўная вера ў ЗША як «горад, што зьзяе на гары», згарэла разам з руінамі УГЦ.

Зразумела, здарылася гэта зусім не зьнянацку, так сама, як і распад СССР. І як тады ў Маскве шукалі прычынаў у «жыдамасонскай змове», гэтак і цяпер у Вашынгтоне лічаць прычынай усіх бедаў Аль-Кайду — таямнічую і непераможную. І Ўсама — прарок яе. Амін!

Няўпэўненасьць у заўтрашнім дні, трывога, непакой душы — гэта не расплата за гады савецкага застою ці капіталістычнага працьвітаньня, і нават ня плата за дэмакратыю й свабоду. Гэта і ёсьць свабода — яе адваротны бок. Марскі коцік па мянушцы Гастон з праскага заапарку, які падчас паводкі кінуўся ў вірлівыя воды Влтавы, кіраваўся інстынктам свабоды, якая яго і забіла. Сэрца жывёлы, якая прывыкла да сытага і бесклапотнага жыцьця ў акварыюме, ня вытрымала фізічных нагрузак і стрэсу.

Разваліны УГЦ і тысячы забітых ня ёсьць платай за цывілізацыю. Гэта і ёсьць цывілізацыя XX стагодзьдзя, яе, так бы мовіць, квінтэсэнцыя. Ці ёсьць шанец у заходняй цывілізацыі выжыць у стагодзьдзі XXI? Паглядзім.

### Непазьбежнае зло

У кожным буйным эўрапейскім горадзе ёсьць месца, куды вы ня хочаце ісьці, якое вы ня хочаце нават бачыць, але якім, рана ці позна (хутчэй, рана) вам давядзецца скарыстацца. Я маю на ўва-

зе мэтро. У некаторых гарадах з гэтым злом неяк можна ўжывацца і нават мірыцца. Напрыклад, мэтро ў Празе. Па-першае, яно не такое глыбокае, шматлюднае і прэтэнцыёзнае, як у Маскве. Але, зь іншага боку, у адрозьненьне ад Менску, дзе мэтро сталася ледзьве не адзіным хуткасным відам транспарту і дзе людзі стаяць у вагонах, шчыльна прыціснутыя адзін да аднаго, як селядцы ў слоіку, у Празе пасажыры, колькі б іх не было, заўсёды стаяць ці сядзяць паасобку. Яны могуць пры гэтым есьці (уражаньне такое, што палова пасажыраў проста не пасьпяваюць пасьнедаць і робяць гэта па дарозе на працу), цалавацца (улюбёны занятак праскай моладзі), смаркацца і г. д. Але пры гэтым кожны зь іх будзе сам па сабе. Вас няма, вас ігнаруюць, вакол вас нейкае поле адчужэньня, але вам жа ад гэтага й лепей — ніхто ня будзе вас наўмысна штурхаць, напіраць на вас, вісець на плячах і тым больш лаяцца з вамі ці ўступаць у публічныя спрэчкі. Як правіла, ад чэха вы пачуеце ўсяго два словы (калі ўвогуле нешта пачуеце) — «здоволэнім» (дазвольце прайсьці) і «пардон»! Замежнікі, у тым ліку з краінаў былога СССР, на гэтым тле, безумоўна, вылучаюцца. Праўда, беларусы ў сваёй маўклівасьці ці, прынамсі, нешматслоўнасьці могуць і паспрачацца з чэхамі. Але ж вонкавы выгляд выдае іх адразу — чорныя курткі («бунды» па-чэску). Зразумела, чорныя скураныя курткі носяць і ўкраінцы, і расейцы. Але тут ужо ўступае ў сілу першая і асноўная характарыстыка — маўклівасьць і змрочнасьць.

Самае гаваркое мэтро, бясспрэчна, парыскае. І дэмакратычнае таксама — такога зьмяшэньня моваў, стылю адзеньня й прычосак, колеру ску-

ры ня ўбачыш ані ў венскім, ані ў бэрлінскім мэтро. Але з парыскім мэтро зьвязаны адзін з самых маіх змрочных успамінаў пра Парыж.

Перш як трапіць у мэтрапалітэн у якім заўгодна горадзе сьвету, трэба ў яго, мэтрапалітэн, спачатку трапіць. Усе гарады, дзе ён ёсьць, паводле майго ўражаньня, негалосна спаборнічаюць у адметнасьці і складанасьці гэтага працэсу. Менск, безумоўна, славіцца лютасьцю кантралёраў на ўваходзе. Адзін зь іх мае такое самае прозьвішча, што і аўтар гэтых нататак (яно, на вялікі мой сорам, напісанае буйнымі літарамі на ягонай службовай бірцы), і ягоная фізіяномія вядомая ўсім, хто калі-небудзь меў пільную неабходнасьць прасьлізнуць у мэтро без аплаты.

У Празе кантралёры сустракаюцца даволі рэдка, але таксама напускаюць на сябе строгі і непрыступны выгляд. Зь імі ня трэба спрачацца ці «качаць правы». Аднак можна ўступаць у перамовы. Напрыклад — прапанаваць заплаціць штраф удвая меншы, але без квітанцыі. Самае складанае для законапаслухмянага замежнага пасажыра, аднак, — асвоіць аўтамат па продажы білетаў. Паводле сваёй канструкцыі і колькасьці кнопак, якія трэба націснуць падчас апэрацыі набыцьця білетаў на пэўную адлегласьць ці час, гэты апарат, безумоўна, саступае дыспэтчарскаму пункту кіраваньня мэтро. Але ж уласьцівасьць «глытаць» манэты і не выдаваць білеты ці не вяртаць рэшты набліжае гэтыя апараты да ўсім вядомых аўтаматаў з газіроўкай.

У Парыжы кантралёры мне не сустракаліся. Білеты тут заўсёды можна купіць у касіра на ўваходзе (у Празе касіры працуюць не паўсюль і не заўсёды). Галоўнае — ведаць, у якім кірунку ехаць.

Ведаць трэба дакладна, цьвёрда і на памяць. Бо калі вы будзеце кіравацца надпісамі ў падземных пераходах, то дакладна прыйдзеце менавіта туды, куды вам ня трэба. Наагул, пасьля пятага-шостага павароту ў падземных камунікацыях вы спачатку губляеце арыентацыю, а потым — і жаданьне куды-небудзь ехаць. Бо ўсе вашыя спробы вярнуцца туды, адкуль вы пачалі ваш шлях, застаюцца марнымі. Больш за тое, кожная ваша перасадка зь лініі на лінію, што, на Вашу думку, мусіць наблізіць вас да мэты ці, прынамсі, адпраўнога пункту, толькі аддаляе вас ад надзеі калі-небудзь выбрацца на паверхню. У адзін з момантаў у цягніку (вы па сваёй наіўнасьці й не заўважылі, як незалежна ад вашай волі перайшлі зь лініі мэтро на чыгуначную галіну), у вагоне, набітым звар'яцелымі брытанскім маладзёнамі (і як толькі зь іх вырастаюць потым стрыманыя халодныя брыты?), вы даведваецеся ад аднаго зь іх, што вам трэба ў процілеглы бок. І вось вы выходзіце і бачыце сябе на пэроне ці, хутчэй, у пекле, дзе ў белых аблоках пары (адкуль толькі яна ўзялася?) у паўцемры стаіць нейкае інфэрнальнае двухпавярховае, падсьвечанае знутры д'ябальскім сьвятлом, даўжэзнае збудаваньне, якое раптам аказваецца электрычкай на Марсэль. Але нам туды ня трэба.

На свой турыстычны аўтобус, які вяртаўся ў Прагу, мы пасьпелі за хвіліну да ад'езду.

У чужым горадзе, вядома, і бульба заўсёды буйнейшая і кветкі прыгажэйшыя. Заўсёды здавалася, што на Захадзе — ды хоць бы і ў Польшчы — людзі спрэс культурныя, выкшталцоныя, ветлівыя, месца жанчынам і старым заўсёды саступаюць. (Як казала вясковая знаёмая маёй ма-

ці, «каталікі — гэта тыя, што відэльцамі ядуць».) У сапраўднасьці ўсё крыху інакш.

Па-першае, натоўп — ён і на Захадзе натоўп. На вуліцы ці ў транспарце не да сантымэнтаў. Па-другое, цягам апошняга дзесяцігодзьдзя ці ня большую частку гэтага натоўпу сталі складаць уцекачы з Усходу (і ня толькі эўрапейскага). Эмігрантаў з гарачага Поўдню там і раней хапала. Адпаведна, норавы мяняюцца.

Нязьменным застаецца адно: розьніца стэрэатыпу паводзінаў. Савецкі чалавек (усе мы родам з СССР), кім бы ён ні быў паводле сацыяльнага паходжаньня, прафэсіі ды сьветапогляду, — істота калектыўная ды яшчэ выхаваная на мільёне інструкцыяў, умоўнасьцяў, дазволаў і забаронаў. Таму і мітусімся: у краме, у кавярні, у банку, у транспарце. Хто там ззаду, ці ня трэба кагосьці прапусьціць наперад, ці не зайшлі вы ў непатрэбны час у непатрэбнае мейсца, ці не пачуеце вокліч: «Вас тут не стаяла»? А ці выходзіце вы на наступным прыпынку? А вось тая бабулька наперадзе — яна выходзіць? Гэткіх словаў вы ніколі не пачуеце ў праскім трамваі, ці аўтобусе, ці мэтро, хоць людзей там бывае ня менш, як у менскім. Усе, каму трэба, выйдуць, каму трэба — увойдуць. І мейсца жанчыне ніхто не падумае саступіць. Заходні чалавек наагул вас не бачыць ва ўпор, нават калі вы будзеце стаяць тварам у твар. Толькі калі яму будзе трэба, ён вам усьміхнецца й нешта запытае — напрыклад, як прайсьці ў бібліятэку? Ва ўсіх астатніх выпадках вас няма. Наагул нікога няма, акрамя яго самога. Ён будзе лічыць грошы, не адыходзячы ад касы, столькі, колькі яму трэба. І рэчы свае на вакзале пакладзе там, дзе яму (а ня іншым) зручна. І сядзе там, дзе яму хочацца.

Ён не дэманструе сваёй незалежнасьці, ён нарадзіўся й вырас незалежным чалавекам, індывідуальнасьцю. Кепскай ці добрай — гэта ўжо іншая рэч.

Нараджэнца СССР заўсёды лёгка вылічыць у натоўпе ў Эўропе па насьцярожанасьці позірку і пэўнай здранцьвеласьці рухаў. Чым больш ён стараецца не вылучацца з натоўпу і паводзіць сябе натуральна, разьняволена, тым больш кідаецца ў вочы, што ён — чужы сярод чужых.

Як я ўжо казаў, эмігрантаў зь Беларусі, Украіны й Расеі можна пазнаць па скураных куртках, якія зрабіліся амаль што спэцвопраткай, мацюках і кароткіх стрыжках. Але ёсьць і адрозьненьні. Украінцы амаль заўсёды размаўляюць на сваёй роднай мове. Беларусы — амаль ніколі. Часьцей за ўсё яны проста маўчаць.

Неяк за савецкім часам давялося ехаць кампаніяй на таксоўцы зь Ялты ў Сімфэропаль (спазьняліся на самалёт). Таксіст — чалавек з паўднёвым тэмпэрамэнтам, хоць і не каўказец, адразу пачаў сыпаць жартамі, гісторыямі, хохмамі. Гаварыў толькі ён адзін. Праз хвілінаў дваццаць ён раптам спытаўся:

— Слухайце, вы адкуль? — Ды зь Менску мы. — А, беларусы! — радасна здагадаўся таксіст. — А я думаю, скуль жа такія маўчуны могуць быць.

Маўклівасьць для беларуса ня рыса характару, сярод сваіх ён можа быць вельмі гаваркі. Гэта суворая неабходнасьць. Беларус і ў сябе дома паводзіць сябе, як на акупаванай тэрыторыі. Таму «язык мой — вораг мой», «знаходка для шпіёна». Што ўжо казаць пра замежжа, дзе ўсё вакол чужое, усё не сваё.

Трапіўшы ў варожае асяродзьдзе, беларус, аднак, пачынае лічыць усіх астатніх беларусаў, якія

прыехалі ў нейкую аблюбаваную ім краіну раней за яго, амаль што сваякамі. Ну, ня тое што сваякамі — хутчэй, людзьмі, якія абавязаныя табе дапамагчы. Абраўшы Чэхію для палітычнага прытулку ды заручыўшыся даведкай у якой-небудзь філіі БНФ пра сваю апазыцыйную дзейнасьць, едзе беларус у Прагу — не кудысьці яшчэ, а менавіта ў сталіцу. У Празе ўцякач ідзе адразу не ў паліцыю здавацца, што было б лягічна, а да суайчыньніка, які тут працуе (і пра эміграцыю, дарэчы, нават ня думае). Маўляў — дапамажы, братка: як тут і што? Дзе даюць грошы, кватэру, працу? Калі даведваюцца, што твая праца ніякага дачыненьня да іміграцыйных службаў ня мае, што запрасіць яго жыць да сябе ў хату ты не зьбіраесься, таксама, як і прапаноўваць грошы альбо працу, беларус страшэнна крыўдзіцца, лічыць цябе буржуем і здраднікам радзімы, якую ён толькі што пакінуў. У імя Бацькаўшчыны, зразумела. Але асабліва моцна беларус крыўдуе на тутэйшыя ўлады — гэта значыць, на чэхаў. Яны і бюракраты (на слова табе ня вераць, патрабуюць нейкія паперы), і скнары (кватэру адразу не даюць, спачатку прымушаюць жыць у лягеры для ўцекачоў), і «кнедлікі» (ядуць living рознае ташноцьце замест сала й дранікаў, а галоўнае — задарма ня кормяць).

Некаторы час беларусаў у Празе найчасьцей можна было сустрэць сярод распаўсюднікаў турыстычных рэклямных улётак. Работа не прыбытковая, але й ня цяжкая — заўсёды на сьвежым паветры ды яшчэ ў цэнтры. Але пасьля таго як праская мэрыя гэты від дзейнасьці ў Старым горадзе забараніла, улюбёны беларускі «бізнэс» захірэў.

Найбольш здатныя паціху перасоўваюцца далей на Захад. Быў у Празе адзін уцякач, які атрымаў палітычны прытулак у Чэхіі, але потым абвінаваціў чэскія ўлады ў парушэньні ягоных чалавечых правоў і атрымаў прытулак у Бэльгіі. Але ж і ў Бэльгіі яму не спадабалася, і стаў ён прасіць палітычнага прытулку ў Швайцарыі. Чым скончылася ягоная эпапэя і на чым душа супакоілася — ня ведаю.

Ведаю, што такіх вандроўнікаў зь Беларусі, якія праўдамі й няпраўдамі прасочваюцца ў Польшчу альбо ў Чэхію, адтуль — у Нямеччыну, адтуль — у Галяндыю, адтуль — у ЗША, далей — паўсюль, вельмі шмат. І нідзе няма краіны, якая цалкам задаволіла б іх, бо паўсюль трэба: а) вучыць мову, b) працаваць і c) інтэгравацца ў тамтэйшае грамадзтва. А навошта інтэгравацца, калі хапае і дзясятка словаў на расейскай мове, каб паразумецца са сваімі? Што ж, для расейскай ці ўкраінскай мафіі гэта не пытаньне. Мафія сапраўды інтэрнацыянальная. Вось толькі мафію звычайныя эўрапейцы ня любяць. І не за тое, што злачынцы-эмігранты не гавораць у большасьці сваёй на эўрапейскіх мовах, а за тое, што яны забіваюць, рабуюць і ўвогуле сядзяць на шыі ў астатніх эўрапейцаў.

Савецкія партфункцыянэры вельмі абураліся падчас сваіх камандзіровак ці, скажам, адпачынку на Захадзе, калі там адбываліся якія-небудзь антыкамуністычныя акцыі пратэсту — напрыклад, супраць уварваньня савецкіх танкаў у Чэхаславаччыну ці ў Аўганістан ці з-за адмовы Савецкага Саюзу выпускаць габрэяў у Ізраіль. «Ну, за што яны нас так ня любяць?» — выказваў шчырае неўразуменьне адзін такі чыноўнік у Менс-

ку. «А за што нас любіць?» — спыталіся неяк у яго ў адказ. Пытаньне засталося без адказу. Справа ня ў тым, каб нас раптам узялі ды палюбілі на Захадзе. Справа ў тым, каб мы самі сябе любілі й песьцілі.

*2002—2003, Прага—Менск*

## Блізу Далі

### Паездка ў Фігейрэс

На чыгуначнай станцыі Фігейрэсу побач з гішпанскім чырвона-жоўта-чырвоным сьцягам лунае дзевяціпалосны, тых самых колераў, каталёнскі. І гэтак на ўсіх станцыях Каталёніі, кожная зь якіх абавязкова абвяшчаецца двойчы: спачатку па-каталёнску, потым па-гішпанску.

У душным нумары таннага прыморскага гатэлю вісіць выцьвілая ад сонца рэпрадукцыя карціны Далі «Ў пошуках чацьвертага вымярэньня». Подпіс пад рэпрадукцыяй на чатырох мовах — каталёнскай, гішпанскай, ангельскай і францускай.

Каталёнцы ня могуць дараваць вялікаму мастаку, што ён пакінуў большую частку сваіх твораў у спадчыну ня роднай Каталёніі, а гішпанскаму нацыянальнаму музэю «Прада» ў Мадрыдзе. Не даруюць яму і захапленьня «каўдыльлё» Франка, які забараніў каталёнскую мову. Але ж каталёнцы, якіх называюць «шатляндцамі поўдню», славяцца сваім практыцызмам і прадпрымальнасьцю. Імя Далі сёньня прыносіць немалы прыбытак Каталёніі. Малюнкі ды эскізы мастака, якіх ён пакінуў па сабе безьліч, можна бачыць за памяркоўную плату ці ня ў кожным мястэчку на ўзьбярэжжы.

Агромністы аўтобус, поўны разнамоўных турыстаў, лёгка ўзносіць цябе на вяршыню сьвятой для ўсіх каталёнцаў гары Мансэрат. Тут, у глыбіні бэнэдыктынскага кляштару, можна дакрануцца да адпаліраванай да бляску мільёнамі дотыкаў міраносіцы ў руках «Чорнай Мадонны». Пасьля цішыні й прахалоды кляштару неўтаймаванае сонца сьлепіць яшчэ больш.

Уяўляеш сабе, як цяжка было дабірацца сюды пешкі гадоў трыццаць таму, калі не было яшчэ сучаснай аўтастрады, а дарогі Гішпаніі нагадвалі колішняе савецкае бездарожжа.

На пачатку 1940-х гадоў дзьвесьце вядомых інтэлектуалаў Каталёніі сабраліся на гары Мансэрат і напісалі адозву, у якой патрабавалі ад Франка шанаваць правы чалавека і вярнуць незалежнасьць іхнай рэспубліцы. Далі сярод падпісантаў не было й не магло быць. Але карціны ягоныя, як і работы Пікасо й Міро, ёсьць у тутэйшым музэі падарункаў.

Больш як за сто кілямэтраў ад Мансэрату, у Фігейрэсе, месьціцца тэатар-музэй Далі, які ён стварыў сам, з дапамогай каманды архітэктараў і мастакоў, у 1960-я... Выглядае музэй фээрычна. На тле сіняга неба побач са старадаўнім каталіцкім саборам Сьв. Пэрэ — цёмна-чырвоны паралелепіпэд з празрыстым копулам-сфэрай. Сьцены будынку ўпрыгожаныя геамэтрычна разьмешчанымі ўзорамі-кветкамі. Пры бліжэйшым разглядзе яны ператвараюцца ў тое, што падказвае вашая фантазія. Гідэса — маладая жвавая бляндынка, якая аднолькава кепска размаўляе на чатырох мовах, — безапэляцыйна сьцьвярджае, што гэта выявы хлеба...

У глыбіні будынку ў цёмным халаднаватым сутарэньні, аздобленым чорнай матэрыяй, побач

з падсьветленымі залатымі вырабамі самога майстра спачывае маркіз Сальвадор Далі-э-Пуболь (тытул маркіза быў яму дадзены каралём Гішпаніі).

Як і пры жыцьці майстра, вакол яго шмат людзей з усяго сьвету. Сярод стракатых аўтобусаў розных турыстычных фірмаў каля музэю заўважаю адзін непрыкметны й сьціплы з бляклым надпісам «Минск»...

Вось некалькі немаладых жанчынаў і мужчынаў гучна спрачаюцца й рагочуць, моцна жэстыкулюючы. Гэта, відаць, гішпанцы. Вось сталага веку француз нешта напаўголасу тлумачыць свайму маладзейшаму суразмоўцу. Той уважліва слухае. Польская й чэская моладзь выглядае крыху зьбянтэжанай. Некаторыя нават шакаваныя. А вось і турысты з Усходняй Эўропы — адразу ня скажаш, адкуль менавіта. Ёсьць нешта знаёмае ў іхнай манеры гаварыць напаўголасу, скаванасьці рухаў, насьцярожанасьці позіркаў. Здаецца, для некаторых зь іх гэта ці ня першая сустрэча з творамі замежнага мастака...

За савецкім часам танныя рэпрадукцыі карцінаў Далі можна было бачыць у многіх савецкіх кватэрах, побач з фатаздымкамі Гэмінгўэя. «Прадчуваньне грамадзянскай вайны» («Мяккая канструкцыя з гатаваных бабоў») мяне асабіста ўразіла некалі куды больш, чым славутая «Герніка» Пікасо. Хоць большасьці маіх блізкіх Далі й Пікасо не падабаліся аднолькава.

Савецкае мастацтвазнаўства залічвала творчасьць Далі ў разрад буржуазнага загніваючага мастацтва, а сам ён быў улюбёнай мішэньню для крытыкаў капіталістычнага ладу жыцьця. Між тым, у юнацтве мастак захапляўся марксізмам і камунізмам, як і ўсе ягоныя паплечнікі-сюррэалі-

сты. Але ўжо ў 1930-х Далі назваў марксізм «самай ідыёцкай тэорыяй у гісторыі сучаснай цывілізацыі».

«Адсутнасьць фантазіі, — пісаў Далі гішпанскаму рэжысэру Бунюэлю, разам зь якім стварыў знакаміты фільм «Андалускі сабака», — ёсьць канец усяму. Сталін — самы быдляцкі з усіх пазбаўленых фантазіі людзей».

Па дарозе да замку Пуболь, дзе пахаваная жонка Далі — бясконца любімая ім Гала, якой ён гэты замак і падараваў, — на прыдарожнай сьцяне можна бачыць надпіс па-каталёнску. «Indepedencia» (Незалежнасьць). Побач — зорка, серп і молат. Сымбалі камунізму й анархізму, якія парадаксальным чынам спалучаюцца з заклікамі да нацыянальнай незалежнасьці, можна бачыць паўсюдна ў Каталёніі. Асабліва шмат іх у Барсэлёне, вядомай сваімі рэвалюцыйнымі традыцыямі.

Далі прыпісвае сабе «адкрыцьцё» яшчэ аднаго вялікага каталёнца — архітэктара Гаўдзі. Будаўніцтва сабору «Саграда Фамілія» («Сьвятое Сямейства») у Барсэлёне паводле ягонага праекту, распачатае ў 1920-я гг., магчыма, скончыцца толькі ў 2020-я гг. Геніяльная фантазія архітэктара надала сабору незямныя формы. І разам з тым ён нагадвае дзіцячыя замкі зь пяску.

Для мяне загадка — дзе мог бачыць такія дзіцячыя замкі Гаўдзі? Пясок на пляжах каталёнскага Коста-Брава незвычайны. Ён складаецца з буйных крупінак, цьвёрдых навобмацак, нібы тыя крышталі. Гэта непрыдатны матэрыял для рукатворных цудаў.

«Коста Брава» ў перакладзе азначае «Жорсткі Бераг». Прыбярэжныя скалы тут нагадваюць фрагмэнты касьцяку гіганцкіх вымерлых дыназаў-

раў. Тутэйшыя скалы — адгалінаваньні Пірэнэйскіх гораў, якія абрываюцца проста ў Міжземным моры. Далі назваў некалі мыс Крэўс — самы ўсходні на Пірэнэйскай паўвысьпе — «геніяльным геалягічным трызьненьнем». Формы й зьменлівы колер скалаў падказалі мастаку тэмы для многіх ягоных карцінаў.

Далі, які нарадзіўся ў мястэчку Кадакес каля мысу, вельмі імпанавала, што ён і ягоная сям'я першымі ў Гішпаніі маглі сустракаць усход сонца. Дарэчы, ён мог быць удзячны генэралу Франка хоць бы за ягоны дэкрэт «аб разьвіцьці турызму» ў Кадакесе і суседнім Порт-Льлігаце. Мабыць, дзякуючы таму дэкрэту гэтыя мясьціны, абвешчаныя запаведнымі, цяпер пазбаўленыя напліву цікаўных і захаваліся ў амаль некранутым выглядзе.

Далі вучыўся ў Мадрыдзе, жыў у Парыжы й Лёндане, амаль восем гадоў прабыў у ЗША, дзе яго напаткаў сапраўдны трыюмф. Але ж любіў ён толькі родны Кадакес. Гэта добра заўважаецца ў ягонай творчасьці: няма амаль ніводнай работы Далі, у якой не прысутнічаў бы фрагмэнт тамтэйшага пэйзажу. Магчыма, акрамя Далі, быў толькі адзін мастак, чыя творчасьць прысьвечаная адзінаму месцу на зямлі, — гэта Шагал, які ўсё жыцьцё маляваў свой Віцебск.

Хоць Шагал бываў на Коста-Брава і захапляўся відамі ўзьбярэжжа, гэтыя два цалкам непадобныя мастакі пры жыцьці сустрэліся толькі аднойчы, ды й тое завочна. Іхныя работы былі прадстаўленыя на адной з «выставаў сюррэалістычных аб'ектаў» у Парыжы.

Шагал, як і Далі, перажыў пэрыяд захапленьня рэвалюцыяй, але хутка расчараваўся ў саміх

рэвалюцыянэрах. Абодва мастакі лічылі злачынствам адсутнасьць фантазіі, нічым не абмежаванай у іхнай творчасьці. Але размова не пра жывапіс.

200 гадоў таму кароль Філіп V з дынастыі Габсбургаў «аддзячыў» Каталёніі, што падтрымала яго ў вайне за гішпанскі трон, зьнішчыўшы ўнівэрсытэт у Барсэлёне, спаліўшы каталёнскія кнігі й забараніўшы каталёнцам размаўляць, сьпяваць і пісаць па-каталёнску. Але каталёнцы захавалі родную мову. Яны дагэтуль, замест вогненна-паўднёвага, выразна індывідуальнага гішпанскага флямэнка, танчаць сардану — узяўшыся за рукі, карагодам.

Віньня дэ Фабра — звычайнае сталовае віно. Яно крышку пеніцца, калі яго наліваеш у шклянку, а на смак і колер яно нагадвае вішнёвы напой. Бутэлька, у якую разьліваюць гэтае віно, каштуе, мабыць, больш, чым яно само. На кожнай этыкетцы Віньня дэ Фабра — верш клясыка каталёнскай паэзіі Гімэры. Паэзія, як і віно, для каталёнца ўсё адно што хлеб.

Адна з галоўных тэмаў творчасьці Далі — кошык з надламаным боханам хлеба. На некаторых ягоных карцінах хлеб нагадвае разарванае сэрца.

*2002. 18 студзеня.*

# Жэнэўскі тупік, або Страсьці ў кулюарах ААН на тле альпійскага краявіду

## Мяжа на замку

У аэрапорце Жэнэвы шукалі бомбу. Паліцыянты на мігах паказвалі, што далей ісьці нельга, і ачаплялі памяшканьне стракатай стужкай — квадрат за квадратам, выціскаючы натоўп. Паводзілі яны сябе бесцырымонна, нічога не тлумачачы і не ўступаючы ў размовы з пасажырамі. Пасажыры напаўголасу абураліся й спрабавалі ўгадаць, ці пасьпеюць яны патрапіць на свой рэйс. Я, хоць і прыбыў у порт задоўга да вылету, таксама хваляваўся, бо бачыў даўжэзныя чэргі на рэгістрацыю. І тут праз гучную сувязь чую аб'яву — пасажыры швайцарскіх авіяліній могуць прайсьці на пасадку праз французскі сэктар аэрапорту. Паколькі я ляцеў самалётам швайцарскай авіякампаніі цераз Цюрых, вырашыў скарыстаць з сытуацыі. Памежнік на пашпартным кантролі нават не паглядзеў дакумэнтаў, толькі зірнуў на квіток ды махнуў рукой, паказваючы, куды ісьці. На свой «гейт» я прыйшоў першым...

Такім чынам, я здолеў ступіць на тэрыторыю Францыі, не выходзячы са швайцарскага аэрапорту. І гэта не адзіны выпадак.

Вывучаючы турыстычную мапу, я зьвярнуў увагу на рэкляму мястэчка Салеў у прыгарадзе

Жэнэвы і вырашыў туды зьезьдзіць. Аўтобус едзе туды з цэнтральнага вакзалу Карнава хвілін дваццаць. Ад канцавога прыпынку — яшчэ хвілін дзесяць пешкі да месца, дзе знаходзіцца «тэлефэрык». Так на францускі манер завецца канатная дарога. З аглядной пляцоўкі на вышыні 1080 мэтраў адкрываецца маляўнічая панарама Жэнэвы з возерам, а з другога — манумэнтальны від на славуты Манблян (у сонечны дзень яго добра відаць і ў цэнтры гораду).

Паблукаўшы крыху па горных камяністых сьцежках, пазьбіраўшы пралескі — акурат такія растуць на Лысай гары пад Менскам — ды адчуўшы сябе на хвіліну ў ролі Леніна ў выгнаньні, я пасьпяшаўся назад. І толькі вяртаючыся на аўтобусны прыпынак, прыгледзеўся ўважліва да дзіўнаватай, казённага выгляду будыніны са шкла й бэтону ля шашы. Гэта быў КПП — інакш кажучы, пункт пропуску на швайцарска-францускай мяжы. Праўда, будынак быў зачынены на замок... Так бы мовіць, мяжа на замку. Магчыма, увесну, калі сьнег застаецца толькі на альпійскіх вяршынях, а паўсюль на газонах цьвітуць стакроткі, тутэйшыя памежнікі адпраўляюцца куды-небудзь у адпачынак.

Не гістарычны цэнтар з саборам Сьв. Пятра, зусім сьціплы паводле плошчы, а менавіта возера зьяўляецца геаграфічным, культурным ды сэнсавым цэнтрам Жэнэвы.

**Кальвін, Русо і флямінга**

Гледзячы на гіганцкі ўтульны парк адпачынку, якім ёсьць на сёньня Жэнэва, цяжка ўявіць, што тут некалі Жан Кальвін закладаў рэфармацкі рух. Палымяны аскет-пратэстант Кальвін, калі б

мог устаць з магілы і паглядзець навокал, моцна зьдзівіўся б. І яшчэ больш быў бы азадачаны, калі б нехта сказаў яму, што ўбачанае — вынік Рэфармацыі, якая дала штуршок эўрапейскай цывілізацыі на многа вякоў наперад. Шматлікія банкі, гатэлі й крамы на кожным кроку ён яшчэ мог бы зразумець. Але дух вольнасьці, бестурботнасьці й спакою, нібы разьлітых на гарадзкіх вуліцах напалам з водарам квітнеючых вішняў і рададэндронаў, — хто яго ведае. Ці настолькі ён быў пурытанінам, каб не захапіцца?..

Мушу прызнаць, некаторыя рэчы становяцца адкрыцьцём. Уразіў той факт, што Жэнэўскае возера мае працяг у выглядзе ракі Роны — той легендарнай Роны, якую Ганібал фарсаваў на сланах на шляху з Галіі ў Рым. Бурлівыя воды ракі зусім не падобныя да водаў лагоднага пад вясновым сонцам возера.

Мяркуючы па вялікай колькасьці розных вадаплаўных птушак, вада ў возеры досыць чыстая, хоць і не празрыстая. Акрамя звыклых лебедзяў, чаек ды качак розных відаў, у батанічным садзе ля берагу возера можна ўбачыць ружовых флямінга. Канкурэнцыю чайкам складаюць арлы, іх тут процьма. Яны харчуюцца рыбай, а гняздуюцца на дрэвах у парках. Каля вады — надпісы з просьбай карміць птушак без залішняга фанатызму — ежы ў прыродным асяродзьдзі ім і так хапае, а дадатковае сьмецьце нікому не патрэбнае.

Швайцарцы вельмі заклапочаныя экалёгіяй. Улетку ў лясах тут паўсюдна забаронена паліць вогнішчы й шумець пасьля дзявятай вечара — у гэты час кладуцца спаць мурашкі.

Францускі філёзаф Жан-Жак Русо, які жыў у Жэнэве ў выгнаньні ды стаў яе ганаровым гра-

мадзянінам, быў, можна сказаць, папярэднікам цяперашніх «зялёных». Ён першы загаварыў пра небясьпеку тэхнагеннай цывілізацыі для чалавечай маралі. Выспа паміж Ронай і Жэнэўскім возерам, на якой Русо некалі любіў бавіць час у самоце, названая ягоным імем. Тут, побач з папулярнай сярод турыстаў рэстарацыяй, стаіць бронзавы бюст філёзафа, які ледзь прыметна іранічна ўсьміхаецца, пазіраючы на запоўненую транспартам і натоўпам грамадзян набярэжную ды мост Манблян.

Жэнэва, заціснутая з усіх бакоў Францыяй, — францускае места. Па-першае, тут размаўляюць па-француску. Адчуваецца францускі ўплыў і ў архітэктуры, і ў манерах паводзінаў жыхароў. Кожны другі мінак на вуліцы з табой павітаецца нараспеў: «Банжу-у-у-р». Гэтак прынята вітацца зь незнаёмымі ў беларускай вёсцы... Магчыма, галянтныя манеры сьведчаць аб нейкай долі правінцыялізму. Але яны вельмі пасуюць гэтаму някідкаму, некрыклівому, сьціпламу ў сваёй прыгажосьці месту.

Пры канцы красавіка ў Швайцарыі адбудзецца чарговая сэрыя нацыянальных і мясцовых рэфэрэндумаў (яны праводзяцца штогод, калі не часьцей). Пытаньні — самыя розныя: ад лёсу Жэнэўскага стадыёну да праблемы, ці даваць права голасу неграмадзянам Швайцарыі.

### Арлы над палацам нацый

Жэнэва жыве за кошт турызму. Цэнтры банкаўскага жыцьця — у Бэрне ці Цюрыху. А галоўны турыстычны аб'ект Жэнэвы (пасьля возера й знакамітага фантану на ім, які ўтварае пэўнага кшталту вадзяны ветразь альбо вэлюм 50-мэтровай вышыні) — гэта ААН. Ці дакладней — Палац

наций, дзе працуе Камісія ААН па правох чалавека. У Жэнэве шмат міжнародных арганізацый — галоўная сядзіба Міжнароднай арганізацыі Чырвонага Крыжа, Сусьветная агенцыя ў пытаньнях інтэлектуальнай уласнасьці, і Міжнародная арганізацыя працы, і офіс Генэральнага пагадненьня па тарыфах і гандлі. Але ААН па-за канкурэнцыяй. Менавіта Жэнэва была з 1919 да 1946 гг. штаб-кватэрай Лігі Нацый — папярэдніцы ААН. Дарэчы, пабудаваны да вайны палац, які мусіў служыць сымбалем міру, бясьпекі й дэмакраты, стылем нагадвае тагачасныя ўрадавыя будынкі як у Італіі пры Мусаліні, так і гітлераўскага Райху ды Савецкага Саюзу зь яго «сталінскім ампірам».

У Палацы нацый працуе і 61-я сэсія Камісіі ААН па правох чалавека. Прычым ня столькі ў залях пасяджэньняў, колькі ў кулюарах. На паверхах крыла «Е» Палацу нацый стаіць гармідар, як на вакзале. Сотні, тысячы людзей вядуць размовы ў фае, холах, калідорах, на лесьвіцах. Ну і, зразумела, у кавярні пад назвай «Сэрпантын», зь якой адкрываецца спазор на Альпы й возера. Аднак на прыгажосьць пэйзажу з арламі ніхто не зьвяртае ўвагі. Тут за кавай вядуцца перамовы, вырашаюцца сусьветныя праблемы.

**Кубачак кавы з Адрыянам Севярынам**

Так за столікам у кавярні адбылася й сустрэча спэцдакладчыка ААН па правох чалавека ў Беларусі Адрыяна Севярына з прадстаўнікамі беларускіх няўрадавых арганізацый.

Адчувалася, што для дыплямата нефармальная сустрэча была ня менш важнай, чым непасрэдны выступ на сэсіі. Тут ён мог менш дыпляматычна і больш эмацыйна выказаць тое, што яго

хвалюе, давесьці мэты дакладу да апазыцыі, частка якой успрыняла даклад ледзь не як здраду беларускай дэмакратыі. Няма сэнсу гаварыць пра аргумэнты Севярына і ягоных апанэнтаў. Гаворка пра тое, што камісія не зьяўляецца закрытай арганізацыяй, усе рашэньні даступныя ў інтэрнэце, а сябры камісіі — для сустрэчы з праваабаронцамі ці іншымі грамадзкімі актывістамі, акрэдытаванымі на сэсіі. Усе дэлегаты адкрытыя для выслухоўваньня аргумэнтаў розных бакоў. Менавіта гэта не задавальняе афіцыйную дэлегацыю. Яна пільна сачыла за ўсімі кантактамі беларускіх праваабаронцаў, але ніхто зь яе ўдзельнікаў нават не падышоў да суайчыньнікаў, хоць бы са звычайнай ветлівасьці. Нават тут, удалечыні ад Менску, адчувалася стаўленьне дзяржаўных чыноўнікаў да апанэнтаў рэжыму як да ворагаў ці ў найлепшым выпадку — ізгояў, зь якімі побач нават стаяць небясьпечна.

Але такое стаўленьне да праваабаронцаў уласьцівае ня толькі Беларусі. У Камісіі ААН ёсьць некалькі дзяржаў — Кітай, Куба, Зымбабвэ і да іх падобныя, — пра якія нават генэральны сакратар ААН Кофі Анан быў вымушаны сказаць, што яны дыскрэдытуюць сваёй прысутнасьцю гэтую арганізацыю. Дыскрэдытуюць пастаяннай маной, фальшаваньнем фактаў, крывадушнасьцю, агрэсіўнымі нападкамі на іншыя краіны. Цяпер гэтыя краіны, адчуваючы непазьбежнасьць рэформы, якая абмяжуе вагу дыктатарскіх рэжымаў у прыняцьці рашэньняў па правох чалавека, фактычна выступілі адзіным фронтам супраць інстытуту спэцдакладчыкаў. У якасьці забойчага аргумэнту выкарыстоўваецца дзяржаўны сувэрэнітэт, які нібыта парушае крытыка становішча з правамі

чалавека з боку ААН. Такі самы аргумэнт выкарыстоўваў некалі й СССР. Любая крытыка міжнароднай супольнасьці адразу абвяшчалася ўмяшаньнем ва ўнутраныя справы дзяржавы.

**Камень на шляху Дыктатуры**

Адрыян Севярын у выступе на сэсіі назваў спэцдаклады каменем, які ляжыць на шляху дыктатараў да беспакаранасьці. Між іншым, на аснове фактаў, сабраных праваабаронцамі і перададзеных у ААН, быў зроблены некалі даклад аб масавых парушэньнях правоў чалавека ў Чылі, і ўжо на падставе яго здолелі распачаць крымінальны працэс супраць Піначэта. Дзіва што падобныя прэцэдэнты выклікаюць лютасьць у сучасных дыктатараў. Мяккасьць беларускага дакладу Севярына, які пакідае кіраўніцтву Беларусі свайго роду апошнюю магчымасьць выбару на карысьць дэмакратыі, была ўспрынятая афіцыйным Менскам як слабасьць і сыгнал да атакі супраць рэзалюцыі ААН па Беларусі.

Міжнародныя праваабарончыя арганізацыі, што сабраліся днямі ў Жэнэве, маюць багата пытаньняў як да самой Камісіі ААН у пляне эфэктыўнасьці яе дзейнасьці, так і да многіх яе сяброў. У тым ліку і да ЗША ці краін Эўразьвязу, непасьлядоўнасьць пазыцыі якіх прывяла да таго, што пытаньне Чачэніі другі год запар здымаецца з разгляду сэсіі ААН. Падобнае можа адбыцца і ў дачыненьні да Беларусі.

Аднак усё гэта ня мае непасрэднага дачыненьня да Жэнэвы, дзе воляю лёсу месьціцца Камісія па правох чалавека. Маляўнічы краявід Жэнэўскага возера, на тле якога кіпяць страсьці ў залях Палацу, дадае горычы ва ўсьведамленьне таго,

што, хоць шчыгрынавая скура дыктатуры ва ўсім сьвеце сьціскаецца з кожным годам, эўрапейская краіна Беларусь усё яшчэ застаецца ў ліку самых зацятых ворагаў дэмакратыі. Тае самае дэмакратыі, якая толькі й дазваляе прадстаўнікам цяперашняга рэжыму засядаць у структурах ААН у Жэнэве ды цынічна заяўляць, нібыта Беларусь дасягнула ў галіне правоў чалавека нечуваных, можна сказаць, нечалавечых посьпехаў.

*Наша Ніва. 2005. 15 красавіка.*

# Замест пасьляслоўя

# Што гэта было?

Некалькі пытаньняў да самога сябе

**Іспыт плошчай**

Падзеі апошніх тыдняў сакавіка не ўкладаюцца ў рамкі акцыяў пратэсту, да якіх усе — і ўлады, і апазыцыя — прызвычаіліся цягам апошніх гадоў. Справа ў тым, што падзеі 19—25 сакавіка як бы выйшлі па-за рамкі палітычнага поля, пашырылі яго. Распачаўшыся як мітынг супраць фальшаваньня вынікаў выбараў, пратэст вельмі хутка ператварыўся ў нешта значна больш сур'ёзнае, чым меркаваны выступ апазыцыі.

Адна знаёмая дзяўчына прызналася, што 19-га яна і ейныя сяброўкі ішлі на Кастрычніцкую плошчу, як на расстрэл, — у літаральным сэнсе слова, з заміраньнем сэрца. Адолеўшы страх, наступным днём многія маладыя людзі выйшлі на плошчу ўжо ня дзеля таго, каб проста падтрымаць Мілінкевіча ці Казуліна, якія ня здолелі нічога канкрэтнага прапанаваць. Яны выйшлі бараніць не свае галасы, якіх ніхто не лічыў, але сябе, сваю годнасьць і самапавагу. Не яны пайшлі за палітыкамі, але палітыкі, уражаныя мужнасьцю і бескампраміснасьцю маладых людзей, вымушаныя былі неяк рэагаваць і ўрэшце саступіць маральнаму аўтарытэту нікому не вядомых датуль юнакоў і дзяўчат.

Ніхто з апазыцыі, выглядае на тое, ня верыў у магчымасьць абвяргнуць вынікі прэзыдэнцкіх выбараў, а тым больш — у паўторныя выбары, ніхто ня верыў у масавасьць пратэстаў ці ў іхную эфэктыўнасьць. Максымум, на што, відаць, спадзяваліся лідэры апазыцыі, — гэта на рэакцыю Захаду і Расеі. Гэтыя спадзяваньні спраўдзіліся толькі на палову. Ды й дапамога Захаду была, зноў жа, досыць абмежаванай — хутчэй, калі называць рэчы сваімі імёнамі, дэкларацыйнай.

Але ж не міжнародная рэакцыя і не прадказальная рэакцыя ўладаў на дзеяньні апазыцыі сталіся галоўным чыньнікам. Галоўнымі сталіся дзеяньні передавой часткі менскай моладзі — прычым ня толькі «зуброў», маладафронтаўцаў ды іншых актывістаў, але моладзі палітычна незаангажаванай альбо, прынамсі, далёкай ад якіх-кольвечы партыйных і грамадзкіх структураў. І тут ня мела асаблівага значэньня масавасьць.

Тыя, хто з упартасьцю папугаяў паўтараў словы пра «менскі Майдан», нічога не зразумелі. Яны ня здолелі разгледзець за сьпінамі амапаўцаў і рэпартэраў беларускае Плошчы. (Дарэчы, у польскіх газэтах зьявілася і атрымала распаўсюд у слэнгу гэтае беларускае слова — толькі з польскім вымаўленьнем.) Беларускай Плошчы, канечне, не хапала маштабу й арганізацыі ўкраінскага Майдану, бо тым, хто стаяў у Менску, было ў мільён разоў цяжэй, чым тым, хто выйшаў на плошчу ў Кіеве ўвосень 2004-га. Бо ў менчукоў не было спадзяваньняў на перамогу, не было спадзяваньняў, што сілавікі раптам пяройдуць на бок апазыцыі, не было спадзяваньняў на незалежную прэсу, не было спадзяваньняў на лідэраў апазыцыі,

урэшце. Ня кажучы ўжо пра недахоп цёплых рэчаў і прыбіральняў.

**Жалезны сьмех**

Але гэта й не было актам адчаю, прынясеньнем сябе ў ахвяру рэвалюцыі. Кожны з тых, хто прыйшоў на Плошчу, паводзіў сябе так, як лічыў для сябе адзіна магчымым і правільным. Інакш кажучы, кожны зь іх зрабіў выбар, які не называўся «Мілінкевіч», або «Казулін», або «супраць Лукашэнкі». Гэты выбар называўся — «я сам». А калі выявілася, што такіх «самых» у Менску ды іншых месцах Беларусі не адзін дзясятак і нават ня сто, сіла кожнага зь іх узрасла шматкроць.

Яе не змаглі, па вялікім рахунку, адужаць ні спэцслужбы, ні суды, ні турмы. Пачалося тое, што называецца «ланцуговай рэакцыяй».

Называць дзеяньні купкі — сапраўды, усяго толькі купкі — юнакоў і дзяўчат камічнымі могуць толькі людзі, пазбаўленыя ня тое што маралі, але пачуцьця рэальнасьці. І ня мае асаблівага значэньня, хто выстаўляе пратэст моладзі ды карныя апэрацыі супраць яе ў камічным сьвятле — БТ, «Советская Белоруссия» альбо «БелГазета». У кожным разе гэта ёсьць рэакцыя страху. Бо калі нехта перастае баяцца, нягледзячы на ўсе застрашваньні, калі парушаецца «звыклы» парадак рэчаў — тады пачынаюць баяцца тыя, хто страшыць, хто лічыць сябе гаспадарамі жыцьця й чужых душаў. Тады супраць мірнай акцыі «стаяньня» на плошчы кідаюць спэцназ. Гэта ўсё адно што кідаць супраць кветак у полі танкі ды авіяцыю. У Пэкіне, на плошчы Цяньаньмэнь, танкі ехалі па людзях. У Менску пакуль што абышліся СОБРам і тэлебачаньнем.

Але звыклая «карцінка» сьвету аднойчы пачынае разбурацца. І вось ужо з БТ пачынаюць сьмяяцца нават тыя, хто яшчэ нядаўна нічога, акрамя Першага нацыянальнага, не глядзеў і верыў усяму, што гавораць з тэлеэкранаў. Усьмешка на вуснах кіраўніка, які даводзіць, быццам забарона трансьляцыі беларускіх дзяржаўных тэлеканалаў прыватнымі кампаніямі ў Літве ёсьць лепшым доказам эфэктыўнасьці дзяржаўнае прапаганды, нагадвае вышчэрваньне пацука, які раптам апынуўся ў яркім сьвятле. У оруэлаўскім сьвеце, як вядома, «чорнае» ёсьць «белым» і наадварот. Але ж сьвет вампіраў і кадаўраў не вытрымлівае сьвятла дня. Ад яго промняў скура нячысьцікаў пакрываецца пухірамі й гнойнымі ранамі.

Асобнай ацэнкі заслугоўвае пазыцыя расейскіх інфармацыйных праграмаў. Зусім сьцісла яе можна характарызаваць так: мы прызвычаіліся жыць у страху й брудзе, дык і вы, беларусы, бярыце тое, што вам даюць, і не рабіце выгляду, быццам вам трэба болей за іншых.

**Хістаньні лідэраў**

Зразумела, нельга прымяншаць таго, што здолела зрабіць апазыцыя за няпоўныя тры месяцы да выбараў. Яна здолела раскатурхаць, разварушыць грамадзкую думку ў Беларусі, давесьці хоць бы частку праўды да многіх тысяч людзей. І ў той момант, калі апазыцыя спынілася ў сваім руху, палічыўшы сваю задачу ў цэлым выкананай, купка маладых людзей зрабіла яшчэ адзін крок наперад. Яны засталіся на Плошчы. Лідэры апазыцыі не змаглі адразу ацаніць усёй важнасьці гэтага кроку, бо яны працягвалі думаць чыста палітычнымі катэгорыямі. Яны разгубіліся ў першы мо-

мант гэтаксама, як і ўлада, сталі разважаць над тым, ці карысна ім гэта, ці не. А калі карысна — дык у якой ступені і якія палітычныя дывідэнды можна выціснуць з новай сытуацыі? Адсюль хістаньні Казуліна, які то падтрымліваў моладзь на Плошчы, то ўмаўляў іх разысьціся, то сыходзіў сам, то вяртаўся ў самы недарэчны момант — праз дваццаць хвілінаў пасьля «зачысткі», то крытыкаваў Мілінкевіча за тое, што той нібыта правакуе ўлады на рэпрэсіі супраць дэманстрантаў, то сам адчайна кідаўся на міліцэйскія дручкі на чале «маршу на Акрэсьціна».

Прыхільнікі Мілінкевіча, як вядома, у сваю чаргу абвінавацілі Казуліна ў правакацыйных дзеяньнях. Адпаведны адказ казулінцаў таксама быў адэкватным і хуткім. І ніхто зь іх, відаць, не разумеў у момант «дыскусіі», што гэтыя разборкі меней за ўсё цікавяць грамадзкасьць. Разыходжаньні паміж экс-прэтэндэнтамі на прэзыдэнцкую пасаду, іхныя выпады й контравыпады цікавілі хіба беларускія дзяржаўныя мэдыі ды расейскія сродкі масавай інфармацыі, перад якімі была пастаўленая задача прынізіць і высьмеяць акцыі пратэсту ў Беларусі, выставіць дзеячоў апазыцыі ў выглядзе блазнаў, якія ня могуць падзяліць паміж сабой славу ды грошы. Але яны, гэтыя праўладныя мэдыі, памыліліся ў сваіх разьліках. Адразу пасьля арышту Казуліна Мілінкевіч пачаў актыўна дамагацца ад уладаў зьвестак аб ягоным лёсе і стане здароўя. Але ня лідэры апазыцыі на той момант ужо зрабіліся галоўнымі героямі падзеяў. Імі сталі сотні невядомых юнакоў і дзяўчат, мужчынаў і жанчын, якіх пачкамі дастаўлялі на Акрэсьціна, у Жодзіна ды ў іншыя выхаваўчыя інстытуты.

**Нешта зьмянілася**

Ці можна назваць акцыі пратэсту і масавыя арышты рэвалюцыйнымі падзеямі? У клясычным сэнсе, безумоўна, не. Вядома, што рэвалюцыю, якая прайграла, называюць спробай бунту. Але ж і звычайным бунтам тое, што адбылося ў Менску, не назавеш. Бунт азначае, як правіла, выхад стыхійных пачуцьцяў і інстынктаў натоўпу з-пад кантролю розуму. Таму расейскі паэт назваў некалі бунт бессэнсоўным і бязьлітасным. У таго, што зрабілі менскія хлопцы і дзяўчаты, быў свой глыбокі сэнс. Бязьлітаснымі былі тыя, каму яны процістаялі. Гэта быў вынік усьвядомленага выбару, зробленага пад уплывам нармальных, высакародных чалавечых пачуцьцяў. Калі не ў жыцьці краіны, дык у жыцьці гэтых людзей адбылося нешта надзвычай важнае, чаго ніколі не перакрэсьліць тысячам прапагандыстаў ні за якую зарплату.

Калісьці ў 1968-м на Красную плошчу ў Маскве выйшлі ўсяго некалькі чалавек, каб выказацца супраць савецкага ўварваньня ў Чэхаславаччыну. Усіх — у тым ліку, паэтку Натальлю Гарбанеўскую, у якой было малое дзіця, — імгненна арыштавалі пераапранутыя агенты КГБ. Удзельнікаў пратэсту хутка схавалі ў лягерах на даўгі тэрмін. Іхны ўчынак, з гледзішча прагматыкаў, нічога не зьмяніў і ня мог зьмяніць у тагачасным СССР. Ды ня толькі ў СССР. Манеры спэцслужбаў, як бачым, ня надта зьмяніліся й праз пятнаццаць гадоў па ягоным распадзе.

Але ў сакавіку 2006 г., пасьля падзеяў на Кастрычніцкай плошчы, у беларускім грамадзтве — прынамсі, у частцы яго — нешта скранулася, рушыла зь мёртвай кропкі. Гэтым амаль няўлоўным,

неўсьвядомленым да канца адчуваньнем таго, што нешта зьмянілася, мабыць, адрозьнівалася палітычная кампанія вясны 2006-га ад 11 папярэдніх вёснаў.

Ці зробяць зь сёлетняй раньняй вясны свае высновы палітыкі? Ці зьменяцца яны самі, іх мэтады? Чакаць хуткіх і адназначных зьменаў да лепшага было б, напэўна, недарэчна. Ды ўвогуле, калі гаварыць пра палітычныя зьмены, то яны самі па сабе не гарантуюць паляпшэньня жыцьця й росту дабрабыту, справядлівасьці й грамадзкага спакою. Жыцьцё кожнага канкрэтнага чалавека ўвогуле мала залежыць ад грамадзкага ладу ці формы кіраваньня дзяржавай. У кожным выпадку, можна зрабіць у сваім жыцьці нешта такое, чым будуць ганарыцца дзеці і ўнукі.

Але варта ўсьведамляць: тое, аб чым ідзе гаворка, пакуль што засталося фактам біяграфіі некалькіх дзясяткаў асобаў. У крайнім выпадку, гэта можа стаць фактам біяграфіі пакаленьня. Называць тыя або іншыя падзеі гістарычнымі (у чым павінен пакаяцца аўтар гэтых радкоў) сьпяшацца ня трэба. Раздачай ацэнак і падсумаваньнем рахункаў хай займуцца нашыя нашчадкі. Сёньня ёсьць больш пільныя справы.

*Наша Ніва. 2006. 3 красавіка*

*Літаратурна-мастацкае выданьне*

Віталь Тарас
**Звыклае зло**

Рэдактура: Раман Маладзяшын
Карэктура: Натальля Харытанюк
Вёрстка: Сяргей Кандраценка
Фота: Андрэй Лянкевіч

Падпісана ў друк 07.06.2007. Фармат 84×108/32
Афсэтны друк. Папера афсэтная. Гарнітура PetersburgG.
Ул.-выд. арк. 16,17. Наклад 1000.

Надрукавана ў Вільні.

**Кніжная сэрыя «Кнігарня «Наша Ніва»**
**заснаваная ў гонар 100-годзьдзя газэты «Наша Ніва»**

Раней выйшлі ў сэрыі:

**Андрэй Хадановіч.** «Сто лі100ў на tut.by»
**Пётра Рудкоўскі.** «Паўстаньне Беларусі»
**Андрэй Дынько, Андрэй Скурко.** «Беларусь за дзесяць падарожжаў»
**«Жанчыны выходзяць з-пад кантролю».** Анталёгія нашаніўскага жаночага апавяданьня
**Сямён Печанко.** «У Беларускім войску»
**«Застаемся!».** Сакавік 2006: прыватнае і агульнае»
**Наталка Бабіна.** «Крыві не павідна быць відна»
**Алесь Кудрыцкі.** «Суд на Каляды»
**«Бабілёнская бібліятэка».** Замежная літаратура ў перакладах «Нашай Нівы»
**«Найясьнейшая Рэч Паспалітая».** Цывілізацыя. Культура. Рэлігія. Палітыка. Авантура. Героіка. Успамін.

**Пытайцеся ў кнігарнях і незалежных распаўсюднікаў**

**Наша Ніва**

**У выдавецкіх праектах «Кнігарні «Наша Ніва» на 2007–2008 гады**

**Лявон Вольскі.** «Жывёльны сьвет Беларусі». Апавяданьні

**Алесь Кудрыцкі.** «Плястыляндыя». Кніга для дзяцей

**Юрась Пацюпа.** «Бэз». Вершы

**Франц Сіўко.** «Дзень Бубна». Аповесьці

**Міхал Анемпадыстаў.** «Простыя словы». Вершы

**Сяргей Астравец.** «Каты Ёзафа Ратцынгера». Апавяданьні

**Валянцін Тарас.** «На высьпе ўспамінаў». Мэмуары. Выданьне другое, дапоўненае

**Валянцін Тарас.** «Тэст на сумленнасьць». Публіцыстыка

**Сяргей Харэўскі.** «Пра моўленае». Эсэістыка

**Наталка Бабіна.** «Рыбін горад». Раман

**«Спадчына Вялікага Княства».** ВКЛ на старонках «Нашай Нівы»

**Артур Клінаў.** «Падарожная кніга па горадзе Сонца». Раман-vademecum

**Павал Севярынец.** «Лісты зь лесу». Публіцыстыка

**Алесь Белы.** «Наша страва». З гісторыі нацыянальнай кулінарыі

**Наша Ніва**



Чытаючы ўсхваляваныя словы літаратара, ты кожны раз пераконваешся, што дабро і зло, белае і чорнае, сьвятло і цемра ў гэтым сьвеце хоць і зьмянілі свой выгляд, але ў сутнасьці засталіся ранейшымі. Ты можа і гатовы быў зачараванца іх новымі незвычайнымі апранахамі, але прачытаў артыкул і – ня даў падмануць сябе шэрасьці ды ня зьбіўся з дарогі ў тумане.

Сяргей Дубавец

МЕНСК 2007

Віталь Тарас **Звыклае зло**

НН